Аддзелу адукацыі
Віцебскага раённага выканаўчага камітэта

# Віцебскі раён: краязнаўчыя нарысы

2007

УДК
ББК

**Рэцэнзенты:** Г.В. Штыхаў, доктар гістарычных навук, прафесар Г.М. Якаўлева, кандыдат гістарычных навук, дацэнт

**Аўтар-укладальнік** М.В. Півавар

**Навуковыя рэдактары:** А.М. Дарафееў, кандыдат біялагічных навук, дацэнт; А.М. Дулаў, кандыдат гістарычных навук; І.А. Абрамава

**Віцебскі раён:** Краязнаўчыя нарысы / Аўт.-уклад. М.В. Півавар. – Віцебск, 2007. –

Кніга ўяўляе сабой навукова-папулярныя нарысы, прысвечаныя прыродзе, гісторыі і культуры Віцебскага раёна і некаторых тэрыторый, якія на працягу гісторыі ўваходзілі ў склад Віцебскай зямлі, княства, павета.

Разлічана на краязнаўцаў, гісторыкаў, супрацоўнікаў музеяў, студэнтаў, навучэнцаў сярэдніх навучальных устаноў, настаўнікаў, усіх тых, хто цікавіцца гісторыяй і культурай Віцебшчыны.

УДК

ББК
ISBN

©
©

# Змест

Слова да чытача (Вазміцель І.К.)
Уводзіны (Півавар М.В.)

**Раздзел 1. Прырода Віцебскага раёну** (навуковы рэдактар Дарафееў А.М.)
**Тэма 1. Геалогія і клімат**
1. Рэльеф і глебы (Кавальчук Г.В., Кадушкевіч Н.І., Калько Г.А., Кухарава В.Ц., Фалейчык А.М.)
2. Клімат краю (Туркова С.В.,Яскевіч К.І.)
3. Карысныя выкапні (Ляўшова Т.В., Яленская М.І.)
**Тэма 2. Раслінны і жывёльны свет**
1. Флора (Смірнова Л.С.)
2. Фауна (Карнілава Т.М.)
**Тэма 3. Ахоўваемыя прыродныя тэрыторыі і аб'екты** (Півавар М.В.)
1. Помнікі прыроды і ахоўваемыя тэрыторыі Віцебскага раёна
2. Аб'екты, якія могуць быць зарэгістраваны як помнікі прыроды
**Тэма 4. Наша Дзвіна** (Півавар М.В.)

**Раздзел 2. Гісторыя Віцебскага Прыдзвіння** (навуковы рэдактар Дулаў А.М.)
**Тэма 1. Наш край у старажытнасці і раннім сярэднявеччы** (Падгурскі П.М.)
1. Каменны і бронзавы вякі
2. Жалезны век
3. Ранняе сярэднявечча
**Тэма 2. Віцебская зямля ў XIII – XVIII стст.** (Макараў М.Дз.)
1. Уключэнне Віцебскага княства ў склад ВКЛ. Віцебская зямля ў XIV ст.
2. Ліквідацыя Віцебскага княства. Віцебская зямля ў канцы XIV – пачатку XVI ст.
3. Гарады і мястэчкі Віцебскага павета ў XVI – XVII стст.
4. Войны XVI – пачатку XVIII ст. і лёс краю
**Тэма 3. Наш край у канцы XVIII ст – пачатку XX ст.**
1. Уключэнне ў склад Расійскай імперыі (Дзядзінкін А.Л.)

2. Падзеі вайны 1812 года (Дзядзінкін А.Л.)

3. Сацыяльна-эканамічнае жыццё ў першай палове XIX ст. (Дулаў А.М.)

4. Паўстанне 1863–1864 гг. (Дулаў А.М.)

5. Сацыяльна-эканамічнае развіццё ў 60-90-я гады XIX ст. (Дулаў А.М.)

6. Віцебскі павет у пачатку XX ст. (Акуневіч В.У., Дулаў А.М.)

7. Стан адукацыі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. (Дзіянава Т.Б., Юргевіч Н.К.)

**Тэма 4. Паўночна-ўсходняя Віцебшчына ў 1917-1941 гг.**

1. Віцебскі павет ў 1917–1921 гг. (Акуневіч В.У.)

2. Мерапрыемствы савецкай улады ў галіне нацыянальнай палітыкі (Дзядзінкін А.Л.)

3. Сельская гаспадарка ў 1920–1930-я гг. (Дулаў А.М.)

4. Развіццё прамысловасці ў 1920–1930-я гг. (Дулаў А.М.)

5. Развіццё асветы і культуры Віцебскага раёна ў 1920–30-я гг. (Юргевіч Н.К.)

**Тэма 5. Віцебскае Прыдзвінне ў гады Вялікай Айчыннай вайны**

1. Пачатак Вялікай Айчыннай вайны. Абарончыя баі (Шырокая М.)

2. Акупацыйны рэжым (Грэбень Я.А.)

3. Барацьба партызан і падпольшчыкаў (Выхадцава І.М.)

4. Вызваленне Віцебскага раёна (Нікіціна Л.К., Паўлава А.І.)

**Тэма 6. Віцебскі раён у пасляваенны час**

1. Аднаўленне гаспадаркі. Віцебскі раён у 1950-я – 1980-я гг. (Табуноў А.В.)

2. Адукацыя і культура ў сярэдзіне 40-х – 80-я гг. XX ст. (Юргевіч Н.К.)

**Раздзел 3. Гонар і слава краю** (навуковы рэдактар Абрамава І.А.)

**Тэма 1. Асобы, якія праславілі наш край** (Півавар М.В.)

1. Славутыя людзі Прыдзвіння

2. Даследчыкі Віцебскага краю

3. Падарожнікі, шлях якіх пралягаў праз наш край

**Тэма 2. Асобныя старонкі духоўнага жыцця Прыдзвіння**
1. Легенды і паданні Прыдзвіння (Півавар М.В.)
2. Асяродкі хрысціянскай духоўнасці (Дулаў А.М.)
2.1 Віцебскі Маркаў Свята-Троіцкі манастыр
2.2 Тадулінскі Свята-Успенскі манастыр
**Тэма 3. Установы адукацыі і музеі**
1. Лужаснянскі аграрны каледж (Півавар М.В.)
2. Лужаснянская школа-інтэрнат-гімназія для здольных і таленавітых дзяцей Віцебскай вобласці (Шыцько У.У.)
3. Музеі Віцебскага раёна (Півавар М.В.)
**Тэма 4. Турысцка-краязнаўчыя рэсурсы нашага краю** (Півавар М.В.)

**Наш раён сёння** (замест заключэння) (Півавар М.В.)

**Дадаткі**
1. Спіс раслін, занесеных у Чырвоную кнігу Беларусі, якія сустракаюцца ў Віцебскім раёне (падрыхтавала Федасеева Н.)
2. Спіс жывёл, занесеных у Чырвоную кнігу Беларусі, якія сустракаюцца ў Віцебскім раёне (падрыхтаваў Півавар М.В.)
3. Спіс населеных пунктаў Віцебскага павета (1906 г.)
4. Тапанімія раёна (Нікіціна Л.К, Півавар М.В.)
5. Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Віцебскага раёна
6. Страчаныя культавыя помнікі (паводле Кулагіна А.М.)
7. Віцебскае Прыдзвінне XIX – пач. XX ст. у матэрыялах тагачасных выданняў (падрыхтавала Бабровіч Н.А.)
8. Паходы нядзельнага адпачынку ў наваколлях Віцебска (Півавар М.В.)

**Спіс выданняў (XIX ст. – 1941 г.),** у якіх утрымліваюцца звесткі пра Паўночна-ўсходнюю Віцебшчыну (падрыхтаваў Півавар М.В.)
**Спіс рэкамендаванай літаратуры** да вывучэння гісторыі і культуры Прыдзвінскага краю (падрыхтаваў Півавар М.В.)
**Храналогія гісторыі Прыдзвінскага краю** (Півавар М.В.)

## Слова да чытача



*Шаноўны чытач! У цябе ў руках кніга “Віцебскі раён: краязнаўчыя нарысы”. Яна дапаможа табе прайсці па Віцебскім раёне ад мінулага да сучаснасці, зацікавіць багатым краязнаўчым матэрыялам, узбагаціць веды па гісторыі Прыдзвінскага края, пазнаёміць са славутымі землякамі Віцебшчыны.*

*“Са старажытных цудоўных камянёў складаюцца прыступкі будучыні”, – гаварыў мастак Н. Рэрых. Наша мясцовасць адметная сваімі традыцыямі, звычаямі, гісторыяй, багатай культурнай спадчынай. Мы жывем у цудоўным Віцебскім краі, дзе нарадзіліся, дзе жылі нашы продкі, жывуць і працуюць нашы бацькі, дзе мы – грамадзяне сваёй краіны.*

*Спадзяюся, што гэта кніга дапаможа яшчэ больш палюбіць Віцебскі край, дзе можна праявіць усе свае здольнасці, раскрыць таленты, каб выдатнай вучобай і самаадданай працай прынесці найбольшую карысць не толькі роднаму раёну, але і ўсёй Беларусі.*

***Старшыня***
***Віцебскага райвыканкома*** ***І.К.Вазміцель***

## Уводзіны

Гэтае выданне – спроба комплекснага апісання Віцебскага раёна, падрыхтаванае па ініцыятыве аддзела адукацыі Віцебскага райвыканкома. Галоўная ідэя выдання – пашырыць веды пра край, развіваць цікавасць да вывучэння прыроды, гісторыі і культуры малой Радзімы, садзейнічаць выхаванню патрыятызму, грамадзянскіх якасцяў жыхароў нашай мясцовасці. Аўтары пастараліся зрабіць гэта на прыкладах адметнасці краю ў гісторыі Беларусі, важнасці той ролі, якую адыграў рэгіён у эканамічным, палітычным, культурным і духоўным жыцці краіны.

Так склалася, што некаторыя тэрыторыі, якія на працягу гісторыі доўгі час уваходзілі ў склад Віцебскай зямлі, княства, Віцебскага павета цяпер належаць да сумежных раёнаў. Аднак з імі звязаны важныя падзеі ў гісторыі нашага краю. Таму ў адпаведным раздзеле аўтары ўжывалі тэрміны “Прыдзвінскі край”, “Віцебскае Прыдзвінне”, “Паўночна-Усходняя Віцебшчына”. Пад Прыдзвіннем у межах гэтага выдання мы разумеем рэгіён, які гістарычна, геаграфічна і адміністрацыйна прывязаны да г. Віцебска. Сюды мы ўключаем частку Бешанковіцкага раёна (в. Астроўна), Гарадоцкага (в. Ноўка), Лёзненскага (в. Высачаны, Крынкі, Веляшкавічы).

Кніга складаецца з трох раздзелаў: “Прырода Віцебскага раёна”, “Гісторыя Віцебскага Прыдзвіння”, “Гонар і слава краю”. У дадатку змяшчаюцца статыстычныя звесткі, матэрыялы па тапаніміі, прыродзе, культуры рэгіёна. Прыводзяцца таксама спісы рэкамендаванай літаратуры, хранaлагічная табліца.

У першым раздзеле даецца апісанне прыроды Віцебскага раёна. Другі раздзел адлюстроўвае гісторыю Віцебскага Прыдзвіння ў кантэксце гісторыі Беларусі. Трэці раздзел прысвечаны адметнасцям і асаблівасцям нашага краю, мае больш прыкладны характар і змяшчае матэрыял, які можа быць выкарыстаны ў практычнай дзейнасці: настаўнікамі пры арганізацыі вандровак па родным краі, у працы турысцка-краязнаўчых гурткоў, дзяржаўнымі структурамі і прадпрымальнікамі пры стварэнні аб’ектаў турысцкай інфраструктуры.

У падрыхтоўцы выдання прынялі ўдзел выкладчыкі ВНУ гг. Віцебска і Мінска, настаўнікі школ Віцебскага раёна, краязнаўцы.

Пры напісанні артыкулаў выкарыстоўваліся матэрыялы Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі, Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці і Віцебскага абласнога краязнаўчага музея, матэрыялы археалагічных раскопак, працы дарэвалюцыйных, савецкіх, сучасных беларускіх і замежных навукоўцаў і краязнаўцаў, інфармацыя, якая змяшчаецца ў гісторыка-дакументальнай хроніцы Віцебскага раёна “Памяць”. У выданні выкарыстаны артыкулы А.П.Грыцкевіча, А.М. Кулагіна, А.М. Падліпскага, Р.П. Платонава.

Аўтары шчыра дзякуюць усім, хто аказаў дапамогу ў падрыхтоўцы выдання, у першую чаргу, шаноўным рэцэнзентам: галоўнаму навуковаму супрацоўніку Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі доктару гістарычных навук, прафесару Штыхаву Георгію Васільевічу, дацэнту кафедры ўсеагульнай гісторыі і сусветнай культуры Віцебскага дзяржаўнага універсітэта імя П.М. Машэрава, кандыдату гістарычных навук Якаўлевай Галіне Мікалаеўне. Выказваем асаблівую ўдзячнасць тым, хто ласкава пагадзіўся прачытаць рукапіс і даць крытычны яго аналіз, падрабязны і выключна карысны: Іне Аляксандраўне Абрамавай, Уладзіміру Пятровічу Каханку, Алегу Васільевічу Куржалаву, Аляксандру Генадзьевічу Лісаву, Пятру Мікалаевічу Падгурскаму, Аркадзю Міхайлавічу Падліпскаму. Іх каштоўныя заўвагі і прапановы па меры магчымасці былі ўлічаны.

Зразумела, што праца над усебаковым краязнаўчым апісаннем Віцебскага раёна далёкая да завяршэння. Кніга хутчэй толькі этап у даследаванні багатай прыроды, гісторыі, культуры Віцебскага раёна. Спадзяемся, што выданне будзе садзейнічаць актывізацыі вывучэння нашага краю, стварэнню гісторый вёсак, школ, сямейных радаводаў.

Будзем удзячныя за заўвагі і прапановы.

# ПРЫРОДА ВІЦЕБСКАГА РАЁНУ

РАЗДЗЕЛ 1









# ТЭМА 1 ГЕАЛОГІЯ І КЛІМАТ

## РЭЛЬЕФ І ГЛЕБЫ МЯСЦОВАСЦІ

**Рэльеф.** Сучасны рэльеф Віцебскага раёна фарміраваўся на працягу доўгага часу, пачынаючы з дакембрыйскага перыяду да нашых дзён. Час гэты падлічваецца больш чым мільярдам гадоў. Неаднойчы суша змянялася морам, а мора – сушай, рэзка змяняўся і клімат: тут быў і трапічны, і ўмераны, а перад наступленнем ледавікоў – халодны арктычны.

Кожная геалагічная эра пакінула свае асадкавыя пароды, якія гарызантальнымі слаямі ляжаць на старажытным



Оз каля в. Суднікі

крышталічным фундаменце. Дэвонскія моры пакінулі шэрыя і стракатыя пясчанікі з пражылкамі жоўтых даламітаў, а ў мелкіх залівах адклаліся зялёна-блакітныя пяскі і гліны, якія зрэдку на берагах Заходняй Дзвіны выходзяць на паверхню.

Сучасны рэльеф сфарміраваўся пераважна пад уплывам эразійна-акумуляцыйнай дзейнасці ледавікоў. У канцы трэтычнага перыяду ў гарах Скандынавіі з’явіліся ледавікі, якія сталі паступова прасоўвацца на поўдзень. На сваім шляху яны зразалі грэбні вышынь, стваралі заглыбленні, а адыходзячы, пакінулі марэны – горы пяску, гліны, камянёў. Марэнная града добра праглядаецца на тэрыторыі Віцебскага раёна. На палях знаходзіцца шмат валуноў з гнейсаў, гранітаў, дыябазаў. Найбольш працяглым і магутным было дняпроўскае ледавікоўе, а найбольш вызначальным для сучаснага рэльефу паўночнай Беларусі – апошняе, або паазерскае.

Сучасная паверхня Віцебскага раёна ўяўляе сабой чаргаванне ўзгоркавых узвышшаў з плоскімі раўнінамі і нізінамі, расчлененымі далінамі рэк. Аб ледавіковым паходжанні рэльефу сведчаць буйныя і невялікія марэнныя ўзгоркі, друмліны, камы і озы, якія добра захаваліся да нашых дзён.

Цэнтральную і ўсходнюю часткі раёна займае Віцебскае ўзвышша, на захадзе – частка Полацкай нізіны, на паўночны ўсход – Суражская нізіна. Найвышэйшая кропка раёна – 254 м над узроўнем мора (каля в. Хамутоўка Вымнянскага с/с). Самая нізкая кропка – 120 м (урэз р. Дзвіна каля в. Старое Сяло Лятчанкага с/с).

Суражская нізіна займае тэрыторыю на паўночным усходзе Віцебскага раёна на мяжы са Смаленскай вобласцю (Расійская Федэрацыя), з захаду мяжуе з Гарадоцкім, а на поўдні – з Віцебскім узвышшамі. Працягласць яе з поўначы на поўдзень 60 км, з захаду на ўсход – 25 км. У час адступання паазёрскага ледавіка на месцы сучаснай нізіны існаваў прыледавіковы вадаём, які пазней быў спушчаны Заходняй Дзвіной у Балтыйскае мора. Паверхня нізіны плоскахвалістая, ускладнена ўзгоркамі-дзюнамі, лагчынамі, азёрнымі катлавінамі. Вышыня Суражскай нізіны – 150–160 м над узроўнем мора, ваганні адносных вышынь – 2–3 м. Некаторыя яе месцы забалочаны, перасечаны каньёнападобнымі далінамі маруднацякучых рэк.

Віцебскае ўзвышша на поўначы і паўночным усходзе мяжуе з Гарадоцкім узвышшам і Суражскай нізінай, на поўд-

ні – з Лучоскай нізінай, на захадзе – з Полацкай нізінай. Рэльеф буйнаўзгорысты і сярэднеўзгорысты з адноснымі перавышэннямі ад 10 да 25 м і больш. Паўночны схіл стромка абрываецца ў бок р. Каспля. Пашыраны глыбокія даліны рэк, яры, лагчыны, трапляюцца камы, озы.

Гарадоцкае ўзвышша займае невялікую паўночную частку Віцебскага раёна. На ўсходзе мяжуе з Суражскай нізінай, на поўдні па даліне Заходняй Дзвіны – з Полацкай нізінай. Узвышша прыўзнята над суседнімі нізінамі на 100 м. Паверхня – сістэма канцовамарэнных град.

Полацкая нізіна знаходзіцца на паўночным захадзе Віцебскага раёна і займае паўночную частку. Мяжуе на ўсходзе з Віцебскім і Гарадоцкім узвышшамі. Нізіна ўтварылася на месцы прыледавіковага вадаёма, які існаваў у час адступлення апошняга паазёрскага ледавіка. Нізіна значна забалочана. Лучоская нізіна на поўначы мяжуе з Віцебскім узвышшам. Займае часткова Віцебскі раён. Паверхня нізіны спадзістахвалістая, месцамі плоская. Аднастайнасць рэльефу парушаецца дзюнамі, радзей озамі.

Асабліваe месца ў рэльефе Віцебскага раёна займаюць даліны рэк. Яны маюць розны ўзрост, звычайна 1–2 надплаўныя тэрасы, але канчаткова сфарміраваліся пасля адступання апошняга ледавіка. Напрыклад, Заходняя Дзвіна мае глыбокую каньёнападобную даліну.

На тэрыторыі Віцебскага раёна знаходзіцца 68 азёраў агульнай плошчай 1727 га, даўжыня рэк складае больш за 200 кіламетраў. Рачная сетка належыць да басейна Заходняй Дзвіны, прытокамі якой з'яўляюцца рэчкі Усвяча, Лужаснянка, Храпаўлянка, Каспля, Вымнянка, Віцьба, Лучоса, Сухадроўка. Найбольшыя з азёраў – Лосвіда, Вымна, Янавіцкае, Сосна, Заронава.

Рэльеф Віцебскага раёна адносіцца да геамарфалагічнай вобласці Беларускага Паазер'я.

**Глебы.** На тэрыторыі Віцебскага раёна глебаўтваральнымі пародамі служаць розныя асадкавыя адклады антрапагеннага перыяду. З'яўляюцца распаўсюджанымі ледавіковыя і азёрналедавіковыя суглінкавыя і глiністыя адклады, радзей –



Краявід каля в. Мазалава

пяскі. Распаўсюджанай глебаўтваральнай пародай з’яўляецца таксама торф.

Глебаўтваральнымі чыннікамі выступаюць таксама клімат, раслінны і жывёльны свет, рэльеф мясцовасці, геалагічны ўзрост тэрыторыі, а таксама гаспадарчая дзейнасць чалавека.

Найбольш пашыраны дзярнова-падзолістыя глебы, бедныя перагноем, якія змяшчаюць раствораныя кіслоты. Сустракаюцца трафяна-балотныя, поймавыя і дзярнова-карбанатныя глебы. Дзярнова-карбанатныя глебы фарміруюцца на вапняках і даламітах, утрымліваюць кальцый, які стрымлівае працэс ападзольвання, паляпшае структуру глебы.

У сувязі з тым, што значную частку Віцебскага раёна займае Віцебскае ўзвышша, для якога характэрны ўзгоркавы рэльеф мясцовасці, пашыранай з’явай з’яўляецца водная эрозія глебы. Эразійныя працэсы развіваюцца ў сувязі з расчлянёнасцю рэльефу, адносна вялікай колькасцю ападкаў і іх нераўнамернасцю па сезонах года, лёгкай размывальнасцю глебы.

## КЛІМАТ КРАЮ

Віцебскі раён знаходзіцца паміж 55° і 56° пн.ш., што вызначае вугал падзення сонечных праменняў, працягласць дня і сонечнага ззяння. Раён знаходзіцца ва ўмераным кліматычным поясе з умерана кантынентальным тыпам клімату.

Адносная блізкасць Атлантычнага акіяна, раўніннасць рэльефу і адсутнасць гор на суседніх тэрыторыях садзейнічаюць пранікненню ўсіх тыпаў паветраных мас (арктычных, умераных, трапічных) і фарміруюць пераходны тып клімату ад марскога да кантынентальнага. Усе гэтыя фактары ствараюць няўстойлівы тып надвор’я. Гэта значыць, што надвор’е вельмі зменлівае ва ўсе поры года, асабліва зімою.

Максімальная працягласць дня складае 17 гадзін 35 хвілін (22 чэрвеня), а мінімальная працягласць дня складае 6 гадзін 57 хвілін (22 снежня).

На працягу ўсяго года ў Віцебскім раёне пераважаюць вятры заходніх кірункаў, улетку – заходнія і паўночна-заходнія, узімку – заходнія і паўднёва-заходнія.

Сярэдняя шматгадовая хуткасць ветру ў Віцебскім раёне складае каля 4 м/с. Узімку хуткасць ветру максімальная, што

звязана з працягласцю цыклонаў, а ўлетку – мінімальная, гэта абумоўлена слабейшай дзейнасцю цыклонаў. Моцныя вятры (з хуткасцю 15 м/с) назіраюцца параўнальна рэдка. У сярэднім за год бывае 9 дзён з моцным ветрам. Зрэдку бываюць буры і віхраслупы. Улетку хуткасць ветру мінімальная ўначы (да 1 м/с), а максімальная днём – (2–5 м/с). На вадаёмах пры штылях улетку назіраецца брыз з хуткасцю ветру каля 2 м/с.

Надвор'е ў Віцебскім раёне фарміруецца пад уплывам цыклонаў і антыцыклонаў.

Цыклоны ў сярэднім за год дзейнічаюць 212 дзён, а антыцыклоны – 153 дні. Цыклоны фарміруюць хмурнае, вільготнае, ветранае надвор'е, улетку прыносяць пахаладанне, а ўзімку – адлігу. Антыцыклоны фарміруюць малавоблачнае сухое надвор'е, улетку прыносяць спякоту, узімку – маразы.

У самым халодным месяцы года – студзені – тэмпература паветра звычайна бывае ад – 6,7° да – 8,1°С. Самы цёплы месяц года – ліпень. Тэмпературы ліпеня змяняюцца ад 17,0 да 17,8°С. За ўвесь час назіранняў мінімальная сярэдняя гадавая тэмпература паветра назіралася ў 1956 годзе (3,3°С), максімальная – у 1989 годзе (7,4°С). Наш край можна лічыць самым халодным месцам у краіне. У 1940 г. на чыгуначнай станцыі Лужасна быў зарэгістраваны мінімум тэмператур па Беларусі – 44 °С.

Віцебскі раён мае досыць высокую адносную вільготнасць паветра. Яна спрыяе ўтварэнню смугі. У сярэднім за год у Віцебску бывае 50 дзён са смугой, з іх большая палова прыходзіцца на халодны перыяд (лістапад–сакавік).

За год у Віцебску бывае 164 пахмурных, 28 ясных і 173 дні з пераменнай воблачнасцю. Найбольшая воблачнасць назіраецца ўзімку, дасягаючы максімуму ў лістападзе–снежні, найменшая – з мая па жнівень.

Вялікая частка ападкаў (каля 70%) выпадае ў цёплы час года (з красавіка па кастрычнік). Самы вільготны месяц – ліпень (80–97 мм). Менш усяго ападкаў у лютым–сакавіку (па 29–43 мм у месяц).

Агульны лік дзён з ападкамі для Віцебска і Віцебскага раёна – 183, з іх 14 – з ападкамі 10 мм і больш, 3 дні – 20 мм і больш. Летнія ападкі пераважна інтэнсіўныя і кароткачасовыя. Зімовыя ападкі, наадварот, малаінтэнсіўныя, але працяглыя.

Найбольш вільготным за год можа быць любы месяц з мая па лістапад. Абсалютны максімум ападкаў за месяц у раёне адзначаны ў жніўні 1961 года – 261 мм.

У розныя гады сумы ападкаў за год і па месяцах могуць значна адхіляцца ад сярэдніх шматгадовых значэнняў. У самы сухі год па Віцебскім раёне выпала 492 мм (1959), у самы вільготны – 871 мм (1998). Самым сухім за год можа быць любы месяц, нават ліпень (як гэта было ў 1999 г.).

## КАРЫСНЫЯ ВЫКАПНІ

Геалагічная будова тэрыторыі і гісторыя яе развіцця – асноўны фактар, які абумовіў утварэнне і месцазнаходжанне разнастайных пакладаў карысных выкапняў. У адкладах антрапагена сканцэнтраваны запасы торфу, будаўнічых матэрыялаў, сапрапелю, прэснай вады. Найніжэйшыя дэвонскія ўтварэнні (даламіты) з'яўляюцца крыніцай аграхімічнай сыравіны і будаўнічага каменю. Яшчэ больш глыбей залеглыя тоўшчы (ніжні палеазой, верхні пратэразой) змяшчаюць значныя запасы прэснай і мінералізаванай вады.

У цэлым раён небагаты на запасы карысных выкапняў у параўнанні з іншымі раёнамі Беларусі.

**Аграхімічная сыравіна.** Аграхімічная сыравіна раёна прадстаўлена даламітам і сапрапелем. Агульнарэспубліканскае значэнне маюць радовішчы даламіту: Гралёўскае, Краснадворскае, Цякава-Койтаўскае, Рубаўскае. Залеж даламіту на ўчастку Руба (левы бераг Заходняй Дзвіны) распасціраецца на 1,7 км пры шырыні 0,12–0,85 км. Глыбіня залягання ад 5 да 16 м. Рубаўскае радовішча – самае буйное. Распрацоўка даламітаў на радовішчы Руба пачалася ў 1933 г. адкрытым кар'ерам. На цяперашні час эксплуатацыя радовішча "Гралёва" ажыццяўляецца ААТ "Даламіт". Здабыча даламіту ў 2000 г. склала каля 5 млн. тон. Асноўным відам прадукцыі Віцебскага вытворчага аб'яднання "Даламіт" з'яўляецца даламітавая мука для вапнавання кіслых глебаў. Даламіт нездарма называюць "каменем урадлівасці".



Распрацоўка даламітавага радовішча каля г.п. Руба

Даламіты прыгодныя для вытворчасці паветранай вапны, цэменту маркі “400”, шчэбеню, для жыллёвага будаўніцтва ў выглядзе адзінкавага каменя, мінеральнага парашка, прыгатавання гарачых асфальтабетонных сумесей, дарожнага будаўніцтва, даламітавага вогнеўпора, тэрмаізаляцыйнага матэрыялу, флюсаў у металургічнай прамысловасці.

Участак Цякава-Койтава размешчаны на правым беразе Заходняй Дзвіны, за 6 км на поўнач ад участка Руба. Пластавы паклад даламітаў цягнецца ўздоўж ракі на 3–5 км пры шырыні 0,17–0,35 км.

Участкі Гралёва і Краснадворскі размешчаны на левабярэжнай надабалоннай тэрасе Заходняй Дзвіны. Гэта даламіты шэрага, светла-шэрага, жоўта–шэрага колеру, трэшчынаватыя, з ярка выяўленай слаістасцю. Адклады даламітаў на ўчастку Гралёва прымеркаваныя да франскага яруса верхняга дэвону. Глыбіня пакладання эксплуатуемай пароды ад паверхні – 10–50 метраў. У той час, як найбольшая магутнасць пакладу дасягае 80 і больш метраў, магутнасць прадукцыйнай тоўшчы толькі набліжаецца да 30 м (сярэдняя 22,7 м). Магутнасць карыснага выкапню вышэйшая за межавы ўзровень вады ў рацэ Дзвіна на 1,1–0,3 м, і ніжэйшая больш за 20 м.



Экскурсія ў кар’ер Гралёвана

У залежах даламітаў знаходзяцца шматлікія рэшткі выкапнёвых жывёл дэвонскага часу: іглаcкурых, каралаў, брахіяпод, панцырных рыб. У антрапагенавых пакладах знойдзены шкілеты мамантаў.

**Сапрапель.** У раёне вядомы радовішчы сучаснага і выкапнёвага сапрапелю. Гэта глеевыя адклады прэсных вадаёмаў, якія змяшчаюць звыш 155 арганічных рэчываў. Сапрапель выкарыстоўваецца ў якасці ўгнаення (для малаўрадлівых земляў, лугавых і забалочаных участкаў), вапнавых матэрыялаў, дамешкі ў корм сельскагаспадарчых жывёл. Ён можа таксама выкарыстоўвацца для вытворчасці будаўнічых матэрыялаў, у якасці буравога раствору ў геолагаразведачнай практыцы, а таксама ў лячэбных мэтах. Лячэбны сапрапель, напрыклад, мае лепшыя паказчыкі за многія іншыя лячэбныя гразі. У складзе лячэбнага сапрапелю – вітаміны, ферменты, амінакіслоты, мікра- і макраэлементы і іншыя біялагічна актыўныя рэчывы. Многія радовішчы сапрапелю рэкамендуюцца для выкарыстання ў бальнеалогіі.

У Віцебскім раёне рэсурсы пахаваных пад торфам сапрапеляў большыя за азёрныя. Па запасах сапрапелю Віцебская вобласць займае першае месца ў Рэспубліцы Беларусь, яе запасы складаюць 71,8% ад рэспубліканскіх паказчыкаў (1882,9 млн. $м^3$).

З ліку даследаваных не маюць сапрапелевых адкладаў 12 азёр раёна (Вымна, Скрыдлёва, Янавіцкае і інш.).

**Торф.** Віцебская вобласць з’яўляецца адным з найбольш затарфаваных рэгіёнаў Рэспублікі Беларусь. У нашым раёне торф пераважна выкарыстоўваецца як мясцовае паліва ў выглядзе торфабрыкету, і, у меншай ступені, у якасці ўгнаення для сельскай гаспадаркі. Акрамя гэтага торф ужываецца ў вытворчасці біястымулятараў, кармавых дражджэй, сарбітаў і фарбавальнікаў драўніны, воскаў, лекавых сродкаў, прадуктаў для бытавой хіміі, у паліграфічнай прамысловасці.

У Віцебскім раёне ёсць 178 радовішч торфу з агульнымі запасамі каля 38 млн. т. Пераважаюць радовішчы нізіннага тыпу.

Сярод пакладаў торфу, уключаных у рэзерв урада ў Віцебскім раёне, маецца 6 аб’ектаў (Гладынскі Мох – 2180 га; Мошна – 430 га; Жукоўскае – 220 га; Чысцік – 170 га і інш.).

Зараз у Віцебскім раёне 2,2 тыс. га выпрацаваных плошчаў тарфянікаў. Выпрацаваныя тарфяныя паклады звычайна

падсцілаюцца сапрапелямі, якія служаць дадатковай, а ў некаторых месцах і асноўнай крыніцай арганагеннай сыравіны.

У мэтах паляпшэння экалагічнага становішча частка плошчаў выпрацаваных тарфянікаў ізноў забалочваецца, бо змененыя балотныя экасістэмы не маюць магчымасці самастойна ўзнавіць свае першапачатковыя біясферныя функцыі.

У цяперашні час выкарыстанне торфу ў якасці ўгнаення рэзка зніжаецца. У сувязі са значным павелічэннем кошту на энерганосьбіты асноўная частка здабываемага  торфу можа ўжывацца для выпуску бытавога паліва. Не выключаецца больш інтэнсіўнае выкарыстанне ў малой энергетыцы торфу ў сумесі з вуглём ці вугальным пылам.

**Будаўнічыя матэрыялы.** У раёне ёсць 7 радовішч **гліны** з агульнымі запасамі каля 34 млн. м3. Гліны і суглінак (цагляныя, ганчарныя) шырока выкарыстоўваюцца ў прамысловасці будаўнічых матэрыялаў, што абумоўлена іх шырокім распаўсюджаннем і неглыбокім заляганнем, дапушчальным для здабычы адкрытымі кар’ерамі. Прамысловыя радовішчы гэтага віду сыравіны размешчаны ў Віцебскім раёне. Напрыклад, радовішча Журжава–2 (плошча 225 га.). Залягаюць гліны на глыбіні 0,2–5,0 м. Магутнасць “стужак” гліны 5–20 см.

Гліны цэментныя прыдатныя для цэментнай вытворчасці. У Віцебскім раёне буйнейшае радовішча “Пушча”. Залягаюць яны на глыбіні 0,95–1,1 м. Магутнасць пакладу вагаецца ад 2,1 да 8,2 м. Зараз перспектыўныя запасы радовішча складаюць каля 3 млн. $м^3$.

У раёне ёсць 6 радовішч **пясчана-гравійнага матэрыялу** з запасамі 4,6 млн. $м^3$: Загрузддзе, Прывадзіна, Гаране, Малыя і Вялікія Копці.

Пясчана-гравійная сумесь (ПГС) выкарыстоўваецца як кампанент для вытворчасці бетону. ПГС выконвае розныя адсыпкі, яе выкарыстоўваюць як фільтравальны матэрыял, фармовачныя сумесі. Сярэдняя магутнасць пластоў вагаецца ад 3 да 5 метраў, часам можа дасягаць 20 метраў і больш.

У раёне існуе буйнейшае радовішча **будаўнічага пяску** – Астраўскае, з запасамі ў 4,3 млн. мі. Будаўнічыя пяскі выкарыстоўваюцца для вытворчасці бетону, сілікатных вырабаў для living рознага віду будаўніцтва, будаўнічых раствораў. Яны залягаюць на глыбінях 0,1–7,5 м. Магутнасць можа дасягаць

25 метраў і больш. Прамысловыя запасы ў Віцебскім раёне складаюць 6,8 млн. м$^3$.

У раёне вынайдзена адно радовішча пяскоў- аташчыцеляў, якія палягаюць на глыбінях 0,1–5 м ад паверхні, з моцнасцю слаёў ад 1 да 12 метраў. Распрацоўваецца ўсяго тры такія радовішчы, сярод якіх радовішча "Курына" – 38 тыс. тон.

**Падземныя воды** Прыдзвіння прадстаўлены прэснымі падземны¬мі водамі і мінеральнымі лекавымі водамі. Гэта найважнейшая частка водных рэсурсаў і карысных выкапняў рэгіёну.

**Прэсныя воды** – асноўная крыніца гаспадарча-пітнога і часткова тэхнічнага водазабеспячэння. Адбор падземных вод з дэвонскіх адкладаў толькі з аднаго кар'ера "Гралёва" ў г.п. Руба разам з буйнымі канцэнтраванымі заборамі падземных вод для патрэб г. Віцебска зменшыў наводненасць ракі Віцьба, якая ўлетку амаль не мае сцёку вады ў раку Дзвіна.

Для захавання якасці падземных вод неабходна стварaць санітарныя і водаахоўныя зоны ў раёне водазабораў, абмяжоўваць выкарыстанне атрутных рэчываў і мінеральных угнаенняў, паляпшаць якасць ачысткі прамысловых і бытавых сцёкаў.

**Мінеральныя воды** раёна прадстаўлены хларыднымі, сульфатнымі, хларыдна-сульфатнымі і сульфатна-хларыднымі водамі.

Радовішчы **хларыдных вод,** вынайдзеных у Віцебскім раёне, залягаюць на глыбінях ад 2,58 да 803 метраў. Мінералізацыя вод складае 2,7–105 г/л. Гэтыя воды з'яўляюцца эфектыўнымі пры лячэнні захворванняў страўніка, пячонкі, жоўцевыводных шляхоў, панкрэатыту, хвароб абмену рэчываў. На базе радовішч функцыянуе санаторый "Лётцы".

Цікавы гістарычны факт прыводзіць вядомы віцебскі гісторык І. Абрамава пра тое, што на пачатку XX ст. гаючыя крыніцы былі знойдзены ў маёнтку Руба, які належаў Г.П. Навіцкаму. Паводле праведзеных у віцебскай хімічнай лабараторыі Мойжэса аналізаў, яны мелі вуглекісла-жалезісты склад. Гаспадар маёнтка збіраўся адкрыць курорт пад назвай "Североводск". Гэтая падзея была запланавана на 1916 г., аднак перашкодзіла Першая сусветная вайна.

ТЕМА 2

раздзел I

# РАСЛІННЫ І ЖЫВЁЛЬНЫ СВЕТ



## ФЛОРА

Флора Віцебскага раёна фарміравалася на працягу доўгага часу. Не менш пяці ледавікоў у розны час пакрывалі магутнай тоўшчай ільду гэту тэрыторыю часткова або цалкам. У міжледавіковыя перыяды вызваленую сушу абжывалі расліны-прыхадні з розных кліматычных зон. Кожны перыяд фарміравання флоры характарызаваўся рознымі раслiннымі згуртаваннямі і асобнымі спецыфічнымі відамі характэрных раслін, і кожны раз пасля ледавіка заставаліся сведкі таго часу. У прыледавіковай тундры раслі невысокія дрэўцы і хмызнякі, для якіх у наш час аказаліся прыдатнымі балоты. З пацяпленнем клімату пачалі з'яўляцца хвойныя, змешаныя лясы. Дзякуючы сухому і цёпламу перыяду трапілі да нас расліны з паўднёвых стэпаў. Яны прыжыліся не толькі на адкрытых пясках, але і ў хваёвых лясах.

Сёння флора Віцебскага раёна налічвае 725 відаў вышэйшых сасудзістых раслін. Гэта ў асноўным кветкавыя (пакрытанасенныя) – 693 віды, але ёсць і больш старажытныя – дзеразовыя – 6 відаў, хвашчовыя – 6 відаў, папаратнікавыя – 11 відаў, голанасенныя – 9 відаў, двудольныя – 551 від.

Флора вышэйшых раслін адносіцца да наступных жыццёвых форм: дрэвы, хмызнякі, травяністыя расліны. Травяністыя расліны сустракаюцца пераважна пад дрэвамі і хмызнякамі.

Па ўсім рэгіёне сустракаюцца такія дрэвавыя расліны, як хвоя звычайная, елка звычайная, бяроза павіслая. Хмызнякі – арэшнік, крушына ломкая, вольха шэрая. Хмызнячкі – багун балотны, журавіны балотныя.

Сярод траў ёсць такія віды, якія адыгрываюць вядучую ролю ва ўтварэнні раслінных скапленняў і сустракаюцца суц-

эльнымі зараснікамі. На лугах гэта мятліца, цімафееўка, вострыца, метлюжок, а таксама канюшына, крываўнік, розныя віды рамонкаў. На балотах пераважаюць асака, некаторыя злакі (канарніца, мятліца), а побач з імі – вахта трохлістая, аер, лотаць, чартапалох і многія іншыя расліны.

Раслінны свет Віцебскага раёна багаты і разнастайны. Тут вырастаюць 233 лекавых, 251 харчовых, 63 агародных, 57 фітанцыдных відаў. Гэтыя групы раслін вылучаюцца з дзікарослай флоры. Лекавыя ўласцівасці мае кожны пяты від раслін. У медыцыне выкарыстоўваецца каля 100, астатнія вядомы як сродкі народнага травалячэння. З групы лекавых раслін адзначаны жаўцягонныя, кровапыняльныя, страўнікава-кішэчныя, адхарквальныя, сардэчна-сасудзістыя, слабіцельныя. Важнейшымі лекавымі раслінамі лічацца ландыш, талакнянка, чабор, святаяннік, бяссмертнік (цмян), дуброўка, крапіва, маліна, аер, трыпутнік, сардэлік, валяр'ян, падбел, валошкі. Шырока нарыхтоўваецца сыравіна, якую даюць хвоя і бяроза (пупышкі), дуб і крушына (кара).

Вельмі папулярныя такія харчовыя расліны, як лясныя ягады: чарніцы, буякі (дурніцы), брусніцы, журавіны. Насельніцтва збірае ў вялікай колькасці маліны, суніцы. Прыдатнымі для ежы з'яўляюцца шчаўе, лясны арэх, кмен, нават крапіва. Вялікія запасы таксама меданосаў. Мёд можна атрымліваць з культурных, а таксама з дзікарослых раслін – чабору, ліпы, вярбы, большасці лугавых траў.

Вялікую цікавасць уяўляюць дэкаратыўныя расліны, якія сустракаюцца ў лясах і на лугах. Самыя прыкметныя з іх кураслеп дуброўны, сон, пралеска высакародная, першацвет – "баранчыкі", пярэсна еўрапейская, медуніца. Летам цвітуць розныя віды званочкаў, чараўнік, рамонкі, купена, купальнік. Прыцягваюць увагу велічынёй і прыгажосцю водныя расліны – белыя і жоўтыя гарлачыкі. Усе яны могуць культывавацца, паспяхова канкурыраваць з традыцыйнымі раслінамі садоў, паркаў і газонаў.


Званочкі

Галоўнымі з фітанцыдных раслін з'яўляюцца хвоя (сасна) звычайная, елка звычайная, лістоўніца еўрапейская, ядловец звычайны, чаромха звычайная, багульнік балотны. Значэнне фітан-

цыдных раслін заключаецца ў выдзяленні біялагічна актыўных рэчываў, якія прыгнятаюць развіццё мікробаў.

Раслінны покрыў складаецца ў асноўным з шырока распаўсюджаных відаў, што пераважаюць у лясах, на лугах і балотах, а таксама з тых, якія сустракаюцца толькі ў пэўных месцах, але даволі рэдка. У складзе расліннага покрыва ёсць вельмі рэдкія віды, якія патрабуюць спецыяльных мер аховы.

Ахоўваемыя расліны – рэдкія, дэкаратыўныя і гаспадарча-карысныя дзікарослыя віды, натуральна біялагічныя рэсурсы якіх знаходзяцца пад пагрозай скарачэння ці поўнага знішчэння, як у сілу натуральных прычын, так і пад уплывам антрапагенных фактараў.

На тэрыторыі Віцебскага раёна выяўлены шэраг відаў раслін, якія занесены ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь. Найбольш рэдкімі з'яўляюцца ятрышнік шлёмавідны, ятрышнік мужчынскі, дрэмлік цёмна-чырвоны, фіялка высокая, гарачаўка скрыжавана-лісцевая і іншыя расліны, якія прадстаўлены адзінымі экземплярамі. Часцей сустракаецца шпажнік чарапіцавы, касацік сібірскі, ліннея паўночная, пярэсна еўрапейская, тайнік яйкападобны, прадстаўленыя некалькімі папуляцыямі.

Сярод раслін, якія патрабуюць прафілактычнай аховы, выдзелены высока дэкаратыўныя віды, арэал якіх у



Асіна

зоне вялікіх гарадоў хутка скарачаецца ў выніку збору насельніцтвам: званочка персікалісцевага, мяты двулісцевай, ландыша майскага, пралескі высакароднай, першацвету вясенняга, гваздзікі Борбаша, гарачаўкі лёгачнай, купэны шматколернай, наперсцянкі буйнакветкавай, ластаўня лекавага, васілісніка водазборалісцевага, сітохі блакітнай, прастрэла раскрытага, страусніка звычайнага, суніц зялёных, дрэмліка балотнага, ятрышніка пятністага.

Лясы займаюць 32% тэрыторыі раёна, найбольш буйныя лясныя масівы знаходзяцца на паўночным усходзе раёна. Хваёвыя і бярозавыя лясы займаюць 30%, яловыя – 17%, асінавыя – 8%, шэраальховыя – 7%, чорнаальховыя – 5%, ясеневыя – 2%. Распаўсюджанымі з'яўляюцца змешаныя лясы, у якіх разам з сасной і елкай растуць шыракалістыя і драбналістыя пароды дрэў. Падлесак утвараюць арэшнік (ляшчына), брызгліна, бружмель, крушына, каліна, ядловец, рабіна, маліна, ажыны. Зямлю ў залежнасці ад віду лесу пакрываюць ландышы, кісліца, суніцы, чарніцы, брусніцы, вейнік, папаратнік і іншыя віды, што чаргуюцца з плямамі зялёных імхоў і лішайнікаў.

Даволі багаты жывёльны свет лясоў, звычайнымі насельнікамі якіх з'яўляюцца лось, казуля, заяц, вавёрка. У забалочаных месцах і паблізу вадаёмаў жывуць дзікі. Драпежнымі звярамі з'яўляюцца лясныя куніцы, лісіцы, ваўкі, ласкі. Значна радзей сустракаюцца барсук, буры мядзведзь, рысь, якія з'яўляюцца прадстаўнікамі Чырвонай кнігі Рэспублікі Беларусі.

Пастаяннымі жыхарамі лесу з'яўляюцца каля 10 відаў дзятлаў і соў, шматлікія сініцы, попаўзелі, мухалоўкі, берасцянкі, дразды, зязюлі, пеначкі.

У 1980-я гады на тэрыторыі Віцебскага раёна былі створаны пяць батанічных заказнікаў мясцовага значэння – "Чортава барада", "Тулаўскі", "Віцебскі", "Акцябрскі", "Прыдзвінне", дзе ахоўваюцца папуляцыі раслін, якія ўключаны ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь, а таксама віды, якія патрабуюць прафілактычнай аховы.

На тэрыторыі Віцебскага раёна ёсць батанічныя аб'екты, якія выклікаюць цікавасць і могуць быць зарэгістраваны як помнікі прыроды. Пра іх асобны раздзел.

## ФАУНА

Як і ў іншых рэгіёнах Зямлі, жывёльны свет Віцебскага раёна фарміраваўся ў цеснай сувязі з геалагічнай гісторыяй тэрыторыі, змяняўся пад непасрэдным кліматычным уплывам. Аснову жывёльнага свету складаюць шырока распаўсюджаныя ў Паўночным паўшар'і віды: звычайны вожык, крот, ліс, воўк, звычайная вавёрка, шэрая курапатка, шызы голуб, порсткая яшчарка, жабы і іншыя.

Пазваночныя насяляюць самыя розныя тэрыторыі і групуюцца ў прыродныя комплексы лясоў, адкрытых ландшафтаў (палёў і лугоў), узбярэжжаў і вадаёмаў, балот, паселішчаў.

Фауна пашыраных у раёне лясоў, асабліва лішайнікавых і верасовых, аднастайная. Тут мала корму для жывёл і няма падлеску – хованкі ад ворагаў-драпежнікаў. У такіх лясах нярэдка селіцца ліс, лясная рыжая палёўка, звычайная буразубка, вавёрка. На ўзлесках і ў зрэджаных барах трапляюцца заяц-русак, крот. У хвойніках, якія мяжуюць з балотамі, сустракаюцца казуля, лось, зрэдку дзік. У змешаных хваёвых лясах селіцца заяц-русак, рыжая вячэрніца, паўночны кажанок. У чарнічных барах кормяцца выВадкі глушцоў і цецярукоў, каля вадаёмаў гняздуецца шэрая чапля. Часта трапляюцца ў хваёвых лясах дзятлы, сойка, пішчуха, пеначка, шэрая мухалоўка. Небагатая ў барах фауна паўзуноў і земнаводных.

На парубках, парослых маладымі хвойнікамі, жыве порсткая яшчарка, у сырых, зацененых месцах – вуж, гадзюка (адзіная ядавітая змяя ў Беларусі). Усе паўзуны прыносяць карысць: знішчаюць мышападобных грызуноў, шкодных насякомых, з'яўляюцца пажывай для млекакормячых і птушак, атрута гадзюкі выкарыстоўваецца ў медыцыне.

Жывёльны свет яловых лясоў у параўнанні з хвойнымі значна багацейшы, у ельніку больш корму, лепшыя мікракліматычныя і ахоўныя ўмовы. Тут трапляюцца крот, буразубкі, лясная мыш, ёсць куніца, на ўзвышшах і сухіх месцах – ліс. Зімой у ельніку трымаецца заяц-бяляк, лось, дзік, у пошуку корму заходзіць воўк. Багатае птушынае



Бабровая плаціна на ручаіне каля в. Воўкава

насельніцтва: пашыраны крыжадзюб-яловік, рабчык, чорны дзяцел, у маладых ельніках – сойкі, сініцы, дразды, пеначкі.

Багаты жывёльны свет шыракалістых і змешаных лясоў, дзе спрыяльныя для жывёл умовы – шмат'ярусная расліннасць і вялікая колькасць корму. Тут большасць лятучых мышэй, мышападобных грызуноў. У ліецёвых лясах трапляюцца барсук, воўк, янотападобны сабака, у глухіх кутках – зрэдку рысь. Разнастайныя ў змешаных лясах птушкі: сініцы, авельга, зязюля, шчыгол, салавей. З драпежнікаў ёсць ястраб-цецяроўнік, канюк. Значна больш тут земнаводных і паўзуноў.

Спецыфічны жывёльны свет адкрытых ландшафтаў. Тыповы насельнік палёў – заяц-русак, з птушак – палявы жаваранак, шэрая курапатка. На палях кормяцца вераб'і, галубы, шпакі, гракі.

На ўзбярэжжах вадаёмаў асабліва шмат птушак: чайкі, кулікі, качкі, чаплі, у хмызняках – вераб'іныя. З млекакормячых каля вадаёмаў жывуць бабёр, выдра, вадзяны пацук. У рэках і азёрах пашыраны шчупак, акунь, плотка, лешч, карасі, гусцяра, лінь.

Каля жылля з пазваночных жывёл найбольш птушак: вераб'і, ластаўкі, шпакі, сініцы; у пабудовах селяцца лятучыя мышы, совы, зрэдку чорны тхор, ласка.

Ёсць на тэрыторыі Віцебскага раёна і рэдкія віды дзікіх жывёл, што выміраюць або колькасць якіх скарачаецца. Таму адстрэл, адлоў такіх жывёл, прычыненне ім шкоды непасрэдна ці праз парушэнне месцаў іх пражывання забаронены. Гэта мядзведзь, барсук, рысь, бусел чорны, сажалкавая начніца. Каб даведацца больш падрабязна пра іх, глядзіце ў дадатках "Спіс жывёл, занесеных у Чырвоную кнігу Беларусі".

Жывёльны свет – важная састаўная частка прыроднага асяроддзя. Ведаючы адметнасці асобных відаў жывёл, іх ролю ў прыродзе, чалавек можа захоўваць рэдкія і знікаючыя віды, садзейнічаць павелічэнню іх колькасці або абмяжоўваць размнажэнне шкоднікаў сельскай гаспадаркі, пераносчыкаў і ўзбуджальнікаў хвароб.



Зялёны дзяцел

# ТЭМА 3 АХОЎВАЕМЫЯ ПРЫРОДНЫЯ ТЭРЫТОРЫІ І АБ'ЕКТЫ

## ПОМНІКІ ПРЫРОДЫ І АХОЎВАЕМЫЯ ТЭРЫТОРЫІ ВІЦЕБСКАГА РАЁНА

У Віцебскім раёне 11 помнікаў прыроды і ахоўваемых тэрыторый рэспубліканскага і абласнога значэння.

**Заказнікі** – гэта ўчасткі прыродных ландшафтаў, якія прызначаны для захавання і аднаўлення аднаго ці некалькіх кампанентаў прыроднага комплексу ў спалучэнні з абмежаваным гаспадарча–рэкрэацыйным выкарыстаннем іншых аб'ектаў.

**Помнікі прыроды** – гэта каштоўныя ў навуковых, культурна–пазнаваўчых і аздараўляльных адносінах прыродныя аб'екты (лясы, балоты, азёры, геалагічныя агаленні, валуны, асобныя дрэвы і іх групы, месцы вырастання рэдкіх раслін, паркі і інш.). Вылучаюцца батанічныя, геалагічныя, гідралагічныя (унікальныя крыніцы, азёры, балоты), комплексныя (выключныя па прыгажосці, унікальныя ці тыповыя ландшафты) помнікі прыроды.

**Ахоўваемыя тэрыторыі Віцебскага раёна**

| № п/п | Назва тэрыторыі, якая ахоўваецца | Плошча, га | Год стварэння |
|---|---|---|---|
| | Заказнікі рэспубліканскага значэння | | |
| 1. | Заказнік-журавіннік “Запольскі” | 794,0 | 1979 |
| 2. | Заказнік-журавіннік “Мошна” | 399,0 | 1979 |
| 3. | Заказнік-журавіннік “Чысцік” | 300,0 | 1979 |
| | Заказнікі мясцовага значэння | | |
| | *Батанічныя* | | |
| 1. | “Віцебскі” | 151,0 | 1983 |
| 2. | “Чортава Барада” | 50,0 | 1980 |
| 3. | “Акцябрскі” | 16,5 | 1987 |
| 4. | “Тулаўскі” | 2,0 | 1983 |
| 5. | “Прыдзвінне” | 283,0 | 1985 |
| | *Арніталагічныя* | | |
| 6. | “Дымаўшчына” | 160,0 | 1979 |
| | Помнікі прыроды | | |
| 1. | “Лужаснянскі дэндрапарк” | 8,8 | 1994 |
| 2. | “Суражскія агаленні” | 4,0 | 1995 |

# ЗАКАЗНІКІ-ЖУРАВІННІКІ РЭСПУБЛІКАНСКАГА ЗНАЧЭННЯ

**“Запольскі”.** Створаны ў 1979 г. для захавання ў прыродным стане месцаў росту журавін. Плошча 794 га (1982). Размешчаны на верхавым балоце са значнымі мінеральнымі ўчасткамі. У складзе балотнай расліннасці хваёва-кусцікава-сфагнавыя фітацэнозы з вялікім пашырэннем журавін, хвойнікі асаковыя, асакова-сфагнавыя, багуновыя і інш. На мінеральных участках пераважаюць яловыя, бярозавыя і асінавыя лясы чарнічнага і кіслічнага тыпаў. На тэрыторыі заказніка гняздуюцца занесеныя ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь рэдкія віды птушак: белая курапатка, варакушка, арол-маркут, дзербнік, шэры саракуш, шэры журавель, вялікі ўліт, балотная сава, арол-вужаед, жыве буры мядзведзь, расце ліннея паўночная.

**“Мошна”.** Створаны ў 1979 г. (Скрыдлёўскае лясніцтва) для аховы прыродных запасаў журавін. Плошча 399 га (1984). Размешчаны на балоце Мошна. У складзе балотнай расліннасці хваёва-кусцікава-сфагнавыя фітацэнозы з удзелам журавін, бяроза-асакова-сфагнавыя і бяроза-асакова-хваёвыя фітацэнозы. Лясы прадстаўлены багульнікавымі і асаковымі хвойнікамі, асаковымі беразнякамі. На мінеральных участках пераважаюць кіслічныя і імшыстыя ельнікі, чарнічна-бярозавыя і кіслічна-асінавыя лясы. На тэрыторыі заказніка адзначаны гнездаванні рэдкіх відаў птушак, занесеных у Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь: белая курапатка, салаўіны сверчок, дзербнік, шэры саракапут.

**“Чысцік”.** Створаны ў 1979 г. для захавання ў прыродным стане месцаў росту журавін. Плошча 300 га (1985). Размешчаны на балотным масіве пераходнага тыпу Жукаўскае. У складзе расліннасці хваёва-кусцікава-сфагнавыя фітацэнозы з перавагай журавін.

На тэрыторыі заказніка адзначаны гнездаванні рэдкіх відаў птушак, занесеных у Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь: гогаль, шэры журавель, доўгахвостая кугакаўка, шэры саракапут, сокал-кабец, малы падворлік.

## ЗАКАЗНІКІ МЯСЦОВАГА ЗНАЧЭННЯ

### *Батанічныя*

**“Акцябрскі”.** Быў створаны рашэннем Віцебскага райвыканкома ў 1987 г. на землях саўгаса “Сялюты”, тэрмінам на 15 год. Мае плошчу 16,5 га. З’яўляецца месцам экалагічнага выхавання вучняў Акцябрскай СШ. На тэрыторыі заказніка вырастаюць расліны, занесеныя ў Чырвоную кнігу Беларусі і тыя, што падлягаюць прафілактычнай ахове: шпажнік чарапіцавы, пралеска высокародная, першацвет веснавы, чараўнік двухлісты, званочак персікалісты. Тут жа сустракаюцца і рэдкія ў нашым краі птушкі – вялікі бугай і рэмез.

**“Віцебскі”.** Створаны рашэннем Віцебскага райвыканкома ў 1982 г. без тэрміна дзейнасці. На тэрыторыі заказніка сустракаюцца рэдкія ў нашай краіне жывёлы і расліны. Сярод іх 5 відаў раслін, 1 від грыбоў і 2 віды птушак. Сярод іншых пярэсна еўрапейская, шпажнік чарапіцавы, вясёлка звычайная і іншыя.

**“Прыдзвінне”.** Знаходзіцца ў 15 км на захад ад Віцебска ў пойме р. Шэвінка. Створаны ў 1985 г. для аховы пойменнай дубровы, якая з’яўляецца каштоўным насаджэннем дрэў і рэдкіх раслін, занесеных у Чырвоную кнігу Беларусі. Заказнік складаецца з дзвюх частак. Адна – пойма ракі Шэвінкі ад выпадзення з возера Шэвінскае да ўпадзення ў Дзвіну, дзе вырастаюць дубы, што ўзяты пад ахову. Другая частка – гэта прылягаючы да поймы ракі лес.

З ахоўваемых відаў тут вырастаюць боцікі шарсцістагубыя, асака Дэвела, ятрышнік шлеманосны і мужчынскі, пярэсна еўрапейская, познацвет асенні, тайнік яйкападобны, асака павіслая, шалфей лугавы. Сустракаецца касач сібірскі, фіялка персікалістая, шпажнік чарапіцавы, пальчатакарэннік балтыйскі і мясачырвоны, першацвет высокі, венерын чаравік сапраўдны. На тэрыторыі заказніка рэгулярна гняздуюцца рэдкія віды птушак: пустальга, малы пагоніч, дамавы і махнаногі сыч, зімародак звычайны.

Цікавыя і вартыя аховы ўчасткі расліннасці і аб’екты, якія, на жаль, не ўваходзяць у склад заказніка, сустракаюцца паблізу ад вёсак Шэвіна, Дарагакупава, Лётцы, Малыя

Лётцы, Старое Сяло (напрыклад, валун і вялікі клён каля в. Дарагакупава).

### “Тулаўскі”.

Заказнік быў створаны ў 1983 г. з мэтай захавання раслін, занесеных у Чырвоную кнігу Беларусі. Ахоўваемая тэрыторыя прылягала да вадасховішча “Тулава” ў пойме р. Віцьбы. Аднак з прычыны падняцця ўзроўню вады і будаўнічых работ на тэрыторыі заказніка змяніліся экалагічныя ўмовы існавання рэдкіх раслін, што прывяло да іх знікнення.



Батанічны заказнік “Тулаўскі”

### “Чортава барада”.

Створаны ў 1980 г. Знаходзіцца ў 2 км на захад ад Віцебска на беразе р. Дзвіна. Створаны для аховы каштоўных насаджэнняў і рэдкіх раслін. Першапачаткова пад заказнік было адведзена 50 га. З часам (у 2002 г.) да яго былі далучаны блізкія палі і плошча стала налічваць 78,5 га.



Батанічны заказнік “Чортава барада”

Незвычайную назву заказніку даў вялікі мыс, які меў крутыя, амаль адвесныя схілы і высока ўзвышаўся над наваколлем. На ўцёсе расла дуброва, сярод якой вылучаўся стары дуб-волат. Адпаведна паданню, пад ім дзялілі сваю здабычу разбойнікі. Гэта ўскосна сведчыць пра тое, што тут было капішча, дуб шанаваўся і лічыўся свяшчэнным. Паблізу ад мысу знаходзіўся парог “Цаглінка”. І пра ўцёс “Чортава Барада” і парог пісаў у сваёй кнізе “Река Западная Двина” А.П. Сапуноў.

Рэльеф тэрыторыі заказніка ўзгорысты. Тут растуць векавыя дрэвы дубу звычайнага, хвоя, елка, ясень, ліпа і інш. Вырастаюць рэдкія расліны: пералеска (пячоначніца) высакародная, першацвет веснавы, званочак персікалісты. Тэрыторыя заказніка перспектыўная для стварэння ландшафтнага парку.

*Арніталагічныя*


Арніталагічны заказнік “Дымаўшчына”

## “Дымаўшчына”.

Створаны ў 1979 г. на 15 гадоў для аховы унікальных згуртаванняў птушак на зарослых тарфяных кар’ерах на месцы верхавога балота ў 3 км на захад ад Віцебска. Плошча, пасля ўзбуйнення ў 1982 г., дасягае 160 га. На тэрыторыі заказніка гняздуецца 68 відаў птушак, што складае 30,1% гняздуючыхся відаў фауны Беларусі. У іх ліку прамысловыя (вадаплаўныя, кулікі), ахоўныя і рэдкія, агульнай колькасцю каля 1,5 тыс. пар.

З рэдкіх птушак, унесеных у Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь, на тэрыторыі заказніка гняздуюцца малы бугай, пустальга звычайная, дзербнік, вялікі бугай, балотная сава, варакушка, салаўіны свярчок, рэмез звычайны. Тут жа вырастаюць 8 відаў раслін, рэкамендаваных да аховы Чырвонай кнігай нашай краіны. У заказніку вядуцца навуковыя назіранні.

Заказнік створаны на месцы тарфянога балота, якое было выпрацавана кар’ерным спосабам у 1930–1940-я гг. і цяпер аднаўляецца.

Заказнік з’яўляецца натуральным сховішчам для шэрагу жывёл, якія не падлягаюць ахове, аднак пражываючы навокал звязаны ў экасістэму. З той прычыны, што заказнік знаходзіцца блізка ад горада, тут можна праводзіць экалагічныя экскурсіі, навучанне школьнікаў і студэнтаў, стварацць экалагічны маршрут і трапу.

## ПОМНІКІ ПРЫРОДЫ

**Лужаснянскі дэндрапарк.** Дэндрапарк (ад грэчаскага дэндра – дрэва, познелацінскага паркус – агароджанае месца) – сад з пасаджанымі дрэвамі для прагулак і адпачынку.

Закладзены ў 1974 годзе студэнтамі і выкладчыкамі Лужаснянскага сельскагаспадарчага тэхнікума (цяпер аграрны каледж) у гонар трыццаціgоддзя вызвалення БССР ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Нягледзячы на невялікі



Куток Лужаснянскага дэндрапарка

ўзрост, калекцыя парка можа скласці канкурэнцыю любому падобнаму значна старэйшаму аб'екту ў нашай краіне.

Парк быў закладзены з мэтай стварэння на беразе Дзвіны зоны адпачынку для мясцовага насельніцтва. Ствараўся ён і з мэтай практычнага азнаямлення студэнтаў тэхнікума з узорамі мясцовай і іншаземнай флоры.

Парк размяшчаецца на правым беразе Дзвіны, у месцы ўпадзення ў яе ракі Лужаснянкі. Месца само па сабе вельмі маляўнічае, у старажытнасці тут было паселішча і зараз у вадзе знаходзяць рэчы, якія дайшлі да нас з сівой мінуўшчыны: каменныя сашнікі, фрагменты керамікі, косткі і іншыя. Плошча парка 8,8 гектара.

Кампазіцыйную аснову дэндрапарка складаюць 3 алеі (кляновая, ліставая, ліпавая), якія разыходзяцца промнямі ад цэнтра парка. Тут насыпана горка і аформлены ракарый (месца, дзе высаджаны расліны, тыповыя для высакагор'яў). У планіроўцы спалучаюцца рэгулярны і ландшафтны стыль. Тэрыторыя размежавана на 9 секцый сцяжынкамі і алеямі (кляновай, ліпавай, ліставой, бярозавай і ясеневай).



Куток Лужаснянскага дэндрапарка



Куток Лужаснянскага дэндрапарка

У прамежках між алеямі дрэвы пасаджаны ў выглядзе невялікіх гайкоў (бярозавы, тапалёвы, арэхавы, рабінавы, глогавы і інш).

Дрэвы размяшчаюцца на некаторым аддаленні ад дарожак, а хмызнякі, як правіла, паміж групамі дрэў альбо каля сцежак, што зручна для агляду. Сапраўдным упрыгожваннем дэндрапарка з'яўляюцца ліянавыя расліны (розныя віды вінаграду, пяргола, дрэвагубец, капрыфоль, лунасямяннік даўрскі). Для іх у парку ўсталяваны металічныя апоры.

30 лістапада 1994 г. парк быў аб'яўлены помнікам прыроды мясцовага значэння.

Парк знаходзіцца на высокім беразе Дзвіны, што выглядае вельмі прываблівa. З высокага берагу адкрываецца прыгожы выгляд далёка ўздоўж па рацэ. У перспектыве тут вырашана стварыць адмысловыя пляцоўкі для назірання і лесвіцы для таго, каб спускацца да ракі.

Заснавальнікам дэндрапарка стаў выкладчык тэхнікума М.Т. Ражкоў. Звязваючыся з батанічнымі садамі БССР, найбуйнейшымі і вядомымі садамі СССР (Ленінградскім, Маскоўскім, Нікіцкім (Крым), нават з Далёкага Усходу) ён змог стварыць гэтую калекцыю. Жывая калекцыя драўнінна-хмызняковых раслін – галоўны гонар дэндрапарка. На пачатак 1997 года тут налічвалася больш за 250 відаў, разнавіднасцей драўнінна-хмызняковых і 32 віды кветкавых шматгадовых раслін. Тут вырастаюць дрэвы, якія з'яўляюцца




Схема Лужаснянскага дэндрапарка

звычайнымі для нашых месцаў: бяроза барадаўчатая, ліпа мелкалістая, клён востралісты, вольха шэрая, вяз звычайны, розныя віды чубушніку (язміну) і іншыя.

У парку расце шмат цікавых хваёвых раслін: кедровыя хвоі, цісы, тсугі, дугласіі, елкі, розныя разнавіднасці ядлоўцу, туі. З ліставых парод тут растуць розныя віды арэхаў, арабін, граб, скумпія, ліпы, барбарысы, бразгліны і інш.

Ёсць і незвычайныя, "заморскія" дрэвы – дзёрэн, свядрэна, корнус, яліна канадская, арэх валошскі, манчжурскі, чорны, шэры, Зібальта. Расце бук, якога ў наш час на тэрыторыі Беларусі няма, хаця ў сярэднявеччы ён быў распаўсюджаны ў нашым краі. Ёсць і віды, занесеныя ў Чырвоныя кнігі Беларусі, былога СССР: піхта белая, бархат амурскі (коркавае дрэва). Ёсць пасадка шаўкавіцы белай, якая лічыцца самай паўночнай у рэспубліцы (да гэтага часу такой лічылася плантацыя Віцебскага батанічнага сада).

Пры парку створаны калекцыйны пітомнік для папаўнення, рамонту пасадак і азелянення тэрыторыі. Дарэчы, кедры, плакучыя ясені, бэз персідскі і іншыя незвычайныя віды дрэў і кустоў растуць не толькі ў дэндрарыі, але і па ўсёй тэрыторыі пасёлка.

Асабліва прыгожым дэндрапарк бывае ўвесну, у перыяд цвіцення, і ўвосень, у пару бабінага лета.

Акрамя дэндрапарка, у Лужасне ёсць іншыя помнікі прыроды – дуб, які зросся з ясенем, вялізныя валуны, прынесеныя сюды ледавіком.

## Геалагічны помнік прыроды "Суражскія агаленні".

Уключае ў сябе 8 аб'ектаў агульнай плошчай 4 гектары: Чорны Бераг, Барысава Гара, Дзяснінава, Рагатка, Шапурова, Слабада на Каспл, Слабада Дзвінская, Дрычалукі.

Знаходзіцца ў 36 км на паўночны ўсход ад г. Віцебска, у наваколлях г.п. Суража на беразе р. Дзвіна, у вусці рэк Каспля і Усвяча. Уяўляе сабой фрагменты натуральных геалагічных агаленняў, якія маюць навуковую, культурную і асветніцкую каштоўнасць. Вывучэнне агаленняў дазваляе атрымаць звесткі пра клімат, флору і фауну мінулых геалагічных перыядаў. Тут сустракаюцца рэшткі дробных млекакормячых, наземнай фауны, малюскаў, астраподаў і інш. Агаленні з'яўляюцца апорнымі стратыграфічнымі зрэзамі пры вызначэнні ўзросту трацічных адкладаў валдайскага (паазёрскага) абледзянення.

# АБ'ЕКТЫ, ЯКІЯ МОГУЦЬ БЫЦЬ ЗАРЭГІСТРАВАНЫЯ ЯК ПОМНІКІ ПРЫРОДЫ

Існуе таксама вялікая колькасць аб'ектаў, якія па сваім значэнні могуць быць зарэгістраваны як помнікі прыроды, але па розных прычынах не маюць такога статуса.

## *Перспектыўныя і势 плануемыя ахоўваемыя тэрыторыі і помнікі прыроды*

**Суражскі біялагічны заказнік.** У 1995–1997 гг. на тэрыторыі Віцебскага і Гарадоцкага раёнаў планавалася стварэнне нацыянальнага парка “Суражскі” плошчай у 92 тыс. гектар. Былі праведзены пэўныя папярэднія работы: падрыхтаваны картаграфічны матэрыял, нанесены праектныя межы ахоўваемых тэрыторый і інш. Аднак па шэрагу прычын было прынятае рашэнне, што арганізацыя нацыянальнага парка не мэтазгодна. У перспектыве тут плануецца ўтварэнне біялагічнага заказніка ці некалькіх мінізаказнікаў.

**Месца знаходжання вадзянога імха Цынклідотуса Дунайскага** (Cinclidotus danubicus). Гэтая рэдкая расліна вырастае каля г.п. Руба на даламітавых парогах на рацэ Дзвіна. Цынклідотус належыць да нешматлікіх у Беларусі вадзяных імхоў і можа расці толькі на абмежаванай глыбіні (да 2 метраў) і на даламітавых парогах. Сустракаецца ён таксама і на даламітавых парогах у ніжнім цячэнні Дзвіны (Даўгавы) у Латвіі (Рыжскім раёне). Вучоныя лічаць, што менавіта з Беларусі, г.зн. з Рубы, гэты від змог распаўсюдзіцца ўніз па цячэнні, на тэрыторыю Латвіі. За межамі



Выгляд на парог, дзе вырастае Цынклідотус Дунайскі



рэспубліке мох расце толькі ў Сярэдняй Еўропе (Францыі, Бельгіі, Германіі і інш.).

Найбольшую небяспеку для захавання гэтага вадзянога імха прадстаўляе павышэнне ўзроўню вады над даламітавымі глыбамі больш на 2 метры, а таксама забруджванне рэк.

**Верхавое балота “Глоданскі мох”.** На 2001–2005 гг. на базе ўрочышча “Глоданскі мох” (Суражскае лясніцтва Суражскага лясгасу) было запланавана стварэнне гідралагічнага заказніка як тыповага верхавога балота. На плошчы аб’екта сустракаюцца птушкі, занесеныя ў Чырвоную кнігу Беларусі: пустальга, дзербнік, арол-вужаед, вялікі кроншнеп, залацісты сявец, шэры журавель, балотная сава. Сярод рэдкіх раслін можна адзначыць вадзяніку чорную, чараўніка двухлістага, пальчатакарэннік балтыйскі. Верагодная плошча 1900 га.

**Былы батанічны сад у Вялікіх Лётцах.**

У Вялікіх Лётцах знаходзіўся маёнтак вядомага геабатаніка, фларыста, дэндролага У. Адамава. Тут у 1890 г. ён заснаваў батанічны і даследча-акліматызацыйны сад. Пры ім былі пабудаваны цяпліца, парнікі, пітомнік, у якіх вырошчвалі лекавыя расліны і праводзілі іх вывучэнне.


У кутку былога батанічнага сада ў Вялікіх Лётцах

Для збору калекцыі У. Адамаў звязваўся з вядучымі батанічнымі садамі Расійскай імперыі і Заходняй Еўропы: батанічным інстытутам Пецярбургскага універсітэта, батанічным садам Расійскай акадэміі навук, Нікіцкім батанічным садам, садовымі ўстановамі Берліна, Варшавы, Жэневы, Парыжа і інш. У асноўным у садзе былі сабраны расліны з розных месцаў паўночнага паўшар’я і акліматызаваныя прадстаўнікі азіяцкай, заходнееўрапейскай і іншых флор, якія добра пераносілі клімат паўночнай Беларусі. Асаблівую цікавасць у садзе выклікалі калекцыі дрэвавых і травяністых раслін-альбіносаў і раслін сямейства араліевых (аралія маньчжурская, акантапанакс сядзячакветны). Сам У. Адамаў вельмі ганарыўся калекцыяй розных сартоў бэзу, які цвіў у садзе на працягу некалькіх месяцаў.

У 1924 г. у садзе вырастала каля 400 відаў дрэваў і кустарнікаў, больш за 2 тысячы тэхнічных, лекавых, ягадных раслін. У цяпліцах выраcталі каля 300 відаў экзатычных раслін. Мелася добрая бібліятэка, батанічны музей, сабраны гербарый.

Пасля ад'езду У. Адамава спачатку ў Мінск, а потым у Крым сад заняпаў. Значная частка калекцыі, ад 200 да 300 відаў раслін, у сярэдзіне 1920-х гг. была перанесена ў Віцебск, у мясцовы батанічны сад. На цяперашні час у Лётцах захавалася 46 дрэўных таксонаў вышэйшых сасудзістых раслін, сярод якіх бэз венгерскі, ліпа шырокалістая, маліна водарная, бузіна чорная і інш.

Памёр У. Адамаў у 1939 г. у Федосіі, дзе і пахаваны. У Лётцах захаваўся дом, на якім да 125-годдзя У. Адамава была ўсталявана мемарыяльная шыльда ў гонар выдатнага батаніка.

## ІНШЫЯ АБ'ЕКТЫ:

### Групы дрэў і каштоўныя насаджэнні.

1. Каштоўнае насаджэнне хваёвых дрэў на беразе Дзвіны каля в. Калінава Мазалаўскага с/с.

2. Дубы каля в. Сасноўка Ноўкінскага с/с. 5 дрэў з дыяметрам 0,60 – 0,85 м растуць у весцы і на полі, непадалёк ад населенага пункта.

3. Хвойнік каля в. Цяцёркі Мазалаўскага с/с. Каштоўнае насаджэнне хвоі звычайнай. Дыяметр дрэў ад 0,7 да 1 метра. Дрэвы растуць на беразе Дзвіны, на мясцовых могілках.

### Асобныя дрэвы і групы дрэў.

<u>Самая вялікая хвоя ў Беларусі</u>. Самая вялікая хвоя (Pinus silvestris) у нашай краіне знаходзіцца каля вёскі Сушчова Віцебскага раёна. Памеры дрэва наступныя: дыяметр – 140 см., вышыня – 28 метраў, верагодны ўзрост – 200–250 гадоў. На Беларусі шмат батанічных помнікаў прыроды, аднак ахоўваемых хвой толькі пяць. Сушчоўская ў параўнанні з імі значна большая. Акрамя таго, што



Дуб-волат у в. Сасноўка

гэта гіганцкае дрэва, яно каштоўна яшчэ і тым, што з'яўляецца вялікаўзроставым дрэвам. Яно прыгожа выглядае як дэкаратыўны элемент ландшафта. Дрэва з'яўляецца прыстанкам для рэдкіх, каштоўных птушак (напрыклад, арла-маркута), пералётных чарод лясных вераб'іных птушак. Хвоя – высокабанітэтны экзэмпляр свайго віду, каштоўнае дрэва-матачнік, г.зн. якое можа выкарыстоўвацца для паляпшэння якасцей мясцовай папуляцыі хвоі.



Сасна каля в. Сушчова

Каля хвоі-гіганта расце яшчэ адна, меншая па памерах. Вышыня яе прыкладна такая ж – 27–28 метраў, але дыяметр ствала меншы – 0,7 метра. Узрост – больш за 130 гадоў. Уверсе кроны хвояў спляліся, і надаць статус помніка прыроды пажадана адразу абодвум дрэвам.

Такая ж па памерах хвоя вырастае каля в. Бібіраўка. Яе дыяметр 150 см. Вышыня 28 метраў. Узрост прыкладна 200–250 гадоў.

Растуць на тэрыторыі нашага раёна і вялікія дубы. Напрыклад, дуб-волат з радыусам 0,85 м расце ў в. Сасноўка Ноўкінскага с/с. Вялікія дубы ўзростам па 150–200 гадоў растуць каля в. Сакольнікі Мазалаўскага с/с.

Незвычайная з'ява прыроды – дуб, які зросся з ясенем, ёсць у п. Лужасна. Растуць яны каля стадыёна тэхнікума і дарогі, што вядзе да гімназіі. Мясцовая назва “Браты”.

Хвоя, якая зраслася з бярозай, знаходзіцца каля в. Калінава Мазалаўскага с/с. Растуць гэтыя дрэвы на тэрыторыі аздараўленчага лагера “Бярозка” (фабрыкі “Чырвоны Кастрычнік”). Узрост – прыкладна 30 год.

Вось яшчэ некалькі незвычайных дрэваў, якія вырастаюць у нашым раёне. Вяз у п. Лужасна Мазалаўскага с/с. Знаходзіцца на самым беразе ракі Лужаснянка, непадалёк ад вады, каля клінічнага корпуса Лужаснянскага сельска-

гаспадарчага тэхнікума. Даўжыня акружнасці – 330 см, дыяметр – 105 см.

Клён востралісты ў в. Дарагакупава (Прыдзвінне) Лятчанскага с/с. У цэнтры вёскі. Даўжыня акружнасці – 290 см, дыяметр – 92 см. З аднаго боку ствол пашкоджаны высячанай выявай далоні чалавека памерам 0,7 м на 2 м.

**Геалагічныя помнікі.** На тэрыторыі раёна вельмі шмат валуноў. Любы валун з памерамі большымі за 3 метры, або згуртаванні валуноў з'яўляюцца унікальнымі і лічацца помнікам прыроды рэспубліканскага значэння. Ахове падлягаюць і камяні, нягледзячы на іх памеры, калі пра іх існуюць паданні. Ёсць такі і на тэрыторыі нашага раёна.



"Камень кахання" каля в. Доўжа

Валун каля в. Доўжа Мазалаўскага с/с. Мясцовая назва "Камень Кахання". Знаходзіцца на адлегласці 400 метраў на паўднёвы ўсход ад ускраіны вёскі, непадалёк ад падстанцыі і лініі электраперадач, на правым беразе ракі Храпаўлянкі ў 10 метрах ад урэза вады на адрэзку паміж азёрамі Сярэднім і Малым. Гэтае месца тутэйшыя людзі яшчэ называюць Баравінкай. Даўжыня 250 см; шырыня 160 см, вышыня 320 см. Камень патрабуе аховы і па сваіх памерах і па той прычыне, што пра яго існуюць паданні. (На Беларусі ёсць шматлікія легенды пра валуны-"краўцы", што шыюць адзенне, валуны-"гаюны", што загойваюць раны, валуны – месцы жыхарства пачвар і ўваходу на той свет і іншыя, але камянёў закаханых

няма). Чаму камень так называецца, можна прачытаць у паданні, якое змешчана ў раздзеле “Легенды нашага краю”. Легенды ўскосна сведчаць пра выкарыстанне камня ў якасці месца ахвярапрынашэнняў.

Патрабуюць аховы і адпрацаваныя кар’еры ў г.п. Руба, дзе на паверхню выходзяць розныя ярусы даламіту, якія ўтрымліваюць рэшткі істот, што з’яўляюцца эталоннымі для вызначэння флоры і фауны дэвонскага перыяда ў гісторыі Зямлі. На цяперашні час кар’еры заліты вадой, навукоўцы знаходзяць тут расліны, занесеныя ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь. Гэта вельмі маляўнічае месца. У Рубе стварыўся ўнікальны для Беларусі ландшафт, які спалучае скальныя пароды, лісцвяны, хваёвы раслінны покрыў і вялікае люстра вады, што не ўласціва для нашай краіны і з’яўляецца ландшафтнай адметнасцю не толькі Віцебскага раёна, але і Беларусі ўвогуле. Спецыялісты Віцебскага дзяржаўнага універсітэта лічаць мэтазгодным стварэнне тут міні-заказніка для аховы ўтворанай экасістэмы.



Куток Адпрацаванага кар’ера ў г.п. Руба

Адпрацаваныя кар’еры з’яўляюцца таксама і помнікам прамысловай дзейнасці чалавека. На яго берагах захоўваюцца рэшткі агрэгатаў і механізмаў, якія выкарыстоўваліся пры здабычы даламіту.

Цікавым месцам, якое таксама патрабуе аховы, з’яўляецца Вярхоўскі парог на Дзвіне (больш падрабязна ў параграфе, які прысвечаны рацэ). Парог з’яўляецца адным з самых вялікіх на Дзвіне, мае вельмі жывапісны выгляд. Тут па паверхню выходзяць верхнедэвонскія пароды, што ўтварыліся 300 млн. гадоў таму. Парог варты аховы як помнік прамысловай дзейнасці, бо яшчэ з часоў старажытнасці тут здабывалі даламіт, які перапальвалі на вапну, а ў ХХ ст. каля яго быў пабудаваны вапнавы завод. Прыгадаем, таксама, што тут адзінае месца, дзе ў нашай краіне расце вадзяны мох Цынклідотус Дунайскі.

## Месцы знаходжання рэдкіх і занесеных у Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь раслін.

У выяўленні месцаў вырастання рэдкіх раслін значную дапамогу даследчыкам флоры і фауны могуць аказаць школьнікі, гурткоўцы, якія могуць вызначыць такія месцы самастойна. Сярод іншых можна адзначыць месца вырастання рагулькаў высокіх (Delphinium elatum) каля в. Дутчына Мазалаўскага с/с. У 800 – 1500 м на ўсход і паўночны ўсход ад вёскі, на берагах ракі Лужаснянка. Выяўлена некалькі мікрапапуляцый з колькасцю раслін да 50 экземпляраў. Непадалёк ад в. Дутчына і в. Сакольнікі Мазалаўскага с/с расце шпажнік чарапіцавы (Gladiolus imbricatus). Месцы росту пярэсны еўрапейскай (Trollius europaeus) выяўлены ў меліярацыйных каналах на поўдзень і паўднёвы ўсход ад в. Каралёва Мазалаўскага с/с.



Бераг р. Лужаснянка, дзе вырастаюць рагулькі высокія

У наваколлях Віцебска захавалася шмат нявыяўленых месцаў вырастання раслін і пражывання жывёл, занесеных у Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь. Многія вядомыя раслінныя аб'екты: векавыя дрэвы, рэдкія, цікавыя дрэвы, каштоўныя насаджэнні праз нейкі час могуць атрымаць статус помнікаў прыроды. Мае сэнс стварыць "Малую Чырвоную кнігу раёна", куды будуць заносіцца звесткі пра перспектыўныя прыродаахоўныя помнікі з мэтай іх рэгістрацыі, кантролю за станам, маніторынгу, выхавання пазітыўна-экалагічнанага светапогляду, папулярызацыі ведаў пра свой край.

# НАША ДЗВІНА

## НАША ДЗВІНА

Агульныя звесткі пра Дзвіну. Дзвіна (Заходняя Дзвіна – руск., Даўгава – лат., Двіна – ням.) – адна з самых вялікіх рэк нашай краіны. Працякае таксама праз Расію і Латвію. У Латвіі яе называюць Даўгава (daug – многа, ava – вада). Старажытныя грэкі называлі раку Эрыданам, Рубонам, Танаісам. У іншых народаў рака насіла іншыя назвы: Хезін ці Херзін, Турунт, Дзіна, Дзюна, Віна, Вейна, Вена.

Даўжыня 1020 км. Плошча вадазбору 87,9 тыс. км$^2$ , у межах рэспублікі адпаведна 328 км і 33,2 тыс. км$^2$. Сярэднегадавы расход вады ў вусці 666 м$^3$/с. Агульнае падзенне ракі на Беларусі каля 40 м. Сярэдні нахіл воднай паверхні 0,12% .

У басейне Дзвіны працякае 12 тысяч рэк living рознай даўжыні і воднасці. Іх агульная даўжыня складае каля 42 тыс. км. На 1 км$^2$ плошчы басейна ў сярэднім прыходзіцца 0,5 км рачных патокаў.

Пачынаецца Дзвіна з воз. Каракіна, якое знаходзіцца ў Цвярской вобласці Расійскай Федэрацыі. Гэта ціхае,




Карта басейна р. Дзвіна

неглыбокае возера з плошчай усяго 0,64 км$^2$, з пясчанымі берагамі. Тут, на Валдайскім узвышшы, непадалёк адзін ад аднаго, бяруць свой пачатак вялікія рэкі Волга, Днепр, Нява і Дзвіна.

Свой пачатак рака бярэ на вышыні 221 м над узроўнем мора, упадае ў Рыжскі заліў Балтыйскага мора. Выток і вусце знаходзяцца прыкладна на адной шыраце. Калі правесці прамую лінію паміж вытокам Дзвіны і месцам яе ўпадзення ў Балтыйскае мора, то яна складзе 465 км. Аднак, як і ўсе рэкі, Дзвіна не выбірае самы кароткі шлях. У сваім цячэнні рака спачатку адхіляецца на поўдзень, а потым вяртаецца на поўнач. Прайшоўшы 326 км ад вытока, Дзвіна перасякае мяжу Расіі і Беларусі. Самая паўднёвая кропка ракі знаходзіцца каля г.п. Бешанковічы, у 544 км ад вусця. У межах Беларусі рака працякае 342 км.

Рэльеф басейна Дзвіны сфарміраваўся ў выніку дзейнасці старажытных ледавікоў. Тэрыторыя раёна 5 разоў падвяргалася абледзяненням. Сучасны рэльеф – вынік дзейнасці паазёрскага абледзянення. Апошні ледавік пакінуў басейн прыкладна 10 тыс. гадоў таму назад. У перыяд яго актыўнага таяння і быў сфарміраваны басейн Дзвіны. У перыяд адступання ледавіка паміж канечна-марэннымі градамі ўтвараліся шматлікія прыледавіковыя азёры, куды трапляла талая вада. Пры перапаўненні азёр воды прарывалі марэнныя грады, утвараючы ў гэтых участках скразныя даліны. На тэрыторыі нашага раёна такі прарыў якраз і меў месца. Вышэй цяперашняга Віцебску існавала прыледавіковае возера. Пры яго



Дзвіна каля в. Курына

спуску ўтварылася Суражская нізіна.

**Даліна** трапецыяпадобнай формы, каля г.п. Руба – каньёнападобная. Шырыня яе ў асноўным 3–4 км, паблізу ўпадзення Улы і на крайняй усходняй частцы Беларусі дасягае 10–15 км. Глыбіня ўрэза мяняецца ад 20–30 м да 40–50 м. У будове даліны часцей за ўсё вылучаецца пойма і 2 (некаторыя даследчыкі адзначаюць 3–4) надабалонныя тэрасы. У межах тэрыторыі Беларусі Дзвіна ўяўляе сабой паўнаводную раку з руслам шырынёй 120–300 метраў, з берагамі вышынёй 10–40 метраў.

Дзвіна даволі актыўна ўздзейнічае на клімат нашага раёна. Ён фарміруецца пад уплывам Атлантычнага акіяна. Паветраныя патокі з боку Атлантыкі нясуць вільготнае, параўнальна цёплае паветра.

**Асноўныя прытокі** ў Беларусі: Усвяча, Обаль, Палата, Дрыса (справа), Каспля, Лучоса, Ула, Ушача, Дзісна і Друйка (злева). Рака цячэ па Беларусі пераважна з усходу на захад па Суражскай нізіне, паміж Гарадоцкім і Віцебскім узвышшамі, і на большым сваім працягу – па Полацкай нізіне.

**Жыўленне ракі** мяшанае. Пераважна вада трапляе ў раку ад таяння снегу, аднак жывяць Дзвіну і падземныя воды ў выглядзе крыніц. Большая частка гадавога сцёку (больш 50%) утвараецца за кошт таяння снегу. Дажджавыя паводкі забяспечваюць 20% сцёку, грунтовыя воды – 30%.

Увесну Дзвіна шырока разліваецца, а летам-восенню



р. Лучоса ў месцы ўпадзення ў Дзвіну

вады мала. Праўда, пасля вялікіх дажджоў адбываюцца паводкі, аднак, як хутка вада прыходзіць, так хутка і сыходзіць. Зімой узровень звычайна ўстойлівы. Кажучы навуковай мовай, на перыяд веснавога разводдзя прыпадае 56% працякаемай за год у рацэ вады, на летне–асеннюю межань – 33%, на зімовую – 11%. Веснавое разводдзе доўжыцца 60–70 дзён (з канца сакавіка да 1-й дэкады чэрвеня).

**Паводкі.** Звычайна палаводдзе на Дзвіне пачынаецца ў канцы сакавіка, а спыняецца ў пачатку чэрвеня. Пры наступленні ранняй вясны палаводдзе можа пачынацца і ў канцы лютага, а калі вясна затрымліваецца – у пачатку мая. Аб'ём сцёку, хуткасць нарастання і спаду вады за палаводдзе залежаць ад шэрага ўмоў: колькасці выпаўшага за зіму снегу, на якую глебу ён выпадаў (вільготнасную, сухую ці замерзлую); надвор'я ў пачатку вясны (наяўнасці ападкаў, хуткасці павышэння цёплай тэмпературы); як будзе мяняцца надвор'е ў наступныя веснавыя месяцы і інш. Уплывае на характар палаводдзя і форма басейна Дзвіны. Ён выцягнуты з усходу на захад, размешчаны ў бок пераважнага кірунку паветраных мас. У выніку веснавое поўнаводдзе пачынаецца хутка, амаль адначасова па ўсім басейне.

У сярэднім розніца паміж ніжэйшым летнім узроўнем і вяршыняй паводкі складае 7–9 метраў. За XX стагоддзе найбольш высокія веснавыя паводкі былі ў 1929, 1931, 1956, 1958, 1969, 1994 і інш. гг. Найбольш вада ў Дзвіне за мінулае стагоддзе падымалася ў 1931 г.: у красавіку яна складала ў Веліжы 7,95 м, Суражы – 10,14 м. На мяжы з Латвіяй вышыня складала 13,5 м. У сярэднім вышыня над самай нізкай межанню складае 4,4–9 м.

Летне-асенняя межань доўжыцца 4–5 месяцаў. У гэты сезон часта бываюць дажджавыя паводкі. У асабліва дажджлівае лета на Дзвіне можа быць 4–5 паводак. У сярэднім іх вышыня складае 2–3 метры, у асобныя гады да 6 м.

Зімовая межань 70–80 дзён. Паводак амаль не бывае, хаця ў цёплыя зімы могуць здарацца і яны, праўда невялікія.

Замярзае Дзвіна ў 1-й дэкадзе снежня. Устойлівы ледастаў пачынаецца і ў канцы кастрычніка, і ў другой палове студзеня. Крыгалом пачынаецца ў 1-й дэкадзе красавіка. Найбольшая таўшчыня лёду (50–78 см) бывае ў лютым–сакавіку. У асабліва суровыя зімы таўшчыня можа дахадзіць да 1 метра. Аднак, бывае, што рака не становіцца на пра-

цягу ўсёй зімы. На Дзвіне сустракаюцца незамярзаючыя на працягу ўсёй зімы ўчасткі. Такія ёсць каля Суража, на парогах утвараюцца так званыя зажоры. Веснавы ледаход працягваецца 4–10 сутак.

Зімой тэмпература вады захоўвае нулявое значэнне. Вясной вада пачынае прагравацца і да канца красавіка дасягае 8–10°С. Летам максімальная тэмпература вады некалькі больш за 20°С. Такой яна трымаецца 10–15 дзён, пасля чаго пачынаецца яе спад.

**Вада.** Вада на працягу года гідракарбанатна–кальцыевага класа з рэзкавыражаным гідракарбанатным характарам. Выключэнне складае перыяд разводдзя і летне-асенніх паводак, калі ў ваду трапляе шмат зямлі з палёў. Мінералізацыя вады ўзрастае ўніз па цячэнні да Віцебска, а потым паніжаецца. У асноўным мутнасць складае 15–30 г узвешанага рэчыва ў 1 м³ вады. Той факт, што вышэй Віцебска вада больш мутная (25–50 г/м³), тлумачыцца тым, што тут больш інтэнсіўна адбываецца смыў грунту са склонаў у выніку большай колькасці ападкаў. Па-другое, тут большая плошча сцёку вады. У сярэднім на працягу года рака выносіць у мора 370 тыс. тон узвешанага рэчыва, а каля Віцебска – 287 тыс. тон.



Сом, злоўлены ў Дзвіне

**Фауна.** У рацэ водзяцца шчупак, акунь, плотка, лешч, лінь, карась звычайны, верхаводка, гусцяра. З каштоўных рыб у Дзвіне і яе прытоках водзяцца судак, мінога ручаёвая, стронга ручаёвая, галавень і інш.

## Дзвіна ў межах Віцебскага раёна.

Пойма ў межах Суражскай нізіны вузкая – да 60 м. Адрозніваюць 2 узроўні: нізкі (1,5–2 м над летнім урэзам ракі, заліваецца ў разводдзе кожны год) і высокі (4–5 м, заліваецца толькі пасля мнагаснежных зім). Аналагічная будова захоўваецца да Віцебска, прычым шырыня нізкай поймы 40–50 м, а высокай не перавышае 15–20 м. Каля г.п. Руба пойма звужаецца да 10–20 м. На Полацкай нізіне яна

таксама вузкая, з дзвюма ўзроўнямі: ніжняя (2,5–3,5 м над летнім узроўнем вады) шырынёй 5–10 м і верхняя (5–5,5 м) – 15–20 м. Толькі на асобных участках пойма пашыраецца да 300–500 м (зрэдку да 3 км).

Менавіта на тэрыторыі нашага раёна Дзвіна становіцца вялікай ракой. Толькі прыняўшы воды Каспля і Усвячы, яна атрымлівае сапраўдную поўнаводнасць. Напрыклад, аб'ём гадавога сцёку ракі Заходняя Дзвіна на тэрыторыі Расіі складае 0,8 $км^3$, а каля Суража ён складае 6 $км^3$.

Рэчышча звілістае, зарастае пераважна каля берагоў. Шырыня яго ў межах Віцебскага раёна розная, ад 60 да 190 м, у сярэднім – 130 м. Пры гэтым рэчышча займае каля трацiны шырыні ракі. Асноўны ток вады, ці, па найменні мясцовых жыхароў, "быстрак", праходзіць па рэчышчы. Аднак, хуткае цячэнне на Дзвіне – не заўсёды прыродная з'ява. Часта яго "паскараюць" штучна. Яшчэ ў XIX ст., каб русла не размывалася, не мялела і караблі маглі бесперашкодна плаваць па рацэ, ад берагоў у напрамку рэчышча рабіліся насыпы з камянёў, бярвення, плятнёў. У выніку цячэнне ў фарватэры станавілася хутчэй і глыбіня ракі ў цэнтры пашыралася. Цяпер такія плятні ўжо не робяць, аднак і старыя яшчэ адыгрываюць сваю станоўчую ролю і не даюць мялець рацэ, робячы яе суднаходнай. Каля берагоў цячэнне часта амаль адсутнічае і там буяе расліннасць.

На Дзвіне амаль няма старых рэчышчаў і заліваў, бо рака цячэ ў большай сваёй частцы праз цвёрдыя берагі. З'яўляюцца характэрнымі для Дзвіны шматлікія драўляныя падводныя завалы з бярвенняў, якія засталіся з тых часоў, калі па рацэ сплаўлялі лес. Шмат у рацэ і глыбокіх ям штучнага паходжання. Ёсць на Дзвіне і астравы, найбольш цікавы з якіх знаходзіцца каля в. Астраўскія. Існуе паданне, што ў старажытнасці на ім разбойнікі схавалі скарб, які і да цяперашняга часу не знойдзены. Найбольшыя глыбіні ў межах нашага раёна Дзвіна мае каля вё-



Выспа на Дзвіне каля в. Астраўскія

сак Курына, Казімірава, Камары, Навасёлкі, Прыдзвінне, Лукі. Яма ў 6 метраў каля в. Курына вядома большасці рыбакоў г. Віцебска. Раней яна з'яўлялася "зімавальнай", г.зн. менавіта тут значная частка рыбы, малаактыўная зімой, чакала надыходу цёплых часін. Казіміраўская яма (8 м) знаходзіцца насупраць Цірaспаля і былой в. Казімірава. Каля в. Камары глыбіня ракі складае 10 метраў. Паміж вёскамі Дарагакупава і Шуты глыбіня складае 12 м. Аднак самая вялікая яма знаходзіцца насупраць вусця р. Шэвінка – 14 м! Яна, як і некаторыя іншыя, штучная. У сутоцы ракі знаходзіцца затон, у якім зімуюць караблі Віцебскага рачнога порта.

Дно пясчана-камяністае і пясчанае або пясчана-галечнае. Берагі ўмерана-стромкія, супясчаныя, радзей – пясчана-глiністыя з валунамі, вышынёй да 8 м, зрэдку – да 22 м.

**Гаспадарчая роля ракі.** Гандаль. У старажытныя часы рэкі адыгрывалі вельмі значную ролю ў жыцці людзей. Яны не толькі давалі ваду, ежу, а былі часта адзінымі сродкамі перамяшчэння. Ад паселішча да паселішча праз дрымучыя лясы зрабіць дарогі было вельмі складана, ды і саміх паселішчаў было не шмат. Вось і перасоўваліся па сваім патрэбам людзі па рэках: летам – на лодках, зімой – на санях па лёдзе. Па рэках праходзілі важныя гандлёвыя шляхі. У IX–XI стст. па Дзвіне праходзіла адно з адгалінаванняў шляху з "варагаў у грэкі". Тавары з Міжземнамор'я і Блізкага Усходу траплялі ў Паўночную і Паўночна-Заходнюю Еўропу (сучасныя краіны Скандынавіі, Польшча, Германія). Купцам у доўгай дарозе патрабавалася ахова ад разбойнікаў, час ад часу адпачынак. Пасля перахода праз волакі патрэбны быў і рамонт караблёў. У розных месцах на рацэ і яе прытоках узнікалі паселішчы, якія абслугоўвалі гандляроў. Некаторыя гарады і вёскі нашага раёна з'явіліся дзякуючы рацэ.

З цягам часу значэнне гандлёвага шляху па Дзвіне мянялася. Пасля захопу крыжакамі вусця Дзвіны, заснавання там горада Рыгі шлях "з варагаў у грэкі" губляе



Паводка на Дзвіне (каля в. Лужасна)

сваё значэнне. Аднак з часоў сярэднявечча і да XX ст. (да з'яўлення чыгунак) па рацэ ў Балтыйскае мора сплаўляліся шматлікія тавары. Пянька, лён, паташ, вапна, дзёгаць, воск перапраўляліся на лодках, лес – плытамі. Некаторыя вёскі па берагах Дзвіны жылі з гэтага сезоннага заробку. Сплаўлялі тавары звычайна ўвесну, у час вясновай паводкі, калі Дзвіна хутка імкне свае воды да Балтыкі. У іншы перыяд гэта было складана зрабіць.

Рускі цар Іван Грозны разумеў важнае значэнне ракі і называў Дзвіну так: "берега Двины серебряные, а дно ея златое". Іншы рускі цар Пётр I загадаў правесці дакладныя вымярэнні ракі, каб выкарыстоўваць яе на карысць Расіі. У 1701 г. былі праведзены прамеры ракі і апісанне яе берагоў экспедыцыяй пад кіраўніцтвам Максіма Цызырова і складзены падрабязны "чарцёж".

Шматлікія даследаванні паказалі, што гідраэнергетычнае значэнне маюць толькі сярэдняе і ніжняе цячэнне Дзвіны. Першая гідраэлектрастанцыя ў ніжнім цячэнні Дзвіны (Кегумская, у Латвіі) была пабудавана ў 1939 г. Цяпер на Дзвіне (Даўгаве) працуе каскад з трох ГЭС з вадасховішчамі – Кегумскім, Плявіньскім і Рыжскім. Усе тры вадасховішчы маюць глухія плаціны, што вельмі значна змяніла ўмовы жыцця жывых арганізмаў. Да будаўніцтва плацін Дзвіна была буйной прамысловай ракой, у якой вылаўлівалася шмат каштоўных парод прахадной і паўпрахадной рыбы (вугор, ласось, таймень, судак). Плаціны сталі непераадольнай перашкодай для гэтых відаў рыб.

У 1980-я гады планавалася стварэнне яшчэ некалькіх гідраэлектрастанцый на тэрыторыі Беларусі – Полацкай, Бешанковіцкай і Віцебскай гідраакумулюючых станцый.

Перад Вялікай Айчыннай вайной і ў 1980-я гг. у СССР разглядалася магчымасць злучэння басейна Дзвіны і Дняпра шляхам правядзення канала даўжынёй каля 80 км з удзелам ракі Лучоса.

У апошні час павялічылася выкарыстанне рэкрэацыйнага патэнцыялу Дзвіны і яе басейна. Басейн ракі багаты на азёры, лясы, балоты. Тут жывапісна спалучаюцца розныя формы рэльефу, маюцца мінеральныя крыніцы, гразі і азёрныя адклады, благапрыемныя кліматычныя ўмовы. Добра прадстаўлены жывёльны і раслінны свет, шмат помнікаў гісторыі і культуры. На правым беразе Дзвіны, непадалёк ад Віцебска, знаход-

зіцца возера Лосвіда, якое абкружана больш мелкімі вадаёмамі (Белае, Даўжанскае (Сосна), Заронаўскае, Шэвінскае). Гэта раён Віцебскага ўзвышша, дзе пагоркі і грады марэннага паходжання пакрыты хваёвымі і хваёва-яловымі лясамі. Каштоўнасць гэтых тэрыторый (якія з большага знаходзяцца на тэрыторыі нашага раёна) у тым, што яны ляжаць блізка ад вялікага горада з яго шматтысячным насельніцтвам і добра забяспечаны транспартнымі шляхамі. Тут створана зона адпачынку, якая ўключае раён азёр Лосвіда і Доўжа, Шэвіна, Белае, радовішча хларыдна-натрыева-кальцыевых вод Лётцы, буйныя масівы хваёвага лесу. Тут створаны санаторый “Лётцы”, турбаза “Лосвіда”. На левым беразе Дзвіны створана зона адпачынку ўздоўж Лучосы.

Бальнеалагічныя рэсурсы Дзвіны ў межах нашага раёна дакладна яшчэ не вывучаны (напрыклад, даліна ракі Усвяча). Яе нізінныя і верхавыя балоты багатыя на тарфяныя лекавыя гразі. Тут знойдзены крыніцы з прэснай вадой, якая ўтрымлівае серавадарод 65–136 мг/л. Асаблівыя лекавыя якасці маюць тарфяныя гразі, якія ўзбагачаныя серавадародам.

Дзвіна, яе прытокі і азёры вельмі перспектыўныя для воднага турызму. Напрыклад, байдарачнікам вельмі добра выкарыстоўваць Вярхоўскі парог.

**Суднаходства.** У 1860-я гады на Дзвіне было заснавана параходнае суднаходства. Параходы хадзілі з Віцебска да Суража і Веліжа. На рацэ былі пабудаваны прыстані. У пач. XX ст. у сувязі з будаўніцтвам чыгунак значэнне ракі як транспартнай артэрыі зменшылася.

З 26 лістапада 1919 г. па 23 лістапада 1920 г. на Дзвіне дзейнічала Заходнедзвінская ваенная флатылія, якая ўключала ў сябе 21 карабель. Галоўная база флатыліі знаходзілася ў Віцебску. Пасажырскія параходы хадзілі па рацэ да канца 1970-х гадоў. А да 1980-х гадоў па рацэ можна было паплаваць на баржы, якую цягнуў буксір. Цяпер, на жаль, актыўнасць на рацэ невялікая.

Наяўнасць парогаў, мелкаводных участкаў, стварэнне глухіх плацін абмяжоўвае суднаходства. У Беларусі Дзвіна судаходная на так званым Віцебскім участку: паміж г. Веліжам і Верхнядзвінскам даўжынёй 333 км. Працягласць навігацыі, у сярэднім, складае 240 дзён.

**Парогі.** Русла Дзвіны ў межах Беларусі характарызуецца вялікай колькасцю пясчаных выспаў, якія ў час паводкі затапляюцца (выключэнне складае востраў каля в. Астраўскія). Акрамя таго часта сустракаюцца перакаты і парогі.

Напрыклад, на тэрыторыі раёна знаходзяцца добра вядомы комплекс парогаў, які атрымаў назву Віцебскі, або Вярхоўскі парог, які ўключае ў сябе шэраг меншых парогаў і проста вялікіх камянёў, што перашкаджаюць суднаходству. Гэта самы вялікі і небяспечны парог на Дзвіне. Яго ўтварэнне звязана з выхадам тут на паверхню як цвёрдых карэнных дэвонскіх парод, так і скапленнем мноства валуноў крысталічных і асадачных парод. Парог вельмі перашкаджае транспартнаму суднаходству. Схіл Вярхоўскага парога складае 0,8%, хуткасць цячэння дасягае 2 м/с (7,2 км/час). Агульная даўжыня складае каля 12 км.

Парожысты ўчастак пачынаецца каля г.п. Руба ў 30 км вышэй Віцебска і цягнецца да цяперашняга мікраараёна Віцебска – Ціраспаля. А.П. Сапуноў у сваёй кнізе “Река Западная Двина” прыводзіць назвы водных перашкод:

“... Пороги Витебские начинаются в 25 верстах выше Витебска. Идут с небольшими перерывами верст 15. ...славнейший из них Закладень (24), Вахолка, Руба (20) между ф. Койтово и д. Руба до 50 саженей длины, Водни (19 1/4), Авдеевечи (19), Кравцы (18 1/2); при д. Подберезье Верховские (18), Попуски (у с. Слободы (17 1/2), Копачи (17), Кольно, Смоляная (16), Беревинские (15), Козлы (12), Бараньи рожки (10), Толкачиха (8 верст, выше с. Лужесна). Камень у им. Тераcполь (5)”. Лічбамі ў дужках адзначана адлегласць ад Віцебска.

Утварэнне парогаў, страмнін, водаваротаў, наяўнасць завалаў валуноў у рэчышчы – вынік таго, што рака пракладвае сябе шлях праз моцныя марэнныя адклады. І цяпер у русле ракі можна сустрэць вялізныя валуны дыяметрам да 3 метраў. Каля в. Курына знаходзяцца радовішчы глін, якія раней распрацоўваліся і на іх працавалі цагляныя заводы. Радовішча даламіта каля г.п. Руба распрацоўваюцца прадпрыемствам “Даламіт”.


Парог на Дзвіне каля г.п. Руба

# ГІСТОРЫЯ ВІЦЕБСКАГА ПРЫДЗВІННЯ

РАЗДЗЕЛ 2










раздзел II

# ТЭМА 1

# НАШ КРАЙ У СТАРАЖЫТНАСЦІ І РАННІМ СЯРЭДНЯВЕЧЧЫ

## КАМЕННЫ І БРОНЗАВЫ ВЯКІ



Мамант

Чалавек вылучыўся з жывёльнага свету больш за 2,5 млн. гадоў таму назад у далёкай спякотнай Афрыцы. Пазней людзі пачалі рассяляцца на іншых тэрыторыях.

У перыяд "дзяцінства" чалавецтва тэрыторыя Паўночнай Беларусі, дзе знаходзіцца і сучасны Віцебскі раён, была пакрытая ледавіком. Каля 1 млн. год таму назад на зямлі пачаўся перыяд абледзянення і Еўрапейскі кантынент некалькі разоў пакрываўся вялікай тоўшчай ільдоў, якая дасягала больш за 1 км. Толькі ў перыяд чарговага пацяплення (міжледавікоўя) тэрыторыя Беларусі вызвалялася ад ледавіковага покрыва. Менавіта ў гэты час з'яўлялася магчымасць засялення чалавекам тэрыторыі Беларусі.

У перыяд 40 – 35 тыс. год таму назад з'явіўся чалавек сучаснага фізічнага тыпу – краманьонец. Менавіта ён засяліў Паўночную Беларусь, але гэты працэс адбываўся паступова.

Першыя стаянкі краманьонцаў Юравічы і Бердыж з'яўляюцца на поўдні Беларусі ў перыяд 26 – 23 тыс. год таму назад. Тэрыторыя Віцебскага раёна была вызвалена з-пад ільдоў у гэты час. Аб гэтым сведчаць знаходкі костак маманта каля вёсак Вярхоўе, Шапуры і г.п. Руба. Нажаль, стаянак гэтага часу на нашай тэрыторыі археолагамі не выяўлена. Магчыма, суровы клімат тундры і блізасць ледавіка не спрыяла засяленню

нашага раёна людзьмі ў гэты перыяд. У такіх суровых умовах тэрыторыю раёна засялялі жывёлы тундравай прыроднай зоны, да якіх адносяцца мамант, шарсцісты насарог (вымерлыя жывёлы), паўночны алень, пясец, паўночная курапатка і інш.

Асноўным аб'ектам палявання чалавека верхняга палеаліту з'яўляўся мамант. Абрысамі ён нагадвае сучаснага слана. Дарослыя жывёліны дасягалі 3,5 метраў у вышыню і важылі да 7 тон. Мамант меў густую бурую шэрсць з падшэрсткам, маленькія вушы, вялікія выгнутыя іклы. Даўжыня аднаго ікла дасягала 2,5 – 3 метры, а вагай – да 100 кг.

Паляванне адбывалася шляхам загону, сродкам палоху (магчыма, выкарыстоўваўся агонь). Забітая жывёла поўнасцю спажывалася чалавекам. Мяса ўжывалі ў ежу і нарыхтоўвалі ў запас. Косткі і іклы выкарыстоўвалі як будаўнічы матэрыял,



Жытло першых людзей

паліва (замест дроў), з іх выраблялі прылады працы, зброю і розныя ўпрыгожванні. Скура выкарыстоўвалася для накрывання жытла, на ёй таксама спалі.

Яшчэ адна спроба засяліць Беларусь скончылася няўдачай, таму што 19 – 18 тыс. год таму назад адбылося апошняе наступленне ледавіка на поўдзень. Ледавік дасягнуў лініі Гродна – Вілейка – Орша. Тэрыторыя Віцебскага раёна зноў апынулася пад ледавіковым покрывам і ўсялякае жыццё прыпынілася.

Аднак каля 17 тыс. год таму назад на Зямлі пачалося глабальнае пацяпленне. Ледавік паступова пачаў таяць і адыходзіць на сваю радзіму ў Скандынавію. У час таяння ледавіка пачаў фарміравацца сучасны рэльеф і сетка рэк Беларусі. Вымiраюць маманты, шарсцістыя насарогі. Паўночны алень прасоўваецца далей на поўнач за адыходзячым ледавіком, а за ім пачалі рухацца і людзі. Паляўнічыя пачынаюць прыстасоўвацца да новых кліматычных умоў пасляледавіковай эпохі.

У мезаліце (11 – 6 тыс. год таму назад) з'явіліся спрыяльныя ўмовы для засялення тэрыторыі сучаснага Віцебскага

раёна. Археолагамі выяўлена мезалітычная стаянка Крыжы (раней побач з паселішчам існавала аднайменная вёска), якая змешчана на правым беразе Заходняй Дзвіны ў 2,5 км на поўдзень ад в. Увалокі Старасельскага с/с. Стаянка знойдзена яшчэ ў 1930-я гг. знакамітым беларускім археолагам К.М. Палікарповічам і неаднаразова даследавалася ў пасляваенны час. На паселішчы знойдзены крамянёвыя прылады працы (тронкавы наканечнік стралы, скрабкі, адшчэпы, а таксама косткі высакароднага аленя). Як мы бачым, жыхары стаянкі валодалі лукам, пры дапамозе якога палявалі на дзічыну. Скрабкі выкарыстоўваліся для апрацоўкі скуры здабытых жывёл. Мезалітычнае паселішча Крыжы пакуль адзінае ў межах Віцебскага раёна, яно з'яўляецца сведчаннем першапачатковага засялення чалавекам дадзенай мясцовасці.

Эпоху мезаліту змяняе неаліт, які датуецца 6 – 4 тыс. год таму назад. У гэты час адбываюцца карэнныя змены ў матэрыяльнай культуры мясцовага насельніцтва. Самым галоўным дасягненнем неаліту з'яўляецца вынаходніцтва керамічнага посуду. Вырабляўся ён без ганчарнага круга і быў вострадонны (гаршчок з такой формай дна лепей стаяў у вогнішчы). Амаль увесь посуд аздабляўся адбіткамі грабенчатага штампа, наколамі, насечкамі. Трэба зазначыць, што і ў апрацоўцы крамянёвых прылад працы адбыліся пэўныя змены. Прылады апрацоўваюцца больш дэталёва і маюць закончаную форму. Насельніцтва пачынае шліфаваць каменныя сякеры. Першапачаткова шліфоўцы падвяргалі лязо, а потым і ўсю прыладу. Значных зменаў у вядзенні гаспадаркі не адбылося. Насельніцтва працягвала весці прысвойваючую гаспадарку, асновай якой было паляванне, рыбалоўства і збіральніцтва.

Тэрыторыя цяперашняга раёна ўваходзіла ў межы распаўсюджвання нарвенскай археалагічнай культуры. Адметнасцю нарвенскай культуры з'яўляецца шырокае выкарыстоўванне для вырабу прылад працы вялікай колькасці костак і рога. Звязана гэта з беднасцю залежаў крэмня ў Паўночным рэгіёне. Нажаль, ні адна стаянка ў раёне не даследавалася шляхам раскопак. Усе неалітычныя паселішчы раёна вядомы толькі па зборам з паверхні рэшткаў матэрыяльнай культуры і выпадковых знаходак шліфаваных сякер. Такія знаходкі былі зроблены віцебскімі навукоўцамі яшчэ ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Стаянак неаліту і выпадковых знаходак вядома вельмі мала – усяго каля 5 месцазнаходжанняў. Да іх адносяцца паселішчы

на Шэвінскім возеры, каля в. Старое Сяло на Заходняй Дзвіне і раней згаданая стаянка Крыжы.

Трэба зазначыць, што ў межы нарвенскай культуры пранікалі і прадстаўнікі іншых культур. Да іх можна аднесці фінскамоўнае насельніцтва, якое жыло на берагах Фінскага заліву і пакінула культуру тыповай грабенчата-ямачнай керамікі. Менавіта элементы такой арнаментацыі посуду сустракаюцца на помніках нарвенскай культуры, што з'яўляецца сведчаннем кантактаў людзей рознага паходжання.

У бронзавым веку (2 тыс. гадоў да н.э. – 8–7 стст. да н.э.) адбываюцца карэнныя змены ў гаспадарцы. На змену прысвойваючай прыходзіць вытворчая гаспадарка, якая распаўсюджвалася разам з рассяленнем індаеўрапейскіх плямёнаў. У выніку гэтага чалавек стаў менш залежаць ад прыроды. Павялічылася колькасць ежы, што прывяло да меншай смяротнасці і павелічэння працяглаці жыцця насельніцтва. У гэты час чалавек вырошчваў пшаніцу, ячмень, лён. Першыя палі былі маленькія. Злакавыя зразаліся невялікімі крамянёвымі сярпамі.

Апрацоўка каменя дасягнула дасканаласці. Людзі навучыліся яго свідраваць. У асноўным свідраванне прымянялася пры вырабе сякер і матык. З'яўляюцца першыя прылады з медзі і бронзы. Аднак, колькасць іх была вельмі малая з той прычыны, што радовішчаў медзі ці волава на Беларусі няма. Асноўнымі прыладамі працы ўсё ж такі заставаліся каменныя, касцяныя і рагавыя прылады. Трэба зазначыць, што ў гэты перыяд пачынаецца першае накапленне багаццяў і назіраецца маёмасная дыферэнцыяцыя (іншымі словамі, з'яўляецца падзел на бедных і багатых).



Раскопкі Г.В. Штыхава на гарадзішчы каля в. Баронікі

У перыяд бронзавага веку тэрыторыя Віцебскага раёна ўваходзіла ў межы паўночнабеларускай культуры. Як і стаянкі неаліту, так і паселішчы бронзавага веку не даследаваліся шляхам раскопак. Усе яны вядомы толькі па зборам з паверхні рэшткаў матэрыяльнай культуры і выпадковых знаходак свідраваных сякер. Да паселішч бронзавага веку адносіцца таксама вышэйзгаданая стаянка каля в. Старое Сяло. Свідраваная сякера, якая адносіцца да перыяду бронзавага веку, была знойдзена непадалёк ад в. Курына.

## ЖАЛЕЗНЫ ВЕК

З распаўсюджваннем жалеза ў VIII–VII стст. да н.э. пачынаецца ранні жалезны век, які скончыўся ў V ст. н.э. Помнікі ранняга жалезнага веку Віцебскага раёна адносяцца да днепра-дзвінскай культуры. Жалеза выплаўлялася з балотнай руды сырадутным спосабам. З гліны рабілася невялікая печка – домніца, куды закладваліся балотная руда і драўляны вугаль. Вугаль падпальваўся і пры дапамозе кавальскіх мяхоў у печ штучна нагняталася паветра для павелічэння тэмпературы. Менавіта выкарыстаннем кавальскіх мяхоў дасягалася тэмпература плаўлення звыш 1200оС. Пры такой тэмпературы руда плавілася і ператваралася ў крыцу. Крыцу даставалі, шляхам коўкі выдалялі шлакі, рабілі першапачаткова загатоўкі, а з іх потым неабходныя прылады працы. Такая домніца была знойдзена пры даследаванні гарадзішча Канькі Запольскага с/с у 1934 г. беларускімі археолагамі А.М. Ляўданскім і К.М. Палікарповічам. Знаходзіцца паселішча за 0,5 км на паўднёвы ўсход ад вёскі, ва ўрочышчы Цербухань на беразе Заходняй Дзвіны. У культурным пласце знойдзены амаль цэлая печ-домніца і шмат шлакаў. Яна мела зусім невялікія памеры 35 см х 45 см. Неабходна зазначыць, што знаходкі шлакаў і крыц з'яўляюцца неад'емнай часткай знаходак пры раскопках гарадзішчаў ранняга жалезнага веку. Гэта сведчыць аб вытворчасці жалеза на кожным паселішчы.

Вынаходніцтва жалеза з'явілася вялікім штуршком у далейшым развіцці гаспадаркі. Жалезныя прылады былі больш трывалыя, больш вострыя, чым каменныя ці бронзавыя. З жалеза можна было зрабіць прыладу розных памераў і рознага прызначэння. Пры дапамозе такіх прылад павялічылася вытворчасць сельскагаспадарчай прадукцыі (пры меншых затратах сілы). Усё гэта прывяло да накаплення вялікіх багаццяў у выглядзе жывёлы і запасаў зерня. Аднак часта атрымлівалася так, што ў адных абшчын (у якіх, напрыклад, была больш урадлівая зямля, ці самі жыхары былі больш працавітыя) зерня станавілася больш і яны станавіліся болей багацейшымі, а ў іншых сродкаў не хапала. З'яўляецца варожасць паміж суседзямі, пачынаюцца першыя ваенныя сутычкі.

Для аховы багаццяў і абароны ад ворагаў–суседзяў упершыню будуюцца ўмацаваныя паселішчы–гарадзішчы. Такіх гарадзішчаў на тэрыторыі раёна вядома больш за 20.

Для будоўлі ўмацаванага паселішча насельніцтвам выбіраліся цяжкадаступныя месцы, якія самі мелі ўжо прыродныя ўмацаванні, напрыклад, мысы, утвораныя ярамі ці рэчкамі, ці высокія ледавіковыя халмы, якія мелі стромкія схілы. Такім чынам, вызначаюцца два тыпы гарадзішчаў – мысавыя і халмавыя. Да мысавых гарадзішчаў адносіцца Старое Сяло, якое знаходзіцца на мысе, на правым беразе З. Дзвіны. Гарадзішча дадаткова ўмацавана з боку поля двумя абарончымі валамі і ірвом паміж імі. Халмавыя гарадзішчы больш распаўсюджаныя на Віцебшчыне, што звязана з асаблівасцямі рэльефу нашай мясцовасці. Умацаванымі паселішчамі на халмах з'яўляюцца гарадзішчы Бабінічы, Баронікі, Дрыкольле, Лужасна, Мяклава. Дадаткова яны ўмацаваны абарончымі валамі па краю жылой пляцоўкі і схілах.

Помнікі днепра-дзвінскай культуры ў межах Віцебскага раёна пачалі даследавацца яшчэ ў XIX ст. Дарэчы, і першая археалагічная карта Віцебскай губерні была складзена сакратаром Віцебскага статыстычнага камітэта А.М. Семянтоўскім у 1867 годзе і перавыдадзеная з дапаўненнямі ў 1890 годзе. Асабліва вялікая цікавасць да помнікаў ранняга жалезнага веку праявілася ў 1920–30-я гг. Былі праведзены і першыя археалагічныя раскопкі гарадзішча ранняга жалезнага веку на тэрыторыі Віцебскага раёна. Было даследавана гарадзішча Старое Сяло пад кіраўніцтвам А.М. Ляўданскага. У выніку раскопак знойдзены два нажы, частка жалезнай дужкі, косткі жывёл, ляпная гладкасценная і штрыхаваная кераміка. У пасляваенны час значныя работы на помніках ранняга жалезнага веку былі праведзены К.П. Шутам (раскопкі гарадзішча Заронава), Г.В. Штыхавам (раскопкі гарадзішчаў Баронікі, Лужасна).



Паўзямлянка

У культурным слоі ранняга жалезнага веку гарадзішча Баронікі выяўлены ямы ад жытлаў слупавой канструкцыі, знойдзены жалезны нож з гарбатай спінкай, 2 каменныя клінападобныя сякеры, глінянае прасліца, жалезная сякера скіфскага тыпу, тачыльны брусок. Кераміка ляпная, у большасці выпадкаў гладкасценная, зрэдку трапляюцца фраг-

менты, паверхня якіх пакрытая штрыхамі, асобныя чарапкі маюць адбіткі тэкстылю. Гарадзішча аднесена даследчыкамі да днепра-дзвінскай культуры і датавана V ст. да н. э. – IV-V стагоддзямі н. э.

Пры даследаванні гарадзішча Заронава ў слоі ранняга жалезнага веку знойдзена ляпная тэкстыльная і архаічная гладкасценная кераміка, арнаментаваная па венчыку скразнымі адтулінамі і рознымі лініямі, каменная клінападобная сякера, касцяная праколка, фрагмент вітай жалезнай шыйнай грыўны. Трэба адзначыць, што яшчэ ў 1920-х гг. гэты помнік абследаваўся мясцовымі краязнаўцамі І.Р. Калодкіным і П. Цвятковым, якія зазначылі добрую захаванасць помніка. Але ў 1964 годзе К.П. Шут заўважыў, што амаль увесь помнік ужо знішчаны гравійным кар'ерам. У выніку была даследавана толькі невялікая плошча ў 24 м2. Як мы бачым, помнік падчас неразумнай гаспадарчай дзейнасці чалавека быў знішчаны і назаўсёды страчаны для навукі.


Скроневыя кольцы знойдзеныя на гар. Бaронікі (Г.В. Штыхаў, 1972)

Цікавыя матэрыялы ранняга жалезнага веку атрыманы пры раскопках гарадзішча Лужасна. Гэта жалезны серп, тры нажы. Знойдзеныя кавалкі ляпнога посуду адносяцца да днепра-дзвінскай культуры.

У апошнія гады раскопкі гарадзішчаў ранняга жалезнага веку праводзіць П.М. Падгурскі. Ім праведзены раскопкі гарадзішча Мяклава, дзе знойдзена некалькі фрагментаў ляпной гладкасценнай керамікі і частка жалезнага нажнога бранзалета. На гарадзішчы Старое Сяло былі даследаваны 368 м2. Да матэрыялаў днепра-дзвінскай культуры належаць фрагменты ляпных гладкасценных гаршкоў, кельт, 2 нажы з гарбатымі спінкамі, 2 брытвы, фрагмент жалезнага бранзалета, бронзавае кальцо, абломак касцяной булаўкі, адназубы касцяны гарпун, лашчыла. Знойдзены прасліцы з гліны, якія нанізвалі на верацёны для лепшага кручэння. Выяўлены косткі свойскіх і дзікіх жывёл, апошнія дамінуюць па колькасці. Да дзікіх адносяцца: зубр, лось, алень, кабан. Сярод свойскіх жывёл: каровы, коні, свінні.

## РАННЯЕ СЯРЭДНЯВЕЧЧА

З V ст. н.э. пачынаецца новая эпоха – ранняе сярэдневякоўе. У гэты час у Еўропе завяршаецца Вялікае перасяленне народаў. У выніку на поўнач Беларусі, у тым ліку і на тэрыторыю нашага раёна, пранікаюць прадстаўнікі іншых этнасаў. У эпоху ранняга сярэдневякоўя тэрыторыя Віцебскага раёна ўваходзіла ў арэал распаўсюджвання культур тыпу тушамля-банцараўшчына.

Павелічэнне вытворчых адносін (выкарыстанне рала, коней ці валоў пры аранні зямлі і інш.) прымусіла мясцовае насельніцтва пакінуць невялічкія гарадзішчы і перайсці жыць на неўмацаваныя селішчы накшталт сучасных вёсак. Але старыя гарадзішчы не ўсе былі закінуты, а ператварыліся ў сховішчы, дзе насельніцтва хавалася ў перыяд ваеннай небяспекі. Такім чынам, побач з многімі гарадзішчамі ўзнікаюць селішчы. Прыкладамі такіх паселішч з’яўляюцца гарадзішча і селішча Заронава, Лужасна, Старое Сяло, Мяклава. Нажаль, большасць з іх археолагі амаль не даследавалі.



*Лужасна: 1—3 — бронзавыя вырабы з гарадзішча; 4 — бронзавы пінцэт; 5 — гліняная прасліца з селішча V—VIII стст.*

Рэчы, знойдзеныя пры раскопках гарадзішча і селішча Лужасна (Г.В.

З усіх вядомых селішч, якія датуюцца V – VII стст. н.э., даследавана раскопкамі толькі Лужасна. У выніку выяўлены рэшткі жытла (4 х 5 м), крыху паглыбленага ў

грунт, з печчу-каменкай (1 х 2 м, вышынёй 0,6 м), каля якой знаходзілася шмат ляпной керамікі, глінянае біканічнае прасліца. На селішчы знойдзены бронзавы пінцэт. Частка матэрыялаў ранняга сярэдневякоўя знойдзена і на гарадзішчы, да якіх адносяцца серп, бронзавыя трапецападобныя падвескі і частка ляпной тоўстасценнай керамікі.

Пры даследаванні гарадзішча Старое Сяло атрымана шмат матэрыялаў V – VII стст. н.э. Сярод іх тры паўзямлянкавых жытла. Плошча іх дасягала 11 – 19 м2. Падлога была земляной. Сцены ўяўлялі сабой зрубна-слупавую канструкцыю. Ацяпляліся яны з дапамогай адкрытых вогнішчаў. Асобна знойдзена печ-каменка, аснову якой складалі два вертыкальна пастаўленыя плоскія камні. Асноўныя знаходкі паходзяць з жытлаў. Гэта скроневае драцяное кальцо, бранзалет з патоўшчанымі канцамі, на які нанесены геаметрычны арнамент, фрагмент срэбранай шыйнай грыўны, баявая сякера, жалезная раменная пражка. Знойдзены глянцаваныя біканічныя прасліцы, частка якіх арнаментавана рознымі рыскамі. Посуд прадстаўлены таўстасценнымі гаршчкамі баначных і цюльпанавідных форм. Выяўлены косткі свойскіх (карова, свіння, конь, каза, авечка, сабака) і дзікіх жывёл (лось, кабан, бабёр рачны, казуля). Костак свойскіх жывёл больш, чым дзікіх. Селішча, якое знаходзіцца побач, не раскопвалася.



Бранзалет, знойдзены пры раскопках гарадзішча Ст. Сяло (П.М. Падгурскі, 2001)



Жалезная сякера, знойдзеная пры раскопках гарадзішча Ст. Сяло (П.М. Падгурскі, 2001)

Кераміка ранняга сярэдневякоўя была знойдзена і пры раскопках гарадзішча Заронава. Унікальны скарб з трох драцяных бронзавых скроневых кольцаў (V-VII стст. н.э.), якія мелі па 2 трапецападобныя падвескі, быў знойдзены пры раскопках гарадзішча Баронікі. Аналагаў гэтым кольцам пакуль не выяўлена. Магчыма, у тыя часы гарадзішча выкарыстоўвалася як сховішча.

Мясцовае насельніцтва ранняга сярэдневякоўя адчувала ўплыў славян з поўдня і захаду, але ж у цэлым культура тушамлябанцараўшчына заставалася балцкай.

Актыўная славянізацыя нашых зямель пачынаецца з VIII ст. н.э. з распаўсюджваннем культуры смаленскіх доўгіх курганоў. Археолагі звязваюць насельніцтва, якое пакінула такія пахавальныя помнікі, з летапіснымі крывічамі. На тэрыторыі Віцебскага раёна доўгіх і падоўжаных курганоў не многа, яны не складаюць асобныя групы, а змяшчаюцца побач з круглымі, паўсферычнымі курганамі. Тым больш раннія крывіцкія пахаванні часткова фіксуюцца і ў круглых курганах. Так, у круглым кургане каля Старога Сяла знойдзены гаршчок, аналагічны кераміцы смаленскіх доўгіх курганоў.

На тэрыторыі раёна раскопваўся толькі адзін доўгі курган у курганным могільніку Лятохі. У кургане памерам 18 х 8 х 1,5 м рэштак пахавання не было, але пад насыпам выяўлены адзнакі вогнішча і знойдзены ляпны гаршчок тыпу культуры тушамля-банцараўшчына. Даследчык курганоў Г.В. Штыхаў адзначыў наяўнасць самага доўгага кургана ў могільніку, даўжыня якога дасягае 70 м, а вышыня – 1,5 м. На сённяшні дзень гэта самы доўгі курган у Віцебскім раёне. Падоўжаныя курганы ёсць і ў іншых курганных могільніках (напрыклад, Бараўляны, Курына, Лётцы, Янавічы). Пры пахаванні нябожчыка спальвалі разам



Доўгі курган каля в. Лятохі

з інвентаром. Рэшткі крэмацыі ссыпалі ў гаршчок. Зверху насыпалі курган. У ім магло быць і некалькі пахаванняў. Рэчы, якія знаходзяць у пахаванні, моцна абпаленыя. Сустракаюцца розныя бусы, нажы, пражкі, бронзавыя спіралі, трапецападобныя падвескі. Матэрыяльная культура ранніх крывічоў у асноўным вядома па раскопках могільнікаў. Адкрытыя паселішчы, а тым больш умацаваныя, фактычна не даследаваны.




Выгляд славянскага гарадзішча (з малюнка Я. Драздовіча)

У канцы X ст. знікае традыцыя насыпання доўгіх курганоў. Змяняецца пахавальны абрад: на змену трупаспальвання (крэмацыі) прыходзіць традыцыя трупапакладання (інгумацыі) у круглых паўсферычных курганах.

Курганных могільнікаў, якія складаюцца з круглых паўсферычных курганоў, на тэрыторыі раёна значная колькасць. Вядомы яны каля вёсак Старое Сяло, Сакольнікі, Лятохі, Саўчонкі, Лебартова і інш. Усяго налічваецца каля 40 такіх помнікаў. Перад пахаваннем пры дапамозе вогнішча ачышчалася месца. Потым лажылі нябожчыка з рознымі бытавымі рэчамі, упрыгожваннямі, маглі ставіць і гаршчок з ежай. Потым насыпалі паўсферычны курган і рабілі трызну. Зямлю для насыпу бралі побач ці прыносілі з іншых месц. Неад’емнай часткай крывіцкага жаночага пахавання пачатку XI – XIII стст. з’яўляецца браслетапа-

добнае драцяное скроневае кальцо з завязанымі канцамі. Яно з'яўляецца этнавызначальнай прыметай пахавання. Рабілі яго з бронзы, радзей з серабра. Жаночыя пахаванні адрозніваюцца ад мужчынскіх вялікай колькасцю ўпрыгожванняў: падвескі, бусы, бранзалеты, пярсцёнкі і г.д.

Археалагічнымі раскопкамі пачалі даследавацца крывіцкія курганныя могільнікі яшчэ ў XIX ст. Напрыклад, у



Курганная група "Кахоўка" каля в. Сакольнікі (Мазалаўскі с/с)

Старым Сяле даследаваў М.Ф. Кусцінскі, у маёнтку Кахоўка, што належаў А.П. Сапунову, раскопкі праводзіў Е.Р. Раманаў у 1891. Было даследавана 3 курганы. У адным кургане выяўлены 3 шкілеты, каля аднаго ляжаў нож і гаршчок, у другім пры касцяку знойдзена хрусталёвая шарападобная пацерка, у трэцім — рэшткі трупаспалення, крэмень і рыбалоўны кручок.

У даваенны час раскопкі курганоў праводзіў у Старым Сяле А.М. Ляўданскі. Пасля вайны маштабных раскопак крывіцкіх могільнікаў у раёне не праводзілася. Трэба адзначыць толькі раскопкі Г.В.Штыхава: ў пачатку 1970-х гг. некалькіх курганоў на могільніках у Старым Сяле і Лятохах.

З X ст. актыўна пачынае дзейнічаць міжнародны гандлёвы шлях "з варяг у грэкі" і вялікі Волжскі гандлёвы



Карта гандлёвага шляху “з вараг у грэкі”

шлях. Тэрыторыя сучаснага Віцебскага раёна ляжала на перакрыжаванні гэтых двух знакамітых шляхоў. Напрыклад, рухаючыся ўверх па цячэнні Дзвіны да вытоку, адтуль волакам да вытоку Волгі і па ёй да Каспійскага мора ў Арабскі Халіфат.

Старажытнарускія летапісы даюць назву шляху з “вараг у грэкі” і яго апісанне: “ и из Грек по Днепру, и верх Днепра волок по Ловоти, и по Ловоти внити в Илмерь озеро великое, из него же озера потечеть Волхов и втечеть в озеро великое Нево и того озера внидеть устье в море Варяжское; и потому морю внити даже и до Рима, а от Рима прити по тому же морю к Царюграду и от Царяграда прити в Понт море, в неже втечеть Днепр река”.

Гэта быў транзітны шлях, якім карысталіся арабскія і варажскія купцы і варажскія наёмнікі. Славянскае насельніцтва хутчэй за ўсё абслугоўвала дадзены міжнародны гандлёвы шлях, на чым і зарабляла немалыя сродкі. І па сённяшні дзень у нашым раёне знаходзяць скарбы, у якіх ёсць прадметы, што адносяцца да матэрыяльнай культуры арабскага Усходу і Скандынавіі. На тэрыторыі г. Віцебска неаднаразова знаходзілі прадметы матэрыяльнай культуры варагаў, скарбы дырхемаў і асобныя манеты.



Частка дырхема

Трэба зазначыць, што Лучоса не названа як рэчка, па якой праходзіў шлях “з вараг у грэкі”, але ж па яе цячэнні можна было дабрацца амаль да Дняпра і толькі невялікі шлях трэба прайсці волакам. Па цячэнні Лучосы вядомы ў межах раёна два знакамітых скарба. Адзін скарб грашова-рэчавы, знойдзены ў 1870 годзе ў маёнтку Сухадрэва, на беразе ракі Сухадрэўкі непадалёк ад упадзення яе ў Лучосу. Захаваліся толькі нязначныя звесткі аб вялікай колькасці куфіцкіх дырхемаў.

Рэчавая частка скарба складалася з некалькіх шыйных грывен і пярсцёнкаў з камянямі і разьбой. Другі скарб быў знойдзены на беразе Лучосы паблізу вёскі Лучоса каля 1910 года. З усяго клада вядомыя толькі 2 дырхемы, адзін, чаканены ў канцы VIII ст., і другі, чаканены ў другой палове IX ст. у Самаркандзе. Гэтыя скарбы з'яўляюцца доказам праходжання гандлёвых шляхоў праз тэрыторыю Віцебскага раёна, у тым ліку па Лучосе.

У X ст. пры зліцці р. Віцьба і р. Заходняя Дзвіна ўзнікае горад Віцебск, які стаў адміністрацыйным цэнтрам навакольных зямель. Узнікненню горада спрыяла яго выгаднае геаграфічнае становішча на шляху “з вараг у грэкі”. Археалагічныя даследаванні пацвердзілі, што старажытныя паселішчы на месцы сучаснага Віцебска размяшчаліся на асобных узвышшах у забалочанай пойме р. Віцьбы. На рубяжы нашай эры на Замкавай гары знаходзілася гарадзішча днепра-дзвінскай культуры. У трэцяй чвэрці 1 тыс. н.э. узніклі паселішчы: адно, відаць, каля падножжа Замкавай гары пры вусці Віцьбы, другое далей, на беразе Дзвіны каля ручая. Агульная іх плошча складала каля 2 га. Замкавая гара працягвала выкарыстоўвацца як гарадзішча-сховішча ў час ваеннай небяспекі. Віцебск як горад сфарміраваўся з асобных паселішчаў крывічоў у IX – пач. X ст. З канца X ст. пачынае засяляцца Узгор'е, дзе пазней узнік значны пасад Віцебска. На працягу XII–XIII стст. адбываўся працэс паступовага зліцця асобных пасадскіх паселішчаў у адзіную гандлёва-рамесную частку горада.

Паводле падання, запісанага ў Віцебскім летапісе XVIII ст., Віцебск заснавала кіеўская княгіня Вольга ў 974 г. Аднак, улічваючы той факт, што Вольга памерла ў 969 г., вучоныя мяркуюць, што датай заснавання горада можна лічыць 947 г. Першае ўпамінанне Віцебска ў “Аповесці мінулых часоў” датуецца 1021 г., калі кіеўскі князь Яраслаў Мудры перадаў гарады Усвят і Віцебск полацкаму князю Брачыславу. Пасля смерці полацкага князя Усяслава Брачыславіча ў 1101 г. Віцебск стаў цэнтрам удзельнага княства.



Перасоўванне карабля волакам

# ТЭМА 2 ВІЦЕБСКАЯ ЗЯМЛЯ Ў XIII – XVIII СТСТ.

## УКЛЮЧЭЕННЕ ВІЦЕБСКАГА КНЯСТВА Ў СКЛАД ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА. ВІЦЕБСКАЯ ЗЯМЛЯ Ў XIV СТ.

Працэс пашырэння ўлады літоўскіх князёў на землі заходняй Русі распачаўся ў першай чвэрці XIII ст. З сярэдзіны XIII ст. у сферу палітычных уплываў Літвы трапіла некалі магутная Полацкая зямля, падзеленая на шэраг дробных удзелаў. Адным з іх было Віцебскае княства. Ужо ў 1264 г. на Віцебск распаўсюджвалася ўлада літоўскага князя Гердзеня. Пазней, каля 1265 г., полацкім і віцебскім князем быў Ізяслаў, які прызнаваў вярхоўную ўладу вялікага князя літоўскага Войшалка.

Пасля смерці Войшалка літоўскія ўплывы на землях Беларускага Падзвіння часова аслаблі. У 70–90-я гг. XIII ст. Віцебскае княства цалкам выйшла з-пад кантролю Літвы, але трапіла пад уладу смаленскіх князёў. Залежнасць ад Смаленска не была, аднак, працяглай. Ужо на мяжы XIII і XIV стст. Віцебскае княства ізноў было незалежным: тут княжыў свой князь Міхаіл Канстанцінавіч.

Апошнім віцебскім князем з дынастыі Рурыкавічаў быў Яраслаў Васількавіч. У 1318 г. ён выдаў сваю адзіную дачку Марыю Яраслаўну замуж за літоўскага князя Альгерда, а ў 1320 г. памёр, не пакінуўшы пасля сябе нашчадкаў мужчынскага полу. Пасля смерці Яраслава Васількавіча ў Віцебску пачаў княжыць яго зяць Альгерд, які, як віцебскі князь, непасрэдна падпарадкоўваўся свайму бацьку – вялікаму князю літоўскаму Гедзіміну. Такім чынам, у 1320 г. Віцебскае княства мірным шляхам трывала ўвайшло ў склад Вялікага княства Літоўскага.

У складзе гэтага дзяржаўнага ўтварэння Віцебскае княства захоўвала тэрытарыяльную цэласнасць, самабытнасць, свае палітычныя і прававыя традыцыі. Як у XIV ст., так і пазней, Віцебшчына карысталася шырокай аўтаноміяй і не злівалася ў адзінае цэлае з ядром дзяржавы. Аб асобнасці пазіцый і аўтаномным статусе Віцебскай зямлі ў складзе Вялікага княства Літоўскага ў XIV ст. яскрава сведчыць наступны факт: у 1338 г. мірнае пагадненне паміж гэтай дзяржавай і Лівонскім Ордэнам было заключана вялікім князем літоўскім Гедзімінам са згоды віцебскага князя і гараджан Віцебска.

Мясцовым удзельным князем быў цяпер прадстаўнік роду Гедзіміна, але, за выключэннем гэтага і прызнання вярхоўнай улады вялікага князя літоўскага, ніякіх змен ва ўнутраным жыцці Віцебскай зямлі не адбывалася. Тут фактычна ў нязменным выглядзе захоўваліся парадкі, выпрацаваныя яшчэ ў старажытнарускую эпоху. Да ліквідацыі ў 1393 г. Віцебскага княства адносіны паміж яго насельніцтвам і ўдзельнымі князямі рэгуляваліся пры дапамозе спецыяльнай умовы (“ряда”), якая значна абмяжоўвала княскую ўладу. Усе істотныя пытанні ўнутранага жыцця Віцебскай зямлі па-ранейшаму знаходзіліся ў кампетэнцыі мясцовага веча. Права прымаць удзел у вечы было агульным для ўсяго паўнапраўнага насельніцтва. Веча аб’ядноўвала ўсю зямлю-княства як палітычны арганізм і з’яўлялася агульназемскім органам улады.

У 20-х – пачатку 40-х гг. XIV ст. віцебскім князем быў Альгерд Гедзімінавіч. Віцебская зямля засталася непасрэдна пад яго ўладай і пасля 1345 г., калі Альгерд стаў вялікім князем літоўскім. З дзейнасцю Аль-


Вялікі князь Альгерд

герда звязана ўзвядзенне магутнай сістэмы сярэднявечных абарончых умацаванняў Віцебска. Яна складалася з двух мураваных замкаў – Верхняга і Ніжняга. Іх будаўніцтва было завершана каля 1351 г. Агульная даўжыня мураваных сцен віцебскіх замкаў дасягала 1750 м.

Пад кіраўніцтвам Альгерда апалчэнне Віцебскай зямлі ўдзельнічала ў многіх вайсковых мерапрыемствах Вялікага княства Літоўскага. У 1341 г. віцябляне дапамагалі Пскову ў барацьбе супраць крыжацкай агрэсіі. У 1348 г. віцебскі полк удзельнічаў у крывавай бітве з рыцарамі Тэўтонскага Ордэна на рацэ Стрэве. У 1368, 1370 і 1372 гг. Альгерд збіраў свае войскі ў Віцебску перад паходамі на Маскву.

Пасля смерці Альгерда ў 1377 г. Віцебскае княства разам з вялікім княжэннем атрымаў у спадчыну яго сын Ягайла. У 1385 г., пасля заключэння Крэўскай уніі, Ягайла стаў польскім каралём і выехаў з Вялікага княства Літоўскага. Пры гэтым ён перадаў кіраванне Віцебскам сваёй маці – другой жонцы Альгерда – Ульяніі Цвярской. Пасля яе смерці, у пачатку 90-х гг. XIV ст., Ягайла вырашыў не аддаваць княства сваякам, прадстаўнікам роду Гедзімінавічаў, а зрабіў віцебскім намеснікам свайго сакольнічага Фёдара Вясну.

Такое рашэнне не задаволіла брата Ягайлы – князя Свідрыгайла Альгердавіча, які сам разлічваў на віцебскі стол. У 1393 г. пры падтрымцы мясцовых баяр і гараджан, якія і пазней са спачуваннем адносіліся да яго, Свідрыгайла захапіў Віцебск і забіў Фёдара. Па просьбе Ягайлы ў паход на мяцежнага князя выправілася вялікае літоўскае войска на чале з Вітаўтам. Яно ўступіла на тэрыторыю Віцебскага княства, авалодала гарадамі Друцк і Орша, і падышло да Віцебска. Сюды на дапамогу Вітаўту прыбыў таксама атрад са Смаленска. Выкарыстоўваючы магутныя ўмацаванні замкаў віцябляне мужна абараняліся, аднак, пасля працяглай аблогі, яны вымушаны былі выдаць Свідрыгайлу Вітаўту і прызнаць уладу апошняга.

# ЛІКВІДАЦЫЯ ВІЦЕБСКАГА КНЯСТВА. ВІЦЕБСКАЯ ЗЯМЛЯ Ў КАНЦЫ XIV – ПАЧАТКУ XVI СТ.

Вітаўт праводзіў палітыку цэнтралізацыі ўлады ў Вялікім княстве Літоўскім. У 1393 г., пасля перамогі над мяцежным Свідрыгайлам, ён канчаткова зліквідаваў Віцебскае ўдзельнае княства і пачаў кіраваць гэтай тэрыторыяй праз сваіх намеснікаў. Аднак у яе ўнутраным жыцці змянілася няшмат.

Удзельны князь быў заменены намеснікам вялікага князя літоўскага. У XV – XVI стст. пры віцебскім намесніку па-ранейшаму функцыянаваў штат чыноўнікаў былога ўдзельнага князя – гараднічыя, цівуны, лоўчыя, сакольнічыя, канюшыя і г.д. Усе гэтыя пасады маглі займаць толькі мясцовыя баяры. Намеснік распараджаўся вядзеннем гаспадаркі ў дзяржаўных маёнтках на тэрыторыі Віцебскай зямлі (у першай палове XVI ст. такімі маёнткамі былі Лужасна, Ілемніца, Любашкава, Сялец). Ён сачыў за выкананнем павіннасцей і зборам падаткаў, з'яўляўся кіраўніком мясцовага апалчэння, камендантам віцебскіх замкаў, вярхоўным суддзёю на тэрыторыі падпарадкаванай яму акругі. У пачатку XVI ст. за віцебскім намеснікам замацаваўся тытул ваяводы. У сувязі з гэтым Віцебская зямля атрымала статус ваяводства.

У XV – першай палове XVI ст. у Віцебску працягвала функцыянаваць веча. Яно паступова губляла свой ранейшы агульназемскі характар і ператваралася ў мясцовы соймік – з'езд землеўласнікаў. На вечы віцебскія баяры і мяшчане супольна вырашалі многія пытанні ўнутранага жыцця зямлі-ваяводства. Так, 8 лютага 1531 г. яны прынялі мясцовы закон аб умовах утрымання залежных сялян. Дзеянне гэтага закона распаўсюджвалася на ўсю тэрыторыю Віцебскай зямлі. 2 верасня 1551 г. віцебскія баяры і мяшчане прынялі чарговую пастанову аб становішчы залежных сялян Віцебшчыны. Заканадаўчая дзейнасць веча з'яўляецца яскравым сведчаннем захавання шырокай аўтаноміі Віцебскай зямлі ў складзе Вялікага княства Літоўскага.

Асноўным дакументам, які ў XV – першай палове XVI ст. рэгуляваў адносіны паміж насельніцтвам Віцебскай зямлі і вялікім князем літоўскім (яго намеснікам), быў Віцебскі земскі прывілей. Першы прывілей быў нададзены Віцебскай

зямлі Вітаўтам ў перыяд з 1393 па 1399 г. Ён з’явіўся кампрамісам паміж вярхоўнымі ўладамі краіны і пазбаўленым дзяржаўнасці ў выглядзе ўдзельнага княства віцебскім грамадствам. Прывілей быў гарантыяй захавання палітычна-прававых традыцый і рэгіянальнай аўтаноміі Віцебскай зямлі.

У прывілеі вялікі князь гарантаваў віцяблянам недатыкальнасць іх земляў і іншай маёмасці, звальненне ад мытных збораў і свабоду выбару месца жыхарства на тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага. Ён абавязаўся не караць віцяблян па даносе без правядзення следства і не выклікаць іх на суд па-за межы Віцебскай зямлі. Значна абмежавана была таксама ўлада намесніка-ваяводы. Ён мог судзіць віцяблян толькі ў Віцебску ў прысутнасці паўнапраўных прадстаўнікоў мясцовага насельніцтва. Віцябляне мелі права патрабаваць ад вялікага князя замены няўгоднага ім намесніка. Пакаранне асобаў, якія парушалі правілы вядзення гандлю, было пакінута ў кампетэнцыі саміх віцяблян.

У XV – першай палове XVI ст. Віцебскі земскі прывілей неаднаразова пацвярджалі іншыя вялікія князі. Да нашага часу дайшлі тэксты пацвярджэнняў дакумента 1503, 1509, 1547 гг. Нягледзячы на паступовую цэнтралізацыю ўлады ў Вялікім княстве Літоўскім і звязаную з гэтым ліквідацыю старажытных рэгіянальных асаблівасцей, у сярэдзіне XVI ст. асноўная маса пастаноў прывілея захоўвала сваю моц.

Галоўнай павіннасцю паўнапраўных прадстаўнікоў насельніцтва Віцебшчыны (баяр, мяшчан) было нясенне коннай службы ў войску Вялікага княства Літоўскага. Апалчэнне Віцебскай зямлі выступала пад асобным сцягам і славілася адвагай. У войнах XV – XVI стст. яно неаднаразова паказвала свае высокія баявыя якасці. 15 ліпеня 1410 г. віцебская харугва прыняла актыўны ўдзел у разгроме войск Тэўтонскага Ордэна пад Грунвальдам. Згодна з Перапісам войск Вялікага княства Літоўскага 1528 г. апалчэнне Віцебскай зямлі



Вялікі князь Свідрыгайла

налічвала больш за 90 цяжкаўзброеных конных воінаў.

Першыя тры дзесяцігоддзі XV ст. былі адносна мірным часам у гісторыі Беларускага Падзвіння. Аднак, пад час грамадзянскай вайны 1432–1439 гг. у Вялікім княстве Літоўскім Віцебская зямля ізноў апынулася ў зоне актыўных баявых дзеянняў.

У 1430 г., пасля смерці Вітаўта, вялікім князем стаў сын Альгерда – Свідрыгайла. Ён выступіў супраць уніі з Польшчай і пачаў прыцягваць да кіравання дзяржавай буйных землеўладальнікаў праваслаўнага веравызнання. Гэта выклікала вострае незадавальненне літоўскіх феадалаў, якія, у выніку дзяржаўнага перавароту, абвясцілі вялікім князем Жыгімонта Кейстутавіча. Свідрыгайла ўцёк у Полацк. У Вялікім княстве Літоўскім пачалася грамадзянская вайна, пад час якой усходнія землі дзяржавы, у тым ліку Віцебская, актыўна падтрымлівалі Свідрыгайлу.

У 1435 г. апалчэнне Віцебскай зямлі прымала ўдзел у паходзе аб'яднанага войска Свідрыгайлы і рыцараў Лівонскага Ордэна на Літву. Там, на рацэ Швянтоі пад Вількамірам, 1 верасня 1435 г. адбылася рашучая бітва, у якой войска Свідрыгайлы пацярпела цяжкае паражэнне ад літоўска-польскай арміі Жыгімонта Кейстутавіча. Толькі невялікая частка беларуска-украінскіх палкоў Свідрыгайлы здолела ўратавацца ўцёкамі.

У тым жа 1435 г. войска Жыгімонта Кейстутавіча асадзіла Віцебск. Аблога замкаў працягвалася 6 тыдняў, аднак была безвыніковай. Жыхары Віцебска мужна адбілі ўсе атакі непрыяцеля. Толькі ў 1437 г. пазбаўленыя падтрымкі віцябляне былі вымушаны здацца і прызнаць уладу Жыгімонта Кейстутавіча.

У 1440 г., пасля забойства Жыгімонта Кейстутавіча, вялікім князем літоўскім быў абраны Казімір Ягелончык. Супраць новага манарха ўспыхнула паўстанне ў Смаленску. Неўзабаве яно было падтрымана віцяблянамі і палачанамі. Казімір здолеў дастаткова хутка аднавіць вялікакняскую ўладу на ўсходзе дзяржавы, у тым ліку і на абшары Віцебшчыны. У перыяд з 1440 па 1447 г., каб супакоіць мясцовае насельніцтва, ён пацвердзіў Віцебскі земскі прывілей, чым прызнаў усе ранейшыя правы і вольнасці віцяблян.

Панаванне Казіміра Ягелончыка (1440–1492) было выключна спакойным перыядам у гісторыі Віцебскай зямлі. На доўгія шэсць дзесяцігоддзяў у Вялікім княстве Літоўскім усталяваўся мір.

# ГАРАДЫ І МЯСТЭЧКІ ВІЦЕБСКАГА ПАВЕТА Ў XVI – XVII СТСТ.



Віцебскі павет у канцы XVI ст. (аўтар карты М.Ф. Спірыдонаў)

У XVI – першай палове XVII ст. гарады Віцебскай зямлі ў сваім сацыяльна-палітычным развіцці значна адрозніваліся ад гарадскіх паселішчаў іншых земляў Вялікага княства Літоўскага. Галоўнай прычынай гэтага было захаванне аўтаномнага статуса рэгіёна ў складзе дзяржавы. На тэрыторыі Віцебскай зямлі працягвала дзейнічаць старажытнае мясцовае права. У XV – XVI стст. у гарадскіх паселішчах заходніх і цэнтральных раёнаў Вялікага княства Літоўскага шырока распаўсюдзілася запазычанае з Заходняй Еўропы Магдэбургскае права. У той жа час жыхары гарадоў Віцебшчыны працягвалі карыстацца правам мясцовага паходжання.

Найбуйнейшым асяродкам рамяства і гандлю на тэрыторыі ваяводства быў яго цэнтр – Віцебск. У XV – першай палове XVI ст. ён быў адзіным горадам на тэрыторыі сучаснага Віцебскага раёна. У Віцебску жылі і працавалі рамеснікі многіх спецыяльнасцей: кавалі, ювеліры, цесляры, бандары, токары, ганчары, шаўцы, краўцы, муляры і інш. Тут адбываліся таргі і кірмашы, на якія прыязджалі як сяляне з навакольных вёсак, так і купцы з іншых краін. Віцябляне падтрымлівалі цесныя гандлёвыя кантакты з купцамі многіх гарадоў Вялікага княства Літоўскага, Прыбалтыкі, Расійскай дзяржавы. У Рыгу па Дзвіне вывозіліся воск, футра, прадукты лясной і сельскай гаспадаркі, з Рыгі ў Віцебск завозіліся соль, селядцы, тканіны, віно, металічныя вырабы. На рынкі гарадоў Расійскай дзяржавы віцябляне пастаўлялі алей, хмель, пяньку і тавары, спецыяльна закупленыя ў рыжскіх купцоў на перапродаж. З Расіі ўвозілася галоўным чынам футра. У 1441 г. Казімір Ягелончык узгадаў

Віцебск сярод 15 найбуйнейшых гарадоў Вялікага княства Літоўскага. У сярэдзіне XVII ст. у Віцебску налічвалася каля 10 тысяч жыхароў.

У 60-я гг. XVI ст. ва ўсходняй частцы Віцебскага ваяводства ўзнік яшчэ адзін горад – Сураж. Ён адносіцца да нешматлікай групы гарадоў Беларусі, якія паўсталі не ў выніку развіцця рамяства і гандлю, але дзякуючы вайне. Месца, на якім размешчаны Сураж, у гады Лівонскай вайны (1558–1583 гг.) мела важнае стратэгічнае значэнне. З паўднёвага боку тут упадае ў Дзвіну рака Каспля. За некалькі кіламетраў на ўсход ад горада Дзвіна прымае ў сабе яшчэ адзін прыток – Усвячу. Панаванне над гэтым месцам дазваляла кантраляваць значныя адрэзкі трох судаходных рэк – Дзвіны, Каспліі Усвячы. Не пазней 1560 г. віцебскі ваявода Стэфан Збаражскі збудаваў тут замак, які быў названы Суражам. Ужо ў 1560 г. пад яго сценамі існавала гандлёва-рамеснае паселішча. У XVI – XVIII стст. памежны Сураж так і не стаў буйным населеным пунктам. У 1772 г. тут пражывала ўсяго каля 600 чалавек. У XVII – XVIII стст. мястэчкамі – дробнымі паселішчамі гарадскога тыпу – былі Янавічы, Глазамічы і Княжыца.



Фрагмент карты Полацкага княства М. Пахалавіцкага (1579)

Да сярэдзіны XVI ст. віцебскія мяшчане разам з іншымі сацыяльнымі групамі асабіста вольнага насельніцтва ваяводства карысталіся мясцовым земскім правам. Яго асноўныя нормы былі змешчаны ў Віцебскім земскім прывілеі. Працэс фарміравання шляхецкага і мяшчанскага саслоўяў на землях рэгіёна паступова прывёў да падзела некалі агульнага для ўсіх мясцовага права на шляхецкае і гарадское. У сярэдзіне XVI ст. на аснове віцебскага земскага права была створана адзіная ў сваім родзе на абшары Вялікага княства Літоўскага арыгінальная мясцовая сістэма саслоўных правоў мяшчанства – віцебскае гарадское права. 6 чэрвеня 1561 г. віцебскія мяшчане атрымалі свой першы гарадскі прывілей.

Віцебскае гарадское права зраўняла мяшчан у правах і абавязках са шляхтай Віцебскага ваяводства. Галоўнай павіннасцю мяшчан па віцебскім праве было нясенне коннай вайсковай служ-



Герб г. Віцебска (1597)

бы. Ва ўмовах несупынных канфліктаў Вялікага княства Літоўскага з Расійскай дзяржавай на неспакойным памежжы такая мадэль гарадскога права была значна больш прыдатнай, чым Магдэбургская. У 70–80-я гг. XVI ст. віцебскае права было распаўсюджана на шэраг іншых гарадоў Беларускага Падзвіння. 5 чэрвеня 1570 г. гарадскія правы па ўзору Віцебска былі нададзены Суражу.

Асаблівасцю сацыяльна-палітычнага жыцця Віцебска апошняй чвэрці XVI ст. быў падзел мяшчанства на дзве групы – конных і паспалітых. "Коннымі" называліся заможныя мяшчане, якія валодалі зямельнымі маёнткамі на тэрыторыі ваяводства і неслі вайсковую службу разам са шляхтай. У 1576 г. гэта сацыяльная група выстаўляла ў войска Вялікага княства Літоўскага каля 100 конных воінаў. Тэрмін "паспалітыя" ўжываўся ў адносінах да ўсіх астатніх, простых мяшчан. У 1592–1593 гг. паміж гэтымі групамі жыхароў Віцебска ўзнік востры канфлікт. "Паспалітыя" паспрабавалі адхіліць багатых мяшчан-землеўласнікаў ад удзелу ў кіраванні горадам, але "конныя" пры падтрымцы віцебскага ваяводы Мікалая Сапегі здолелі захаваць свае ранейшыя пазіцыі.

Пасля заканчэння канфлікту 1592–1593 гг. адносіны паміж коннымі і паспалітымі мяшчанамі працягвалі заставацца вельмі напружанымі. Узніклі вялікія цяжкасці ў кіраванні горадам. Выхадам з гэтай складанай сітуацыі стала наданне Віцебску агульнапрынятага ў гарадах Вялікага княства Літоўскага Магдэбургскага права. З адпаведнай просьбай да ўладаў дзяржавы звярнуліся самі віцебскія мяшчане. 17 сакавіка 1597 г. Віцебск атрымаў ад Жыгімонта III Вазы прывілей на Магдэбургскае права.

12 лістапада 1623 г. праваслаўныя мяшчане Віцебска забілі полацкага уніяцкага архіепіскапа Іясафата Кунцэвіча, які прымушаў іх да пераходу ва уніяцтва. За гэта горад быў пазбаўлены Магдэбургскага права, а гарадская ратуша разбурана. 98 найбольш актыўных удзельнікаў паўстання былі прыгавораны да пакарання смерцю. Званы віцебскіх цэркваў і ратушы, якія заклікалі народ да паўстання, таксама апынуліся ў ліку пакараных. Па загадзе каралеўскіх камісараў з іх адлілі адзін вялізны звон з надпісам у памяць аб Кунцэвічу. Дзеянне Магдэбургскага права ў Віцебску было адноўлена толькі 28 верасня 1641 г.

# ВОЙНЫ XVI – ПАЧАТКУ XVIII СТ. І ЛЁС КРАЮ

У першай палове XVI ст. Віцебская зямля ізноў уступіла ў паласу частых ваенных ліхалеццяў. Актыўныя баявыя дзеянні на абшары нашага краю вяліся ў часе войн Вялікага княства Літоўскага з Расійскай дзяржавай 1500–1503, 1507–1508, 1512–1522 і 1534–1537 гг. Атрады расійскіх ваявод асаджалі Віцебск і спусташалі яго наваколлі ў 1502, 1513, 1515, 1516, 1518, 1535, 1536 гг., аднак на працягу ўсяго XVI ст. віцебскія замкі ні разу не былі імі здабыты.



Фрагмент карты з выявай Віцебскага павету (XVIII ст.)

Цяжкія выпрабаванні выпалі на долю Віцебскай зямлі ў гады Лівонскай вайны (1558–1583). Войскі расійскага цара Івана IV тройчы безвынікова асаджалі Віцебск у 1562, 1563, 1568 гг. Некалькі разоў іх нападам падвяргаўся таксама Сураж. Віцябляне ў сваю чаргу рабілі спусташальныя набегі на памежныя раёны Расійскай дзяржавы. У выніку пастаянных баявых дзеянняў уся паўночная частка Віцебскага ваяводства практычна абязлюдзела. Ацалелыя жыхары вёсак, размешчаных на поўнач ад Дзвіны, былі вымушаны ўцякаць пад ахову ўмацаванняў Віцебска і Суража. Доўгачаканы спакой прыйшоў на Віцебшчыну толькі пасля пераможных паходаў войск Рэчы Паспалітай пад кіраўніцтвам Стэфана Баторыя на Полацк (1579 г.) і Вялікія Лукі (1580 г.).

Значныя страты і разбурэнні прынесла Віцебшчыне вайна Расійскай дзяржавы з Рэччу Паспалітай 1654–1667 гг. У сярэдзіне жніўня 1654 г. да Віцебска падышло расійскае войска ваяводы В. Шарамецьева і атрад украінскіх казакаў В. Залатарэнкі. Пачалася 14-тыднёвая аблога горада. Віцябляне актыўна абараняліся і часта рабілі вылазкі. У верасні войска В.



Замчышча ў Суражы (сучасны выгляд)

Шарамецьева спрабавала штурмам захапіць горад, аднак віцябляне адбілі ўсе атакі нападаючых. У кастрычніку колькасць асаджаючых Віцебск расійскіх войск дасягнула 20 тысяч чалавек. У горадзе пачаўся голад, востра адчуваўся недахоп пораху. 2 снежня 1654 г. у выніку чарговага штурму Віцебск быў захоплены і спалены. У той жа дзень перад расійскімі войскамі капітуляваў гарнізон Суража. Насельніцтва Віцебска было часткова знішчана пад час аблогі і штурму, а часткова – вывезена ў Расію. Акупацыя краю працягвалася 13 гадоў. У 1667 г. па ўмовах Андрусаўскага перамір'я Віцебск быў перададзены Рэчы Паспалітай.



Герб г. Сураж (XVI ст.)

Вайна 1654–1667 гг. мела катастрафічныя наступствы для эканомікі і дэмаграфіі рэгіёна. Калі ў пачатку 50-х гг. XVII ст. на землях Віцебскага павета пражывала больш за 80 тысяч чалавек, то ў 1667 г. на гэтай жа тэрыторыі засталося ўсяго каля 31 тысячы жыхароў. Такім чынам, за 13 гадоў вайны страты насельніцтва склалі больш за 61% ад яго даваеннай колькасці.

У час Паўночнай вайны (1700–1721 гг.) Віцебск аказаў падтрымку польскаму каралю С. Ляшчынскаму, саюзніку шведскага караля Карла XII. Віцебскія мяшчане перадавалі яму значныя сумы грошаў. За гэта 28 верасня 1708 г. па загадзе расійскага цара Пятра I карны атрад на чале з капітанам Салаўёвым дашчэнту спаліў горад. Адкупіцца ўдалося толькі жыхарам Задзвінскага пасада.

Пастаянныя ваенныя разбурэнні XVI – XVIII стст. прывodзілі да заняпаду эканомікі рэгіёна. Значныя сілы і сродкі неабходна было ўвесь час накіроўваць на аднаўленне разбуранай гаспадаркі.

# НАШ КРАЙ У КАНЦЫ XVIII – ПАЧАТКУ XX СТ.



## УКЛЮЧЭННЕ Ў СКЛАД РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ

Тэрыторыя Віцебскага павета была далучана да Расійскай імперыі ў выніку першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772 г.). З гэтага часу павет уваходзіў у склад Пскоўскай (з 1772 г.), Полацкай (з 1776 г.), Беларускай (з 1796 г.), Віцебскай (з 1802 г.) губерняў. З увядзеннем у Расіі новага адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу тэрыторыя Віцебскага павета была значна паменшана: з яго вылучаны Веліжскі, Гарадоцкі і Суражскі паветы. У склад Віцебскага павета ўваходзілі толькі сельскія пасяленні: 5 слабод, 9 цвінтароў, 14 сёл, 157 сяльцоў, 109 вёсак. Насельніцтва павета налічвала ў 1808 г. 38 627 чалавек.

Жыхары павета на працягу месяца пасля далучэння да Расіі прыводзілася да прысягі. Прыгонных сялян запісалі за новай дзяржавай уласныя паны з паручыцельствам духавенства. Асобам, якія не жадалі прысягаць новай уладзе, было прапанавана ў трохмесячны тэрмін выехаць за мяжу.

На беларускіх землях рускія ўлады праводзілі мерапрыемствы, скіраваныя на ўключэнне іх у агульнарасійскую гаспадарчую сістэму. Паступова ўводзіліся расійская грашовая сістэма і меры вагі. Сяляне ў 1772 г. былі на паўгода вызвалены ад падаткаў – царскі ўрад такім чынам хацеў схіліць насельніцтва беларускіх зямель да прызнання новай улады.

Становішча сялян пагоршылася. Была ўведзена невядомая дагэтуль рэкруцкая павіннасць. Павялічылася колькасць падаткаў і іх памеры. Згодна ведамасці “Аб прыбытковасці дзяржаўных маёнткаў Віцебскага павета”, складзенай у лістападзе 1781 г., на працягу года 1187 чалавек заплаціла ўраду прамых падаткаў 1386 рублёў (ці 1

р. 18 кап. на душу). Гэта вельмі значная сума! Становішча панскіх сялян было яшчэ горшым. Па расійскіх законах памешчыкі маглі прадаваць сваіх прыгонных без зямлі, ссылаць на катаргу. Часам назіралася “дзікая свістапляска панскіх інтарэсаў, жудасная драма мужыцкай душы”. Так, у 80-х гадах XVIII ст. абшарнік Віцебскага павета Казімір Жаба і яго брат Францішак дзялілі паміж сабой спадчыну. У выніку, Францішак атрымаў “па закону” 40 дзяцей і 52 дарослых мужчыны. Жанчын жа ён не ўзяў. У выніку сем’і былі раздзелены, дзеці і маці аказаліся ў розных памешчыкаў. Прыгонныя сяляне не мелі законнай магчымасці абараняць свае правы. Любая скарга селяніна на памешчыка кваліфікавалася як ілжывы данос і каралася высылкай у Сібір.

Не дзіўна, што сяляне былі незадаволены сваім становішчам. Успыхвалі стыхійныя пратэсты, бунты. У 1797 г. на Віцебшчыне адбыліся масавыя антыфеадальныя выступленні сялян. Гэта было выклікана раздачай царскім урадам былых дзяржаўных маёнткаў – староставаў – у прыватнае ўладанне і пераводам сялян з чыншу на паншчыну. Пачаліся выступленні ў студзені ў маёнтках Суражскага і Віцебскага паветаў. Найбольшай напружанасці яны дасягнулі ў лютым. Асабліва ўпартымі былі выступленні ў маёнтках Прыбыткова, Верач, Загараны, Вышадкі (Суражскі павет), а таксама Гасцілава (Віцебскі павет). Сяляне адмаўляліся выконваць паншчыну, збіраліся на сходы, выбіралі хадакоў да цара з просьбамі вярнуць іх у разрад дзяржаўных, выдаліць аканомаў і арандатараў як жорсткіх прыгнятальнікаў. У некаторых вёсках пры спробе арыштаваць кіраўнікоў паўстання адбыліся сутычкі з прадстаўнікамі ўлад, паліцыяй. Асцерагаючыся расправы, многія ўладальнікі маёнткаў выехалі ў іншыя мясцовасці. Для падаўлення выступленняў былі накіраваны вайсковыя каманды. Многія ініцыятары выступленняў і хадакі былі арыштаваны і паводле прыгавору спецыяльна ўтворанай судовай камісіяй пакараны бізунамі.

Такім чынам, вынікі далучэння беларускіх зямель да Расійскай імперыі былі супярэчлівымі. З аднаго боку, адбылося ўключэнне іх у агульнарасійскую гаспадарчую сістэму, што дало імпульс эканамічнаму развіццю. З другога боку, сацыяльнае становішча беларускага сялянства – асноўнай катэгорыі насельніцтва – ў асноўным пагоршылася.

## ПАДЗЕІ ВАЙНЫ 1812 ГОДА

Вялікія цяжкасці выпалі на долю нашага краю ў час Айчыннай вайны 1812 г. Французскія войскі сустрэлі на Віцебшчыне ўпартае супраціўленне. Баі тут вяла I руская армія пад камандаваннем М. Барклая дэ Толі. Рускія войскі адступалі, аднак без бою не здаваліся. Уступіўшы ў ліпені 1812 г. у Віцебск, М. Барклай выслаў насустрач арміі французаў 4-ы пяхотны корпус графа А.І. Остэрмана-Талстога, каб часова затрымаць яе.

Першая сутычка рускіх з французамі адбылася ў дванаццаці вярстах ад Віцебска, пад Астроўна. Рускія гусары змялі авангард французскай кавалерыі і пачалі даганяць яе, але ў хуткім часе былі адкінуты варожай коннай брыгадай. У гэты час падышлі асноўныя сілы А.І. Остэрмана-Талстога і завязаўся жорсткі бой з конніцай Мюрата. Ён працягваўся з пераменным поспехам увесь дзень 13 ліпеня. Дзевяцітысячнаму войску А.І. Остэрмана-Талстога супрацьстаяла 20 тысяч французаў. Рускі атрад панёс цяжкія страты, аднак выканаў загад і затрымаў праціўніка.

На досвітку наступнага дня на дапамогу да вымушанага адступіць А.І. Остэрмана-Талстога падышла пяхотная дывізія П.П. Канаўніцына. Новы бой завязаўся ўжо ля вёскі Кукавячына. У 3 гадзіны дня, калі войскі Мюрата і Багарнэ пацяснілі П.П. Канаўніцына, да месца бітвы прыбыў сам Напалеон. Ён аддаў загад праследаваць адступаючых. Марудна, з баямі, рускія войскі працягвалі сваё адступленне да самай ночы. Баі пад Астроўна і Кукавячына працягваліся 2 дні. 15 ліпеня наступіла зацішша. Пасля баёў пад Астроўна і Кукавячына рускія войскі адышлі да Віцебска. Армія Напалеона страціла за гэтыя дні 3700 чалавек. З рускага боку было забіта 827 чалавек, паранена 1855, без вестак прапалі 1082 чалавекі.

Напалеон разлічваў, што пад Віцебскам рускія дадуць генеральную бітву, якая на яго думку вырашыць лёс вайны. Аднак, рускія войскі пакінулі Віцебск і рушылі ў напрамку Смаленска на злучэнне з II арміяй, якой камандаваў П. Баграціён. Напалеон вырашыў прыпыніць наступленне.

З 16 ліпеня па 1 жніўня 1812 г. французскі імператар знаходзіўся ў Віцебску. Галоўны план Напалеона – разграміць рускую армію на Беларусі не быў выкананы. У гэтых умовах ён меў намер пачаць перагаворы з рускім імператарам. Аднак Аляксандр I не збіраўся весці перамовы, а ў французскім войску, у складзе якога былі прадстаўнікі заваяваных краін, пачала зніжацца дысцыпліна, пашыралася марадзёрства. Напалеон разумеў, што толькі новыя перамогі могуць выратаваць армію ад дэмаралізацыі.

У жніўні 1812 г. адбыліся баі рускіх з французамі спачатку пад Смаленскам, а потым на Барадзінскім полі. У Барадзінскай бітве прымалі ўдзел нашы землякі – жыхары Віцебскага павета. У складзе 3-й пяхотнай дывізіі чатыры палкі былі сфарміраваны з жыхароў нашага краю. Яны стаялі на самых небяспечных участках, дзе праціўнік наносіў галоўны ўдар.



Помнік падзеям вайны 1812 г. у в. Вароны

Пасля таго як рускія войскі пакінулі Маскву, яна была занятая французамі. Разбураная, спаленая сталіца Расіі стала пасткай для Напалеона. З мэтай захаваць армію, французскі імператар у пачатку кастрычніка 1812 г. вымушаны быў адступаць з Масквы на Смаленск па спустошанай мясцовасці.

Вызваляць Віцебск было даручана генералу П.Х. Вітгенштэйну. Да горада ён накіраваў авангард генерала Гарпэ, які прыбыў у Старое Сяло і рушыў да Віцебска па правым беразе Дзвіны. У той час па левым беразе ішлі два эскадроны Ямбургскага уланскага палка пад камандаваннем падпалкоўніка Сталыпіна. На досвітку 26 кастрычніка абодва атрады падышлі да горада і напалі на французскі гарнізон.

Заспеты знянацку, французскі каравул ледзь паспеў перабегчы на левы бок Дзвіны і запаліць мост. Тады рускі эскадрон літаральна на плячах ворага кінуўся да моста,

пачаўшы абстрэл левага берага Дзвіны. Пад прыкрыццем агню да месца бою падаспеў Гарпэ з егерскім палком. Карцеч прымусіла ворага ачысціць бліжэйшыя будынкі левага берага. У выніку ахвотнікі-егеры пабеглі па масту і пагналі французаў па вуліцах горада. Французы зрабілі спробу аказаць супраціўленне і на вуліцах завязаўся кароткі бой.

Разумеючы, што ўтрымаць горад у сваіх руках не ўдасца, французскі камендант Віцебска генерал Пушэ загадаў рухацца ў напрамку Смаленска, дзе знаходзіліся асноўныя сілы адступаючай арміі Напалеона.

Увайшоўшы ў Віцебск, атрад падпалкоўніка Сталыпіна стаў праследаваць непрыяцеля. За 10 кіламетраў ад Віцебска, у вёсцы Вароны, французы заўважылі пагоню. Пасля кароткай схваткі каля 400 французаў здаліся ў палон. Пераможцам дасталіся трафеі – 2 гарматы і шмат вайсковага рыштунку. У гонар гэтай падзеі у 1912 г. у вёсцы Вароны быў устаноўлены помнік, на якім зроблены надпіс: “Тут ямбургскія уланы 26 кастрычніка 1812 г. пад камандаваннем свайго слаўнага падпалкоўніка Сталыпіна знішчылі карэ французскай пяхоты і ўзялі ў палон генерала Пушэ і яго артылерыю”.



Царква Узвіжання Крыжа ў в. Лужасна

Вайна пакінула на Віцебшчыне вялікія спусташэнні. Многія гарады і вёскі былі разбураны і знішчаны. Рэзка скарацілася колькасць насельніцтва, прыйшла ў заняпад сельская гаспадарка, паменшылася пагалоўе жывёлы. У 1815 г. у Лужасне была пабудавана і асвечана мураваная царква Узвіжання Крыжа Гасподняга. Адпаведна з паданнямі, яе пабудавала ў адпаведнасці з даным абетам мясцовая памешчыца (верагодна Рахіль Антонаўна Макавецкая) за тое, што ў час вайны яе сваякі засталіся жывыя.

# САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАЕ ЖЫЦЦЁ Ў ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XIX СТ.



Суражскі павет у 1-й пал. – сяр. XIX ст. (аўтар В.Л. Насевіч)

У першай палове XIX ст. аснову эканомікі Віцебскага і Суражскага паветаў складала сельская гаспадарка. Вялікія зямельныя ўгоддзі належалі памешчыкам і дзяржаве. Як у памешчыцкіх, так і ў дзяржаўных маёнтках пераважала паншчынная сістэма гаспадарання. Становішча прыгонных і дзяржаўных сялян мала адрознівалася, бо дзяржаўныя маёнткі ў большасці здаваліся ў арэнду, а арандатары імкнуліся да хуткага ўзбагачэння і ўзмацнялі эксплуатацыю.

Значную частку прыбыткаў землеўладальнікам прыносіла земляробства. Віцебскія памешчыкі ў першай палове XIX ст. усё больш прыстасоўваліся да патрабаванняў рынку. Найбольш прыбытковымі таварнымі культурамі станавіліся жыта і бульба, якія служылі сыравінай для вінакурэння. Пашырыліся пасевы ільну, што ішоў на экспарт. У шэрагу маёнткаў сталі выкарыстоўвацца сельскагаспадарчыя машыны. Прапагандай перадавых метадаў земляробства і жывёлагадоўлі займалася Беларускае вольнае эканамічнае таварыства, што існавала ў Віцебску з 1826 па 1841 г.

Сяляне знаходзіліся ў цяжкім матэрыяльным становішчы. Сялянскі надзел складаў у сярэднім 8 – 10 дзесяцін на цяглую гаспадарку, што пры нізкай культуры земляробства і вялікай сям'і было недастаткова. Сяляне выкарыстоўвалі традыцыйныя прылады працы: саху, драўляную барану. Угнаенне ўносілася ў абмежаванай колькасці з-за недахопу жывёлы. Зерне давала невялікі ўраджай, а часам земляроб толькі вяртаў пасеянае.

Частымі былі неўраджаі. Пастаянна існавала праблема голаду. Сенатар (і знакаміты рускі паэт) Гаўрыла Раманавіч Дзяржавін наведаў Віцебшчыну ў чэрвені 1800 г. з інспекцыйнай паездкай па прадпісанні імператара Паўла I. 1798 і 1799 гг. выдаліся неўраджайнымі. Г.Р. Дзяржавін павінен быў высвет-

ліць маштабы голаду і становішча сялян. На шляху ў Віцебск сенатар заходзіў ў сялянскія хаты ў прыдарожных паселішчах, дзе ўбачыў "настоящий образ жизни поселян. Лучшие из них едят пушной хлеб пополам с мякиной, доставая и тот покупкой и займом со дня на день на дневное пропитание, а другие употребляют пятую только долю ржи, смешивая с четырьмя частями мякины; иные же и того не имеют, а едят вареный щавель или хлебают из отрубей и выжимок вареную, по их названию, кислину, или самую жидкую кисельную сулу. От таковой пищи все вообще вялы, тощи и бледны, как мертвецы". Неўраджаі паўтараліся і ў далейшым. Так за 30 гадоў (з 1820 да 1850 гг.) у Віцебскай і Магілёўскай губернях было 10 неўраджаяў.

У галодныя гады сялян ратавала бульба, пасевы якой імкліва пашыраліся ў першай палове XIX ст. Напачатку сяляне часта з недаверам ставіліся да новай культуры. Цікавая гісторыя здарылася ў 1817 г. у маёнтку Цялятнікі на Віцебшчыне. Гаспадар маёнтка генерал Р. Гернгрос пачаў прымушаць сялян, каб яны садзілі на палях бульбу. Аднак бульба не расла. Высветлілася, што пасля пасадкі сяляне яе выкопвалі і прадавалі ў карчме, бо лічылі "д'ябальскім плодам". Даведаўшыся пра гэта, гаспадар маёнтка загадаў сялянам разразаць кожную бульбіну на чатыры часткі, каб крыжападобным надрэзам пазбавіцца ад "д'ябальскага ўплыву". Сяляне перасталі выбіраць парэзаную бульбу з зямлі, а ў хуткім часе зразумелі яе карысць.

Урад імкнуўся палепшыць становішча сялян і павялічыць прыбытковасць дзяржаўных маёнткаў. У 1830–1850-я гг. была праведзена рэформа дзяржаўнай вёскі, ініцыятарам якой выступіў міністр дзяржаўных маёмасцей П.Д. Кісялёў. У ходзе рэформы была ліквідавана сістэма здачы дзяржаўных сялян у арэнду, павялічыліся сялянскія надзелы і зменшыліся памеры павіннасцей, паншчына была заменена чыншам. Павысіўся прававы статус дзяржаўных сялян. Праводзілася палітыка "апякунства" над сялянамі. Для дапамогі ім у неўраджайныя гады ў некаторых маёнтках ствараліся "збожжазапасныя магазіны", але ў большасці выпадкаў іх дапамогі было недастаткова, каб пракарміцца людзям і забяспечыць пасеў. Такія магазіны існавалі ў 1840-я гг. у вёсках Андронавічы, Паляі, Вялікія Лётцы, Мазалава, Котава, Мішуткі, Пышнякі і інш.

Была здзейснена спроба аслабіць прыгнёт у памешчыцкай вёсцы праз увядзенне ў 1840–1850-я гг. абавязковых інвентароў, якія былі заклікаеы ўрэгуляваць павіннасці сялян. Аднак інвентарная рэформа сустрэла супраціўленне з боку памешчыкаў.

Да 1857 г., калі распачалася падрыхтоўка адмены прыгону, абавязковыя інвентары былі ўведзены прыкладна ў дзесятай частцы маёнткаў Віцебскай губерні.

Прамысловасць Прыдзвіння была скіравана на перапрацоўку сельскагаспадарчай сыравіны. Памешчыкі стваралі ў маёнтках прадпрыемствы, на якіх працавалі прыгонныя сяляне (вотчынныя мануфактуры). З часоў Рэчы Паспалітай пераважалі мукамольная і вінакурная вытворчасць. Вадзяныя млыны існавалі ў вёсках Лужасна, Мазалава, Абухава, Бялынавічы, Вялікае Любашкова (цяпер не існуе) і шэрагу іншых. Ветракі былі ў вёсках Заронава, Пляшкі і інш. У многіх вёсках, у тым ліку ў Бялынавічах, Валасове, Глазамічах, Сялютах, Доўжы, Заронаве, працавалі вінакурні. Многія памешчыкі будавалі ў сваіх маёнтках лесапільныя прадпрыемствы. Развівалася рамесная вытворчасць.

Існавалі сялянскія хатнія промыслы: кавальства, шавецтва, кравецтва і інш. Яны мелі сезонны характар. З дазволу або па патрабаванню памешчыка сяляне скіроўваліся ў адыходныя промыслы. Напрыклад, мужчыны вёскі Лужасна традыцыйна, яшчэ з XVI ст., былі плытагонамі. Сплаўлялі лес і жыхары вёсак Вялікія Лётцы, Мазалава, Хамякова, Шульцава. Падобны промысел быў развіты таксама на Суражчыне.

Пасля далучэння да Расійскай імперыі праводзіліся работы па паляпшэнні шляхоў зносін, што спрыяла ўключэнню гаспадаркі Віцебшчыны ў агульнарасійскі рынак. Шляхі-гасцінцы звязалі Віцебск з іншымі гарадамі імперыі. Важную ролю адыгрывалі водныя шляхі, у першую чаргу Заходняя Дзвіна.

Традыцыйнай формай мясцовага гандлю быў кірмаш, які звычайна праводзіўся ў дзень храмавага свята вёскі. Бывала, што кірмашы збіраліся ў вёсцы два разы на год. Напрыклад, у вёсцы Курына гэта было 1 верасня і 1 кастрычніка, у вёсцы Старое Сяло – у дзень Троіцы і 8 верасня. Вялікія кірмашы праходзілі два разы на год у Янавічах. Жыхары вёсак, блізкіх да Віцебска, збывалі лішкі сваёй прадукцыі, а таксама яйкі і ягады ў губернскім цэнтры.

Такім чынам, у першай палове XIX ст. прыгонніцкая гаспадарка выявіла сваю неэфектыўнасць, у эканоміку ўсё больш пранікалі капіталістычныя элементы. Многія памешчыкі паступова прыстасоўваліся да ўмоў рынку. Сяляне знаходзіліся ў цяжкім матэрыяльным становішчы. Дзяржава рабіла спробы палепшыць становішча сялянства пры захаванні феадальна-прыгонніцкай сістэмы. Наспела неабходнасць буржуазных рэформ.

## ПАЎСТАННЕ 1863 – 1864 ГГ.

Значнай падзеяй еўрапейскай гісторыі XIX ст. стала нацыянальна-вызваленчае паўстанне 1863 – 1864 гг. у Польшчы, Літве і Беларусі. Яно закранула і тэрыторыю Віцебскай губерні, у тым ліку мясцовасці ў наваколлях Віцебска. Але праявы паўстання мелі тут свае асаблівасці. Яно не набыло тых маштабаў, што на Віленшчыне і Гродзеншчыне.

У першыя месяцы ад пачатку паўстання сітуацыя ў Віцебскай губерні была адносна спакойнай. Шляхецкая моладзь выказвала патрыятычныя пачуцці, што выяўлялася ў спяванні гімнаў, нашэнні недазволеных старапольскіх касцюмаў і касцёльных богаслужэннях за вызваленне Польшчы.

У красавіку 1863 г. невялікая група віцебскай моладзі шляхецкага паходжання здзейсніла спробу далучыцца да паўстання. У выправе ўдзельнічалі беларускі паэт Элегі Францішак Карафа-Корбут (Ялегі Пранціш Вуль), яго малодшы брат Вільгельм, Аляксандр Васілеўскі, Станіслаў Гелваноўскі, Анастасій Казлоўскі, Генрых Круковіч, Сцяпан Стэфаноўскі, Баляслаў Улінскі, Баляслаў Шкленік. Выступленне было прызначана на св. Юр’я – 23 красавіка па старым стылі. Напярэдадні маладыя людзі паасобна пакінулі горад па Магілёўскай шашы і сустрэліся ўвечары ў лесе, вярстах у 5-і ад станцыі Дыманова, дзе да іх далучылася яшчэ некалькі чалавек. Пры сабе паўстанцы мелі паляўнічыя стрэльбы і рыштунак. Відавочна, арганізатарам і кіраўніком атрада быў беларускі пісьменнік Арцём Вярыга-Дарэўскі, які валодаў маёнткам Стайкі ў Віцебскім павеце. Але праз некалькі дзён паўстанцы былі захоплены ўзброенымі сялянамі і перададзены ў рукі ўладаў.

Дакладна невядома, ці вёў атрад баявыя дзеянні. Дакументы сведчаць, што ў ваколіцах Віцебска менавіта ў канцы красавіка 1863 г. мела месца прынамсі адна сутычка паўстанцаў з войскамі.

Пасля сутыкнення цяжка паранены паўстанец, чыноўнік губернскага праўлення, быў схоплены і дастаўлены ў віцебскую бальніцу, дзе памёр. Яго пахаванне ператварылася ў маўклівую маніфестацыю. Па сведчаннях расійкага афіцэра, капітана Варапая, узнікла “пытанне ў тым як яго хаваць: ці з ушанаваннямі, ці як ворага Айчыны… Час пахавання пастаяння перамянялі, нарэшце вырашылі пахаваць яго ў

5 гадзін вечара, не выносячы цела ў касцёл і без асаблівых цырымоній. У асаблівасці ж было забаронена гаварыць якія б там ні было прамовы. На хаўтурах сабралася больш за тры тысячы чалавек, гэта значыць амаль усё польскае (каталіцкае – аўт.) народанасельніцтва горада, не выключаючы і малых дзяцей. Жанчыны былі ўсе ў жалобе і выказвалі вялікае спачуванне. Цырымонія адбылася надзвычай ціха... Натоўп народу рухаўся, нібы цені, знаёмыя пры сустрэчы моўчкі паціскалі адзін аднаму рукі, і нават слова прывітання не чутно было, цяжкія сумота і панурасць былі агульным станам".

Абсалютную большасць паўстанцаў на тэрыторыі Віцебскай губерні склалі прадстаўнікі шляхецкага саслоўя. Сялян сярод паўстанцаў налічвалася толькі 7 %, галоўным чынам, за кошт жыхароў Дынабургскага, Дрысенскага і Лепельскага паветаў. Сялянства Віцебскага павета, у большасці праваслаўнае, не падтрымала паўстанне. Сялянам быў уласцівы т.зв. "наіўны манархізм", вера ў добрага цара. Хаця многія былі незадаволены ўмовамі аграрнай рэформы 1861 г., сяляне чакалі паляпшэння свайго становішча ад урада. Стаўленне да паноў, якія стагоддзямі выступалі ў ролі прыгнятальнікаў, было выразна адмоўнае. Гэта ўдала скарысталі прадстаўнікі царскай адміністрацыі. Сялянам тлумачылі, што паўстанне ўзнялі супраць цара-бацюхны польскія паны каб вярнуць прыгон. Згодна з урадавым распараджэннем, сельскія абшчыны павінны былі ствараць каравулы для затрымкі "мяцежнікаў", за што абяцалася ўзнагарода. Таму сяляне ў асноўным дапамагалі ўраду змагацца супраць паўстанцаў. Вясной 1863 г. у Віцебску працягваліся арышты памешчыкаў і чыноўнікаў, якіх прыводзілі мясцовыя сяляне, не разбіраючы "паляк ён ці рускі", па падазрэнні ў антыўрадавых дзеяннях. Амаль усе затрыманыя пасля праверкі вызваляліся.

Асобы, прыналежнасць якіх да паўстання была больш-менш даказана, жорстка караліся. Так, бязлітасны прысуд – 8 гадоў катаргі – быў вынесены больш чым 60-гадоваму Маўрыкію Карафа-Корбуту, бацьку згаданых вышэй Элегія і Вільгельма, які быў прызнаны адным з завадатараў "мецяжу". На 8 гадоў катаржных работ на заводах быў асуджаны і А. Вярыга-Дарэўскі, "як дзейны ўдзельнік мецяжу, які меў шкодны ўплыў на іншых". Сябры атрада, які ён узначальваў, былі пазбаўлены дваранскай годнасці і ўсіх маёмасных правоў і пакараны высылкай на катаржныя работы або на пасяленне ў Сібір. На пасяленне былі сасланы, у прыватнасці, браты Карафа-Корбуты.

Да следства прыцягваліся і жанчыны. Антаніна Іванаўна Сабалеўская і Ганна Іванаўна Талвінская, маці і жонка Элегія Карафа-Корбута, урэшце былі выпушчаны на парукі. Ім дазволілі застацца на радзіме. Але жанчыны паследавалі ў Сібір за ссыльнымі роднымі. Багуміла Вайцяхоўская панесла адказнасць за захаванне папер бунтарскага зместу. З яе і яе бацькі спагналі штраф, іх узялі пад нагляд паліцыі.

Такім чынам, з наяўных звестак можна меркаваць, што паўстанне на тэрыторыі Віцебскага павета не набыло значных маштабаў. Сялянства не падтрымала паўстанцаў. Шляхта і чыноўнікі каталіцкага веравызнання спачувалі барацьбе за ідэалы свабоды і незалежнасці, але не спяшаліся далучыцца да гэтай барацьбы. Спроба выступлення рамантычна настроенай моладзі не ўвянчалася поспехам, а яе ўдзельнікі апынуліся ў Сібіры. Тым не менш, менавіта дзякуючы паўстанню на тэрыторыі Беларусі, у тым ліку ў Віцебскай губерні, было скасавана часоваабавязанае становішча сялян і захаваны сервітуты.

## САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАЕ РАЗВІЦЦЁ Ў 60-90-Я ГАДЫ XIX СТ.

Тэндэнцыі капіталістычнага развіцця эканомікі ўступалі ў супярэчнасць з феадальнай сістэмай гаспадарання. У 1861 г. урадам была праведзена аграрная рэформа, якая ліквідавала прыгон і адкрывала шлях для развіцця капіталізму.

Ажыццяўленне аграрнай рэформы пачалося з падпісання імператарам 19 лютага 1861 г. Маніфеста, а таксама агульнага і мясцовых “Палажэнняў аб сялянах, якія выйшлі з прыгоннай залежнасці”. Апублікаваны дакументы былі ў сакавіку 1861 г. Ішла Масленіца. Абвяшчэнне ўмоў рэформы было адкладзена на пазнейшы час. У сельскай мясцовасці Беларусі абнародаванне адбывалася ў красавіку – маі. Звычайна Маніфест зачытваўся сялянам у цэрквах і тлумачыўся святарамі. Напісаны ён быў маскоўскім мітрапалітам Філарэтам, якога ў народзе празвалі Фількам, вельмі заблытана і незразумелай для сялян мовай. Адсюль узнік выраз “Фількіна грамата” (бязглузды дакумент).

Прыгонныя сяляне адразу атрымлівалі асабістую свабоду і грамадзянскія правы. Яны маглі несці асабістую адказнасць перад судом, заключаць пагадненні, у тым ліку маёмаснага характару, адкрываць гандлёвыя і прамысловыя прадпрыемствы, паступаць у навучальныя ўстановы, пера-

ходзіць у іншыя саслоўі. У сельскай мясцовасці ўводзілася новая сістэма кіравання, заснаваная на выбарнасці ніжэйшых службовых асоб.


Віцебскі павет у кан. XIX – пач. XX ст. (аўтар В.Л. Насевіч)

Памешчыкі захавалі ўласнасць на зямлю, што належала ім да рэформы. Сяляне павінны былі выкупіць палявы надзел, які знаходзіўся ў іх карыстанні. Да правядзення выкупной аперацыі яны лічыліся “часоваабавязанымі” і за карыстанне зямлёй павінны былі адпрацоўваць паншчыну або плаціць чынш. У Віцебскай губерні за вышэйшы надзел (4 – 5,5 дзесяцін) паншчына складала 40 мужчынскіх і 30 жаночых дзён у год; чынш – 8 руб. у год.

У аснову выкупу была пакладзена 6-працэнтная капіталізацыя гадавога чыншу. Калі надзел складаў 4 дзесяціны, а гадавы чынш 8 руб., памешчык Віцебскага павета павінен быў атрымаць такую суму, якая, калі яе пакласці ў банк, давала б яму штогод у выглядзе працэнтаў 8 рублёў. Гэтая сума роўная 133 руб. 33 кап. (8 рублёў складалі прыбытак у 6% гадавых, а выкупная сума (100%) раўнялася (8 х 100)/6=133,33). Рыначны кошт 1 дзесяціны зямлі ў Віцебскай губерні быў 18 рублёў, а селянін павінен быў заплаціць 33 руб. 33 кап. (на 85% больш).

У сялян такіх грошай звычайна не было. На дапамогу ім прыходзіла дзяржава, якая выплачвала да 80% сумы. Гэта афармлялася як пазыка, якую селянін павінен быў выплачваць 49 гадоў з высокімі працэнтамі. У 1907 г. выкупныя плацяжы былі датэрмінова адменены. Да гэтага часу сяляне выплацілі ў 3 разы больш, чым каштавала набытая імі зямля.

Падобныя ўмовы рэформы не маглі задаволіць сялян. Яны палічылі, што памешчыкі падмянілі сапраўдны царскі Маніфест. На Беларусі пачаўся ўздым сялянскага руху. У прыватнасці, ужо ў красавіку 1861 г. былі зафіксаваны сялянскія хваляванні ў вёсках Вышадкі і Зайкава Суражскага павета.

У сувязі з паўстаннем 1863–1864 гг. ва ўмовы рэформы былі ўнесены змены. З мэтай адцягнуць сялян ад удзелу ў паўстанні, урад адмяніў у Заходніх губернях часоваабавязанае становішча (у Віцебскай губерні – указам ад 2 лістапада 1863 г.). Уводзіўся абавязковы выкуп сялянскіх надзелаў. Выкупныя плацяжы зніжаліся на 20%. Сяляне пераходзілі

ў разрад сялян-уласнікаў. За імі замацоўвалася права карыстацца сервітутамі: пашамі, сенажацямі, лясамі. У выніку на Беларусі былі ліквідаваны феадальныя адносіны, а сяляне вызваляліся на больш спрыяльных умовах у параўнанні з расійскімі губернямі. У 1867 г. было праведзена пазямельнае ўладкаванне дзяржаўных сялян. Чынш быў заменены выкупнымі плацяжамі, а сяляне далучаны да разраду ўласнікаў.

Аднак пасля аграрнай рэформы 1861 г. на вёсцы захоўваліся перажыткі феадалізму: буйное памешчыцкае землеўладанне, адпрацоўкі, цераспалосіца, сервітуты. Усё гэта было ўласціва і для Віцебшчыны. У Віцебскай губерні буйнапамесным гаспадаркам належала больш за 30% зямлі. Так, на рубяжы XIX – XX ст. заронаўская графіня Забела валодала больш чым 4 тыс. дзесяцін. У Лужасне і Шалыгах памешчыцы Краснадземскай належала звыш 2 тыс. дзесяцін.

Пасля адмены прыгону і памешчыцкая, і сялянская гаспадаркі эвалюцыяніравалі ў бок капіталізму. Больш моцныя і прадпрымальныя сяляне пашыралі сваю зямельную ўласнасць, ператвараліся ў таваравытворцаў. Але амаль дзве трэці сялянскіх двароў у Віцебскай губерні мелі ў сярэднім 7 дзесяцін на двор. Пры архаічнай агратэхніцы гэтага было недастаткова. Таму галеча і голад заставаліся ў парэформеннай вёсцы нярэдкай з’явай. Многія разараліся і вымушаны былі ісці ў горад або наймацца на працу да памешчыка ці заможнага аднавяскоўца.

Адны памешчыкі прыстасоўваліся да новых умоў гаспадарання, прымянялі ўдасканаленыя прылады працы, выкарыстоўвалі наёмных рабочых, пераходзілі да шматполля, змянялі спецыялізацыю. Іншыя, якія не здолелі прыстасавацца і вялі гаспадарку старымі метадамі, паступова разараліся і прадавалі або закладалі свае землі. На Віцебшчыне назіралася пашырэнне буржуазнай зямельнай уласнасці.

Імкненне асэнсаваць складанасці пераходных працэсаў і выпрацаваць практычныя меры гаспадарання ў новых умовах вылілася ў стварэнне мясцовымі памешчыкамі ў 1877 г. Віцебскага таварыства сельскіх гаспадароў. Сябры таварыства праводзілі агульныя сходы, абмяркоўвалі эканамічныя і агранамічныя пытанні, чыталі і публікавалі даклады, выпрацоўвалі меры,


Ручное тачыла

якія спрабавалі рэалізаваць на практыцы. Таварыствам былі створаны бібліятэка, склад земляробчых прылад і машын, Таварыства ўзаемнага крэдыту землеўладальнікаў Віцебскай губерні (1881 г.), у якім на 1903 г. налічвалася 659 сяброў, ладзіліся курсы па жывёлагадоўлі і масларобству. У 1890 г. таварыства сельскіх гаспадароў набыло ў в. Лужасна 101 дзесяціну зямлі для арганізацыі земляробчай школы і паказальнай фермы, якія былі адкрыты ў 1909 г.

У парэформенны час аснову прамысловасці Віцебскага павета складала дробнатаварная вытворчасць, прадстаўленая сялянамі-саматужнікамі і рамеснікіамі разнастайных спецыяльнасцей (пекарамі, краўцамі, шаўцамі, кавалямі, ганчарамі, слесарамі і інш.). Дробныя вотчынныя мануфактуры, што існавалі ў павеце, ператвараліся ў капіталістычныя, пашыралі выкарыстанне наёмнай працы. У 1863 г. на млыне ў Мазалаве працавалі 11, а ў Лужасне – 10 наёмных рабочых. На 1892 г. у Віцебскім павеце і заштатным горадзе Суражы пераважалі мукамольныя прадпрыемствы, якіх налічвалася 29. Дзейнічалі таксама 10 цагельных, 5 гарбарных, 3 вінакурных, 2 аўчынных і 1 кафлянае прадпрыемствы.

З'явіліся ў Віцебскім павеце і новыя для яго галіны вытворчасці. У 1866 г. у вёсцы Падзародная Слабада (цяпер не існуе) быў заснаваны мылаварны завод. Вядомы ва ўсёй Расійскай імперыі шклозавод быў створаны ў 1860-я гг. у маёнтку Ноўка (зараз – Гарадоцкі раён). З 1884 г. завод выпрабляў бутэлькі, лямпы, лямпавае шкло, а з 1910 г. – посуд і рэзервуары.

Сельскагаспадарчая сыравіна перапрацоўвалася і на прадпрыемствах Віцебска, у прыватнасці, на піваварным заводзе акцыянернага таварыства "Левенбрэй" і льнопрадзільнай фабрыцы "Дзвіна".

Важную ролю ў другой палове XIX ст. захоўваў водны гандлёвы шлях па Заходняй Дзвіне, на якім пашырылася выкарыстанне параходаў. Але яго значэнне зніжалася са з'яўленнем чыгунак. Так, калі ў 1859–1862 гг. па гэтым шляху ў Віцебскай губерні грузілася штогод у сярэднім 7 млн. пудоў тавараў (каля 3 млн. пудоў зерня, а таксама льняное і канаплянае семя, пянька, лён), то на 1876 г. грузаў стала ў 4 разы менш у



Фрагмент карты Віцебскай губерні

сувязі з адкрыццём Рыга-Арлоўскай чыгункі, якая прайшла праз Віцебск у другой палове 1860-х гг. З 1902 г. пачала дзейнічаць Пецярбургска-Адэская магістраль, якая таксама не абмінула губернскі горад.

Чыгункі давалі магчымасць хутчэй і ў большай колькасці дастаўляць разнастайныя тавары, садзейнічалі пашырэнню ўнутранага рынку і сувязей са знешнімі рынкамі. Гэта спрыяла памяншэнню ролі кірмашовага гандлю. На змену яму прыходзіў стацыянарны крамны гандаль. Захаваўшыеся кірмашы мелі пераважна сельскагаспадарчую накіраванасць, спецыялізаваліся, у першую чаргу, на гандлі лёнам і свойскай жывёлай.

Такім чынам, аграрная рэформа 1861 г. стварыла магчымасці для капіталістычнага развіцця гаспадаркі. Умовы вызвалення беларускіх сялян аказаліся больш спрыяльнымі ў сувязі са зменамі, выклікаными паўстаннем 1863–1864 гг. Аднак рэформа захавала шэраг феадальных перажыткаў, якія стрымлівалі развіццё капіталізму. У прамысловасці пераважала дробнатаварная і мануфактурная вытворчасць, хаця пачала развівацца і фабрычна-заводская. З'явіліся новыя галіны (выраб шкла, мыла). Будаўніцтва чыгунак спрыяла ўмацаванню рыначных сувязей і памяншэнню ролі кірмашоў.

## ВІЦЕБСКІ ПАВЕТ У ПАЧАТКУ XX СТ.

Віцебскі павет уступіў у XX ст. у складзе 15 валасцей, аб'яднаўшы крайне паўночна-усходнія землі Віцебшчыны. У складзе павета акрамя павятовага г. Віцебск былі заштатны г. Сураж, м. Калышкі і Янавічы. Паводле першага Усерасійскага перапісу (1897) тэрыторыя павета складала 2 861,1 кв. вярсты, насельніцтва звыш 177 тыс. чалавек, у тым ліку беларусы складалі 51 %, яўрэі – 22 %, рускія – 20 %, палякі – 3 %, латышы – 2 %.

Рэвалюцыйныя падзеі пачатку XX ст. захапілі і Віцебшчыну. У 1905 г., у час першай расійскай рэвалюцыі пракаціліся забастоўкі рабочых на прадпрыемствах г. Віцебска і павета, хваляванні сялян. Адбыліся сутыкненні з войскамі, у выніку якіх гінулі людзі, як гэта адбылося ў кастрычніку 1905 г. у Віцебску.

З 1906 г. пачала ажыццяўляцца знакамітая Сталыпінская рэформа, заклікаmake спрыяць ліквідацыі рэшткаў прыгонніцтва і далейшай капіталізацыі сельскай гаспадаркі. Яна пачалася і ў Віцебскім павеце. Мэтамі рэформы была



Віцебская губерня ў пач. ХХ ст.
(Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. – Т. 2)

ломка сярэдневяковых форм сялянскага землекарыстання, а таксама фарміраванне класа сельскай буржуазіі з заможнага сялянства, які б стаў апорай самадзяржаўя. Асноўнымі накірункамі рэформы былі: разбурэнне сялянскай абшчыны; хутарызацыя; правядзенне комплексу агратэхнічных мерапрыемстваў; перасяленне сялян у маласаселеныя раёны Расійскай імперыі.

Адпаведна з указам 9 лістапада 1906 г. кожны селянін, які меў у карыстанні абшчынную зямлю, мог патрабаваць выхаду з абшчыны і замацавання зямлі ў прыватную ўласнасць. У 1910 г. выхад з абшчыны стаў абавязковым. Сяляне з ахвотай ішлі на выдзяленне свайго надзелу зямлі з абшчыны і адсяленне на хутар. Хутарская сістэма земляробства адпавядала прыродна-кліматычным умовам Віцебскага павета, бо тут адсутнічалі вялікія палі, значную частку зямлі займалі лясы і балоты. У Віцебскай губерні працэс выхаду з абшчыны ішоў хуткімі тэмпамі. Да 1915 г. з абшчыны выйшлі 28,9% усіх абшчыннікаў, што было адным з самых высокіх паказчыкаў па ўсёй Расіі.

На стварэнне моцнай прыватнай зямельнай уласнасці было накіравана насаджэнне хутарскіх і водрубных гаспадарак. У Віцебскім павеце першыя хутары з'явіліся яшчэ ў XIX ст. Яны ствараліся перасяленцамі з Прыбалтыкі. Да лютага 1908 г. на хутарскія ўчасткі ў Віцебскім павеце перайшла частка насельніцтва 89 вёсак. Тэмпы хутарызацыі ў нашым краі, у параўнанні з агульнабеларускімі, былі вышэйшымі. На хутарскую гаспадарку прыходзілася ў сярэднім 8,5 дзесяцін зямлі.

Для паляпшэння эфектыўнасці гаспадарання ўрадавымі, земскімі і кааператыўнымі ўстановамі праводзіўся комплекс агратэхнічных мерапрыемстваў. Для дапамогі хутаранам ствараліся сельскагаспадарчыя склады, пракатныя і ветэрынарныя пункты, арганізоўвалася грашовая дапамога і выдача пазык для закупкі тэхнікі, ладзіліся мерапрыемствы па прапагандзе агранамічных ведаў.

Значны ўклад у павышэнне аграрнай культуры і

развіццё сельскай гаспадаркі ўнеслі Віцебскае губернскае і павятовыя земствы, якія з'явіліся ў 1911 г. Дзякуючы дзейнасці земстваў, колькасць аграномаў у губерні ўзрасла за 1908–1913 гг. з 3 да 169. У 1913 г. у Віцебскім павеце існавала 6 пракатных станцый, дзе меліся сельгасмашыны і прылады. Перыядычна на сродкі Віцебскага павятовага земства ладзіліся сельскагаспадарчыя выставы, разнастайныя агранамічныя і жывёлагадоўчыя курсы.

Састаўной часткай сталыпінскай рэформы стала перасяленчая палітыка. Значная колькасць перасяленцаў з Віцебскага павета выехала ў Сібір у 1908 г.

Прамысловасць павета ў асноўным была прадстаўлена саматужна-рамеснымі промысламі. У 1902 г. галоўныя даходы ў галіне саматужных промыслаў (палову ад агульнай сумы) у Віцебскім павеце прыносіла апрацоўка дрэва: у павеце выраблялiся сані, калёсы, брычкі, драўляны посуд, лодкі і іншыя тавары. Ажыццяўлялася гонка дзёгцю, выпальванне вапны, у Рубе і ваколіцах меліся саматужныя промыслы па здабычы і абпальванню вапняку.

У самым пачатку ХХ ст. пачалося грунтоўнае асваенне буйнога месцанараджэння даламіту ў Вярхоўі і Рубе. Тут былі ўзведзены дзве падлогавыя і адна Гофманаўская печы. Праца рабочых, занятых на здабычы і абпальванні вапняку, была вельмі цяжкай. Усе асноўныя аперацыі выконваліся ўручную: парода адбівалася ламамі, кіркамі, кувалдамі, затым грузілася і на ручных тачках і дастаўлялася да печаў.

Буйным прадпрыемствам з'яўляўся ўжо вядомы нам шклозавод Ноўка. У 1903 г. ён выпусціў прадукцыі больш чым на 75 тыс. руб. У 1913 г. на базе прадпрыемства было заснавана акцыянернае таварыства шкляных, хрусталёвых і лесапільных заводаў "Заходняя Дзвіна", у якое ўвайшоў таксама і лесапільны завод маёнтка Ноўка. У 1913 г. у Ноўцы працавала 500 рабочых і выраблялася прадукцыі на 300 тыс. руб.

На прадпрыемствах Віцебска, у прыватнасці, на піваварным заводзе акцыянернага таварыства "Левенбрэй" і льнопрадзільнай фабрыцы "Дзвіна", перапрацоўвалася сельскагаспадарчая сыравіна.

З пачаткам Першай сусветнай вайны Віцебскі павет, як і ўся губерня, быў аб'яўлены на ваенным становішчы, а з восені 1915 г. Віцебск стаў прыфрантавым горадам, куды перамясціўся штаб Дзвінскай ваеннай акругі, ваенныя ўстановы, шпіталі, а гарнізон горада дасягнуў 40 тыс. ваеннаслужачых. З 1916 г. у Віцебску і акрузе асела вялікая колькасць бежанцаў з акупіраваных германскімі войскамі раёнаў Прыбалтыкі.

## СТАН АДУКАЦЫІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX – ПАЧАТКУ XX СТ.

У перыяд другой паловы ў XIX – пачатку XX стст. у Віцебскім павеце працавалі народныя вучылішчы, царкоўнапрыходскія школы і школы граматы. Асноўны змест палітыкі расійскага ўрада складала барацьба з польска-каталіцкім уплывам і русіфікацыя, адным з дзейсных сродкаў якой была адукацыя. У навучанні выкарыстоўвалася толькі руская мова.

Народныя вучылішчы падзяляліся на аднакласныя (3–4 гады навучання) і двухкласныя (5–6 гадоў). Статус іх зацвярджаўся “Палажэннем аб пачатковых народных вучылішчах” 1864 г., паводле якога ўсе народныя вучылішчы падпарадкоўваліся Міністэрству асветы, губернскім і вучылішчным саветам. У Віцебскім павеце народныя вучылішчы дзейнічалі з пачатку 1860-х гг. у вв. Пышнякі (1862 г.), Сялюты (з 1863 г.), Бабінічы (1864 г.), Старое Сяло (1865 г.). З 1872 г. Суражская школа была перайменавана ў гарадское народнае вучылішча з дзвюма ступенямі навучання. У 1875 г. у Віцебскім павеце працавала 14 штатных вясковых народных вучылішчаў. У 1880 г. вучылішча з’явілася ў Янавічах, а ў 1882 г. у в. Курына. Вучэбны год у такіх навучальных установах пачынаўся восенню, у верасні, па меры вызвалення дзяцей ад палявых работ. Прадметамі навучання былі Закон Божы (Стары і Новы Запаветы), рускае і царкоўна-славянскае чытанне, пісьмо, арыфметыка, гісторыя дзяржавы Расійскай і інш.

У губернях з пераважна праваслаўным насельніцтвам, да якіх адносілася і Віцебская, ствараліся ў першую чаргу царкоўнапрыходскія школы. У Віцебскім павеце падобныя школы былі створаны ў 1862 г. у в. Будзіслава, у 1863 г. у в. Лужасна, у 70-я гг. – у вв. Глазамічы і Шалыгі.

Найбольшая колькасць царкоўна-прыходскіх школ была створана ў час праўлення Аляксандра III. У 1880-я гг. яны з’явіліся ў мяст. Янавічы, вв. Пышнякі, Любашкава, Астраўскія, Зазыбы. У 1896 г. у павеце працавала 30 царкоўнапрыходскіх школ. У канцы XIX – пачатку XX стст. былі пабудаваны царкоўнапрыходскія школы пры храмах у вв. Заронава (1893 г.), Бабінічы (1899 г.), Пышнякі (1900 г.), Старае Сяло (1901 г.), Сялюты (1904 г.), Астраўскія

(1905 г.), Полцева (1907 г.), Янавічы (1908 г.). Як адзначае даследчыца гісторыі адукацыі С.В. Снапкоўская, “царква лічыла галоўнай мэтай школы рэлігійнае і вернападданіцкае выхаванне, а не ўзбраенне ведамі”. У большасці з царкоўнапрыходскіх школ выкарыстоўваліся састарэлыя і неэффектыўныя метады навучання, у тым ліку зубрэнне царкоўнаславянскіх тэкстаў і малітваў.

У Віцебскім павеце існавалі таксама школы граматы, падпарадкаваныя царкоўнаму ведамству. Яны давалі элементарныя навыкі чытання і пісьма. Такія школы былі адкрыты ў сярэдзіне XIX ст. у вв. Бялынавічы, Пляшкі (1862 г.), Дражна (1863 г.), але найбольш іх з’явілася ў 1880–1890-я гг.: у вв. Гаркава, Хатоля (1887 г.), Мазалава, Валькі, Вацекіна, Голедзь, Рымары, Себяхі, Хайсы, Баравыя (1893 г.), Слабадзе (1894 г.). У канцы XIX ст. у Віцебскім павеце працавала 166 школ граматы з колькасцю вучняў 3486. Існавалі школы граматы ў Віцебскім павеце і на пачатку XX ст.

Нягледзячы на ўсе мерапрыемствы ў галіне народнай асветы, узровень пісьменнасці беларускага насельніцтва павышаўся павольна. Паводле дадзеных Першага ўсерасійскага перапісу 1897 г., колькасць пісьменных ва ўзросце звыш 9 гадоў у Віцебскай губерні складала 33%.

У пачатку XX ст. у сістэме школьнай асветы адбыліся станоўчыя змены. Замест школ царкоўнага ведамства ў павеце сталі зноў адкрывацца народныя вучылішчы (у вв. Васюты, Дражна, Заронава, Копці, Косава). Дзейнічалі нацыянальныя народныя вучылішчы: латышскае – у в. Манулкі з 1885 г., яўрэйскае было адкрыта ў 1909 г. у в. Глазамічы.

Станоўчы ўплыў на развіццё адукацыі аказала ўвядзенне ў 1911 г. земстваў. Яны спрыялі развіццю пачатковай і прафесійна-тэхнічнай адукацыі, садзейнічалі ўмацаванню свецкага характару школы. Напрыклад, у Віцебскім павеце былі адкрыты земскія школы ў вв. Абухава (1911 г.) і Бейкава (1914 г.). Нажаль, гэты працэс быў спынены пачаткам Першай сусветнай вайны.

Такім чынам, у другой палове XIX – пачатку XX стст. адбываліся станоўчыя змены ў развіцці адукацыі, расла колькасць школ і навучэнцаў. У той жа час, школы з’яўляліся асяродкам русіфікацыі, а сістэма навучання не заўсёды была эфектыўнай.

раздзел II

ТЭМА 4

# ПАЎНОЧНА-ЎСХОДНЯЯ ВІЦЕБШЧЫНА Ў 1917-1941 ГГ.

## ВІЦЕБСКІ ПАВЕТ Ў 1917-1921 ГГ.

Рэвалюцыйныя падзеі 1917 г. Першая сусветная вайна абвастрыла ўсе сацыяльныя, эканамічныя і нацыянальныя супярэчнасці, што і выклікала ўзрушэнні 1917 г., Лютаўскую і Кастрычніцкую рэвалюцыі. Яны абудзілі да палітычнай актыўнасці насельніцтва Віцебшчыны – пачалі стварацца грамадскія камітэты, Саветы, актывізаваліся розныя палітычныя партыі.

Абудзілася і вёска, 11–17 чэрвеня 1917 г. у Віцебску адбыўся Віцебскі губернскі сялянскі з’езд. У адносінах да найважнейшага для селяніна зямельнага пытання, бо беларуская вёска цярпела ад недахопу зямлі, ад чаго большая частка гаспадарак была беднай, з’езд выказаўся неадназначна: з аднаго боку ён заявіў аб тым, што зямля з’яўляецца агульнанародным набыткам і бясплатна паступае ў карыстанне тым, хто яе апрацоўвае, з другога ён прызнаў недапушчальнымі самавольныя захопы памешчыцкіх зямель да вырашэння аграрнага пытання Устаноўчым з’ездам.

Становішча ў вёсцы летам 1917 г. абвастралася, бо не хапала хлеба. Так, у жніўні 1917 г. з прычыны голаду мелі месца беспарадкі ў г. Сураж, якія былі падаўлены ўладай. Нерашучасць Часовага ўрада ў вырашэнні наспеўшых сацыяльна-эканамічных праблем, асабліва ва ўмовах нарастаючага ўсеабдымнага крызісу ў Расіі прывялі да таго, што народныя масы, у тым ліку і сяляне, хіснуліся ў бок бальшавікоў.

25 лістапада 1917 г. бальшавікі звергլі Часовы ўрад у Петраградзе, а ў ноч з 27 на 28 лістапада 1917 г. Ваенна-рэвалюцыйны камітэт, узначальваемы бальшавікамі, устанавіў кантроль над г. Віцебскам, распусціў Віцебскі гарадскі Савет салдацкіх і рабочых дэпутатаў як контррэвалюцыйны, і арганізаваў выбары новага, рэвалюцыйнага Савета.

Мерапрыемствы бальшавікоў у 1917–1920 гг. Віцебскі павет да сакавіка 1924 г. уваходзіў у склад РСФСР. На працягу снежня 1917 – лютага 1918 г. адбылася ліквідацыя старых органаў самакіравання, гарадскіх дум і земскіх управ, былі створаны Саветы рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў, якія ўзялі на сябе функцыі органаў мясцовай улады. Так сфарміраваліся і павятовыя органы ўлады. Напрыклад, у студзені 1918 г. у Старым Сяле была ліквідавана валасная земская ўправа і створаны Старасельскі валасны Савет.

Аднак дзейнасць Саветаў не задавальняла бальшавіцкую ўладу, асабліва ва ўмовах разгорнутай па ўсёй Расіі грамадзянскай вайны і палітыкі "ваеннага камунізму". 11 чэрвеня 1918 г. Усерасійскі Цэнтральны выканаўчы камітэт РСФСР зацвердзіў Дэкрэт СНК "Аб арганізацыі і забеспячэнні вясковай беднаты". Згодна з ім павінны былі быць створаны камітэты беднаты (камбеды), як органы рэвалюцыйных пераўтварэнняў на вёсцы, барацьбы з кулацтвам і, самае галоўнае, забеспячэння дзейнасці харчатрадаў. У ліпені – верасні 1918 г. у Віцебскім павеце адбылася арганізацыя камбедаў. Яны былі створаны ў Бабініцкай, Вымнянскай, Вярхоўскай, Шчэрбінскай, Янавіцкай валасцях. Да лістапада 1918 г. у Віцебскім павеце ўжо было 402 вясковыя, 17 валасных і 1 мястэчковы камітэты беднаты.

Камбеды павета неадкладна заняліся арганізацыяй уліку земляў і сенажацяў для правільнага размеркавання паміж беззямельнымі. У кулакоў адбіралі лішкі жывёлы і зямлі, каб размеркаваць іх сярод беднаты. Асаблівую актыўнасць праяўлялі ў выяўленні схаванага хлеба і яго рэквізіцыі харчовымі атрадамі.

29 чэрвеня 1918 г. газета "Голос бедняка" надрукавала праект абкладання заможных сялян надзвычайным падаткам. "Заможнасць" было даручана вызначаць камбедам. Тая частка сялянства, якую не аднеслі да катэгорыі беднаты, станавілася поўнасцю бяспраўнай: "кулакі" не маглі выбіраць і быць выбранымі ў выканкомы і камбеды, яны не мелі права набыць мануфактуру і іншыя тавары; "кулакі" абкладаліся надзвычайным падаткам; акрамя таго пачалося масавае стварэнне камун. Камунам аддаваліся лепшыя землі, бязвыплатна выдаваўся сельгасінвентар. Гэты элемент палітыкі "ваеннага камунізму" яшчэ больш паглыбіў раскол у грамадстве, абвастрыў процістаянне, прывёў да разгортвання шырокамаштабнай, паўсюднай грамадзянскай вайны.

Сялянскія выступленні як форма праяўлення грамадзянскай вайны. Першыя сялянскія выступленні ў павеце адбыліся вясной-летам 1918 г. Яны адбыліся ў вв. Курына, Веляшковічы

(цяпер Лёзненскі раён) і іншых населеных пунктах. Выкліканы яны былі рэквізіцыяй хлеба ў сялян. Асабліва вялікае незадавальненне выклікала форма ўліку хлеба ў гаспадарках. Так, у Каралёўскай воласці Віцебскага павета было вырашана ўлічыць усё жыта на караню, а за супраціўленне прадугледжваўся расстрэл на месцы.

Ужо ў ліпені 1918 г. пачалася ўзброеная барацьба супраць Савецкай улады. 7 ліпеня праціўнікі бальшавікоў захапілі Янавічы, разграмілі рэўком, арыштавалі яго старшыню. Толькі з прыбыццём атрада чэкістаў з Віцебска ўдалося падавіць мяцеж.

У верасні 1918 г., з мэтай барацьбы з контррэвалюцыяй у краіне афіцыйна быў аб'яўлены чырвоны тэрор. Для падаўлення сялянскіх выступленняў усё часцей выкарыстоўвалі чырвонаармейскія атрады, асабліва Латышскі і Варшаўскі палкі.

Масавыя мабілізацыі ў Чырвоную Армію восенню 1918 г., правядзенне харчразвёрсткі і рэквізіцыі прывялі да таго, што на 1919 г. у Віцебскім павеце, як дакладваў павятовы рэўком, не засталося ніводнага працаздольнага грамадзяніна, коней жа не больш аднаго-двух дзесяткаў, да і тыя былі выкарыстаны для абслугоўвання тылу чырвонага фронту.

У лістападзе 1918 г. амаль усю Віцебскую губерню ахапіла масавае сялянскае паўстанне. Пачалося яно 9 лістапада ў Касплянскай і Ільінскай валасцях Веліжскага павета. Паўстанцы захапілі Веліж, Усвяты, Усмынскую і Маклакоўскую воласці, мелі сувязь з Парэцкім паветам Смаленскай губ. 11 лістапада ўспыхнула паўстанне ў Зябкінскай, Нова-Вазнясенскай, Аляксееўскай, пазней Трэхалеўскай валасцях Невельскага павета. 13 лістапада паступілі звесткі аб вялікіх сілах, паўстаўшых у раёне Янавіч і Суража, Вазнясенскай, Капцевіцкай і Веляшкоўскай валасцях Віцебскага павета. У той жа дзень паўстанне перакінулася ў Гарадоцкі (Зайкаўская, Стайкаўская, пазней Горкаўская, Вышадская, Старынская, Дубакрайская воласці) і Полацкі паветы.

У паўстанні прынялі ўдзел заможныя і сярэднія сяляне, у некаторых мясцовасцях і бедната. У многіх месцах да яго далучыліся мабілізаваныя ў армію, сабраныя ў ваенкаматах сяляне. Паўстанцы грамілі валасныя выканкомы, ваенкаматы, знішчалі дакументацыю, якая вялася новай уладай. У адных месцах яны абмежаваліся разгромам устаноў, у другіх – справа дайшла да крывавых расправаў з прадстаўнікамі ўлады (Веліжскі пав.). У большасці сваёй гэтыя паўстанні ўспыхнулі стыхійна, іншы раз пасля праведзенай агітацыі. Паўстанцы выдзвігалі патрабаванні "Далоў Саветы", патрабавалі знішчэння падаткаў,

“Святой” уласнасці на зямлю.

Жыхары Віцебскага павета, асабліва яго ўсходніх валасцей, бралі актыўны ўдзел у паўстанні. Аднак самым упартым было супраціўленне ў Веліжскім павеце і працягвалася яно да 27 лістапада. Невельская ЧК растраляла 11 чалавек, 33 было прыгаворана да розных тэрмінаў зняволення. На жыхароў паўстаўшых валасцей была накладзена кантрыбуцыя.

1919 г. таксама быў неспакойным. На тэрыторыю Беларусі ўварваліся польскія войскі, якія захапілі заходнюю частку Віцебшчыны. У жніўні ў г. Віцебску і павеце было ўведзена ваеннае становішча, а 6 кастрычніка загадам Рэўваенсавета Заходняга фронту быў створаны Віцебскі губрэўком, які сканцэнтраваў усю ўладу ў горадзе і губерні. Адначасова пачаў дзейнічаць і Віцебскі павятова-гарадскі рэўком з такімі ж паўнамоцтвамі на адпаведнай адміністрацыйнай тэрыторыі.

Не сціхалі і сялянскія хваляванні. У жніўні ўзняўся мяцеж у Казакоўскай воласці, які ўзначаліў былы афіцэр па мянушцы Грэнька. Мяцежнікі нападалі на вёскі, забівалі камуністаў і савецкіх актывістаў.

Для падаўлення антысавецкіх выступленняў у верасні 1919 г. пры Суражскай павятовай міліцыі быў створаны конны атрад, задачай якога была барацьба з “бандытамі” і дэзерцірамі. У дапамогу ім быў прысланы атрад чырвонаармейцаў. У 1920 г. барацьбу з бандытызмам у Віцебскім павеце ўзначаліў М.П. Шмыроў.

Толькі ў 1922 г. узброеная барацьба супраць Савецкай улады спынілася. Удзельнікам сялянскіх паўстанняў была аб’яўлена амністыя, праціўнікі савецкай улады сталі выходзіць з лясоў. Спыненню супраціву спрыяла і новая эканамічная палітыка савецкай улады, у выніку якой спыняліся рэквізіцыі і харчразвёрстка замянялася фіксаваным харчпадаткам.

Эканамічныя пераўтварэнні савецкай ўлады. Яшчэ ва ўмовах грамадзянскай вайны, узброенага процістаяння адбываліся і спробы будаўніцтва новага жыцця, якое разумелася бальшавікамі ў галіне сельскай гаспадаркі толькі як калектыўнае, з абагульненай гаспадаркай і дзяржаўнай уласнасцю на зямлю.

Жаданне як мага хутчэй пабудаваць камуністычную будучыню выявілася ў першыя гады савецкай улады ў арганізацыі камун. Для арганізацыі камун выкарыстоўваліся землі памешчыкаў, манастыроў, цэркваў з выкарыстаннем усёй раней створанай інфраструктурай. У камуны аб’ядноўваліся сельскагаспадарчыя рабочыя, батракі, вясковая бедната. Адна з першых камун была арганізавана ў красавіку 1918 г. у маён-

тку Лётцы. У верасні – у манастырскім прыгарадным маёнтку Шыдлоўшчына, а ў кастрычніку – у в. Запруддзе. У 1921 г. на тэрыторыі Віцебскага і Суражскага паветаў дзейнічала 21 камуна, дзе працавала 1036 чалавек.

Аднак камуны, як форма арганізацыі працы на зямлі не прыжылася на вёсцы, бо ўраўняльны прынцып размеркавання прыбыткаў не выклікаў у людзей матэрыяльнай зацікаўленасці, фарміраваў абыякавыя адносіны да працы і прыводзіў да разбурэння гэтых гаспадарак.

Яшчэ адной з форм гаспадарання на зямлі, якая ўзнікла ў першыя гады Савецкай улады, былі дзяржаўныя гаспадаркі, саўгасы. У 1918 г. на тэрыторыі Віцебскага павета былі створаны першыя саўгасы "Цірaспаль" і "Якуціна", у 1919 г. – саўгасы "Мазалава" і "Чырвоны Двор". У 1920 г. на тэрыторыі Віцебскага павета дзейнічала 15 саўгасаў.

З 1919 г. пачаўся рост такіх форм землекарыстання, як сельгасарцель і таварыства па сумеснай апрацоўцы зямлі. Былі арганізаваны арцелі "Барацьба", "Баркі", "Бараўляны", "Дзвіна", "Косы" і інш.

Аднак сяляне с цяжкасцю прыстасоўваліся да калектыўных форм гаспадарання, бо прывыклі разлічваць на свае ўласныя сілы. Так, у маі 1919 г. у Віцебскім павеце ў выніку абследаванняў і перарэгістрацыі былі ліквідаваны 2 арцелі, а 19 калектыўных гаспадарак пераведзены на статут таварыстваў па сумеснай апрацоўцы зямлі. Колькасць калектыўных гаспадарак была непастаяннай. Як паказалі 1920-я гг., калі сялянам была дазволена свабода выбару форм землекарыстання, то большасць з іх выбрала аднаасобную гаспадарку.

1920 г. праходзіў ва ўмовах палітыкі ваеннага камунізму. Так, у сакавіку Віцебскі павятовы камітэт звярнуўся да насельніцтва з заклікам "уступаць у рады працоўнай арміі для рашучай перамогі над унутраным ворагам – разбурэннем, голадам, эпідэміямі". Адным з важнейшых сродкаў для такой барацьбы лічыліся барацьба з мяшочніцтвам і ўлік хлеба, як гэта лічыў Віцебскі павятовы рэвалюцыйны камітэт.

14 сакавіка 1920 г. адбыўся 7-ы з'езд Саветаў Віцебскага павета. На ім быў выбраны павятовы камітэт па правядзенні працоўнай павіннасці. На валасных з'ездах былі выбраны валвыканкомы.

Завяршэнне грамадзянскай вайны і інтэрвенцыі ў канцы 1920 г. не прывялі да адмены ваеннага камунізму. Рост незадаволенасці сярод насельніцтва прымушаў кіраўніцтва партыі бальшавікоў задумвацца аб змене эканамічнай палітыкі ў краіне.

# МЕРАПРЫЕМСТВЫ САВЕЦКАЙ УЛАДЫ Ў ГАЛІНЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ПАЛІТЫКІ

Наш край здаўна засялялі прадстаўнікі розных народаў. Побач з беларусамі тут жылі рускія, украінцы, яўрэі, палякі, латышы, літоўцы, татары, цыганы. У XIX – пачатку XX ст. ішло фарміраванне нацый, аднак палітыка русіфікацыі, якую праводзіў царскі ўрад, стварала перашкоды для іх развіцця. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі бальшавікі пачалі праводзіць узважаную нацыянальную палітыку, якая ўяўляла сабой комплекс мер у галіне дзяржаўнага кіравання, сацыяльна-эканамічным і духоўным жыцці. Усе гэтыя мерапрыемствы павінны былі садзейнічаць саветызацыі народаў Беларусі, наладжванню добрасуседскіх адносін у рэгіёне.

Савецкі ўрад паставіў задачу прыцягнуць мясцовае насельніцтва, у першую чаргу беларусаў, да работы ў органах дзяржаўнай улады. Гэты курс, які быў вызначаны ў красавіку 1923 года на XII з’ездзе РКП(б), атрымаў назву “карэнізацыя”.

Планавы характар працэс карэнізацыі мясцовых савецкіх органаў набыў пасля далучэння г. Віцебска і Віцебскага павета да БССР у 1924 г. Паступова да канца 1928 г. сярод адказных працаўнікоў у адміністрацыйных установах павета павялічылася вага беларусаў (з 14,2 % у 1920 г. да 51,3 %) і адпаведна зменшылася – рускіх (з 27,6 % да 18%), яўрэяў (з 54,2% да 24,8 %), палякаў (з 1,8% да 0,1%).

Як бачна, на дзяржаўныя пасады кадры прызначаліся з улікам удзельнай вагі той ці іншай этнічнай супольнасці адносна агульнай колькасці насельніцтва рэгіёна. Калі беларусаў на тэрыторыі Віцебскага павета было больш, то і ў адміністрацыйным апараце яны складалі значную долю. Да таго ж беларусы лепш ведалі свой край і маглі эфектыўна праводзіць рашэнні партыйных і дзяржаўных органаў у жыццё.

Каб ліквідаваць няроўнасць, знайсці падтрымку ў бяднейшай часткі сялянства, савецкі ўрад паставіў задачу правесці землеўпарадкаванне сялянскіх гаспадарак. У першую чаргу землямерныя работы праводзіліся ў гаспадарках латышоў і палякаў, дзе меліся значныя зямельныя надзелы. У выніку “кулацкія” і “серадняцкія” гаспадаркі абразаліся да 8-9 дзесяцін зямлі, а з гэтага фонду надзелы раздаваліся беднаце. Пры гэтым, землі латышскіх заможных сялян пе-

радаваліся латышскай беднаце, польскіх – польскай. Такім чынам савецкі ўрад не даваў магчымасці нацыянальнай буржуазіі выкарыстаць беднату ў антысавецкай барацьбе.

Важнейшым сродкам павышэння дабрабыту насельніцтва савецкая ўлада разглядала кааперацыю, у першую чаргу вытворчую. У 1920-я гады на тэрыторыі Віцебскай акругі, як і на ўсёй Беларусі, разгарнулася праца па стварэнню яўрэйскіх калгасаў. На 1 жніўня 1928 г. іх ужо мелася 17. З ліку гэтых гаспадарак было 8 калектываў з жывёлагадоўчым ухілам і 9 садова-агародных арцелей. Арганізацыя яўрэйскіх калгасаў была выключна важным мерапрыемствам: яўрэі, якія доўгі час займаліся толькі рамяством і гандлем, павінны былі як мага хутчэй уцягнуцца ў сацыялістычнае будаўніцтва побач з іншымі народамі. Пастунова назіралася папаўненне яўрэйскіх калгасаў за кошт збяднелых гандляроў і рамеснікаў. Зразумела, у такім выпадку значная частка членаў арцелей была незнаёмая з вядзеннем сельскай гаспадаркі, але ўключалася ў гэтую працу.

Палякі і латышы, маючы дастатковыя зямельныя плошчы, высокі ўзровень агракультуры, не спяшаліся абагульняць свае гаспадаркі. Іх не заахвочвала нават сістэма ільготнага крэдытавання, якая распаўсюджвалася на нацыянальныя калгасы. Толькі ў 1928 г. у Віцебскай акрузе былі ўтвораны 1 польскі і 1 латышскі калгасы.

Цікава, што яшчэ годам раней у 1927 г. у Віцебскім раёне ўзнік першы ў СССР цыганскі калгас “Новае жыццё”. У 1928 г. у Нікалаеўскім сельсавеце з сямі сем’яў пад кіраўніцтвам Чжан Ван Фу быў утвораны кітайскі нацыянальны калгас “Маркавічы”. На агульным сходзе калгаснікаў было прынята рашэнне арганізаваць садова-агародную арцель. Члены калектыву на ўласныя сродкі набылі інвентар і добра наладзілі працу. Калгас меў чырвоны куток, радыё, на роднай мове вялася культасветная работа. Нажаль, масавая калектывізацыя прывяла да таго, што кітайская арцель стала інтэрнацыянальным калгасам. Новыя члены сельскагаспадарчага таварыства працаваць асабліва не імкнуліся, пагоршыўся маральны клімат і працоўная дысцыпліна.

Беларускамоўныя школы былі створаны толькі пасля далучэння Віцебскага павета да БССР. У рамках беларусізацыі з 1925/1926 вучэбнага года на беларускую мову пачалі пераходзіць старэйшыя класы. Безумоўна, гэты працэс напачатку выклікаў пэўныя цяжкасці: не хапала беларускіх падручні-

каў, кваліфікаваных педагогаў, якія б маглі весці заняткі на роднай мове. У сувязі з гэтым з 1925 г. значна пашыралася сетка курсаў беларусазнаўства ў рэспубліцы, у тым ліку і ў Віцебскім раёне. Такая мэтанакіраваная работа органаў народнай асветы прывяла да таго, што на 1927 г. 85,3% школ і 49 % дзіцячых садкоў раёна былі беларускімі.

У вызначаны перыяд праводзілася значная работа па пераводу школ нацыянальных меншасцей на іх родныя мовы. У 1926 г. у Віцебскай акрузе дзейнічалі 15 школ з выкладаннем на польскай мове і 1 польска-беларуская школа. Усе яны ўтрымліваліся за дзяржаўны кошт. Колькасць навучэнцаў у іх складала 1025 чалавек, выкладчыкаў – 35 чалавек. Гэтыя школы ахоплівалі 88% усіх дзяцей польскай нацыянальнасці па Віцебскай акрузе. Як бачна, гэты працэнт быў даволі высокім. Аднак сама забяспечанасць школ падручнікамі і іншымі метадычнымі матэрыяламі была даволі нізкай і задавальняла толькі 30% ад запатрабаванага. Прыкладна такая ж сітуацыя назіралася з яўрэйскімі, латышскімі і літоўскімі школамі Віцебшчыны.

Ацэньваючы ў цэлым комплекс мерапрыемстваў савецкай улады ў жыцці народаў нашага краю, можна зрабіць выснову: павышэнне эканамічнага і культурнага ўзроўняў мясцовага насельніцтва садзейнічала выхаванню новага пакалення ў сацыялістычным духу, фарміраванню новай класава арыентаванай інтэлігенцыі і партыйна-савецкай эліты.

## СЕЛЬСКАЯ ГАСПАДАРКА Ў 1920-Я – 1930-Я ГГ.

Новая эканамічная палітыка. Ваенныя дзеянні нанеслі значны ўрон сельскай гаспадарцы Віцебшчыны. Значна скараціліся пасяўныя плошчы і зборы зерня. Напрыклад, у Віцебскім павеце ў 1905 – 1914 гг. сярэднегадавы збор складаў 50,5 пуда з дзесяціны, а ў 1917 – 1921 гг. – толькі 41,3 пуда. Палітыка “ваеннага камунізму”, якая праводзілася партыяй бальшавікоў у 1918 – 1920 гг., не спрыяла развіццю гаспадаркі. Рэквізіцыі, што праводзіліся ў працэсе ажыццяўлення харчразвёрсткі, вымушалі сялян адмаўляцца ад пашырэння пасяўных плошчаў і хаваць хлеб.

Правал палітыкі “ваеннага камунізму” прымусіў бальшавікоў шукаць выхад са складанай сацыяльна-эканамічнай сітуацыі. Прынятая на X з’ездзе РКП(б) у

сакавіку 1921 г. новая эканамічная палітыка (нэп) прадугледжвала замену харчразвёрсткі харчпадаткам, які вызначаўся да пачатку сяўбы, каб зацікавіць сялян у пашырэнні пасеваў. Аднак першапачаткова ўвядзенне харчпадатку не прынесла палёгкі сялянам. Галоўнай праблемай сталі стаўкі падатку, якія ў многіх паветах, у тым ліку і Віцебскім, перавысілі сабраны ўраджай. Пры зборы падатку шырока выкарыстоўваліся гвалтоўныя метады. У выніку харчпадатак па Віцебскай губерні ў 1921 г. быў выкананы ў цэлым толькі на 77 %.

Пралікі ў вызначэнні памераў падатку, гвалтоўныя метады яго збору абумовілі насцярожанае стаўленне сялян да новай палітыкі. Не давяраючы нэпу, многія сяляне ўтойвалі рэальную плошчу апрацоўваемай зямлі. Вышэйшай формай пратэсту супраць завышанага аб'ему падатка і гвалту стала ўзброеная барацьба. Асаблівага накалу ў 1921 г. яна дасягнула ў Веліжскім, Суражскім, Гарадоцкім і Невельскім паветах Віцебскай губерні.



Сані для перавозкі сена

Снежаньская канферэнцыя РКП(б) 1921 г. і прайшоўшы ў той жа час IX з'езд Саветаў РСФСР прынялі рашэнне аб свабодным выбары форм землекарыстання. На месцах сяляне тлумачылі гэта як вяртанне да ранейшай землеўпарадчай палітыкі. Загадчык Віцебскага губернскага зямельнага праўлення ў 1922 г. тэлеграфаваў у Маскву: “Новыя пазямельныя адносіны ўспрыняты вёскай добразычліва, і назіраецца вялікая цяга да хутароў, для чаго не шкадуюць аніякіх сродкаў для аплаты землеўпарадчыкам, толькі б атрымаць хутар”.

Да таго ж сялянства атрымала права прадаваць лішкі сваёй прадукцыі. З 1923/24 гаспадарчага года адбыўся пераход ад сістэмы натуральнага падаткаабкладання да грашовага. Гэта пашырала гаспадарчую самастойнасць сялян, давала магчымасць павялічыць вытворчасць прадукцыі, што карысталася попытам, лепш прыстасавацца да рынку. Названыя меры значна павысілі давер сялянства

да ўлады і спрыяльна паўплывалі на выінікі іх працы.

У перыяд нэпа большасць сялян былі аднаасобнікамі. Сям'я па-ранейшаму заставалася асноўнай гаспадарчай ячэйкай. Захоўваўся традыцыйны падзел работ на мужчынскія і жаночыя. Уся праца па доме і ў агародзе лічылася жаночай справай. Мужчыны ж займаліся палявымі работамі, хаця і тут не абыходзілася без жаночай дапамогі, напрыклад, пры ўборцы ўраджаю. Аднак у 1920-я гг. многім жанчынам, мужы якіх загінулі на вайне ці сталі інвалідамі, прыходзілася самастойна весці гаспадарку.

Прыярытэтным напрамкам аграрнай палітыкі было стварэнне пасёлкаў, якія лічыліся прыдатнымі для стварэння ў далейшым калектыўных гаспадарак. Дзяржава падтрымлівала і выхад сялян на хутары, што спрыяла ліквідацыі цераспалосіцы. Найбольш папулярнай формай землекарыстання на Віцебшчыне з'яўлялася хутарская. Ужо ў першай палове 1920-х гг. яна дасягала 80 % ад іншых форм.

Значныя сродкі выдаткоўваліся на калектыўныя гаспадаркі, але яны не карысталіся папулярнасцю ў сялян. У 1926–1927 гг. у Віцебскім і Суражскім раёнах дзейнічала 11 саўгасаў і 12 калгасаў. Кааперацыя развівалася, у асноўным, у двух напрамках: стварэнне крэдытных сельскагаспадарчых таварыстваў і масларобных і сыраварных заводаў.

Па звестках газеты “Заря Запада” ад 14 сакавіка 1926 г. у Віцебскім раёне налічваліся 10 323 сялянскія гаспадаркі. У сярэднім на двор прыходзілася 6,3 дзесяціны зямлі. Пасяўная плошча дасягнула звыш 90% даваеннага ўзроўню. Назіраўся вялікі попыт з боку сялян на сельгасмашыны і прылады. У сярэднім па БССР з 1921 па 1926 г. спажыванне мяса і малака ў сельскай мясцовасці павялічылася ў 2 разы, масла – у 3, цукру – больш чым у 8. Для большасці сялян жыццё значна палепшылася.

Адмова ад нэпа і курс на калектывізацыю. XV з'езд ВКП(б) (1927 г.), у час правядзення якога выявіліся разыходжанні ў поглядах на тэмпы развіцця буйной індустрыі і дробнай аднаасобнай сялянскай гаспадаркі, прыняў рашэнне пра аб'яднанне індывідуальных гаспадарак у калгасы, але выключна на добраахвотнай аснове. Згодна з першапачатковымі кантрольнымі лічбамі пяцігадовага плана развіцця народнай гаспадаркі БССР прадугледжвалася павышэнне

пасяўной плошчы калгасаў і саўгасаў да канца пяцігоддзя не менш як да 12 % ад усёй пасяўной плошчы.

Збожжанарыхтоўчы крызіс 1928 г. падштурхнуў Сталіна да ідэі “звышіндустрыялізацыі” за кошт вёскі, за якую яшчэ год назад ён асудзіў левую апазіцыю. Хутарызацыя была спынена. У другой палове 1929 г. на Віцебшчыне, як і ва ўсёй краіне, пачалася суцэльная калектывізацыя.

Сяляне, звыклыя самастойна весці гаспадарку, не разумелі неабходнасці стварэння калгасаў, былі занепакоены будучыняй сваіх сем’яў і не хацелі абагульваць маёмасць. Але частка сялян, галоўным чынам, беднякоў, паверыла прапагандзе калгаснага ладу, лічачы, што калектыўная праца будзе лягчэйшай і больш прадуктыўнай. Да таго ж, выкарыстоўваўся адміністрацыйны ціск. На 1 кастрычніка 1929 г. у Віцебскім раёне было створана 44 калгасы, у Суражскім – 14. Сярод першых у час калектывізацыі ў Віцебскім раёне былі ўтвораны калгас “Зара сельгасіндустрыі”, які аб’яднаў некалькі сем’яў былых парабкаў і малазямельных сялян з в. Ізбовічы Бараўлянскага сельсавета, і калгас імя Ф.Э. Дзяржынскага ў Рудніцкім сельсавеце.

Метады правядзення калектывізацыі. Моцная хваля калектывізацыі на Віцебшчыне пачалася ў лютым 1930 г. у сувязі з пастановай Бюро ЦК КП(б)Б, згодна з якой да пачатку веснавой сяўбы неабходна было калектывізаваць 80 % сялянскіх гаспадарак. У вёску былі накіраваны рабочыя-дваццаціпяцітысячнікі (у Віцебскай акрузе іх было каля 60-ці), якія часам не мелі ўяўлення аб гаспадаранні на зямлі, але ў правядзенні партыйнай лініі не спыняліся перад гвалтам. Дзякуючы пагрозам і рэпрэсіўным мерам быў дасягнуты інтэнсіўны рост калгасаў.

Успамінае ўдзельнік калектывізацыі ў Суражскім раёне Я.М. Капцелаў: “Нялёгкі быў гэта час. Сяляне баяліся ўсяго новага, і многія не хацелі ўступаць у калгасы, і мы нават пагражалі зброяй. Так, у Котаве сяляне не хацелі пісаць заявы аб уступленні ў калгас. Тады ўпаўнаважаны Абраменка дастаў пісталет, паклаў яго на стол і чакаў, пакуль не вытрымалі жанчыны, а потым і мужчыны. Да раніцы 10 гаспадароў падалі заявы ў калгас”.

У выніку ўзмацнення незадаволенасці і росту супраціву сялян па ўсёй краіне, бальшавікі вымушаны былі

крыху запаволіць працэс. У пачатку сакавіка ў цэнтральнай газеце "Правда" ўбачыў свет артыкул І. Сталіна "Головокружение от успехов", у якім уся віна за "перагібы" ў правядзенні калектывізацыі ўскладалася на мясцовыя партыйныя органы. Артыкул быў успрыняты сялянамі як дазвол на выхад з калгасаў. Многія калгасы распаліся. Пры гэтым, на май у Віцебскім і Суражскім раёнах працэнт калектывізацыі скараціўся па ворнай зямлі – да 14,7, па дварах – да 13,4. Распад калгасаў працягваўся да восені. Потым пачалася новая хваля калектывізацыі.

Састаўной часткай гвалтоўнай калектывізацыі з'яўлялася т.зв. "палітыка ліквідацыі кулацтва як класа", абвешчаная І. Сталіным у снежні 1929 г. Высылка "кулакоў", у якія мог быць залічаны любы праціўнік калектывізацыі, набыла значныя памеры з лютага 1930 г. На 15 красавіка з Віцебскага раёна было выселена 207 кулацкіх сем'яў (749 чалавек), з Суражскага – 127 сем'яў (528 чалавек). Высылаліся "кулакі", галоўным чынам, на Урал, дзе яны траплялі ў нечалавечыя ўмовы працы і існавання. Гэта працягвалася і ў наступныя гады.

Гвалтоўныя метады калектывізацыі ўзмацнілі сацыяльную напружанасць на вёсцы і выклікалі антыкалгасны супраціў сялянства. Існавалі розныя формы барацьбы. Сяляне адмаўляліся ад уступлення ў калгас, забівалі жывёлу, падпальвалі калгасную маёмасць, нападалі на актывістаў, якія праводзілі калектывізацыю, а часам нават забівалі іх. Асаблівую актыўнасць праяўлялі жанчыны, якія распускалі антыкалгасныя чуткі, зрывалі сходы па арганізацыі калгасаў, рабілі спробы вяртання абагуленай маёмасці. Часта сялянкі групамі імкнуліся абараніць раскулачаных ад высылкі.

Да канца 1931 г., калі калгасы былі ўтвораны ў большасці вёсак, якія налічвалі 20 – 30 двароў, раённыя партыйныя і савецкія органы адрапартавалі аб завяршэнні калектывізацыі і перамозе калгаснага ладу на вёсцы. Але фактычна калектывізацыя гаспадаркі, якая суправаджалася ціскам на аднаасобнікаў, працягвалася да канца другой пяцігодкі. Ліквідацыя аднаасобнага сектару на вёсцы завяршылася ў 1939 – 1940 гг., калі было здзейснена ссяленне хутароў. У Віцебскім раёне было сселена 2 512 гаспадарак.

Змены ў жыцці сялян. Жыццё прымусіла сялян змірыцца з калгасамі. Існаванне ў іх, асабліва напачатку, было вельмі цяжкім. Аплата здзяйснялася па колькасці адпрацаваных дзён не грашыма, а прадуктамі, і толькі пасля выканання дзяржаўных паставак. Як успаміналa адна з калгасніц, “толькі разлічваліся з дзяржавай і штонішто засыпалі на насенне, а на працадні ўсё роўна нічога не заставалася, акрамя мякіны і гірсы”. Становішча стала паляпшацца ў другой палове 1930-х гг., аднак і ў канцы дзесяцігоддзя сяляне заставаліся самай нізкааплочваемай катэгорыяй працаўнікоў.

Важнае значэнне надавалася механізацыі сельскай гаспадаркі. Для забеспячэння калгасаў тэхнікай былі створаны машынна-трактарныя станцыі (МТС). У Віцебскім раёне дзейнічалі Віцебская, Мазалаўская, Сялюцкая МТС, у Суражскім – Задзвінская і Суражская. Аднак узровень механізацыі ў 1930-я гг. быў невысокі, у калгасах пераважала ручная праца. Не хапала мінеральных угнаенняў.

Нягледзячы на змены ў ладзе жыцця вёскі, у калгасах захоўваўся традыцыйны падзел працы на мужчынскую і жаночую. Дзяржава імкнулася парушыць гэты падзел за кошт уцягнення жанчын у сферы дзейнасці, якія былі чыста “мужчынскімі”. Так з’явіліся жанчыны-трактарысткі і камбайнёры. Але нават у канцы 1930-х гг. паўсядзённыя клопаты большасці жанчын мала змяніліся. У асноўным яны былі заняты ў асабістай падсобнай гаспадарцы, што забяспечвала сям’ю прадуктамі харчавання, адзеннем і прыносіла грашовы прыбытак.

Такім чынам, эканамічныя свабоды перыяду нэпа забяспечылі аднаўленне сельскай гаспадаркі Віцебшчыны, спрыялі паляпшэнню ўзроўню жыцця сялян. Значных поспехаў дасягнула хутарызацыя. Гвалтоўная калектывізацыя выклікала, у асноўным, адмоўнае стаўленне і супраціўленне сялянства. У выніку высялення найбольш працавітых сялян і адсутнасці матэрыяльнай зацікаўленасці калгаснікаў значна знізілася ўраджайнасць. Толькі да канца 1930-х гг. яна дасягнула ўзроўню дакалгаснай вёскі. Але ў першую чаргу за кошт перакачкі сродкаў з сельскай гаспадаркі была праведзена індустрыялізацыя, павысілася абараназдольнасць краіны.

## РАЗВІЦЦЁ ПРАМЫСЛОВАСЦІ Ў 1920-Я – 1930-Я ГГ.

У 1920-я гг. на тэрыторыі Віцебскага і Суражскага раёнаў развівалася амаль выключна саматужная і дробная прамысловасць, заснаваная на перапрацоўцы мясцовай сыравіны. Працавалі шэраг паравых і вадзяных млыноў (у Суражы, Мазалаве, Лужасне, Курыне, Сялютах, Янавічах і інш.). У Янавічах і Вымне дзейнічалі вінакурні. Кардонная фабрыка імя Вароўскага існавала ў в. Пудаць. У Нова-Аляксандраўцы працаваў ільнозавод. Працягваў працу заснаваны ў другой палове XIX ст. шклозавод "Ноўка". Апошні з'яўляўся адным з буйнейшых прадпрыемстваў Віцебшчыны і належаў да цэнзавай прамысловасці. Сярэдняя дзённая зарплата рабочых шклозавода ў 1926/27 г. складала 1,74 руб. Спажывецкія кошты ў Віцебскім раёне летам 1927 г. былі наступныя: кілаграм жытняй мукі – 14,5 кап., пшанічнай мукі – 38 кап., кілаграм ялавічыны – 75 кап., пшана і грэчкі – 23 кап., дзесятак яек – 39 кап., цэнтнер бульбы – 3 руб. 75 кап. Літр газы можна было набыць за 12,5 кап., метр паркалю – 40 кап., сукна – 4 руб. 10 кап. Пара ботаў каштавала 19 руб.

Прадпрыемствы былі як дзяржаўныя, так і прыватныя. З абвяшчэннем у 1925 г. курса на сацыялістычную індустрыялізацыю ўзмацніўся ціск на прыватнікаў. З 1926 г. былі павялічаны падаходны і ўскосны падаткі з капіталу. Многія прыватныя прадпрыемствы спынілі сваё існаванне. Ліквідацыя прыватнага сектару была завершана ў гады першай пяцігодкі.

Індустрыялізацыя амаль не змяніла характар прамысловасці Віцебскага раёна. Яна заставалася пераважна дробнай і па-ранейшаму арыентавалася на перапрацоўку мясцовай сыравіны. Павысіўся ўзровень электрыфікацыі.

У Віцебскім раёне працавалі млыны, торфаапрацоўкі і цагельныя заводы (Курына, Ст. Сяло). У Суражскім раёне дзейнічалі масла- і ільнозаводы. Існаваў шэраг абутковых, кравецкіх, скураных арцеляў.

Індустрыяльнае развіццё гарадоў запатрабавала велізарнай колькасці працоўных рук, дэфіцыт якіх стаў відавочным у час першай пяцігодкі. Пачалася міграцыя значнай колькасці насельніцтва, у асноўным моладзі, з вёскі ў горад,

якая стымулявалася гвалтоўнай калектывізацыяй. Нават пасля ўвядзення ў 1932 г. пашпартоў, якіх калгаснікі не атрымалі, магчымасць уехаць у горад на працу захоўвалася. Ажыццяўляліся аргнаборы сельскіх жыхароў для працы на прадпрыемствах. Можна было атрымаць афіцыйны дазвол старшыні, або збегчы ў горад. Сяляне Віцебскага і Суражскага раёнаў накіроўваліся ў першую чаргу ў г. Віцебск, які ператвараўся ў буйны індустрыяльны цэнтр. Да 1933 г. колькасць рабочых, занятых у прамысловасці горада, вырасла амаль у два разы.

Значныя поспехі, зробленыя прамысловасцю ў першыя пяцігодкі, былі дасягнуты коштам зніжэння ўзроўню жыцця насельніцтва і эксплуатацыі працоўнага энтузіязму. Адбылося падзенне ўзроўню заробкаў. Абвастрылася жыллёвая праблема. У сувязі з рэзкім падзеннем ураджайнасці, выкліканым пачаткам калектывізацыі, пагоршылася забеспячэнне рабочых прадуктамі харчавання. У 1929 г. у Савецкім Саюзе была ўведзена карткавая сістэма. У 1932 г. на віцебскіх прадпрыемствах былі зніжаны тарыфныя стаўкі аплаты працы і нормы выдачы хлеба. У канцы мая ў Віцебску пачаліся перабоі з хлебам, што прывяло да стыхійных акцый пратэсту. Так, 26 мая адбылася дэманстрацыя галоднай чаргі.

Тым не менш, многія працоўныя верылі, што цяжкасці носяць часовы характар і з вялікім энтузіязмам будавалі сацыялізм. З канца 1920-х гг. развівалася сацыялістычнае спаборніцтва, у гады першай пяцігодкі звыш паловы рабочых Віцебска сталі ўдарнікамі. З 1935 г. на прадпрыемствах горада, як і па ўсім СССР, разгарнуўся стаханаўскі рух. Яго актыўнымі ўдзельнікамі сталі выхадцы з вёскі, якія імкнуліся павысіць свой сацыяльны статус і палепшыць матэрыяльнае становішча. Стаханаўцы ператвараліся ў новую эліту грамадства, але нават іх павышаныя заробкі маглі забяспечыць толькі элементарныя жыццёвыя патрэбы.

У 1935 г. былі адменены карткі на прадукты, праз год – на прамысловыя тавары. Палепшылася матэрыяльнае становішча. Людзі сталі лепш харчавацца і апранацца, у некаторых сем'ях з'явіліся веласіпеды і радыёпрыёмнікі.

Віцебск за гады перадваенных пяцігодак ператварыўся ў індустрыяльны горад з развітай тэкстыльнай, швейнай, дрэваапрацоўчай і іншымі галінамі прамысловасці. Непасрэднымі ўдзельнікамі індустрыяльных пераўтварэнняў сталі шматлікія ўраджэнцы Віцебскага раёна.

# РАЗВІЦЦЁ АСВЕТЫ И КУЛЬТУРЫ ВІЦЕБСКАГА РАЁНА Ў 1920-Я – 1930-Я ГГ.

Адной з перашкод на шляху будаўніцтва савецкага грамадства з'яўлялася непісьменнасць і малапісьменнасць насельніцтва. Напрыклад, у Вымнянскай, Сялюцкай, Янавіцкай валасцях непісьменныя складалі да 90% . Таму новая ўлада разгарнула працу па навучанню дарослага насельніцтва. Пры школах павета арганізоўваліся вячэрнія заняткі з дарослым непісьменным насельніцтвам, ствараліся спецыяльныя пункты па ліквідацыі непісьменнасці (лікпункты), школы пісьменнасці. Для таго, каб заахвоціць людзей да вучобы, мясцовае кіраўніцтва загадвала вызваляць непісьменных на час навучання "от всех видов трудовых и гужевых повинностей", а іх абавязкі размяркоўваць сярод астатняга насельніцтва. За ігнараванне вучобы прадугледжваўся штраф, які ў 1921–1922 гг. складаў 25 тыс. руб.

Аднак, школ для дарослых у павеце было мала, многія з іх закрываліся "по несознательности граждан, которые не хотят посещать школу", а таксама ў выніку занятасці вяскоўцаў на асабістым падвор'і. Не спрыялі хуткаму вырашэнню праблемы па ліквідацыі непісьменнасці дарослых і адсутнасць неабходнай літаратуры, недахоп настаўнікаў, нізкая якасць навучання, вялікі адсеў. У выніку, большасць з тых, хто прайшоў навучанне, заставалася малапісьменнай.

У 1934–1935 гг. у БССР школы для непісьменнага насельніцтва перасталі дзейнічаць. На іх аснове ствараліся адзіная пачатковая вячэрняя школа з трохгадовым тэрмінам навучання.

Стваралася новая сістэма школьнай адукацыі. Адкрываліся ў асноўным пачатковыя школы, дзе вялікая ўвага ўдзялялася працоўнаму навучанню. Гэтыя школы падзяляліся на дзве ступені: у школах I-й ступені навучаліся дзеці ад 8 да 13 гадоў, у школах II-й ступені – ад 13 да 18 гадоў.

Адной з першых на пачатку 1918 г. у двухпавярховым асабняку памешчыка Іванова адкрылася Мазалаўская

пачатковая школа. У кастрычніку 1918 г. на базе гэтай школы і Новаерусалімскага народнага вучылішча ў маёнтку Мазалава была арганізавана школа І-й ступені. У ёй навучаліся дзеці з вв. Мілае, Мазалава, Рымары, Буева, Ізбовічы, Рашоткі, Новы Ерусалім, Плятнішча.

У 1919 г. у Віцебскім павеце працавала 231 школа (вучыліся 13 666 дзяцей), 9 дзіцячых садоў (на 406 дзяцей). Большасць вясковых школ працавала ў сялянскіх хатах. Вострай была кадравая праблема. У 1924 г. на ўліку ў павеце было настаўнікаў з вышэйшай адукацыяй – 10%, з сярэдняй – 71%, з хатняй і ніжэйшай – 19%.

У 1920-я гг. заняткі ў школах павета праводзіліся з кастрычніка па 15 мая ўключна, улічваючы тое, што сялянскія сем'і ўвесну-ўвосень дапамагалі бацькам у гаспадарцы, даглядалі малодшых дзяцей. Вясковыя школы ў Віцебскім павеце працавалі на самазабеспячэнні. Напрыклад, у 1922–1923 навучальным годзе з кожнага вучня Бабініцкай савецкай школы І-й ступені было ўзята на рамонт і патрэбы школы па 900 руб., а з меўшых коней – і па 2 вазы дроў. Вучоба дзяцей амаль поўнасцю залежала ад бюджэту сям'і.

Цяжкасці на Віцебшчыне паступова пераадольваліся. Былі створаны прафесійныя навучальныя установы. У 1920 г. у Лужаснянскім сельгасвучылішчы адбыўся выпуск 30 вучняў. У 1921 г. была адкрыта Лосвідская сельскагаспадарчая школа. У 1928 г. у Віцебскім раёне працавала 280 школ І-й ступені, 18 школ ІІ-й ступені, 6 сямігодак, 4 бібліятэкі, 2 дзіцячыя сады, 2 дзіцячыя дамы.

IX Усебеларускі з'езд Саветаў (май 1929 г.) у прынятым ім першым пяцігадовым плане развіцця народнай гаспадаркі Беларусі прадугледжваў ажыццяўленне ўсеагульнага пачатковага навучання дзяцей школьнага ўзросту. У 1931-32 навучальным годзе ў БССР працягвалася паступовае ўвядзенне ўсенавуча на базе сямігадовай школы. У Віцебскім павеце гэта адбывалася праз перавод пачатковых школ у сямігадовыя і будаўніцтва новых сямігодак. Да прыкладу, у 1935 г. у вв. Задуброўе і Станькі Суражскага раёна, другі камплект у школе в. Цімахі. У 1937 г. былі выдзелены значныя сродкі для рамонту і ўзвядзення школьных будынкаў Лунькаўскай пачатковай, Станькаўскай, Пудацкай і Касплянскай сямігадовых,

Суражскай і Янавіцкай сярэдніх школ гэтага раёна, пры Казакоўскай сямігодцы быў пабудаваны інтэрнат.

У выніку рэарганізацыі ў 1940-41 гг. у Віцебскім раёне працавала 65 школ (11875 вучняў, 420 настаўнікаў), у Суражскім – 81 школа (8976 вучняў, 334 настаўнікі), у гэтых раёнах налічвалася 16 дзіцячых садоў (330 дзяцей, 31 выхавацель). У Лужаснянскім сельгастэхнікуме займаліся 122 навучэнцы.

На Віцебшчыне ў 1920-я гг., як і ва ўсёй краіне, вялікае значэнне ў ходзе сацыялістычнага будаўніцтва надавалася культурна-асветным установам – бібліятэкам, клубам, Народным дамам, хатам-чытальням, якія павінны былі садзейнічаць саветызацыі насельніцтва, далучэнню яго да сацыялістычнага будаўніцтва. Вялікая ўвага надавалася антырэлігійнай прапагандзе. У 1920 г. у Віцебскім павеце існавала даволі шырокая сетка культурна-асветных устаноў: 33 бібліятэкі, 13 Народных дамоў, 4 клубы, 1 народны тэатр, 4 музычныя і харавыя студыі, 70 хат-чытален.

Створаныя ў пачатку 1920-х гг. культустановы Віцебскага павета мелі даволі слабую матэрыяльна-тэхнічную базу. Напрыклад, у 1922 г. у Сялюцкай, Вымнянскай валасцях праца Народных дамоў і клубаў была спынена па той прычыне, што іх будынкі патрабавалі рамонту. Народны дом Янавіцкай воласці з лютага 1922 г. перайшоў на “хозрасчёт и обслуживается своими средствами”, даволі цяжка прыходзілася загадчыку з нарыхтоўкай паліва. Характэрны прыклад са справаздачы 1922 г. загадчыка Віцебскага валаснога аддзела па палітасвеце: “1) Народных домов в волости нет; 2) культкружков также, существующий же раньше кружок распался за отсутствием средств и опытных руководителей. Вновь создать его невозможно в виду безучастного отношения к этому вопросу местного населения; 3) ликпунктов и школ для взрослых не имеется по причине отсутствия средств и работников по ликвидации безграмотности. Отношение шкрабов (школьных работнікаў – аўт.) к ликпунктам и школам для взрослых сочувственное, а отношение к ним населения отрицательное, вследствие ничтожных знаний, даваемых им при больших затратах времени; неграмотных в волости 40%”. Аднак, і ў такі цяжкі перыяд існавання культустаноў, Віцебская воласць адлічыла 12 млн руб. за праведзеныя

12 спектакляў на карысць галадаючых Паволжа.

Некаторая дапамога вёсцы ў культурна-асветнай і палітыка-масавай рабоце аказвалася партыйнымі і камсамольскімі арганізацыямі Віцебска. Партыйная ячэйка вайскоўцаў шэфствавала над Сялюцкай камуністычнай ячэйкай – сабрала ёй бібліятэчку з 80 кніг, выпісала газету «Витебские известия». 1 мая 1923 г. шэфы правялі ў вёсцы мітынг, прачыталі ў Народным доме два даклады, паставілі спектакль, арганізавалі спартыўныя выступленні. Партыйная ячэйка абутковай фабрыкі шэфствавала над саўгасам «Падбярэззе», ячэйка чыгуначнікаў – над Даўжанскай вясковай ячэйкай і г. д. Сяляне былі ўдзячныя шэфам за газеты, часопісы, кнігі, за даклады і інфармацыю пра падзеі ў свеце. Адзначалася з дапамогай шэфаў шостая гадавіна Кастрычніка ў Кузняцоўскай воласці. Шэфамі быў пастаўлены спектакль, а школьныя работнікі і вучні падрыхтавалі канцэрт.

Культура Віцебшчыны ўзбагачалася дасягненнямі навукова-тэхнічнага прагрэсу. У вёскі прыходзіла электрычнасць, радыё, кіно, тэлефон. Так, у пачатку 1930-х гг. у Суражскім раёне была ўжо 101 радыёўстаноўка, пазней з'явіліся кінаўстаноўкі, у тым ліку гукавыя. У 1935 г. Суражскаму раёну на рамонт, абсталяванне, электрыфікацыю і радыёфікацыю ўстаноў культуры было выдзелена 14 тыс. руб. (па тым часе значная сума). У 1937 г. у раёне былі адкрыты паштовыя аддзяленні ў Запольскім, Астраўскім, Шаброўскім і Котаўскім сельсаветах, а ў 1940 г. налічвалася 570 радыёкропак, меліся 54 радыёпрыёмнікі, тэлефоны былі ўстаноўлены ў 16 сельсаветах, 2 МТС, у 2 калгасах і 1 саўгасе. У Віцебскім раёне было 812 радыёкропак, 31 радыёпрыёмнік, а тэлефон быў у 14 сельсаветах, 3 МТС і 8 калгасах. З 1933 г. у Суражы выходзіла раённая газета "Ударнік", з 1938 г. віцебская раённая – "Калгасная трыбуна".

Такім чынам, станаўленне і развіццё вясковых школ і культурна-асветных устаноў у 1920 – 1930-я гг. на Віцебшчыне адбывалася ў няпростых умовах, але былі дасягнуты значныя поспехі ў павышэнні адукацыйнага і культурнага ўзроўню насельніцтва. Нажаль, многія дасягненні ў сістэме адукацыі і культуры былі страчаны ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны.

ТЭМА 5

# ВІЦЕБСКАЕ ПРЫДЗВІННЕ Ў ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

## ПАЧАТАК ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ. АБАРОНЧЫЯ БАІ

22 чэрвеня 1941 года пачалася Вялікая Айчынная вайна. Адчуванне таго, што вайна будзе, існавала ў народзе. 21 чэрвеня бюро Віцебскага райкома КП(б)Б прыняло пастанову аб арганізацыі на тэрыторыі раёна пастаянных груп і атрадаў па знішчэнні авіядэсантаў праціўніка (канкрэтны праціўнік пакуль не называўся).

З пачаткам вайны пачалася мабілізацыя мужчын у Чырвоную армію. "Усе на барацьбу з нямецка-фашысцкімі захопнікамі!" – гэты лозунг стаў галоўным з першых дзён вайны, калі ў распараджэнне Віцебскага аблваенкамата накіроўваліся прызваныя ваеннаабавязаныя, у прыватнасці для ўкамплектавання  Віцебскага запаснога палка. Пачалі стварацца пасты паветранага назірання, апавяшчэння і сувязі. На тэрыторыі раёна яны былі ў населеных пунктах Войтава, Астроўкі, Лётцы, Ноўка, Міхалі, Вугалок і Батанічы.

Калі над Віцебскам і вобласцю навісла пагроза варожай акупацыі, партыйныя і дзяржаўныя органы разгарнулі работу па стварэнні падпольных арганізацый для барацьбы ў тыле ворага. У хуткім парадку з Віцебска і раённых цэнтраў праводзілася эвакуацыя каштоўнасцей на Ўсход.

Віцебскі райком КПБ і райваенкамат праводзілі мабілізацыю ў армію людскіх рэзерваў, цяглавай сілы і тэхнікі на тэрыторыі раёна. Праходзіла эвакуацыя ў савецкі тыл дзіцячых дамоў, грамадзянскага насельніцтва, ішоў вываз трактароў, жывёлы і іншых каштоўнасцей. На тэрыторыі раёна па ўказанні партыйных органаў сталі ствараццa знішчальныя групы. Адна з іх дзейнічала на тэрыторыі Заронаўскага сельскага савета.

У ліпені 1941 года тэрыторыя нашага раёна стала арэнай жорсткіх баёў. Немцы надавалі вялікае значэнне захопу г. Віцебска, бо за ім адкрываўся шлях на Смаленск і Маскву.

Подступы да Віцебска ўтрымлівалі 22-я і 20-я арміі (генералы П.А. Ершакоў і П.А. Курачкін). У тыле ў іх разгортвалася 19-я армія (І.С. Конеў). Да пачатку баёў поўнае размяшчэнне армій не завяршылася, але часці занялі абарону.

На лініі Гняздзілавічы–Ходцы–Ліпнева–Мошканы–Гладышы–воз. Саро–Аляксандрава, на заходніх подступах да горада, з боку Сянно і Лепеля, стаяла 153-я стралковая дывізія 20-й арміі. Штаб дывізіі знаходзіўся ў 2–3 км на захад ад Віцебска (в. Талеркі). Гэтая дывізія была тэрмінова перакінута да Віцебска з Уральскай вайсковай акругі і таму часу для падрыхтоўкі моцнай лініі абароны ў яе байцоў не было. У падрыхтоўцы да абароны горада дапамагалі мясцовыя жыхары, якія рылі акопы, рыхтавалі бутэлькі з гаручай сумессю.

Вайскоўцы ж, у сваю чаргу, аказвалі дапамогу ў падрыхтоўцы і навучанні байцоў народнага апалчэння. Яшчэ ў пачатку вайны асноўныя сілы Віцебскага гарнізона былі перакінуты да заходніх меж і ахова вуліц горада лягла на плечы апалчэнцаў. Так, ужо 5 ліпеня ў раёне Юр’евай горкі вайскоўцы і апалчэнцы сумеснымі сіламі знішчылі нямецкі дэсант.

3–4 ліпеня разгарнуліся баі на дальніх подступах да Віцебска, немцы прарвалі абарону ў раёне Лепеля і выйшлі на лінію Ула–Бешанковічы–Сянно. 8–9 ліпеня пасля жорсткіх баёў праціўнік пераправіўся на правы бераг Заходняй Дзвіны. Матарызаваны нямецкі корпус прарваўся ў раён Віцебска.

Пасля моцнай артпадрыхтоўкі немцы зрабілі спробу прарвацца ў горад адразу ў некалькіх месцах: каля Чэпіна, па Гарадоцкай, Полацкай шашы і з боку аэрадрома. Крывапралітныя баі ішлі і ў самім Віцебску. Левы бераг Заходняй Дзвіны ў раёне Мазурына абараняў батальён АСААВІЯХІМа. Полк міліцыі пад камандаваннем кіраўніка абласнога ўпраўлення НКУС А.Л. Радзюка, які складаўся з чатырох батальёнаў, прыкрываў подступы да Маркаўшчыны, Мазурына, Пескаваціка, лінію абароны ад саду імя Леніна да Новага маста і гарбарні. У складзе палка знаходзіўся і батальён Вілейскай школы міліцыі пад камандаваннем Н.Я. Мандруса, які абараняў Віцебск з боку Цірaспаля, на шашэйных дарогах Віцебск–Полацк і Віцебск–Невель.

Нямецкія войскі ўступілі на тэрыторыю раёна 8 ліпеня 1941 года. У гэты дзень на станцыю Ст. Сяло прыбыў таварны цягнік з маёмасцю прадпрыемстваў, магазінаў, складоў і інш. з Шуміліна. Ён накіроўваўся на станцыю Віцебск для далейшай эвакуацыі. Праляцеўшы над цягнікам нямецкі самалёт пачаў яго бамбіць. Цягнік загарэўся. Пад'ехаўшыя на матацыклах немцы адкрылі агонь па чыгуначніках і салдатах, якія выскоквалі з вагонаў. Усіх загінуўшых жыхары вёскі пахавалі ў брацкай магіле на лятчанскіх могілках.

9 ліпеня немцы захапілі заходнюю частку Віцебска. Баі за Юр'еву горку ўскладнілі выйсце праціўніка да Заходняй Дзвіны ў раёне вакзалу і немцы зрабілі спробу пераправы



Нямецкі умацаванне каля в. Баронікі (сучасны здымак)

на ўсходні бераг Заходняй Дзвіны ў раёне Пескавапіка і Мазурына. Але тут шлях ворагу перашкодзіў батальён АСААВІЯХІМа. 10 ліпеня на паўночна-ўсходняй ускраіне горада, у раёне Журжава, амаль цалкам загінула 1-я рота батальёна АСААВІЯХІМа. У выніку пяцігадзіннага бою каля ст. Лосвіда батальёну Чыгуначнага раёна прыйшлося адысці да Успенскай горкі. Батальён Першамайскага раёна не даваў праціўніку пераправіцца ў раёне маста ў цэнтры горада. Батальён Н.Я. Мандруса са стратамі адступіў на левы бераг Заходняй Дзвіны.

Фарсіраваўшы Дзвіну, немцы захапілі в. Уланавічы

і аэрадром, чыгуначны мост і абыйшлі абаронцаў горада з флангаў, поўначы і поўдня. Горад аказаўся ў акружэнні. Але абаронцы працягвалі змагацца. Раніцай 11 ліпеня савецкія войскі вымушаны былі пакінуць Віцебск.

Жорсткія бai з пераўзыходзячымі сіламі ворага адбываліся і ў раёне Янавіч, дзе 13 ліпеня танкамі і матацыклістамі праціўніка быў атакаваны штаб 25-га стралковага корпуса, і ў раёне Суража, дзе полк міліцыі палкоўніка А.Л. Радзюка вёў бой з фашыстамі, прыкрываючы адыход нашых войск. За арганізацыю абароны г.п. Суража А.Л. Радзюк быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга. У баявых дакументах ліпеня 1941 года згадваюцца баі каля населеных пунктаў Віцебскага раёна: Асінаўка, Маклакі, Старынцы, Латышы, Вароны, Забалоцінка, Пруднікі і іншых.

Такім чынам, на працягу ліпеня 1941 г. тэрыторыя раёна аказалася арэнай ваенных дзеянняў, у выніку якіх былі знішчаны значныя матэрыяльныя каштоўнасці, загінулі тысячы байцоў Чырвонай Арміі і мірных жыхароў. Горад і наваколлі аказаліся захоплены нямецка-фашысцкімі войскамі. Аднак, у баях на тэрыторыі Віцебскага раёна вораг панёс цяжкія страты.

## АКУПАЦЫЙНЫ РЭЖЫМ

У ліпені 1941 г. тэрыторыя Віцебскага раёна была захоплена нямецкімі войскамі. На занятай тэрыторыі быў усталяваны жорсткі ваенна-паліцэйскі рэжым, прыняты шэраг пастаноў і загадаў, праведзены рад мерапрыемстваў, якія рэгламентавалі паўсядзённае жыццё. Так, напрыклад, грамадзянам забаранялася знаходзіцца па-за межамі сваёй воласці, была ўведзена каменданцкая гадзіна. Жыхарам, якія былі заўважаны на вуліцах, пагражаў арышт і нават расстрэл.

Тэрыторыя раёна ўвайшла ў склад тылавой зоны нямецкай групы армій “Цэнтр”; вярхоўная ўлада тут належыла нямецкім ваенным камендатурам. Для больш эфектыўнага кіравання захопленай тэрыторыяй акупанты ўтварылі дапаможную адміністрацыю (акруговыя, гарадскія, раённыя і павятовыя ўправы) з мясцовага насельніцтва, куды, як правіла, ішлі служыць грамадзяне, незадаволеныя савецкай уладай. Падраздзяленнем дапаможнай адміністрацыі з’яўлялася мясцовая паліцыя. На Віцебшчыне дзейнічалі шматлікія

вайсковыя падраздзяленні нямецкай арміі: ахоўныя дывізіі, тайная палявая паліцыя, жандармерыя, СД і атрады айнзацгрупы "Б" (спецыяльнае падраздзяленне, прызначанае для карных аперацый супраць грамадзянскага насельніцтва). Акрамя нямецкіх вайсковых структур і беларускай паліцыі акупанты актыўна выкарыстоўвалі фарміраванні з былых савецкіх ваеннапалонных, ураджэнцаў Каўказа і Сярэдняй Азіі. На тэрыторыі раёна размяшчаўся татарскі батальён.

Масавае знішчэнне савецкіх грамадзян і, галоўным чынам, ваеннаслужачых Чырвонай Арміі, пачалося з моманту акупацыі Віцебска нямецка-фашысцкімі захопнікамі, што пацвярджаецца шматлікімі паказаннямі жыхароў вёсак Мішуткі і Мішкавічы, размешчаных паблізу будучага лагера смерці "5-ты полк". Згодна з гэтымі паказаннямі, немцы штодзённа прывозілі туды на машынах па 200–250 чалавек, ставілі на край ямы і расстрэльвалі іх з кулямётаў і аўтаматаў.

Для ваеннапалонных і грамадзянскага насельніцтва былі ўтвораны канцэнтрацыйныя лагеры. У Віцебску на працягу 1941–1944 гг. дзейнічалі 5 буйных лагераў смерці (у тым ліку, 1 гета), 6 аддзяленняў і філіялаў. Жыццё ў іх вызначалася самай жорсткай барацьбой за выжыванне.

Першы лагер утварыўся на тэрыторыі 5-га чыгуначнага палка (зараз па вуліца Цітова) у верасні 1941 г. для ваеннапалонных. Размяшчаўся па абодва бакі рова. Меў тры вышкі з кулямётамі для назірання. У 1941 г. тут знаходзілася да 40000 чал. Да 1943 г. амаль усе яны былі знішчаны. Пасля таго ён выкарыстоўваўся немцамі як перасыльны пункт для грамадзянскага насельніцтва, якое вывозілася на прымусовыя работы ў Германію (з 1943 г. па люты 1944 г.). Усяго тут загінула 80 (па іншых звестках 100) тыс. чал.



Помнік на месцы былой в. Баркі

Ваеннапалонных і мірных жыхароў вынішчалі шляхам стварэння галоднага рэжыму пры непасільнай фізічнай працы, антысанітар-

ных умовах, пазбаўленні медыцынскай дапамогі, катаванняў і сістэматычных расстрэлаў. Каля 100 грамаў неядомага хлеба і суп з адходаў з'яўляліся сутачным рацыёнам палонных. Людзі не мелі нават лыжак і кацялкоў. Каб атрымаць рэдкую поліўку, яны прыстасоўвалі ржавыя бляшанкі з-пад кансерваў, чарапкі бітага посуду. Летнія баракі зімой не ацяпляліся. Паўраздзетыя ваеннапалонныя паміралі ад жорсткіх марозаў.

Лагер у пасёлку Лучоса ("Архіерэйская дача") быў створаны ў 1941 г. на левым беразе ракі. Тут фашысты трымалі пераважна камандзіраў і палітработнікаў Чырвонай Арміі, армейскіх і партызанскіх разведчыкаў. Умовы ў ім былі самыя жорсткія. Зняволеным амаль не давалі ежы. Ад голаду людзі аб'ядалі лісце і кару на дрэвах. Расстрэлы праводзіліся амаль штодзённа.

Каля вёскі Уланавічы былі размешчаныя "Чорныя пруды", дзе ўжо ў першыя дні вайны з 14 па 17 ліпеня 1941 г. былі расстраляныя нямецка-фашысцкімі захопнікамі героі віцебскага падполля, тысячы вязней канцлагераў-ваеннапалонных салдат і афіцэраў Чырвонай Арміі, а таксама мірных жыхароў Віцебска і навакольных вёсак. У в. Лужасна, у памяшканнях гаспадарчага двара, быў створаны лагер, у якім утрымліваліся ваеннапалонныя, узятыя ў палон партызаны і мясцовыя жыхары, западозраныя немцамі ў сувязях з партызанамі.



Помнік на месцы загубы савецкіх ваеннапалонных і мірных жыхароў у 1941-1944 гг. у в. Лужасна)

Усяго за тры гады акупацыі ў пяці віцебскіх канцлагерах і шасці іх філіялах і аддзяленнях фашысты знішчылі 76 тыс. ваеннапалонных і каля 62 тысяч мірных грамадзян (па іншых звестках – не менш 150 тыс.).

Расавая палітыка нацыстаў прадугледжвала т.зв. "канчатковае выра-

шэнне яўрэйскага пытання”, г.зн. поўнае знішчэнне яўрэяў. На тэрыторыі Віцебскага раёна яўрэйскае насельніцтва кампактна пражывала ў гарадскім пасёлку Сураж і мястэчку Янавічы. 2 жніўня 1941 г. нямецкімі карнікамі была знішчана яўрэі ў г.п. Сураж. Каля ільнозавода і ручая Гарадзішча было расстраляна 969 чалавек. 25 жніўня 1941 г. было створана гета ў м. Янавічы, у якім знаходзілася каля 1600 чалавек. Ужо 10 верасня 1941 г. усе яны былі знішчаны. Трагедыя адбылася і ў в. Вярхоўе. Тут былі знішчаны некалькі дзесяткаў яўрэяў. Некаторых з іх прыгналі ў в. Лужасна і там растралялі.

## Эканамічныя мерапрыемствы акупантаў.

Галоўнай мэтай германскай палітыкі на акупаваных савецкіх тэрыторыях было гаспадарчае іх выкарыстанне. Акупанты абклалі мясцовае насельніцтва шматлікімі падаткамі. Сяляне былі абавязаны здаваць штогадовы натуральны падатак, плацілі падушны падатак. Пасля выплаты абавязковых паставак прадуктаў, рэквізіцый з боку вайсковых частак вермахта і паліцыі заставалася няшмат, каб дацягнуць новага ўраджаю і абмяняць частку харчоў на прамысловыя тавары на рынку.



Мемарыяльны знак на месцы загубы яўрэйскага насельніцтва каля в. Тулава

Сабраныя прадукты павінны былі выкарыстоўвацца ў першую чаргу для патрэб вермахта, а таксама для забеспячэння Германіі. Згодна з “Дырэктывамі па кіраўніцтве эканомікай у зноў акупіруемых усходніх абласцях” Герынга, акупацыйныя ўлады заявілі пра захаванне калгасаў. Гітлераўцы заклікалі сельскае насельніцтва працягваць работу, не прадпрымаць адвольнага перадзелу зямлі, абараняць жывёлагадоўчыя гаспадаркі, запасы зерня ад разбурэнняў і пашкоджанняў. Фашысты планавалі выкарыстаць грамадскія пабудовы, інвентар калгасаў і саўгасаў, склаўшыся ў гэтых гаспадарках севазварот, навыкі калектыўнай працы ў будучым, пры стварэнні нямецкіх гросбаўэраўскіх гаспадарак і памешчыцкіх маёнткаў. Такім чынам, тэрыторыя Віцебскага раёна, як і ўсёй Беларусі, падлягала каланізацыі і германізацыі.

Пазней на базе калгасаў гітлераўцы стварылі так званыя “абшчынныя гаспадаркі”, на базе саўгасаў – “дзяржаўныя

маёнткі”, “земскія двары”.

Нямецкія ўлады захавалі савецкія грошы, увёўшы паралельна з імі акупацыйную марку ў суадносінах: 1 марка роўная 10 савецкім рублям.

Нямецкай адміністрацыяй былі ўстаноўлены наступныя, значна заніжаныя адносна сапраўднага кошту, расцэнкі пры закупцы харчовым аддзелам гародніны ў абшчын Віцебскага раёна: бульба – 25–30 кап. за кг; буракі – 20–25 кап.; морква – 25–30 кап.; зялёныя памідоры – 20–25 кап.; свежая капуста – 20–25 кап. Распараджэннем нямецкага камандавання былі ўведзены таксама абавязковыя пастаўкі гародніны і бульбы з агародаў, якія знаходзіліся на мяжы горада. Нормы паставак былі вельмі высокія: 1) агароды да 0,3 га ад паставак вызваляліся; 2) ад 0,3 да 0,6 га павінны былі пастаўляць па 40 кг гародніны або бульбы з кожнага 0,01 га; 3) ад 0,5 га і вышэй – па 50 кг з кожнага 0,01 га.

Абавязковай рэгістрацыі ў акупацыйных органах падлягалі коні, каровы, цяляты, авечкі, козы, свінні, гусі, трусы, куры і нават пчолы. Прычым парушальнікам пагражаў штраф у памеры да 4000 руб. з канфіскацыяй жывёлы. На падставе загада каменданта вобласці ад 09.07.1941 г. былі ўстаноўлены цэны на здачу мясной жывёлы на пункты, вызначаныя германскім ваенным камандаваннем: за 100 кг жывой вагі рагатай жывёлы – ад 70 да 200 руб., цялят – ад 60 да 170 руб., свіней – ад 200 да 300 руб., авечак – ад 65 да 175 руб.

Продаж усялякай жывёлы на рынках ці іншых месцах забараняўся. Зерне павінна было здавацца на бліжэйшыя загатоўчыя пункты Заготзерно. Так, за 100 кг жыта давалі 25 руб., пшаніцы – 34, авёсу – 25. Гаспадары кароў павінны былі здаваць па 200 літраў малака ў год, незалежна ад памераў іх сям'і і стану іх жывёлы. У 1943 г. норма павялічылася да 300 літраў, а ў 1944 – да 400 літраў. Былі ўведзены таксама абавязковыя пастаўкі яек і воўны.

Распараджэннем нямецкіх улад у жніўні 1941 г. была ўведзена ўсеагульная працоўная павіннасць. Сельскае насельніцтва абавязвалі працаваць у калгасах, яно прыцягвалася да ачысткі, размініравання і аховы шашэйных дарог і чыгунак, выкарыстоўвалася на абарончых работах, торфараспрацоўках, лясных работах, выконвала гужавую павіннасць.

Цяжкае становішча на Усходнім фронце выклікала ў немцаў патрэбу ў мабілізацыі ў армію мужчын малодшага

прызыўнога ўзросту. З вясны 1942 г. акупацыйныя ўлады пачалі вываз насельніцтва Віцебскага раёна на прымусовыя работы ў Германію.

Спачатку насельніцтва раёна акупанты спрабавалі адпраўляць на работу ў Германію на добраахвотнай аснове. На акупаваных тэрыторыях была разгорнута актыўная агітацыйная кампанія. У прэсе друкаваліся матэрыялы аб высокім узроўні жыцця працоўных і сялян у рэйху, растлумачваўся парадак выезду. У агітацыйных артыкулах падкрэслівалася, што большасць прадпрыемстваў у выніку баявых дзеянняў знішчана, а ў Германіі остарбайтарам будзе прадстаўлена работа і дадзена магчымасць стаць кваліфікаваным спецыялістам. Аднак падобныя абяцанні існавалі толькі ў нямецкіх агітацыйных артыкулах.

Колькасць добраахвотнікаў не апраўдала чаканняў нямецкіх улад, і з другой паловы 1942 г. пачаўся прымусовы вываз рабочых у Германію. Ад прымусовай працы вызваляліся толькі асобы, якія неслі службу ў мясцовых узброеных фарміраваннях, а таксама прызнаныя нягоднымі спецыяльнай медыцынскай камісіяй.

З той прычыны, што заселенасць беларускіх зямель значна паменшылася яшчэ да 1942 г., пры выкананні плана вывазу карэннага насельніцтва ў Нямеччыну акупацыйныя ўлады сутыкнуліся са значнымі цяжкасцямі. Былі пашыраны ўзроставыя рамкі працоўных. Немцы сталі адпраўляць у Германію непаўналетніх ва ўзросце ад 10 да 14 год. Былі выпадкі, калі вывозіліся і асобы пенсіённага ўзросту.

Захопам насельніцтва ў горадзе і на тэрыторыі раёна займаліся армейскія часткі 53-га корпуса групы армій “Цэнтр”, жандармерыя, атрады СС і СД, а таксама мясцовыя ўзброеныя фарміраванні (паліцыя, Руская народная армія). Садзейнічалі ўгону прадстаўнікі мясцовых улад – старасты, бургамістры. Вялікая колькасць остарбайтараў была захоплена ў час правядзення карнікамі аперацый супраць партызан.

У час акупацыі з тэрыторыі Віцебскага раёна акупанты вывезлі ў Германію 4362 чал., а з вобласці было ўгнана 68934 чал.

У адказ на партызанскі рух, непадпарадкаванне нямецкім уладам з боку простых грамадзян акупанты правялі шэраг карных аперацый, пад час якіх загінула 8408 чал. (пераважна мірных жыхароў), былі спалены 160 вёсак, 14628

сялянскіх двароў з надворнымі пабудовамі, захоплены дзесяткі тон прадуктаў.

Такім чынам, рэалізацыя нацысцкіх планаў ставіла людзей ва ўмовы выжывання. Генацыд ажыццяўляўся рознымі спосабамі і сродкамі: запалохванне, тэрор, непамерныя, шматлікія падаткі і паборы на карысць нямецкіх улад, пазбаўленне элементарных грамадзянскіх правоў і чалавечых свабод, абмежаванні ў продажы прадукцыі ўласнай гаспадаркі селяніна, сістэма шматлікіх штрафаў і пакаранняў за адыход ад дазволеных дзеянняў. Палітыка, якая праводзілася немцамі, прывяла да масавага разарэння гаспадарак мясцовага насельніцтва, да агульнага пагаршэння жыцця жыхароў нашага краю, вывазу яго ў Германію, знішчэння пэўнай часткі людзей.

## БАРАЦЬБА ПАРТЫЗАН І ПАДПОЛЬШЧЫКАЎ

8 ліпеня 1941 г. пачалася акупацыя вёсак нашага краю. 11 ліпеня савецкія войскі пакінулі горад Віцебск. Знішчальныя групы, якія ствараліся на тэрыторыі раёна для барацьбы з дэсантамі праціўніка, пераўтвараліся ў партызанскія атрады.

9 ліпеня 1941 г. з ліку рабочых Пудацкай картоннай фабрыкі быў арганізаваны першы партызанскі атрад на Віцебшчыне (на той час гэта быў Суражскі раён). Яго ўзначаліў былы дырэктар фабрыкі Мінай Піліпавіч Шмыроў.



У жніўні на тэрыторыі Нікалаеўскага і Бараўлянскага сельскіх саветаў ствараецца партызанская група І.Д. Буцьянава (з лістапада 1941 г. яе ўзначаліў М.Ф. Бірулін), якая ў лютым 1942 г. была пераўтворана ў партызанскі атрад.

За 7 км ад в. Заронава, у лесе “Лосвідская дача”, В.А. Зімяніным была заснавана група, якая дзейнічала ў раёне вёсак Бялянкі, Воронава, Сывараткі, Козлы, Заронава, Лётцы, Палойнікі, Матрасы, Сцепанкова, Кузняцова, Міклушы.

Многія жыхары нашага краю ў перыяд вайны змагаліся ў розных партызанскіх атрадах, якія дзейнічалі ў трохкутніку Полацк – Гарадок – Віцебск і іншых раёнах Віцебскай вобласці. Гэта партызаны атрада імя В.І. Чапаева: камандзір

атрада І.С. Банкароў (афіцэр Чырвонай Арміі), камісар А.В. Мецялёў, начальнік штаба І.П. Галубоўскі (настаўнік Старасельскай школы) і іншыя. Гэта і адважныя падпольшчыкі групы В.А. Зімяніна, якія пасля правалу групы і арыштаў 1942 г., працягвалі змагацца ў атрадзе "Мышко" брыгады "Няўлоўныя" пад камандаваннем М.С. Пруднікава.

Партызанскія фарміраванні распачалі актыўныя баявыя дзеянні: наладжвалі засады, ажыццяўлялі дыверсіі на чыгунках, узрывалі масты, парушалі сувязь. Быў разгромлены малаказавод у в. Собалева, выведзена са строю вадакачка на чыгуначнай станцыі Лосвіда. Пэўны баявы вопыт дапамог у арганізацыі нападаў на нямецкія гарнізоны. У ноч з 9 на 10 верасня 1941 г. атрад М.П. Шмырова разграміў фашысцкі гарнізон у г.п. Сураж, у выніку чаго было забіта шмат гітлераўцаў, падарваны аўтамашыны, парушана тэлефонная станцыя. Партызаны захапілі зброю, боепрыпасы, правіянт. У адказ фашысты завочна асудзілі М.П. Шмырова да смяротнага пакарання, абяцаючы за яго ўзнагароджанне – 30000 нямецкіх марак і ў дадатак карову. 22 кастрычніка гітлераўцы арыштавалі ў якасці заложнікаў чатырох дзяцей партызанскага камандзіра, якія былі расстраляны.


Помнік дзецям М.П. Шмырова ў г.п. Сураж

З першых дзён акупацыі для барацьбы з ворагам у прыгарадзе Віцебска стварыліся падпольныя групы – В.С. Кулагінай (в. Букаціна), П.К. Ляхоўскага (ст. Старое Сяло). Іх колькасць значна ўзрасла ў 1942 г. Гэта групы В.А. Азеуша (в. Букаціна), З.Я. Гваздзёвай (ст. Лужасна), П.П. Грунтова (гаспадарка "Падбярэззе"), М.І. Еўдакімава (в.Альгова), А.М. Казлова (в. Сасноўка), З.Ф. Кочатавай (г. Віцебск і в.Батрукі), А.В. Міхайлоўскай (в. Лётцы), І.А. Сідарэнкі–Пабудзея (в. Бабінічы), Е.С. Спірыдонавай (в. Трыніўкі) і іншыя. Рызыкуючы жыццём, патрыёты прымалі па радыё зводкі Саўін-


Мемарыяльны знак на месцы сходаў падпольшчыкаў каля в. Грабяніца

фармбюро і распаўсюджвалі іх сярод насельніцтва, вялі антыфашысцкую агітацыю, падавалі сігналы савецкім самалётам. Падпольшчыкі перадавалі інфармацыю партызанскім спец- і разведгрупам, здабывалі для іх зброю, боепрыпасы, медыкаменты, прадукты харчавання. Існавала і адваротная сувязь. Партызаны забяспечвалі іх узрыўчаткай, мінамі, лістоўкамі, газетамі, разам здзяйснялі дыверсіі.

У канцы 1941 г. нямецкае камандаванне з мэтай барацьбы з партызанамі было вымушана ўзмацніць ахоўныя і пяхотныя дывізіі, кавалерыйскую брыгаду СС, танкавыя і сапёрныя падраздзяленні, матарызаваныя часці палявой жандармерыі, паліцэйскія палкі і батальёны, якія ажыццяўлялі ахову тылавых камунікацый. З асаблівай жорсткасцю фашысты распраўляліся з мірным насельніцтвам, якое дапамагала партызанам.

Паспяховыя дзеянні партызан супраць немцаў працягваліся ў 1942 г. Агульны поспех мела ўзаемадзеянне партызан і падпольшчыкаў пры разгроме варожых гарнізонаў. У ноч на 7 жніўня 1942 г. атрад Р.І. Сысоева ўчыніў расправу нямецкай гаспадарцы ў м. Астроўна. Партызаны знішчылі барак для адпачынку фашысцкіх афіцэраў, спалілі гараж з газай, склад з боепрыпасамі і правіянтам, 3 аўтамашыны. У верасні партызанскі атрад М.Ф. Біруліна зрабіў налёт на нямецкі гарнізон у в. Мазалава. Стала вядомай і мела водгук аперацыя па разгрому гарнізона ў в. Падбярэззе, што ў 4-х км ад Віцебска. 31 студзеня 1943 г. атрад Сысоева напаў на гарнізон у в. Уланавічы. Ахова маёнтка разбеглася. Партызаны захапілі буйную рагатую жывёлу і коней. Такі ж налёт быў здзейснены на гаспадарку, створаную немцамі за 3 км ад горада на базе былога саўгаса Білева.

Для каардынацыі масавага партызанскага руху і пад-

польнай барацьбы ў маі 1942 г. быў уведзены інстытут адказных арганізатараў абкома партыі. Віцебская вобласць была падзелена на 4 куста. Віцебскі куст уключаў г. Віцебск, Віцебскі, Суражскі, Гарадоцкі, Мехаўскі і Лёзненскі раёны. У чэрвені 1942 г. быў створаны падпольны райком партыі. Яго сакратаром стаў В.І. Когаль. Разам са штабам партызанскага атрада М.Ф. Біруліна райком змяшчаўся ў в. Кабыляк (торфзавод "20 год Кастрычніка").

Праводзілася работа па зборы сродкаў насельніцтва ў фонд абароны краіны, па афармленні падпісак на дзяржаўную пазыку. Партызанамі і падпольшчыкамі быў вынайдзены цікавы спосаб распаўсюджвання лістовак: імі нашпігоўвалі бутэлькі (са шклозавода "Ноўка") і пускалі па Заходняй Дзвіне "ледаход".

Рост партызанскага руху з вясны 1942 г. выклікаў неабходнасць аб'яднання партызанскіх груп і атрадаў у больш буйныя фарміраванні. Некалькі атрадаў аб'ядноўваліся ў партызанскія брыгады.

8 красавіка 1942 г. на базе асобных атрадаў М.П. Шмырова, А.П. Дзіка, Д.Ф. Райцава, М.Ф. Біруліна была створана 1-я Беларуская партызанская брыгада пад кіраўніцтвам М.П. Шмырова, ці, як яго з павагай называлі - "Бацькі Міная". У канцы 1942 г. яна ўключала 1765 чалавек. У лістападзе 1942 г. атрад Д.Ф. Райцава быў сфарміраваны ў брыгаду імя Чырвонасцяжнага Ленінскага камсамолу. Да канца года ў яе ўвайшло да 670 чалавек. У лютым на базе атрада М.Ф. Біруліна была створана 1-я Віцебская партызанская брыгада, якая аб'ядноўвала 5 атрадаў колькасцю каля 500 чалавек.

## ПАРТЫЗАНСКІЯ ФАРМІРАВАННІ, ЯКІЯ ДЗЕЙНІЧАЛІ НА ТЭРЫТОРЫІ ВІЦЕБСКАГА РАЁНА

| Назва брыгады | Камандзіры брыгады | Час узнікнення | Час злучэння з Чырв. Арміяй | Зоны дзеяння |
|---|---|---|---|---|
| 1-я Беларуская брыгада | М.П. Шмыроў, Я.З. Захараў | 8 красавіка 1942 г. | 26 кастрычніка 1943 г. | Суражскі, Гарадоцкі, Віцебскі р-ны |
| Брыгада імя Чырвонасцяжнага Ленінскага камсамолу | Д.Ф. Райцаў | лістапад 1942 г. | 1 лістапада і 3 снежня 1943 г. | Гарадоцкі, Суражскі, Мехаўскі р-ны |
| 1-я Віцебская брыгада | М.Ф. Бірулін | люты 1943 г. | 3 лістапада 1943 г. | Суражскі, Віцебскі р-ны |

У студзені 1942 г. на савецка-германскім фронце перайшлі ў наступленне войскі 4-й ударнай арміі Калінінскага фронту. Пераадольваючы ўпартае супраціўленне ворага, яны пацiснулі немцаў амаль на 250 км і падышлі да Суражскага і Мехаўскага раёнаў. Насустрач чырвонаармейцам рушылі партызанскія атрады Я.З. Захарава, М.Ф. Біруліна, М.П. Шмырова, М.І. Дзьячкова, С.Т. Воранава, В.В. Стралкова. Яны вылучалі для воінскіх падраздзяленняў праваднікоў, вялі разведку, разам з Чырвонай Арміяй штурмавалі варожыя гарнізоны.

У выніку ваенных дзеянняў быў утвораны 40-кіламетровы прарыў лініі фронту на стыку груповак фашысцкіх армій “Поўнач” і “Цэнтр” ад Усвят да Веліжа. Ён быў заняты партызанамі. Так былі створаны славутыя “Віцебскія (Суражскія) вароты”. Яны сталі асноўнай артэрыяй, якая звязвала Вялікую зямлю з партызанскімі атрадамі і падпольнымі арганізацыямі Беларусі. У савецкі тыл перапраўлялася насельніцтва, вывозілася абсталяванне, правіянт, жывёла, фураж. У Беларусь накіроўваліся партыйныя арганізатары, атрады, групы спецыялістаў, падрыўнікі, зброя, боепрыпасы, медыкаменты.

З 10 лютага па 26 верасня 1942 г. партызаны ўтрымлівалі пад кантролем населеныя пункты Суражскага, значнай часткі Віцебскага, Гарадоцкага, Мехаўскага раёнаў, стварыўшы Віцебска-Суражскую партызанскую зону. Тут былі цалкам адноўлены органы савецкай улады. У г.п. Сураж адкрыты бальніца, аптэка, сталовая, бібліятэка, пачалі працаваць харавы і драматычны гурткі. Наладзілі работу невялікі скураны завод, саматужная арцель, хлебзавод, палеткі засеялі збожжам. Паміж атрадамі ўсталявалі прамую тэлефонную сувязь.

Гітлераўцы надавалі важнае значэнне Віцебску і ўзмацнілі барацьбу з партызанамі. Вакол Віцебска змяшчаліся моцныя варожыя гарнізоны на адлегласці ад 3 да 10 км. Напрыклад, у невялікім пасёлку Сасноўка, дзе стаяў штаб 3-й нямецкай танкавай арміі, колькасць салдат у гарнізоне даходзіла да 2 тыс. чалавек, тады як гарнізон у Віцебску складаў 4–5 тыс. чалавек. Значныя гарнізоны былі ў пасёлках Вароны, Падбярэззе, Должа. У выніку, акупацыйны рэжым стаў больш жорсткі.

# НАЙБОЛЬШ БУЙНЫЯ КАРНЫЯ АПЕРАЦЫІ НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ СУПРАЦЬ ПАРТЫЗАН І МЯСЦОВАГА НАСЕЛЬНІЦТВА ВІЦЕБСКАГА РАЁНА Ў 1941–1944 ГГ.

| Назва аперацыі або яе нумар | Час правядзення | Месца правядзення |
|---|---|---|
| № 95 | жнівень 1942 г. | Віцебскі, Суражскі, Лёзненскі, Полацкі, Сіроцінскі, Гарадоцкі р-ны |
| “Хоцемля – Аргуны” | кастрычнік 1942 г. | Суражскі, Віцебскі р-ны |
| “Клетка малпы” | лістапад 1942 г. | Гарадоцкі, Мехаўскі р-ны |
| “Белы мядзведзь” | снежань 1942 г. | Лёзненскі, Суражскі р-ны |
| “Зімовы лес” | снежань 1942–студзень 1943 гг. | Віцебскі, Гарадоцкі, Мехаўскі, Полацкі, Сіроцінскі р-ны |
| “Шаравая маланка” | люты–сакавік 1943 г. | Віцебскі, Гарадоцкі, Суражскі р-ны |
| “Грамавы ўдар” | сакавік–красавік 1943 г. | Віцебскі, Гарадоцкі, Полацкі, Мехаўскі, Сіроцінскі р-ны |
| “Майская навальніца” | май 1943 г. | Віцебскі, Гарадоцкі, Суражскі, Лёзненскі р-ны |

Найбольш партызаны перашкаджалі нямецкім транспартным перавозкам. Для арганізацыі бяспечнага руху ў накірунках Віцебск –Гарадок, Віцебск–Сураж па шашы і водным шляху па Заходняй Дзвіне гітлераўцы распрацавалі план знішчэння партызан у Суражскім раёне і Нікалаеўскім сельсавеце Віцебскага раёна. 13 чэрвеня 1942 г. у гэты раён адначасова з Віцебска і Суража былі накіраваны сілы праціўніка, узмоцненыя артылерыяй і танкамі. Атрад карнікаў зрабіў рэйд у в. Варошына Кабішчанскага сельсавета. Было нарабавана 40 кароў, усе вяскоўцы, каля 100–120 чалавек, загнаны ў хлеў для расправы. 40 байцоў партызанскага атрада Д.Ф. Райцава

вызвалілі насельніцтва і выратавалі ўжо падпаленую фашыстамі вёску.

З чэрвеня 1942 г. па люты 1943 г. партызаны 1-й Віцебскай брыгады трымалі абарону вёсак Талынава, Бараўляны, Сакольнікі, Цяцёркі, Вярхоўе, Койтава.

У 1943 г. немцы сфарміравалі дывізію “Рыхерт” для адпраўкі на фронт, але вымушаны былі кінуць яе супраць партызан. У дапамогу ёй 14 лютага 1943 г. нямецкае камандаванне адправіла 825-ы волга-татарскі батальён. Ён размясціўся ў вв. Сенькава, Суворы і Гралёва Бабініцкага сельсавета. Пры дапамозе падпольшчыц Н.Ф. Буйнічэнка і С.М. Нябылавай у ноч з 22 на 23 лютага 1943 г. на бок 1-й Віцебскай партызанскай дывізіі перайшло каля 600 воінаў-татар з усім узбраеннем і тэхнікай.

23 лютага 1943 г. пачалася маштабная карная экспедыцыя “Шаравая маланка” з прымяненнем авіяцыі, артылерыі, танкаў, кадравых войскаў супраць брыгад Віцебска-Суражскай партызанскай зоны. У Шчалбоўскіх лясах партызаны ледзь не трапілі ў акружэнне, але здолелі супрацьстаяць войскам вермахта.



Помнік М. Сільніцкаму на ч. ст. Лужасна

У партызанскія атрады ўступалі цэлымі сем’ямі. Намаганнямі падпольшчыкаў сталі магчымымі ўцёкі ваеннапалонных з канцлагераў Віцебска. За жнівень-кастрычнік 1943 г. толькі ў 1-ю Віцебскую брыгаду ўвайшло больш за 100 гараджан.

Увосень 1943 г. партызанскія атрады 1-й Беларускай (756 чалавек) і 1-й Віцебскай (247 чалавек) брыгад злучыліся з Чырвонай Арміяй. З іх ліку асобныя атрады былі сфарміраваны ў 1-ю Беларускую і 1-ю Віцеб-

скую брыгады другога складу, якія працягнулі барацьбу з акупантамі на іншай тэрыторыі вобласці, а ўзімку 1944 г. пераправіліся ў заходнія раёны БССР, куды перамясціліся тылы групы армій “Цэнтр”.

Такім чынам, можна адзначыць, што за гады нямецкай акупацыі на Віцебшчыне быў разгорнуты масавы партызанскі і падпольны рух. У розны час тут дзейнічала 39 партызанскіх брыгад, што аб’ядналі 325 атрадаў, і 34 асобных атрады, у якія ўваходзіла больш за 30000 чалавек. Было створана 66 падпольных груп агульнай колькасцю каля 1500 чалавек. На Віцебшчыне загінуў кожны трэці партызан, падпольшчык і мірны жыхар вобласці. За гераізм і поспехі ў арганізацыі і ажыццяўленні партызанскага і падпольнага руху шэраг партызан і падпольшчыкаў былі ўзнагароджаны ганаровымі званнямі. Так, М.П. Шмыроў быў удастоены звання Героя Савецкага Саюза. Яго імем у Віцебску названы вуліца, парк, школа, ГПТВ № 37, у 1969 г. створаны Віцебскі абласны музей М.П. Шмырова, устаноўлены помнікі і мемарыяльныя дошкі. Першым партызанам-камсамольцам Беларусі, каму было прысуджана званне Героя Савецкага Саюза, стаў кулямётчык партызанскага атрада Д.Ф. Райцава дваццацігадовы Міхаіл Сільніцкі. 28 сакавіка 1942 г. ля вёсак Платы і Курына атрад даў пяцігадзінны бой пераўзыходзячым сілам ворага. Прыкрываючы адыход атрада, М. Сільніцкі знішчыў дзесяткі гітлераўцаў, але акружаны ворагам, загінуў у рукапашным баі. Яго імем названа вуліца ў г.п. Сураж. Каля чыгуначнай станцыі Лужасна пастаўлены помнік, у в. Блізнік – бюст. За вялікі ўклад у барацьбу супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў званне ганаровых грамадзян г. Віцебска прысуджана М.Ф. Біруліну, Д.Ф. Райцаву, М.П. Шмырову. У гонар падпольшчыкаў і партызан Віцебшчыны збудаваны помнікі, іх імёнамі названы вуліцы і школы горада.

У выніку сумесных намаганняў партызан і падпольшчыкаў быў нанесены вялікі ўрон акупантам у тэхніцы і жывой сіле, што спрыяла паспяховым дзеянням Чырвонай Арміі. Агульны поспех стаў вынікам адзіных дзеянняў і мэты – перамагчы цаной уласнай самаахвярнасці і высокага патрыятызму.

## ВЫЗВАЛЕННЕ ВІЦЕБСКАГА РАЁНА

У студзені-лютым 1942 г., працягваючы Маскоўскую наступальную аперацыю на Віцебскім напрамку, злучэнні Чырвонай Арміі ўступілі на тэрыторыю Беларусі. 1.02.1942 г. воіны 4-й Ударнай Арміі і партызаны атрада М.Ф. Біруліна разграмілі нямецкі гарнізон у п. Лужасна і, працягваючы наступленне, выйшлі на акраіны Віцебска, у раён Ціраспаля. Аднак, фашысты, перагрупіраваўшы сілы, пачалі контрнаступленне. Каб спыніць далейшы рух Чырвонай Арміі па беларускай зямлі, нямецкае камандаванне спешна перакінула з Заходняй Еўропы 4 дывізіі. У выніку гэтага савецкія войскі вымушаны былі адступіць.

Такім чынам, першая спроба савецкіх войск вызваліць Віцебск і тэрыторыю раёна зімой 1942 г. аказалася няўдалай.

Летам 1943 г. войскі Калінінскага фронту пачалі наступленне з мэтай разгрому нямецкіх войскаў на цэнтральным участку фронту і выхаду да межаў БССР. 7 кастрычніка 1943 г. быў вызвалены г. Невель. 3-й і 4-й ударным арміям адкрыўся шлях на Віцебск і Полацк, з захопам якіх савецкія войскі выходзілі ў фланг нямецкіх груп армій “Поўнач” і “Цэнтр”.

Немцы, разумеючы важнасць утрымання Віцебска ў сваіх руках (яны называлі яго “ключам да Прыбалтыкі”), прымалі ўсе меры для таго, каб затрымаць наступленне нашых войск. З гэтай мэтай, выкарыстоўваючы моцна перасечаную лясіста-балоцістую мясцовасць, была пабудавана магутная, глыбокаэшаланіраваная абарона. Спецыяльным загадам Гітлера гарады Бабруйск, Барысаў, Віцебск, Магілёў, Мінск, Орша абвяшчаліся крэпасцямі. Камандуючыя гарадамі-крэпасцямі давалі фюрэру пісьмовыя абавязальніцтвы ўтрымліваць іх да гібелі апошняга салдата, нават ва ўмовах поўнага акружэння. Фашысцкая прапаганда надала лініі абароны гучную назву – “Фатэрлянд” (“Бацькаўшчына”), падкрэсліваючы тым самым, што нямецкая армія павінна адстойваць яе так, як яна рабіла б на ўласнай германскай тэрыторыі. У гэтай сістэме ўмацаванняў Віцебск быў пераўтвораны ў крэпасць і павінен быў адыграць ролю хвалярэзу ў выпадку франтавога наступлення савецкіх войскаў: яны, па меркаванні гітлераўскага камандавання, наткнуліся б на яго, як на востры штык, і пацярпелі б паражэнне.

Стаўка савецкага камандавання меркавала, што гітлераўцы ў летняй кампаніі 1943 г. панеслі такія вялікія страты і настолькі дэмаралізаваны, што не здолеюць стрымаць наступленне савецкіх войск у Беларусі. Аднак гэтыя прагнозы аказаліся занадта аптымістычнымі.


Помнік М. Абеліск на брацкай магіле савецкіх воінаў каля в. Шчучына

Наступленне пачалося ў кастрычніку і працягвалася на шырокім фронце да канца 1943 г., калі савецкія войскі Заходняга фронту сіламі 33-й і 39-й армій узламалі нямецкую абарончую сістэму Віцебскага ўмацаванага раёна. 8 кастрычніка было вызвалена Лёзна, 28 кастрычніка – Сураж. Упартыя баі на Віцебскім напрамку працягваліся ў лістападзе і снежні. 24 снежня вораг быў выбіты з вельмі ўмацаванага пункта – раённага цэнтра Гарадок.

Каб закрыць прарыў савецкіх войскаў і не дапусціць іх да далейшага прасоўвання на Віцебск, германскае камандаванне спешна перакінула ў раён Гарадка знятыя з іншых участкаў фронту 7 пяхотных і 1 танкавую дывізіі.

У выніку каля Віцебска адбываліся страшэнныя баі і здараліся трагічныя сітуацыі, якія прыводзілі да неапраўданай гібелі тысяч нашых байцоў. Так, савецкае камандаванне вырашыла да новага 1944 г. вызваліць Віцебск. На паўднёвы бераг возера Лосвіда, у раён былой вёскі Магучава, была паслана армейская разведка. У перадавой траншэі немцаў не аказалася. Разведчыкі далажылі, што немцы адступілі. Не праверыўшы даных, камандаванне загадала тром палкам на прамую, прама па лёдзе возера развіваць поспех і даганяць, як меркавалася, адступаючых немцаў.


Помнік савецкім воінам каля в. Герасімава

Немцы падпусцілі чырвонаармейцаў бліжэй і з дальнабойных гармат прамой наводкай адкрылі ўраганны агонь. У выніку, некалькі тысяч байцоў загінулі.

Не менш жорсткія і крывавыя баі пад Віцебскам адбываліся з паўночна-ўсходняга напрамку. 26 снежня 1943 г. 27 байцоў і афіцэраў 158-й стралковай дывізіі пад камандаваннем лейтэнанта І.Я. Бясхлебнага на безыменнай вышыні каля в. Вароны паўтарылі подзвіг герояў-панфілаўцаў, упарта вытрымаўшы шэсць жорсткіх атак фашыстаў. 25 байцоў загінула, двое трапілі ў палон. Сама вёска была вызвалена 1 сакавіка 1944 г.

Штурм нямецкіх умацаванняў працягваліся зімой–вясной 1944 г. У лютым 1944 г. 33-я армія (камандуючы генерал В. Гордаў) вяла наступальныя баі па прарыву шматпалоснай фашысцкай абароны на паўднёвым усходзе ад Віцебска, імкнучыся абысці горад з поўдня, уздоўж ракі Лучоса. Тут, толькі з 4 па 19 лютага, савецкія войскі згубілі забітымі 4040 чалавек, а ў сакавіку – каля дзвюх з паловай тысяч.

Рэха тых жорсткіх баёў адгукаецца і цяпер. Час ад часу ў зямлі знаходзяць снарады ці міны, якія праляжалі да нашых дзён. Стаяць на ўзгорках уздоўж р. Лучоса захаваўшыяся нямецкія доты. Жыве і чалавек, які мае незвычайнае імя – Лучоса, як памяць пра людзей, якія загінулі ў тых страшных баях.

Удзельнік баёў за Віцебск, камандзір снайперскага ўзвода снайперскай роты 251-й стралковай дывізіі Рыгор Ушкоў быў вельмі захоплены прыгажосцю гэтай невялічкай рэчкі, што прысвяціў ёй верш і вырашыў у будучым назваць сваю дачку гэтым імём – Лучоса.

*Тебя на карте я искал,*
*Полоска голубая среди леса,*
*Простая белорусская река*
*С красивым строгим именем Лучёса.*
*Мы на рассвете встали пред тобой,*
*Ты нас ждала, как может ждать невеста.*
*И мы вели здесь долгий смертный бой,*
*Чтоб ты была свободная, Лучёса.*
*И в память тех, кто в росную траву*
*Упал, свой долг отдавши честно,*
*Я будущую дочку назову*
*Твоим красивым именем, Лучёса.*



Помнік Лучосе

Але ён не паспеў ажаніцца і завесці дзяцей, бо загінуў 30 лістапада 1944 г. ва Усходняй Прусіі. У памяць аб сваім браце родная сястра загінуўшага воіна назвала старэйшага сына Рыгорам. Светлую мару дзядзькі здзейсніў пляменнік. Ён назваў сваю дачку прыгожым імем Лучоса. Зараз гэта сталая ўжо жанчына жыве на Далёкім Усходзе Расіі.

**Аперацыя “Баграціён”.** Пасля няўдалых наступленняў восенню 1943 – вясной 1944 г. савецкае камандаванне прыняла рашэнне спыніць наступальныя аперацыі на віцебскім напрамку і больш дасканала падрыхтавацца да наступлення.

Па плану прадугледжваўся прарыў лініі гітлераўскай абароны ў паласе 1100 км, а ўглыб – 600 км адначасова па 6-ці напрамкам. Потым – акружэнне і знішчэнне груповак ворага, у тым ліку і пад Віцебскам.

Падрыхтоўка аперацыі пачалася з першых дзён чэрвеня 1944 года, а найбольш актыўны перыяд падрыхтоўкі аперацыі заняў 22 дні. Вялікая ўвага надавалася разведцы боем і рэкагнасцыроўцы. Падрыхтоўчыя мерапрыемствы былі праведзены на высокім узроўні, што абумовіла поспех аперацыі.

22 чэрвеня была праведзена франтавая разведка боем. У выніку былі выяўлены агнявыя кропкі праціўніка, вызначана лінія ўмацаванняў. 23 чэрвеня пачалася аперацыя “Баграціён” – рашаючы этап бітвы за Беларусь. Перад наступленнем згодна з планам Беларускага штаба партызанскага руху ў ноч на 20 чэрвеня ў тыле ворага на ўсіх чыгунках былі праведзены дыверсіі. Пачаўся апошні этап аперацыі “рэйкавая вайна”.

У якасці прыклада можна прывесці ўрыўкі з артыкула, змешчанага ў газеце 3-га Беларускага фронту “Красноармейская правда”: “Ничего более величественного, мощного и победоносного не приходилось видеть. Когда заговорили сосредоточенные здесь орудия – более чем 200 стволов на километр, – то звук срывал листья с деревьев. А в 500-х метрах от про-



Памятны знак у гонар палка
"Нармандыя-Нёман" у в. Копці

тивника на наблюдательных пунктах расползались брёвна накатов – так нервно и дробно тряслась земля. Из немецких траншей выскакивали сошедшие с ума солдаты".

Перайшоўшы ў наступленне, савецкія войскі сталі імкліва прасоўвацца наперад. Паспяхова дзейнічалі войскі 39-й і 5-й армій 3-га Беларускага фронту. На працягу 23 чэрвеня яны прарвалі абарону ворага на ўчастку шырынёй 50 км і ўглубіліся на 10–11 км з мэтай акружыць віцебскую групіроўку нямецка-фашысцкіх войскаў.

Упартыя баі разгарнуліся ў раёне станцыі Лосвіда і в. Бараўляны. На галоўнай лініі абароны фашыстаў Хайсы – Храпавічы падавіць моцнае супраціўленне ворага дапамагла штурмавая авіяцыя. У раёне Мазалава было акружана і знішчана больш батальёна нямецкай пяхоты. Да канца дня часці 145-й стралковай дывізіі выйшлі на рубеж Суднікі – рака Лужаснянка.

Зацяжны характар прыняў бой у раёне Ціраспаля на перакрыжаванні дарог, што вядуць на Полацк і Гарадок. Бой працягваўся да глыбокай ночы. У адну гадзіну 26 чэрвеня 1944 г. разведчыкі 1-га батальёна (камандзір М. Бянчук) 599-га палка ўзнялі першы чырвоны сцяг у горадзе.

25 чэрвеня войскі 43-й арміі генерала А.П. Белабародава 1-га Прыбалтыйскага фронту і 39-й арміі генерала І.І. Люднікава 3-га Беларускага фронту злучыліся ў раёне в. Гняздзілавічы. У акружэнне трапілі 5 пяхотных дывізій 3-й нямецкай танкавай арміі агульнай колькасцю 35 тысяч чалавек. У іх ліку: 197-я, 206-я, 246-я пяхотныя, 4-я і 6-я авіяпалявыя дывізіі і асобныя часці 53-га армейскага корпуса.

Войскам, якія трапілі ў акружэнне, было прапанавана здацца. Калі час ультыматуму выйшаў, нашы войскі пачалі аперацыю па знішчэнні абкружанай групоўкі. Фашысты ўпарта супраціўляліся, спрабуючы прарвацца з акружэння. Толькі 26 чэрвеня яны прадпрынялі 22 контратакі на паўд-

ВІЦЕБСКА–АРШАНСКАЯ АПЕРАЦЫЯ 23–28 чэрвеня 1944 г.




Віцебска-Аршанская аперацыя 23-28 чэрвеня 1944 г.
(Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. – Т. 2)

нёва-заходнім накірунку.

Пад націскам войск 43-й і 39-й армій, падтрыманых моцнымі сіламі авіяцыі, немцы былі разбіты. Было ўзята ў палон больш за 10 тысяч салдат і афіцэраў праціўніка. Трапілі ў палон былы камендант Віцебска, камандзір 53-га корпуса немцаў генерал Ф. Гольвітцар, яго начальнік штаба палкоўнік Г. Шмідт, камандзір 206 пяхотнай дывізіі генерал-лейтэнант А. Хіцер.

26 чэрвеня 1944 года Віцебск штурмам быў вызвалены ад акупантаў. Вечарам Масква салютавала 20 артылерыйскімі залпамі з 224 гармат воінам 1-га Прыбалтыйскага і 3-га Беларускага франтоў.

Аперацыя пад Віцебскам мела свае асаблівасці: праведзена была агульнавайсковымі арміямі пры падтрымцы авіяцыі без удзелу танкавых злучэнняў і доўжылася ўсяго 4 дні.

У выніку Віцебскай аперацыі было вызвалена больш за 700 населеных пунктаў. Кошт перамогі быў вялікі. У баях пад Віцебскам на працягу 1943–1944 гг. загінула па розных звестках ад 40 да 60 тысяч воінаў і партызан. За мужнасць і гераізм, праяўленыя пры вызваленні Віцебска, 11427 воінаў былі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі. Званне Героя Савецкага Саюза атрымалі 37 салдат і афіцэраў. 13 з іх загінулі і пахаваны на тэрыторыі нашага раёна. 62-м воінскім злучэнням і часцям было нададзена ганаровае найменне “Віцебскіх”.

раздзел II

# ТЭМА 6 ВІЦЕБСКІ РАЁН У ПАСЛЯВАЕННЫ ЧАС

## АДНАЎЛЕННЕ ГАСПАДАРКІ. ВІЦЕБСКІ РАЁН У 1950-Я – 1980-Я ГГ.

За гады Вялікай Айчыннай вайны народнай гаспадарцы раёна быў нанесены велізарны матэрыяльны урон. Былі спалены і разбураны большасць вёсак. Сельская гаспадарка прыйшла ў заняпад. У даваенным Віцебскім раёне жыло 59 980 чалавек. Пасля поўнага вызвалення раёна ў чэрвені 1944 г. ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў тут засталося каля 40 % даваеннай колькасці жыхароў. Амаль у кожнай сям'і не засталося кармільца.

На вызваленай тэрыторыі, пачынаючы з восені 1943 г., савецкім органам улады даводзілася вырашаць самыя неадкладныя задачы па стварэнні ўмоў для жыцця і нават самога выжывання насельніцтва. Кіраўнікамі ў вызваленым раёне сталі былыя партызанскія камандзіры і камісары: старшынёй райвыканкома – былы камандзір 1-й Віцебскай партызанскай брыгады М.Ф. Бірулін, намеснікам старшыні – былы камісар брыгады У.А. Хабараў.

Многія жыхары раёна, якія вярнуліся пасля вызвалення на папялішчы, зіму 1943–1944 гг. правялі ў зямлянках, таму з вясны 1944 г. неабходна было без прамаруджвання прыступаць да будаўніцтва жылля для людзей і памяшканняў грамадскага прызначэння.

Адразу пасля вызвалення пачалося аднаўленне калгасаў. У большасці з іх пераважалі жанчыны, налічвалася толькі па 6–8 мужчын, пераважна старых і падлеткаў да 16 гадоў. Значную дапамогу калгасам і саўгасам аказвала дзяржава – грашовымі пазыкамі, насеннем, фуражом, пагалоўем жывёлы, запчасткамі, будматэрыяламі. Да 1948 г. у раёне працавалі 168 калгасаў, 2 МТС з 62 трактарамі. Аднаўленне сельскай гаспадаркі праходзіла з вялікімі цяж-

касцямі. Нават у 1948 г. у раёне пасяўныя плошчы склалі 67,7 %, у 1950 г. – 84,9 % ад даваеннага ўзроўню.

Аднаўляліся прадпрыемствы, без якіх было немагчымым задавальненне першачарговых жыццёвых патрэб насельніцтва. У першай палове 1944 г. пачынаецца аднаўленне шклозавода “Ноўка”, торфазавода “Узноры”, Суражскага і Новааляксандраўскага ільнозаводаў. Аднаўляліся і здаваліся ў эксплуатацыю млыны ў многіх вёсках.

У Суражскім і Віцебскім раёнах аднавілі сваю работу торфапрадпрыемствы, біяфабрыка, размешчаная ў вёсцы Доўжа. Яна вырабляла каля 10 відаў ветэрынарных прэпаратаў для лячэння розных жывёл. Сваю прадукцыю фабрыка адпраўляла па ўсяму Савецкаму Саюзу. У 1953 г. пачаў дзейнасць Янавіцкі масласырзавод. Буйных прамысловых прадпрыемстваў не было.

У 1950-я гг. было праведзена ўзбуйненне калгасных гаспадарак. Гэта давала магчымасць больш эфектыўна выкарыстоўваць тэхніку, павышаць культуру земляробства, сканцэнтроўваць сродкі на будаўніцтве гаспадарчых аб’ектаў. Была праведзена рэарганізацыя МТС. На базе Мазалаўскай МТС у 1956 г. была створана перасоўная механізаваная калона № 29 (ПМК-29), якая займалася меліяратыўнымі работамі на тэрыторыі Віцебскага, Гарадоцкага, Суражскага, Шумілінскага раёнаў. Дзякуючы плённай працы прадпрыемства ў эксплуатацыю было здадзена 50 тыс. гектараў меліярыраваных зямель, пры фермах пабудаваны аб’екты водазабеспячэння і ачышчальныя збудаванні. У 1958 г. на базе Віцебскай МТС (машына-трактарнай станцыі) было створана прадпрыемства “Віцебская райсельгастэхніка” (цяпер “Віцебская аграпрамтэхніка”), якое ажыццяўляла рамонт сельскагаспадарчай тэхнікі: трактароў, камбайнаў, агрэгатаў для ферм, абслугоўвала жывёлагадоўчыя фермы, сістэму водазабеспячэння.У 1963 г. быў створаны дарожны рамонтна-будаўнічы ўчастак № 144 (ДРБУ-144), які займаўся рамонтам і будаўніцтвам дарог мясцовага значэння.

Аднак, наступствы вайны яшчэ доўга сказваліся на становішчы сельскай гаспадаркі. Сярэдняя ўраджайнасць у 1960 г. складала: збожжавых – 9,4; бульбы – 110 цэнтнераў з гектара. Паступова павышалася ўраджайнасць збожжавых культур, расла вытворчасць мяса, надоі малака. Галоўная стаўка рабілася на працоўны энтузіязм вяскоўцаў. У гэты перыяд былі ўзнагароджаны ордэнам Леніна пастух калгаса

імя Леніна Варонаўскага сельсавета А.В. Буевіч, даярка саўгаса “Старасельскі” Лятчанскага сельсавета М.М. Навумава, звеннявая калгаса імя Чырвонай Арміі В.А. Жулева.

У 1960 г. былі аб’яднаны Віцебскі і Суражскі раёны. З другой паловы 1960-х гг. у раёне закладваюцца асновы племяннoй жывелагадоўлі, была створана племянная станцыя ў вёсцы Прыгарадная. У 1960-я гады павялічвалася колькасць тэхнікі па палях. У 1967 г. на палях калгасаў і саўгасаў раёна працавала 905 трактароў, 252 камбайны, 525 грузавых аўтамабіляў. Умацоўвалася матэрыяльна-тэхнічная база гаспадарак раёна, і адпаведна раслі іх працоўныя дасягненні. За поспехі ў развіцці жывёлагадоўлі было прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы свінарцы калгаса імя Калініна Р.І.Дарафеенка, старшыні калгаса імя Чырвонай Арміі М.І. Кацу, даярцы саўгаса “Рудакова” Г.Е.Мікалаевай. У 1970 г. калгас імя Кірава і саўгас “Рудакова” удастоены дыплома другой ступені ВДНГ СССР, а калгас імя Дзімітрова – дыплома трэцяй ступені. У 1975 г. было прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы свінарцы калгаса “Расія” Н.З. Курносавай. За год яна атрымлівала па 22–24 парасяці ад асноўнай свінаматкі. Свінарка была ўзнагароджана ордэнамі Леніна і Кастрычнікай рэвалюцыі.

З мэтай паляпшэння ўмоў жыцця сялян былі пабудаваны цэнтральныя сядзібы вв. Акцябрская, Кіраўская, Копці, Тулава. У 1970-я гг. у раёне ажыццяўлялася шырокая праграма жыллёвага і гаспадарчага будаўніцтва. За 1971–1977 гг. пабудавана 756 кватэр. У раёне пракладзена 45,1 кіламетраў водаправодных сетак, 196 кіламетраў дарог с цвёрдым пакрыццём. Усе цэнтральныя сядзібы гаспадарак былі звязаны аўтобуснымі маршрутамі з абласным цэнтрам.

У 1960-я – 80-я гг. удасканальвалася сістэма аховы здароўя ў раёне. У 1965 г. у раёне працавалі раённая бальніца, 9 участковых бальніц, 28 ФАПаў, 7 медыцынскіх пунктаў, санэпідэмстанцыя, 2 пункты “Хуткай дапамогі”, 8 рэнтген-кабінетаў. У 1969 годзе здадзена ў эксплуатацыю раённая паліклініка. Добрай славай карысталіся санаторыі “Лётцы”, “Сасноўка”, “Лукі”. Сюды прыязджалі і прыязджаюць на лячэнне і адпачынак з розных куткоў Беларусі. У 1980-х гадах у сістэме аховы здароўя раёна працавала каля 700 чалавек.

## АДУКАЦЫЯ І КУЛЬТУРА Ў СЯРЭДЗІНЕ 40-Х – 80-Я ГГ. ХХ СТ.

Адукацыя. Страты Віцебскага раёна ў галіне адукацыі і культуры ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны былі вельмі значнымі, бо на гэтай тэрыторыі ішлі самыя кровапралітныя баі. Трэба было аднавіць разбураныя і спаленыя школы, клубы, хаты-чытальні, дамы культуры, бібліятэкі.

Кіраўніцтва БССР і КП(б)Б паставіла задачу аднавіць да пачатку 1944–1945 навучальнага года сетку пачатковых, сямігадовых і сярэдніх школ і ахапіць навучаннем усіх дзяцей школьнага ўзросту. У раёне пад школы прыстасоўваліся ацалеўшыя сялянскія хаты, рамантаваліся разбураныя і будаваліся новыя школы.

У першыя пасляваенныя гады ў Віцебскім раёне з-за недахопу людскіх і матэрыяльных рэсурсаў, цяглавай сілы, фінансавання вясковыя школы аднаўляліся маруднымі тэмпамі. Так, у 1945–1946 навучальным годзе 6 школ раёна працавала ў зямлянках. Існавалі цяжкасці з забеспячэннем вясковых школ дапаможнікамі, падручнікамі, сшыткамі, вучэбным абсталяваннем, паперай.

Нажаль, матэрыяльна-тэхнічная база вясковых школ папаўнялася па астаткавым прынцыпе – толькі пасля гарадскіх школ. Не хапала настаўнікаў. У першую чаргу кваліфікаванымі кадрамі камплектаваліся спачатку школы сталіцы, абласных і раённых цэнтраў, а толькі потым вясковых школ. Большасць настаўнікаў раёна знаходзілася ў складаных матэрыяльных умовах. Зарплата вясковых настаўнікаў была ніжэйшай, чым гарадскіх.

У першыя пасляваенныя гады намаганні партыйных і савецкіх органаў, Віцебскага раённага аддзела народнай адукацыі былі накіраваны на рэалізацыю закона аб усеагульным навучанні дзяцей школьнага ўзросту. Для прыцягнення дзяцей з бедных сямей у школу ствараліся абласныя, раённыя і школьныя фонды ўсенавуча, аказвалася матэрыяльная дапамога прадуктамі харчавання, адзеннем, абуткам. Некаторая частка вясковых дзяцей часта прапускалі заняткі, ці нават

не вучыліся ў школах. Прычыны былі рознымі: цяжкія ўмовы пасляваеннага жыцця, слабы бюджэт многіх вясковых сем'яў, няхватка працоўных рук у асабістых і калгасных гаспадарках. У 1945–1946 навучальным годзе з 6143 улічаных дзяцей Віцебскага раёна ў школе вучылася 5997. Як зафіксаваў архіўны дакумент, шмат вучняў мела пропускі заняткаў з-за “поездки их в западные области за хлебом”.

Аднак, цяжкасці першых пасляваенных гадоў у Віцебскім раёне паступова пераадольваліся, колькасць навучэнцаў, якія заканчвалі сямігадовую і сярэднюю школы, штогод павялічвалася.

Станоўчыя вынікі дало адкрыццё школ сельскай моладзі (вячэрніх) для тых юнакоў і дзяўчат, якія па ўзросту не маглі навучацца ў дзённай школе. У 1946–1947 навучальным годзе ў Віцебскім раёне працавала 7 школ сельскай моладзі, 3 школы граматы і 7 асобных класаў пры агульнаадукацыйных школах.

У 1957 г. у Віцебскім раёне працавала 8 сярэдніх, 19 сямігадовых, 27 пачатковых школ, у якіх вучылася звыш 5 тыс. дзяцей. Выпуск дзесятых класаў сярэдніх школ у 1956 г. павялічыўся ў параўнанні з 1950 г. у чатыры разы. Да пачатку 1958/59 навучальнага года адкрыты інтэрнаты пры Рудакоўскай, Княжыцкай і Мазалаўскай сярэдніх школах, абсталяваны майстэрні ў Грышанскай сямігадовай і Старасельскай сярэдняй школах. З 1962–1963 навучальнага года сталі праводзіць заняткі ў адну змену ў 110 школах Віцебскага раёна са 115.



Будынак аддзела адукацыі Віцебскага раёна

Школам раёна дапамагалі бацькі вучняў. У пачатку 1960-х гг. вучням Мазалаўскай сярэдняй, Краснадворскай пачатковай і Нікалаеўскай васьмігадовай школ сельгасарацель “Заклік” і калгас “Перамога” Мазалаўскага сельсавета выдзялялі бясплатна малако, мяса і бульбу.

У 1960-я – 1980-я гады школы раёна дабіліся значных поспехаў у павышэнні якасці ведаў школьнікаў, вялася вялікая работа па перабудове сістэмы адукацыі, збліжэнні навучання і выхавання з жыццём. Да сярэдзіны 1964 года ў раёне здадзены ў эксплуатацыю будынкі 3 сярэдніх, 16 – васьмігадовых і 44 пачатковых школ. Вялікая ўвага надавалася ваенна-патрыятычнаму выхаванню вучняў. За добрую пастаноўку даследчай работы Бабініцкая і Дзяржынская сярэднія школы былі ўдзельнікамі ВДНГ (Выстаўкі дасягненняў народнай гаспадаркі) СССР. У 1970-я гг. у 102 агульнаадукацыйных школах і Лужаснянскім сельгастэхнікуме працавалі 800 настаўнікаў. Вялікую падтрымку школам ва ўмацаванні вучэбна-матэрыяльнай базы аказвалі саўгасы і калгасы. У 1980 г. у Віцебскім раёне працавала 16 сярэдніх, 14 васьмігадовых, 19 пачатковых школ, 2 школы-інтэрнаты, дзіцячы санаторый. Навучалі і выхоўвалі дзяцей 12 заслужаных настаўнікаў БССР, 77 выдатнікаў народнай асветы.

Культурная праца. У пасляваенныя гады ў вёсках у першую чаргу аднаўляліся хаты-чытальні як цэнтры палітычнай і культурна-масавай работы. Аднак, у адносінах да вясковай культуры дзейнічаў рэшткавы падыход да выдзялення матэрыяльных сродкаў, якія накіроўваліся, у асноўным, на развіццё цяжкай прамысловасці. Так, у 1945–1946 гг. бюджэтам не былі прадугледжаны сродкі на аднаўленне і будаўніцтва культасветустаноў у Віцебскім і інш. раёнах Віцебскай вобласці. У 1949 г. на рамонт будынкаў Віцебскага, Мехаўскага, Сенненскага, Лёзненскага, Коханаўскага Дамоў культуры было асігнавана толькі 55 тыс. руб., хаця на кожны патрабавалася па 30-35 тыс. руб. На гэты перыяд у Віцебскім раёне працавала 10 хат-чытален, 1 сельская бібліятэка, 2 сельскія клубы.

Галоўнымі накірункамі ў дзейнасці культустаноў у пасляваенны перыяд былі ідэйна-палітычнае выхаванне вясковага насельніцтва, правядзенне выбараў, навуковая прапаганда сельскагаспадарчых ведаў, арганізацыя мастацкай самадзейнасці і вечароў адпачынку.

Недахоп сродкаў у сярэдзіне 1940-х – пачатку 1950-х гг. на развіццё культурна-асветнай работы, радыёфікацыі і

кінафікацыі ў сельскай мясцовасці прыводзіў да таго, што культурнае развіццё вёсак Віцебскага раёна значна адставала ад горада. У калгасах дэманстрацыя кінафільма была даволі рэдкай з'явай.

Колькасць культустаноў Віцебскага раёна ў 1960–1970-я гг. павялічылася. Калі ў 1962 г. пасля аб'яднання Віцебскага і Суражскага раёнаў працавалі 23 клубныя ўстановы, 15 бібліятэк, то ў 1972 г. налічвалася 40 бібліятэк, 77 клубных устаноў, адкрылася Сялюцкая дзіцячая музычная школа. На гэты перыяд прыпадае творчы росквіт ансамбля народнага танца "Колас", якому ў 1962 г. было прысвоена ганаровае званне "Народнага". Такое ж званне атрымалі хор Вымнянскага сельсавета (1975 г.), ансамблі народнай песні "Раніца" Віцебскага раённага і "Весялуха" Бабініцкага сельскага Дамоў культуры.

Найбольш выдатнымі творчымі калектывамі 1980–1990-х гг. з'яўляліся: група "Альянс" Віцебскага РДК (1985 г.), група "Тэатр" Віцебскага РДК (1991 г.), ансамбль народнай песні Бабініцкага СДК (1990 г.), эстрадная група "Мара" Ноўкінскага СДК (1988 г.), а таксама названыя вышэй ансамбль "Раніца" і Вымнянскі народны хор.

Такім чынам, за першае пасляваеннае дзесяцігоддзе ў асноўным былі ліквідаваны цяжкія наступствы вайны. Значныя поспехі ў развіцці адукацыі і культуры раёна былі дасягнуты ў 1960-я – 1980-я гг.

# ГОНАР І СЛАВА КРАЮ

РАЗДЗЕЛ 3



# ТЭМА 1 СЛАВУТЫЯ ЛЮДЗІ ПРЫДЗВІННЯ

## (ЗЕМЛЯКІ І АСОБЫ, ЯКІЯ ВЫЗНАЧЫЛІСЯ Ў ЧАС ПРАЖЫВАННЯ НА ВІЦЕБШЧЫНЕ)


А.І. Абрамовіч

Абрамовіч Антон Іванавіч (1811(?)–1854), піяніст, кампазітар, педагог. Нарадзіўся ў Віцебскім павеце. Музыцы вучыўся ў бацькі. У канцы 1832 г. пераехаў у Пецярбург, дзе ў хуткім часе заваяваў прызнанне як таленавіты выканаўца і высокапрафесійны педагог. Яго метад навучання ігры на фартэпіяна карыстаўся ў Пецярбургу вялікай папулярнасцю, і многія з яго навучэнцаў дасягнулі значных поспехаў. У 1846 г. А. Абрамовіч зрабіў спробу абагульніць свой педагагічны вопыт і распачаў працу над вучэбным дапаможнікам для піяністаў-педагогаў “Школа для фартэпіяна”. Побач з педагагічнай Абрамовіч актыўна займаўся канцэртнай дзейнасцю, якая атрымала выдатную ацэнку пецярбургскіх музычных крытыкаў. Ён напісаў каля 50 фартэпіянных і вакальных твораў, сярод якіх фантазіі, варыяцыі, паланезы, вальсы, мазуркі, маршы, рамансы, апрацоўкі беларускіх народных песень і інш.

А. Абрамовічу належаць першыя спробы стварэння нацыянальна-характэрных твораў, у аснове якіх мелодыі беларускіх народных песень і танцаў. Сярод іх п’есы “Беларускія мелодыі”, “Зачараваная дуда” для фартэпіяна, песні “Дзеванька” і “Гарэліца” на словы Яна Баршчэўскага.

Род князёў Агінскіх на працягу некалькіх стагоддзяў адыгрываў важную ролю ў палітычным, эканамічным і культурным жыцці нашага краю. Яго прадстаўнікам належалі значныя зямельныя ўладанні, сярод якіх Кашына, Падбярэззе, Лужасна, Тадуліна, Тулава і іншыя населеныя пункты. З гэтага роду выйшла шмат выбітных асоб. Прыгадаем тых, чые імёны цесна звязаны з Прыдзвіннем.



Герб князёў Агінскіх

Леў Самуэль (каля 1595–1657). Валодаў маёнткам Мікуліна ў Віцебскім ваяводстве. У першай трэці XVII ст. ён стаў адным з ініцыятараў аднаўлення праваслаўнага Маркава манастыра, які на той час прыйшоў у заняпад.

Шыман-Караль (каля 1620–1699). З 1654 г. быў падкаморыям віцебскім. З 1679 г. – мечнік ВКЛ. З 1682 г. ваявода Мсціслаўскі. У 1685 г. адмовіўся ад апошніх дзвюх пасад. Быў прызначаны каралём Янам Казімірам кіраўніком прыёму горада Віцебска ад расійскіх войскаў (паводле Андрусаўскага замірэння 1667 г.). Пазней яму было даручана кіраванне горадам. У 1691 г. у Маркавым манастыры на сродкі Шымана-Караля была пабудавана драўляная царква ў гонар Святой Тройцы.

Марцыян Міхал (1672–1750). З 1695 г. мечнік ВКЛ, з 1703 г. – кашталян віцебскі, з 1730 г. – ваявода віцебскі. Практычна ўсю першую палову XVIII ст. з'яўляўся самай уплывовай асобай на Віцебшчыне. Меў тут вялікія зямельныя ўладанні і імкнуўся зрабіць Віцебскае ваяводства галоўным месцам пражывання сваіх нашчадкаў. Актыўна садзейнічаў эканамічнаму і культурнаму развіццю населеных месцаў краю (у першую чаргу сваіх маёнткаў) і пераўтварэнню некаторых сваіх памесцяў ў мястэчкі.

Станіслаў Юрый (?–1748). З 1738 г. староста вержбоўскі, кашталян Мсціслаўскі. З 1740 г. – староста віцебскі.

Анджэй (1739–1787), (нарадзіўся ў в. Тадуліна) староста ашмянскі. З 1762 г. мечнік літоўскі, з 1773 г. – сакратар ВКЛ, з 1778 г. – кашталян трокскі. З 1783 г. – ваявода трокскі.

Адамаў Уладзімір Уладзіміравіч (1875–1939). Вядомы геабатанік, фларыст, дэндролаг. Атрымаў вядомасць як выдатны даследчык флоры беларускага Палесся і Крыма. Важную частку яго навуковых зацікаўленняў займала вывучэнне мясцовага расліннага свету. Так, ён з'яўляецца аўтарам артыкулаў, прысвечаных садам у наваколлях Віцебска: "Бачэйкаўскі сад", "Бешанковіцкі сад", "Фатыньскі сад і гаспадарка" у першым томе зборніка "Віцебшчына".

На працягу 20 год праводзіў назіранні за невядомым раней відам расліны, якую адшукаў каля воз. Лётцы. Зрабіў яго падрабязнае апісанне на рускай, лацінскай мовах і мове эсперанта. У "Запісках Беларускага дзяржаўнага інстытута сельскай гаспадаркі" апублікаваў артыкул "Новая адкрытая ў Віцебску расліна (Alisma submersum)".

У Вялікіх Лётцах знаходзіўся радавы маёнтак, у якім значную частку свайго жыцця пражыў навукоўца. Больш падрабязна пра сад чытайце ў раздзеле ***"Помнікі прыроды нашага краю"***.

Альгерд (1296–1377), князь крэўскі і віцебскі, вялікі князь ВКЛ (1345–1377), адзін з найвыдатнейшых палкаводцаў, правіцеляў ВКЛ. Сын Гедзіміна. Правіў дзяржавай 32 гады. Бацька 12 сыноў, у т.л. Ягайлы, Андрэя Полацкага, Свідрыгайлы, Скіргайлы, Уладзіміра.

За час праўлення Альгерда тэрыторыя ВКЛ павялічылася ўдвая і яно стала самай вялікай і магутнай дзяржавай сярэдневяковай Еўропы. Далучыў да ВКЛ Чарнігава-Северскае, Бранскае княства, гарады Ржэў, Мсціслаў, Тарапец, Кіеўскае княства, Прычарнаморскія землі, паўднёвае Падняпроўе, Падольская, Пераяслаўская і Валынская землі. У палітычнай залежнасці ад яго апынулася і Смаленскае княства (1350-я гг.).

Альгерд адыграў важную ролю ў гісторыі Віцебска, віцебскай зямлі. У 1318 г. ён ажаніўся з віцебскай князёўнай Марыяй Яраслаўнай. У 1320 г. пасля смерці віцебскага князя Яраслава Васільевіча атрымаў княства ў спадчыну. Горад увайшоў у склад ВКЛ. На працягу 1320–1345 гг. Альгерд

жыў у Віцебску. У гэты час ён дбаў пра горад, садзейнічаў яго развіццю, будаўніцтву ягоных умацаванняў. Лічыцца, што пры Альгердзе быў пабудаваны каменны замак. Віцебск з невялікага ўдзельнага горада ператварыўся ў моцны фарпост ВКЛ, які прыкрываў дзяржаву з усходу.

Разбойнік Астроўскі. Усе ведаюць галоўнага персанажа аповесці А.С. Пушкіна "Дуброўскі", памешчыка, паручыка Уладзіміра Дуброўскага. Для многіх людзей ён сімвал барацьбы з несправядлівасцю, свавольствам багатых і нявыхаваных асоб. Аднак мала хто ведае, што сюжэт для аповесці Пушкін узяў з рэальнага жыцця. Калі ён праязджаў праз Віцебск, яму распавялі гісторыю пра маладога памешчыка, які сабраў сваіх дваравых людзей і стаў нападаць на маёнткі ненавісных яму суседзяў, рабаваць лаўкі, праязджаючых па дарогах багацеяў. Усё нарабаванае ён аддаваў бедным і тым, каму вельмі патрэбна была дапамога. А.С. Пушкін вельмі зацікавіўся гэтай гісторыяй, мастацкі перапрацаваў, напісаў аповесць, змяніўшы рэальнае прозвішча галоўнага героя з Астроўскага на Дуброўскага. У сапраўдным жыцці Астроўскі быў арыштаваны і сасланы ў Сібір. У горадзе шмат хто радаваўся злаўленню разбойніка, але былі людзі, якія шкадавалі пра гэта і маліліся аб ягоным пазбаўленні. Як сведчыць у сваіх мемуарах Максіміліян Маркс, праз некалькі гадоў у Віцебск з Пецярбургу прыбыў рэвізор. Перш-наперш ён зрабіў візіт да губернатара. Той даў у гонар сталічнага чыноўніка абед, дзе дзяжурны паліцэйскі прыстаў Гваздзёў пазнаў у рэвізоры Астроўскага і заявіў усім пра гэта. Разбойнік зноў быў схоплены і далейшы ягоны лёс склаўся, верагодна, не так добра, як літаратурнага прататыпа Дуброўскага.

Барадзін (сапраўднае прозвішча Грузенберг) Міхаіл Маркавіч (9.07.1884–1951), партыйны, палітычны дзеяч СССР, саветнік кіраўніка кітайскага ўрада Сунь Ятсена і яго партыі Гаміньдан (Народная партыя). У якасці палітычнага саветніка Гаміньдана адыграў важную ролю ў галоўных падзеях гісторыі Кітая ў 1920-я гады.

М.М. Барадзін нарадзіўся ў мястэчку Янавічы ў беднай яўрэйскай сям'і. Дзяцінства і юнацтва яго прайшло ў Латвіі. У юнацтве ўключыўся ў барацьбу за палітычныя і эканамічныя правы рабочага класа. У 1903 г. уступіў у РСДРП. Жыў у Лондане, Бостане, Чыкага, дзе вёў работу

сярод рускіх палітэмігрантаў. Пасля рэвалюцыі 1917 г. вярнуўся на радзіму, дзе працаваў на партыйнай рабоце.

У 1923 г. быў накіраваны кіраўніком палітычная місіі ў Кітай, які вёў барацьбу за поўнае нацыянальнае вызваленне ад краін Захаду. У выніку дзейнасці М. Барадзіна ў 1923–1926 гг. быў рэарганізаваны Гаміньдан. Ён стаў адыгрываць вядучую ролю ў нацыянальна-вызваленчым руху. У лютым–верасні 1924 г. была створана Нацыянальна-рэвалюцыйная армія. Праведзена значная праца па вывучэнні аграрных адносін і падрыхтоўка аграрнай рэформы. Сувязі Гаміньдана на чале з Сунь Ятсенам і СССР сталі больш цеснымі. Дзейнасць М. Барадзіна і іншых саветнікаў у Кітаі садзейнічала таму, што кампартыя Кітая, з невялікай і малавядомай у краіне ў пачатку 1920-х гадоў, ператварылася ў 1927 г. у значную палітычную сілу. Амерыканскі даследчык Дэллін адзначаў: “За чатыры гады сваёй дзейнасці ў Кітаі Барадзін ператварыўся ў вялікую, амаль легендарную фігуру”.

Пасля вяртання з Кітаю М. Барадзін быў намеснікам наркама працы СССР, адказным кіраўніком ТАСС (тэлеграфнае агенцтва Савецкага Саюза). У часы Вялікай Айчыннай вайны ён працаваў у Саўінфармбюро, рэдагаваў газету “Москаў ньюс”, якая выходзіла на англійскай мове. У самым пачатку 1950-х гадоў Барадзін быў беспадстаўна рэпрэсіраваны. Памёр у турме. Рэабілітаваны.

Бялыніцкі-Біруля Андрэй Сімпліцыянавіч (1926–1917) нарадзіўся ў в. Бабкоў Аршанскага павета. Першапачатковую адукацыю атрымаў дома, а затым паступіў у Пецярбургскі універсітэт. У 1852 г. ён скончыў прыродазнаўчае аддзяленне са ступенню кандыдата навук. Вярнуўшыся на радзіму, Андрэй Сімпліцыянавіч паступіў на службу, якую, аднак, неўзабаве пакінуў. Пасля смерці дзядзькі яму дастаўся ў спадчыну маёнтак Каралёва (цяпер Варонаўскі сельсавет).

У 1855 г. А.С. Бялыніцкі-Біруля набыў у Пецярбургу спецыяльныя прыборы і пачаў рэгулярныя назіранні за прыродай Віцебшчыны. Аб іх выніках ён дакладвае ў Цэнтральны статыстычны камітэт і выступае з публікацыямі ў “Витебских губернских ведомостях”. У зімні час, калі вучоны жыве ў Віцебску, ён працягвае свае назіранні ў горадзе.

З 1870 г., калі сапсаваўся барометр, назіранні Бялыніцкага-Бірулі былі часова спынены. У 1883 г. кіраўнікі

Галоўнай фізічнай абсерваторыі заклікалі энтузіястаў-краязнаўцаў заняцца назіраннямі ападкаў і тэмпературы паветра, навальніц і замярзання рэк. А.С. Бялыніцкі-Біруля рашыў зноў працягваць сваю работу. Пасля набыцця неабходных прыбораў, ён з 1884 г. вывучае прыродныя ўмовы Віцебскага краю. Вынікі назіранняў афармляліся ў выглядзе месячных справаздач і накіроўваліся ў Галоўную фізічную абсерваторыю.

У 1894 г. А.С. Бялыніцкі-Біруля пераехаў у Каралёва на пастаяннае месца жыхарства і праз год на свае сродкі пабудаваў спецыяльны павільён і метэаралагічную будку, набыў партыю новых, больш удасканаленых прыбораў. Каралёўская метэастанцыя стала адзінай станцыяй 1-га класа ў Заходнім краі.

У 1911 г. А.С. Бялыніцкі-Біруля падарыў Галоўнай фізічнай абсерваторыі сваю метэастанцыю разам з 2000 кв. сажнямі зямлі. Па прапанове Акадэміі навук А.С. Бялыніцкі-Біруля быў прызначаны загадчыкам гэтай станцыі. І ён з вялікай энергіяй працягваў займацца справай, якой аддаў не адзін дзесятак гадоў. Толькі смерць у 1917 г. на 91-м годзе жыцця спыніла яго работу.

*Паводле А.М. Падліпскага*

Вітарф фон Уладзімір Паўлавіч (1835–1907?), генерал-лейтэнант. Паходзіў з дваран Маскоўскай губерні. Скончыў Маскоўскі кадэцкі корпус. Служыў на розных пасадах у рускім войску (камандзірам Кексгольмскага грэнадзёрскага палка, уладзімірскім губернскім ваенным начальнікам). Браў удзел у шматлікіх ваенных кампаніях і паходах. Удзельнік руска-турэцкай вайны 1877–1878 гг. Удзельнічаў у баях у складзе Заходняга атрада пад кіраўніцтвам І.У. Гуркі.

Кавалер многіх ордэнаў і медалёў, узнагароджаны залатой зброяй з надпісам “За храбрасць”.

Пасля выхаду ў адстаўку У.П. Вітарф з сям’ёй пасяліўся ў сваім маёнтку Чырвоны Двор Віцебскага павета. Быў знаёмы з І.Я. Рэпіным. Ягоная гаспадарка лічылася ўзорнай. На свае сродкі генерал У.П. Вітарф у 1893 г. адкрыў школу, прычым акрамя памяшкання выдзеліў і ўсё неабходнае для яе функцыянавання. У школе выкладала дачка генерала – Алена Уладзіміраўна.

*Дз Р. Газін*



А.І. Вярыга-Дарэўскі

**Вярыга-Дарэўскі Арцём Ігнатавіч** (4.11.1816–1884), беларускі пісьменнік, рэвалюцыянер, асветнік. Нарадзіўся ў мястэчку Кублічы Лепельскага павета Віцебскай губ. (цяпер Ушацкі раён). Паходзіў са збяднелага шляхецкага роду. Адукацыю атрымаў у Забельскай гімназіі. Служыў у розных установах Віцебска. Ажаніўшыся, набыў у Віцебскім павеце маёнтак Стайкі. У 1852 г. калежскі рэгістратар, у 1885 г. губернскі сакратар. У 1850-я гады арганізаваў у Віцебску прыватную бібліятэку для гарадской беднаты. У Вільні і Пецярбургу меў сувязі з газетамі “Kurjer Wilenski” (“Віленскі веснік”), “Slovo” (“Слова”). За ўдзел у паўстанні 1863–1864 гг. быў сасланы царскімі ўладамі ва Усолле (Усходняя Сібір), з 1868 г. – на пасяленні ў Іркуцку. Памёр у Сібіры.

Адзіная кніга А. Вярыгі-Дарэўскага – аповесць у вершах на польскай мове “Гутарка аб сваяку” пад псеўданімам “Беларуская Дуда” надрукавана ў 1858 г. У 1859–1861 гг. друкаваўся ў часопісе “Музычны рух” (“Ruch muzycny”), дзе пісаў пра музычнае жыццё Віцебска.

На працягу 1858–1863 гг. вёў рукапісны “Альбом”, у якім пакінулі свае запісы вядомыя пісьменнікі, дзеячы культуры Беларусі і Літвы таго часу: У. Сыракомля, В. Каратынскі, А. Кіркор, М. Балінскі, В. Дунін-Марцінкевіч і інш.

Аўтар паэмы, драмы, камедый, падарожных нататак. Асаблівую цікавасць уяўляе верш “Думка хлопка з аколіц Віцебска на адглос вольнасці” (1858) і інш. Беларускія творы А. Вярыгі-Дарэўскага з-за цэнзурных умоў не друкаваліся, рукапісы большасці з іх не знойдзены. А. Кіркор называў Вярыгу-Дарэўскага пасля Дуніна-Марцінкевіча “другім з выдатнейшых беларускіх паэтаў і празаікаў”.

**Гібенталь** (Гюбенталь) **фон Карл Іванавіч** (1786–1858), урач. Вучыўся на медыцынскіх факультэтах універсітэтаў Гётынгена і Марбурга (Германія). Служыў вайсковым урачом, удзельнічаў у шматлікіх баявых паходах, быў паранены. У 1811 г. К.І. Гібенталь быў прызначаны інспектарам Мін-

скай урачэбнай управы і адначасова працаваў апэратарам (хірургам). У 1812 годзе першы ў еўрапейскай медыцыне прапанаваў ужываць гіпс для лячэння пераломаў касцей (за 30 гадоў да Пірагова).

У верасні 1816 г. К.І. Гібенталь быў прызначаны інспектарам Віцебскай губернскай урачэбнай управы і працаваў на гэтай пасадзе амаль чвэрць веку, да сакавіка 1839 г. І пасля адстаўкі працягваў займацца медыцынскай дзейнасцю ў Віцебску. Жыў у сваім маёнтку Тулава.

Доктар Гібенталь меў значныя заслугі ў барацьбе з эпідэміямі. Менавіта ён, па долгу службы, узначаліў барацьбу з эпідэміяй сыпнога тыфу і дызентэрыі, ці, як раней пісалі, "гнилой горячки с пятнами" і "желчной гнилой горячки с поносом и кровотечением", якая мела месца ў Суражскім павеце ў красавіку–чэрвені 1821 г.

У 1826 годзе ў Віцебску было заснавана Беларускае вольнае эканамічнае таварыства накшталт Вольнага эканамічнага таварыства, якое існавала тады ў Пецярбургу. Сваёй мэтай яно ставіла развіццё сельскай гаспадаркі. Адным з арганізатараў і актыўных дзеячаў таварыства з'яўляўся К.І. Гібенталь.

На хутары таварыства Залучоссе і ў маёнтку Каралёва ён удасканальваў асобныя агратэхнічныя прыёмы. У прыватнасці, К.І. Гібенталем быў прапанаваны плуг з прыстасаваннем, якое змяншае трэнне. Вопытам сваёй работы віцебскі вучоны дзяліўся на старонках газеты "Витебские губернские ведомости".

Косаў Сільвестр (кан. XVI ст. – 23.4.1657), рэлігійны і грамадскі дзеяч, пісьменнік, публіцыст. Нарадзіўся ў маёнтку Жаробычы Віцебскага ваяводства. Скончыў Віленскую брацкую школу, Люблінскі езуіцкі калегіум, Замасцянскую акадэмію. Выкладаў рыторыку ў Вільні і Львове. З 1631 г. прафесар філасофіі ў Кіева-Пячэрскай школе.

З 1633 г. епіскап магілёўскі, аршанскі і мсціслаўскі; канфліктаваў з полацкім і віцебскім уніяцкім архіепіскапам Антоніем Сяляваю.

У 1647–1657 гг. мітрапаліт кіеўскі і ўсяе Русі (у межах Рэчы Паспалітай). Выяўляючы інтарэсы вышэйшага ўкраінскага духавенства, якое выступала супраць вызваленчай вайны ўкраінскага і беларускага народаў 1648–1654 гг., праводзіў згодніцкую палітыку з польскай шляхтай.

Быў праціўнікам Брэсцкай уніі 1596 г., дамагаўся роўных правоў для праваслаўнага і каталіцкага духавенства. Пісаў на польскай і царкоўнаславянскай мовах. У 1635 г. выдаў кнігу “Экзегезіс…”, у якой выступіў у абарону праваслаўных лацінскіх школ, закрытых у 1634 г. па хадайніцтве уніятаў і католікаў. У тым жа годзе з’явіўся на польскай мове “Патэрыкон, або Зборнік жыццяў святых пячорскіх айцоў” (перавыдадзены на царкоўнаславянскай мове ў 1661 і 1678 гг.). У Куцеінскай друкарні (пад Оршай) надрукаваў з рэлігійна-асветнымі мэтамі кнігу на царкоўнаславянскай мове – “Дыдаскалія, або Навука для святароў” (1637).



В.В. Лужынскі

**Лужынскі Васіль Венядзікт** (1791 г., па інш. звестках 1786 або 1787 – 21.1(2.2).1879), уніяцкі, потым праваслаўны царкоўны дзеяч. З сям’і святара царквы в. Старая Рудня Рагачоўскага павета. Доктар багаслоўя (1825). Скончыў Галоўную каталіцкую семінарыю пры Віленскім універсітэце (1819). З 1824 г. прэфект і інспектар Полацкай уніяцкай семінарыі, прэфект Галоўнай каталіцкай семінарыі, кафедральны канонік, з 1828 г. асэсар грэка-уніяцкай калегіі ў Пецярбургу.

З 1834 г. служыў аршанскім вікарным епіскапам у Беларускай уніяцкай епархіі, з 1838 г. епіскап беларускі (полацкі). 12.02. 1839 г. разам з іншым вышэйшым уніяцкім духавенствам падпісаў акт Полацкага царкоўнага сабора 1839 г. аб скасаванні Брэсцкай уніі 1596 г. і далучэнні да праваслаўя. З 1840 г. праваслаўны епіскап полацкі, з 1841 г. архіепіскап. У 1866 г. вызвалены ад кіравання епархіяй і прызначаны членам Свяцейшага Сінода. Пакінуў успаміны “Записки Василия Лужинского, архиепископа Полоцкого” (Казань, 1885). Жыў у сваім маёнтку Любашкова (Сялюцкай воласці Віцебскага павета, цяпер Замастоцкі с/с). Быў пахаваны ў склепе Любашкаўс-

кага храма (па іншых звестках у в. Макарава). Магіла не захавалася.

## Лынькоў Міхась

(Міхаіл Ціханавіч) (30.1.1899 – 21.9.1975), беларускі пісьменнік, літаратуразнаўца, грамадскі дзеяч. Нарадзіўся ў вёсцы Зазыбы Віцебскага раёна ў сям'і чыгуначніка.


Міхась Лынькоў

Скончыў Старасельскае народнае вучылішча, у 1917 г. – Рагачоўскую настаўніцкую семінарыю. Працаваў настаўнікам, на розных пасадах у дзяржаўных установах і арганізацыях: Дзяржаўным выдавецтве БССР (1930–1932), у рэдакцыі часопіса “Полымя рэвалюцыі” (1932–1941). З 1938 па 1948 г. з'яўляўся старшынёй праўлення Саюза пісьменнікаў БССР.

Аўтар зборнікаў прозы: “Апавяданні” (1927), “Андрэй Лятун” (1930), “Саўка-агіцірнік” (1933), “На вялікай хвалі” (1934), “Баян” (1935), “Сустрэчы” (1940), “Астап” (1944), “Апошні зверыядавец” (аповесць, 1930), “За акіянам” (нататкі, апавяданні, нарысы, 1962), рамана “На чырвоных лядах” (1934) і рамана-эпапеі ў 4-х кнігах “Векапомныя дні” (1958), нарысу “Герой Савецкага Саюза Канстанцін Заслонаў” (1944), апавяданняў “Агні Танганьікі” (1957). Зборы твораў пісьменніка выдаваліся: у 4-х (1967–1968) і ў 8 тамах (1981–1985).

Для дзяцей выдадзены кнігі “Пра смелага ваяку Мішку і яго слаўных таварышаў” (1937), “Міколка-паравоз” (1937, аповесць экранізавана ў 1957 г.), “Ядвісін дуб” (1940), “Апавяданні” (1946–1988).

М. Лынькову належаць літаратуразнаўчыя працы “Беларуская літаратура за 30 год” (1948, на беларускай і рускай мовах), “Вобраз Сталіна ў беларускай мастацкай літаратуры” (1950), “Якуб Колас” (1952), “Летапіс эпохі: беларускай савецкай літаратуры пяцьдзесят год” (1968), зборнік артыкулаў “Літаратура і жыццё” (1978), кніга “Публіцыстыка” (1980). Пераклаў на беларускую мову асобныя творы М. Горкага, М. Ціханава і інш. Памёр 21.9.1975 г.

У часы Вялікай Айчыннай вайны працаваў рэдактарам

франтавой газеты "За Савецкую Беларусь" (1941–1942). У 1943–1946 і 1949–1952 гг. – дырэктар Інстытута літаратуры, мовы і мастацтва АН БССР.

Абіраўся кандыдатам у члены ЦВК БССР (1921–1931), дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР (1940–1945). Як член дэлегацыі БССР неаднаразова ўдзельнічаў у рабоце сесій Генеральнай Асамблеі ААН. Акадэмік АН БССР. Член СП СССР з 1934 г. Узнагароджаны трыма ордэнамі Леніна, трыма ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнам Чырвонай Зоркі і медалямі. Народны пісьменнік БССР (1962). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР імя Якуба Коласа (1968) за раман "Векапомныя дні".

Адпаведна завяшчання, 46 тысяч рублёў мусіла быць перададзенай аднаму з дзіцячых дамоў на радзіме Лынькова – на Віцебшчыне. На гэты час ў раёне дзейнічаў адзін дзіцячы дом у п. Лужасна. Таму было прынята рашэнне перадаць менавіта яму. Сродкі былі вельмі вялікія. Напрыклад, сярэднемесячны заробак быў 70 рублёў. Абласны аддзел народнай асветы дадаў яшчэ некаторую суму і разам з сродкамі, ахвяраванымі пісьменнікам, быў пабудаваны спартыўны зал і 4 класныя памяшканні. У знак прыемнасці жыхары пасёлка прынялі рашэнне аб наданні галоўнай вуліцы пасёлка імя М. Лынькова. Так і было зроблена. Пазней, на базе тагачаснага дзіцячага дома была створана Лужаснянская гімназія для здольных і таленавітых дзяцей з Віцебскай вобласці. Яе адрас – вул. Лынькова, 3.

Манькоўскі Ігнацій (каля 1765 – 30.12.1831 (11.01.1832)), публіцыст, асветнік, удзельнік літаратурнага жыцця на Віцебшчыне ў 1-й трэці XIX ст. Нарадзіўся на Віцебшчыне.

Паходзіў з беларускай шляхты. Ранні перыяд біяграфіі не высветлены. Ёсць звесткі, што юнацкія гады правёў у беднасці, вучыўся ў адным з езуіцкіх калегіумаў. Меў значныя здольнасці, пастаянна папаўняў свае веды і стаў па-еўрапейску адукаваным чалавекам. У 1783 г. паступіў на службу ў адну з канцылярый Усходняй Беларусі, праз 4 гады – у штат беларускага генерал-губернатара перакладчыкам "па замежнай экспедыцыі". Калі яму было за 30 гадоў, закахаўся ў юную дачку мясцовага вяльможы – Рахіль Антонаўну Макавецкую. Бацькі былі супраць яе шлюбу з бедным чыноўнікам. І. Манькоўскі паехаў

у Пецярбург з пісьмом сваёй абранніцы да цара, здолеў выклікаць прыхільнасць імператара Паўла I, які ўзяўся быць яго сватам і апекуном. (Больш падрабязна глядзіце ў параграфе ***“Легенды і паданні Прыдзвіння”***). 17 лютага 1797 г. быў выдадзены ліст-рэскрыпт Паўла I адносна І. Манькоўскага. Ва ўказе казалася аб наданні яму чына надворнага саветніка і перадачы ў пажыццёвае валоданне казённага маёнтка Буёва ў Віцебскім павеце. Сам ён быў прызначаны саветнікам у Беларускае губернскае праўленне.

Праз некаторы час набыў у шляхціца Талька (Талькэ, Талько?) вёску Мазалава. Пабудаваў тут маёнтак, які назваў Антонава (Антонаўка, Antonowka) у гонар народжанага сына. Разумным гаспадараннем ператварыў яго ва ўзорны, які потым стаў называцца “Мілае”. З 1801 г. атрымаў пасаду віцебскага губернскага пракурора.

У 1812 г. пры падыходзе французаў да Віцебска Манькоўскі эвакуіраваўся з губернскімі ўстановамі ў глыб Расіі (Вялікія Лукі, Луга). Вярнуўшыся ў вызвалены Віцебск, І. Манькоўскі з-за адсутнасці губернатара і віцэ-губернатара ўзначаліў губернскую адміністрацыю, прыняў захады, каб хутчэй наладзіць жыццё ў спустошаным краі. 8 красавіка 1813 г. ён афіцыйна атрымаў пасаду віцебскага віцэ-губернатара.

Пасля выхаду ў адстаўку ў 1817 г. жыў у сваім маёнтку Мілае, займаўся гаспадаркай, літаратурай і навукамі. Поглядамі быў блізкі да дзеячаў Асветніцтва. У маёнтку меў калекцыі старажытных рэчаў, праводзіў доследы з электрычнасцю.

У 1830 г. прыняў удзел у конкурсе, абвешчаным Вольным эканамічным таварыствам у Пецярбурзе, які меў мэту садзейнічаць развіццю гаспадаркі Беларусі. Твор І. Манькоўскага быў адзначаны залатым медалём і надрукаваны ў часопісе таварыства.

Усе матэрыялы заснаваны на мясцовай інфармацыі і з’яўляюцца цікавай крыніцай па даследаванні стану сельскай гаспадаркі, сялянскіх пабудоў. Акрамя гэтага апісвае вясельны абрад у Віцебскім павеце ў першай трэці XIX ст. Твор змяшчае цікавыя звесткі пра прымхі і забабоны мясцовых жыхароў, якія яны ўжывалі супраць эпізаотый.

І. Маньклўскі захапляўся жывым беларускім словам, папулярызаваў паэму “Энеіда навыварат”, верагодна, сам

пісаў па-беларуску, у сувязі з чым многія землякі і сучаснікі (Р. Друцкі-Падбярэскі) лічылі яго аўтарам беларускай “Энеіды”.

Марцінкевіч Геранім Францавіч (14.7.1816 – пасля 1864?), паэт, празаік, драматург. Нарадзіўся ў в. Тулава Віцебскага павета. Паходзіў са збяднелага шляхецкага роду Марцінкевічаў герба “Лебедзь” (да другога адгалінавання гэтага роду належаў В. Дунін-Марцінкевіч). Вучыўся ў Віцебскім базыльянскім вучылішчы, губернскай гімназіі (скончыў у 1835 г.), на юрыдычным факультэце Маскоўскага універсітэта (аднак закончанай універсітэцкай адукацыі не атрымаў). Служыў на розных пасадах у Віцебскім губернскім праўленні

Літаратурнай дзейнасцю Г. Марцінкевіч пачаў займацца ў 1830-я гады. Супрацоўнічаў у часопісе “Rubon” (“Рубон”) і інш. рэгіянальных выданнях. Аўтар быў прагрэсіўным літаратарам, актыўным удзельнікам літаратурна-культурнага жыцця Віцебска. У 1845 г. надрукаваў у віленскага выдаўца Ю. Завадскага томік сваіх польскамоўных паэтычных твораў. У 1848 г. выдаў другую кнігу, куды ўвайшлі драма “Час над Дзвіной”, паэма “Першае падзенне чалавека”, пераклады з І.В. Гётэ і М. Лермантава. Трэцяя яго кніга –зборнік “Творы, напісаныя між іншым” (нарысы, замалёўкі, вершы) – выйшла ў 1858 г.

Цікавіўся і збіраў мясцовы фальклор (вядомы яго пераклады на польскую мову беларускіх песень), а потым стаў пісаць на беларускай мове: камедыя “Адвячорак: аказія ў карчме пад Фальковічамі” (1858) (ці “Аказія падпалкоўніцам” або “Аказія пры палкоўніцах”). Разам з паэмамі “Энеіда навыварат” і “Тарас на Парнасе”, паэма Г. Марцінкевіча з’яўляецца адным з першых твораў, напісаных на беларускай мове. Тэкст яе ў копіі дайшоў да нашага часу і зберагаецца ў Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва (БДАМЛіМ).



Махноў Фёдар

Махноў Фёдар. Самы вялікі чалавек у свеце – Фёдар Махноў жыў у Віцебскім павеце. Нарадзіўся ён 6 (18) чэрвеня 1878 г. ў в. Касцюкі, што была непадалёк ад в. Старое Сяло цяперашняга Віцебскага раёна. Першыя 6–7 гадоў жыцця хлопец нічым асаблівым не адрозніваўся ад сваіх аднагодкаў. Аднак пасля

7 гадоў ён стаў хутка расці: да 12 гадоў ён меў рост вышэй за 2 метры. У перыяд самага хуткага росту хлопец спаў нават па 24 гадзіны ў суткі. З вялікім ростам прыйшла і вялікая сіла. Адной рукой ён мог гнуць падковы, распраўляць іх, закручваў на вузел жалезныя пруты, мог ударам кулака разбіць цагліну. З хлопцамі жартаваў па-свойму – адбіраў шапкі і, падняўшы дах бліжэйшай гаспадарчай забудовы, клаў капялюшы туды.

У жніўні 1898 г. выдаўся вельмі багаты ўраджай яблык. Прывезлі на Полацкі рынак воз яблык і Махновы. Не прайшло і пяці хвілін, як іх воз абступіў народ. Увагу гандляроў і пакупнікоў прыцягнуў малады селянін незвычайна вялікага росту. Сярод натоўпу разявак апынуўся мешчанін Мінкін, які адразу ж сцяміў, што волата можна паказваць у цырку. Мінкін прывёз на Полацкі рынак пана Роберта Кука, уладальніка цырка, які гастраліраваў на той час у Віцебску. Кук дамовіўся з маладым Фёдарам Махновым пра выступленне ў яго цырку. Перамовы цягнуліся да самага вечара. А на наступны дзень волат паўстаў у яскравых промнях святла на арэне цырка. Апрануты ён быў шыкоўна: плісавыя шаравары, чырвоная яркая кашуля, а на галаве – рамізніцкая шапка з паўлінавымі пёрамі.

Фёдару Махнову тады было 20 год. Дэбют быў больш чым паспяховым. Рост волата на той час складаў 3 аршыны 4 вяршкі (прыкладна 2 м 54 см). Трэба адзначыць, што волат працягваў расці. У 1900 г., адбываючы воінскую павіннасць, ён меў рост 3 аршыны 4 вяршкі, а ў 1903 г. яго рост складаў 3 аршыны 7 вяршкоў. Важыў ён 11 пудоў (каля 143 кілаграмаў). У 1903 г. Ф. Махноў ажаніўся з вясковай настаўніцай Еўфрасінняй Лебедзевай. У пачатку сакавіка 1903 года Ф. Махноў прыехаў са сваёй вёскі ў Віцебск, каб у віцебскага натарыуса засведчыць сваю дамоўленасць з берлінскім прадпрымальнікам Дэндэльмеерам, які збіраўся паказваць волата ў Берліне. Кантракт быў заключаны на год. Памер заробку склаў 5000 рублёў. Дапамогу ў складанні дзелавых папер Ф. Махнову аказваў той жа Мінкін, бо волат быў непісьменным. З замежным пашпартам, што атрымаў у канцылярыі губернатара, Махноў з жонкай выправіўся на гастролі ў Берлін, у якім аднойчы ўжо быў.

Гастролі ў Берліне спарадзілі пра Ф. Махнова шматлікія легенды, якія зацікавілі берлінскую публіку. У некалькіх выданнях з'явіліся яго партрэты і анатацыі, дзе паведам-

лялася, што яго бацькі стараверы, продкі якіх "паводле сямейных паданняў" прыйшлі з... Сірыі. Акрамя Берліна Фёдар пабываў у Гамбургу, Амстэрдаме. Становішча яго, нягледзячы на поспех у публікі, пагаршалася: кармілі дрэнна, недастаткова, вымушалі даваць пазапланавыя выступленні. Жонка павінна была выехаць на радзіму – набліжаліся роды. Волат быў вымушаны збегчы ад антрэпрэнера. У Берліне Махноў звярнуўся за дапамогай да консула, але антрэпрэнер з судовым прыставам арыштавалі ў яго 3700 марак няўстойкі па дамоўленасці. Грошы ў суме 1200 рублёў і 1000 марак Махноў здолеў перадаць консулу для жонкі. Ф. Махноў быў вымушаны выконваць умовы дамоўленасці. А ў сакавіку ён вярнуўся ў родную вёску.

Сюды, у родныя Касцюкі, вяртаўся Ф. Махноў штораз пасля гастроляў па розных гарадах Еўропы. Ён гнуў падковы, падымаў гіры, змагаўся з асілкамі з марай пабачыць дзяцей, жонку, пабачыць радзіму. У апошнія гады жыцця волат вельмі хварэў. Памёр Фёдар Махноў у 1913 г. на 35-м годзе жыцця. У Фёдара і Еўфрасінні было пяцёра дзяцей.

З дазволу сваякоў рэшткі велікана былі перанесены ў анатамічны музей Мінскага медыцынскага інстытута, дзе унікальны шкілет захоўваўся да 1941 г. Што з ім здарылася ў часы Вялікай Айчыннай вайны – невядома.

У адрыўным календары за 1905 г. (19 кастрычніка) сцвярджалася, што рост Ф. Махнова 3 аршына 12,5 вяршкоў, што адпавядае 269 см. Французскі біёлаг Ж. Растан у сваёй кнізе "Жыццё" сцвярджаў, што рост Махнова быў роўным 285 см. Калі верыць гэтаму, то наш зямляк з'яўляўся самым высокім чалавекам на свеце.

*Абрамава І.*


М.Я. Нікіфароўскі

**Нікіфароўскі Мікалай Якаўлевіч** (5(17).05.1845, в. Вымна Віцебскага павета – 28.05(10.06.)1910), беларускі этнограф, фалькларыст, асветнік. Правадзейны член Таварыства аматараў прыродазнаўства, антрапалогіі і этнаграфіі Маскоўскага універсітэта (з 1890 г.), Рускага геаграфічнага

таварыства (з 1897 г.). Нарадзіўся ў сям'і дзяка (панамара) мясцовай царквы. Пачатковую адукацыю атрымаў у прыватнай сельскай школе. З 1855 г. на працягу 6 гадоў вучыўся ў Віцебскім духоўным вучылішчы. У 1861 г. як лепшы вучань прыняты на казённае ўтрыманне ў Віцебскую духоўную семінарыю, якую скончыў у 1867 г. Прапанову прадоўжыць адукацыю ў Пецярбургскай духоўнай акадэміі не змог прыняць з прычыны адсутнасці сродкаў і вымушаны быў шукаць працу.

З 1871 па 1877 гг. працаваў настаўнікам у гімназіях у Віцебску і Віцебскай губерні. З'яўленне ў Віцебску этнографа П. Шэйна ўзмацніла цікавасць М. Нікіфароўскага да вывучэння побыту, культуры і творчасці беларускага народа. Больш за 20 гадоў М.Я. Нікіфароўскі быў карэспандэнтам П. Шэйна. У 1891-м годзе М.Я. Нікіфароўскі пад уплывам асабістых перакананняў прыняў рашэнне стаць на самастойны навуковы шлях і прасіў Шэйна вярнуць яму дасланыя раней рукапісы, якія той нідзе не выкарыстаў. Адзначым, што ягонае жаданне працаваць самастойна падтрымлівалі вядомыя вучоныя – Е.Р. Раманаў, Я.Ф. Карскі, М.А. Янчук і інш.

М.Я. Нікіфароўскі выдаў каля 20 даследаванняў па этнаграфіі, фальклоры і гісторыі Віцебшчыны, якія з'яўляюцца каштоўнай крыніцай для вывучэння матэрыяльнай і духоўнай культуры жыхароў нашага краю, іх вуснапаэтычнай творчасці.

Найбольш грунтоўнай працай М.Я. Нікіфароўскага, ў якой адлюстроўваецца матэрыяльная культура і вытворчая дзейнасць сельскага насельніцтва Віцебскага павета, з'яўляецца "Очерки простонародного житья-бытья в Витебской Белоруссии и описание предметов быта (Этнографические сведения)" (1895). Кніга – буйнейшае даследаванне па матэрыяльнай культуры беларусаў XIX ст. Яна абапіраецца выключна на матэрыялы Віцебшчыны, таму яе можна лічыць своеасаблівай "народнай энцыклапедыяй" нашага краю. У 1-м раздзеле гэтай кнігі "Ежа, едзіва, паядуха, прорава, жратва, момна" даецца грунтоўная характарыстыка харчавання і класіфікацыя страў, іх прыгатаванне, гатункі хлеба; паказваюцца змены ў народнай кулінарыі пасля адмены прыгоннага права. У 2-м раздзеле разглядаюцца адзенне і абутак, іх асобныя часткі, пакрой матэрыялаў, спосабаў нашэння ўпрыгожанняў і інш.; апісваюцца працоўныя працэсы ад апрацоўкі лёну да шыцця адзення. У 3-м раздзеле М.Я.

Нікіфароўскі грунтоўна апісаў сельскія паселішчы, сядзібы, жыллё і гаспадарчыя будынкі, іх будаўніцтва і прызначэнне, інтэр'еры жылых памяшканняў, жыццёвыя працэсы і побытавыя абставіны. У апошнім раздзеле даў характарыстыку земляробства, промыслаў і рамёстваў, прылад працы, прадметаў хатняга ўжытку і інш.

Сярод фальклорных збораў М. Нікіфароўскага можна адзначыць: "Белорусские песни "частушки" (1911) (з 2356 частушак – 1357 запісаны ў паветах Віцебскай губерні), "Простонародные загадки" (1898), "Полупословицы и полуговорки, употребляемые в Витебской губернии" (1910–1913). Пра вераванні, абрады, паданні распавядаюць працы Нікіфароўскага "Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды и обычаи, легендарные сказания о лицах и местах" (1897, запісаў 2307), "Нечистики. Свод простонародных в Витебской Белоруссии сказаний о нечистой силе" (1907). Пытанні грамадскага побыту насельніцтва даследчык закранаў у працы "Странички из недавней старины г. Витебска" (1899).

Нікольскі Леанід Дзмітрыевіч (1876 – пасля 1953), батанік, даследчык мастацтва. Скончыў Віцебскую Духоўную семінарыю і Кіеўскую Духоўную Акадэмію. У 1903, 1911 і 1912 гг. ездзіў на Балканскі паўвостраў для вывучэння старажытных фрэсак Афона, Канстанцінопаля і Старой Сербіі. За выдадзеныя на аснове даследавання манаграфіі Нікольскі быў абраны сапраўдным членам Расійскага Археалагічнага Таварыства і Кіеўскага Археалагічнага і Гістарычнага таварыстваў. Краязнаўчымі даследаваннямі стаў займацца з 1914 г. З мясцовых помнікаў даўніны навукова і дэталёва вывучаў і зафатаграфаваў роспісы Троіцкай царквы Маркава манастыра і Траецкую царкву на Пескаваціку г. Віцебска. Аўтар "Кароткага нарысу фрэскавага жывапісу". Як выкладчык прыродазнаўства вывучаў мясцовую прыроду. Вынікам гэтага з'явілася калекцыя казюлек і жывы гербарый у батанічным садзе Ветінстытута, які меў больш за 1200 відаў раслін. Працы Л.Д. Нікольскага друкаваліся ў "Віцебшчыне" (вып. 1), "Заре Запада" за 1926 г., "Живой Природе" за 1926 г. і іншых выданнях. Цікавасць выклікае артыкул, прысвечаны наваколлям Віцебска, у якім даецца характарыстыка яго адметных месцаў (Тулава, Уланавічы, Падбярэззе,

Журжава, Лужасна), эканамічным і прыродным асаблівасцям.



А.Ф. Рыпінскі

**Рыпінскі** (Радван) **Аляксандр Феліксавіч** (каля 1811, в. Кукавячына Віцебскага павета – не пазней 1890), паэт, фалькларыст, кнігавыдавец, мастак. Паходзіў са старадаўняга беларускага шляхецкага роду. У маленстве выхоўваўся ў дзедаўскім маёнтку Стайкі каля Віцебска. У раннім юнацкім узросце, пазнаёміўшыся з беларускімі народнымі песнямі і казкамі, пачаў весці фальклорныя запісы (згублены ў час паўстання 1831 г.), захапіўся вершаскладаннем і перакладамі.

Пасля заканчэння Віцебскай гімназіі ў 1829–1830 гг. вучыўся ў Дынабургскай школе прапаршчыкаў. Удзельнічаў у паўстанні 1830–1831 гг. Калі паўстанне было задушана, ён, ратуючыся ад катаргі, разам са сваім атрадам перайшоў у Прусію.

У 1832–1846 гг. жыў у Парыжы. У 1840 г. на падставе ўласных лекцый выдаў асобнай кнігай фалькларыстычнае даследаванне "Беларусь. Колькі слоў пра паэзію простага люду той нашай польскай правінцыі, пра яго музыку, спевы, танцы і інш." (Białoruś, Kilka słów o poezji prostego ludu... 1840), дзе ўпершыню сістэматызаваў вусную творчасць беларускага народа па жанрах і тэматыцы. Твор прысвечаны гісторыі, этнаграфіі, фалькларыстыцы краю, пераважна Віцебшчыны. У кнізе вялікая колькасць абрадавых твораў (адноўленых па памяці, а таму не заўсёды дакладных), даюцца апісанні і характарыстыка абрадаў, уключаны звесткі па гісторыі літаратуры і музычнай культуры Віцебшчыны, змешчаны народныя рэлігійныя песні кніжнага паходжання ("Стары Восіп барадаты", "О, мой Божа, веру Табе"), уласныя творы, стылізаваныя пад народныя песні.

Быў шырока вядомы як мастак, афармляў уласныя кнігі, выявіў выключныя здольнасці да мастацкай фатаграфіі, стаў адным з піянераў фотамастацтва.

Пасля царскай амністыі ў 1859 г. А. Рыпінскі вярнуўся на радзіму. Пад строгім наглядам паліцыі жыў у в. Кукавячына Віцебскага павета, якая належала яго брату, пазней пражываў у сваячкі ў маёнтку Страганы (цяперашні Лёзненскі раён). Тут працягваў літаратурную працу, бываў на кірмашах у мястэчку Янавічы і ў Віцебску, наведваў бліжэйшыя вёскі Кавалі, Глоданкі, Веляшковічы, Пнёва. Збіраў тут мясцовы фальклор (запісваў паданні і легенды пра курганы, гарадзішчы і іншыя помнікі старажытнасці).

Працаваў над гісторыяй беларускай літаратуры, стварыў шэраг біяграфій пісьменнікаў-беларусаў (55 прозвішчаў), напісаў жыццяпісы Я. Баршчэўскага, Г. Марцінкевіча, В. Рэута, Ф. Рысінскага, Т. Лады-Заблоцкага (не захаваліся). Перапісваўся з пісьменнікам і публіцыстам А. Плугам. Зблізіўся з А.І. Вярыгам-Дарэўскім, які жыў непадалёку ў в. Стайкі, зрабіў два запісы ў яго "Альбоме" – паэтычны і празаічны, маральна і матэрыяльна дапамагаў маладым мастакам і літаратарам з Беларусі і Літвы.

У 1920-я гг. прафесар БДУ М.М. Піятуховіч набыў рукапісы А. Рыпінскага, якія ўяўляюць сабой тры сшыткі, два з якіх з'яўляюцца своеасаблівай рукапіснай хрэстаматыяй беларускіх фальклорных і літаратурных твораў, складзеных А. Рыпінскім на Віцебшчыне ў 60–70-я гады XX ст. У матэрыялах рукапісаў утрымліваюцца звесткі не толькі пра творы, іх аўтараў, але і пра наваколлі Віцебска (апісанне сядзібы І. Манькоўскага, легенды і паданні краю). Запісы змяшчаюць шэраг вартых увагі этнаграфічных замалёвак (апісанні працоўных працэсаў, заўвагі аб вяселлі, аб гульнях, танцах і музыцы, разгляд працоўных песень – жніўных, пры ўборцы льну, касавіцы і інш.).

У гісторыю беларускай культуры А. Рыпінскі ўвайшоў як збіральнік, знаўца і прапагандыст нацыянальнага фальклору і этнаграфіі, выдавец, вакол якога кансалідавалася беларускае эміграцыйнае асяроддзе, адзін з першых даследчыкаў літаратуры Беларусі, спрабаваў упарадкаваць нормы беларускай арфаэпіі. Ён адзін са стваральнікаў жанру балады ў беларускай літаратуры.

Сапуноў Аляксей Парфенавіч (27.03.1851, м. Усвяты Віцебскай губ. – 2.10.1924, Віцебск), гісторык, археограф, краязнаўца. Нарадзіўся ў купецкай сям'і. Пачатковую адукацыю атрымаў у павятовым вучылішчы. Вучыўся ў

Аляксандраўскай гімназіі ў Віцебску (1862–1869). Скончыў гісторыка-філалагічны факультэт Пецярбургскага універсітэта. У 1873–1896 гг. працаваў настаўнікам лацінскай і грэчаскай моў у Віцебскай гімназіі. У 1896–1897 гг. працаваў архіварыусам Віцебскага цэнтральнага архіва старажытных актаў. З 1901 па 1917 г. сакратар Віцебскага губернскага статыстычнага камітэта. З 1919 г. у Віцебскім губернскім архіве. Актыўна ўдзельнічаў у стварэнні Віцебскага царкоўна-археалагічнага музея і Віцебскай вучонай архіўнай камісіі, адзін з ініцыятараў адкрыцця Віцебскага аддзялення Маскоўскага археалагічнага інстытута, у якім выкладаў з 1911 па 1922 г., з 1913 г. – прафесар. Быў ганаровым членам шматлікіх вучоных камісій і навукова-культурных таварыстваў у Віцебску, Магілёве, Маскве, Пецярбургу.


А.П. Сапуноў

Усё жыццё А.П. Сапуноў займаўся вывучэннем гісторыі Віцебска і Віцебшчыны. Значную частку ў яго працах займае гісторыя Віцебскага Прыдзвіння.

Буйнейшымі даследаваннямі вучонага сталі выданне дакументаў па гісторыі Віцебшчыны, задуманае ім у 6 тамах (“Витебская Старина” (Т. I – 1883; Т. IV – 1885; Т. V – 1888) і “Река Западная Двина” (1893). На жаль, Сапуноў змог выдаць толькі I, IV і V тамы. Нягледзячы на шматлікія недахопы пры публікацыі крыніц, гэта выданне не страціла сваёй навуковай вартасці і ў наш час і з’яўляецца каштоўнай крыніцай для вывучэння гісторыі нашага краю.

Пры жыцці выдадзены 72 працы А.П. Сапунова, сярод якіх зборнікі гістарычных матэрыялаў, актаў і дакументаў, навуковыя даследаванні і ўступныя артыкулы да гістарычных зборнікаў, артыкулы і творы, разлічаныя на шырокае кола чытачоў. Храналагічны спіс прац А.П. Сапунова змяшчаецца ў выданні Л. Хмяльніцкай “Гісторык з Віцебска” [С. 219–228].

Археалагічнымі раскопкамі Сапуноў ніколі не займаўся, але археалагічныя помнікі вывучаў. Сумесна з Е. Раманавым вывучаў курганы ў сваім маёнтку Кахоўка непадалёк

ад Віцебска (каля в. Сакольнікі Мазалаўскага с/с Віцебскага раёна). У 1903 годзе выйшла ягоная праца, прысвечаная помнікам старажытнасці, – "Помнікі часоў старажытных і найноўшых у Віцебскай губерні". А. Сапуноў склаў 12 карт, дзе зрабіў спробу вызначэння тэрыторыі Полацкага і Віцебскага княстваў X–XV стст.

А.П. Сапуноў даследаваў гісторыю, літаратуру, этнаграфію, археаграфію, архітэктуру, фальклор Беларусі, пераважна Падзвіння, выявіў і зрабіў палеаграфічныя апісанні старажытных рукапісных помнікаў.

Выдатны рускі мастак Рэпін Ілья Яфімавіч (1844–1930) каля дзесяці гадоў быў звязаны з нашым краем. Нарадзіўся ён у г. Чугуеў на Украіне, вучыўся ў акадэміі мастацтваў у Пецярбургу. На працягу амаль дзесяці гадоў (з 1892 па 1900 г.) ён штогод, на вясну, лета і восень, прыязджаў на Віцебшчыну, адпачываў і працаваў тут. Больш падрабязна пра гэта чытайце ў тэме 4: ***"Турысцка-краязнаўчыя рэсурсы нашага краю"***.

Храпавіцкі Ян Антоній (1.10.1612, в. Падбярэззе каля Віцебска – 3.11.1685), дзяржаўны дзеяч Рэчы Паспалітай, віцебскі ваявода, дыпламат, мемуарыст. Актыўны ўдзельнік палітычнага жыцця Рэчы Паспалітай. З 1669 г. віцебскі ваявода. У 1640–1650-я гг. удзельнічаў у працы камісіі па размежаванні Веліжскай і Усвяцкай валасцей з Невельскай. Вёў дзённік "Dyarysz wojewodowy witepskiego Jana Antoniego dwych imion Chrapowickiego..." за 1656–1685 гг. (выдадзены ў Варшаве, 1845), які з'яўляецца цікавай крыніцай па гісторыі Віцебшчыны XVII ст.

Сапега Леў Іванавіч (4.4.1557–7.7.1633), палітычны, грамадскі і ваенны дзеяч ВКЛ, дыпламат, мысліцель. Паходзіў са старажытнага роду аршанскіх баяр, са старэйшай, чарэйскай лініі магнацкага роду Сапегаў, сын Івана Іванавіча Сапегі, старосты драгічынскага і падстаросты аршанскага, і Багданы Друцкай-Сакалінскай.



Леў Сапега

Нарадзіўся ў радавым маёнтку Астроўна Віцебскага павета (цяпер Бешанковіцкі раён Віцебскай вобласці). Малалетнім яго аддалі на выхаванне ў Нясвіжскі двор Мі-

калая Радзівіла Чорнага. На працягу свайго жыцця Сапега займаў самыя высокія пасады ў Вялікім княстве Літоўскім: пісар вялікі ВКЛ у 1581–1585 гг., падканцлер у 1585–1589 гг., канцлер у 1589–1623 гг., ваявода віленскі з 1623 г. і адначасова гетман вялікі з 1625 г.

Вучыўся ў кальвінісцкіх настаўнікаў у Нясвіжы, у 1570–1573 гг. у Лейпцыгскім універсітэце, дзе перайшоў у кальвінізм. Добра ведаў замежныя мовы. У 1579–1581 гг. на чале гусарскай харугвы прымаў удзел у Лівонскай вайне 1558–1583 гг. Разам з канцлерам А.Б. Валовічам і падканцлерам К. Радзівілам удзельнічаў у стварэнні Трыбунала Вялікага княства Літоўскага. У 1584 г. падпісаў у Маскве пагадненне аб новым перамір'і. У 1586 г. перайшоў у каталіцтва.

Узначальваў соймавую камісію па падрыхтоўцы Статута Вялікага княства Літоўскага 1588 г., адрэдагаваў яго тэкст і фінансаваў яго выданне ў віленскай друкарні Мамонічаў. З 1589 г. як канцлер стаў кіраўніком знешняй і ўнутранай палітыкі ВКЛ. На царкоўным саборы ў Берасці ў 1596 г. як каралеўскі камісар выступіў у абарону царкоўнай уніі.

У 1600–1601 гг. узначальваў пасольства ў Маскву, у выніку якога перамір'е было працягнута яшчэ на 20 гадоў. У 1609 г., пераканаўшыся, што унія з Масквой не адбудзецца, выступіў за вайну Рэчы Паспалітай з Расіяй (1609–1618) і падтрымаў Ілжэдзмітрыя II. Удзельнічаў у аблозе Смаленска і падтрымаў кандыдатуру каралевіча Уладзіслава Жыгімонтавіча на маскоўскі трон. У 1617–1618 гг. садзейнічаў арганізацыі і фінансаванню паходу каралевіча Уладзіслава на Маскву, выставіў гусарскую і пяхотную роты і суправаджаў Уладзіслава да Вязьмы. У кастрычніку 1618 г. вярнуўся да каралевіча пад Маскву, у Тушына. Удзельнічаў у перагаворах з маскоўскімі пасламі, у выніку чаго падпісана Дэвулінскае перамір'е 1618 г.

Пасля забойства уніяцкага полацкага архіепіскапа Іасафата Кунцэвіча віцебскімі праваслаўнымі мяшчанамі ў 1623 г. Сапега ўзначальваў судовую камісію, якая вынесла судовыя пакаранні ўдзельнікам забойства. У 1625 г. удзельнічаў у вайне Рэчы Паспалітай са Швецыяй (1600–1629). Удзельнічаў у ваенных дзеяннях у Інфлянтах, дзе кіраваў дывізіяй.

Займаючы высокія пасады ў кіраўніцтве ВКЛ, у сваёй палітыцы адстойваў суверэнітэт ВКЛ у складзе федэратыў-

най Рэчы Паспалітай. Сапега з’яўляўся адным з багацейшых магнатаў, меў маёнткі ва ўсіх рэгіёнах ВКЛ. Меў свае вайсковыя атрады.

З’яўляўся прадстаўнікам і выразнікам інтарэсаў свайго асяроддзя. Яго дзейнасць аб’ектыўна спрыяла развіццю і ўмацаванню на Беларусі ў 2-й палове XVI ст. прагрэсіўнай свецкай сацыяльна-палітычнай думкі. Садзейнічаў развіццю беларускага кнігадрукавання. У Ружанах сабраў вялікую бібліятэку.

*Паводле А. Грыцкевіча*

Сурганаў Фёдар Анісімавіч, вядомы дзяржаўны і партыйны дзеяч БССР. У часы Вялікай Айчыннай вайны з’яўляўся адным з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху на Беларусі.



Ф.А. Сурганаў

Нарадзіўся 25.05(7.6.)1911 г. у в. Суднікі Віцебскага раёна. Скончыў Лужаснянскі ільнопяньковы тэхнікум (потым сельскагаспадарчы тэхнікум, цяпер аграрны каледж) (1928), Беларускі сельскагаспадарчы інстытут (1939). У 1931–1934 гг. працаваў аграномам у сістэме Народнага камісарыята земляробства. З 1939 г. працаваў на камсамольскай рабоце. Займаў розныя пасады. У 1943 г. быў закінуты ў тыл ворага, дзе правёў важную працу па арганізацыі і развіцці партызанскага руху і камсамольскага падполля на тэрыторыі Беларусі.

З 1945 г. стаў працаваць у апараце ЦК Камуністычнай партыі Беларусі. З 1947 па 1956 г. прайшоў па службовай лесвіцы ад пасады 2-га сакратара Мінскага абкома КПБ да 1-га сакратара Мінскага абкома КПБ. З 1956 г. стаў працаваў у апараце ЦК КПБ, г.зн. вышэйшага кіраўніцтва БССР. Напрыклад, Ф.А. Сурганаў з’яўляўся стар¬шынёй Бюро ЦК КПБ па кіраўніцтве сельскай гаспадаркай (1962–1965), сакратаром ЦК КПБ, 2-м сакратаром ЦК КПБ.

У 1971–1976 гг. займаў пасаду Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР (што па сучасных мерках эквівалентна пасадзе прэзідэнта краіны). Адначасова Ф.А. Сурганаў з’яўляўся і вельмі высокім чыноўнікам у структуры урада

СССР і ўваходзіў у правячую эліту гэтай вялікай краіны. Так, ён з'яўляўся намеснікам старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР, членам ЦК КПСС, дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР (1954–1976), намеснікам Старшыні Са¬вета Нацыянальнасцей Вярхоўнага Савета СССР (1962–1966).

З'яўляючыся аграномам па адукацыі, у сваёй дзейнасці на дзяржаўных і партыйных пасадах Ф.А. Сурганаў надаваў вялікую ўвагу вырашэнню праблем сельскай гаспадаркі. Значныя фінансавыя ўліванні садзейнічалі сацыяльнаму развіццю вёскі. Выступаў за прадуманую палітыку ў правядзенні меліярацыі Палесся, узважанае вырашэнне пытання развіцця кармавой базы сельскай гаспадаркі. Напрыклад, ён процістаяў "кукурузнай" эпапеі і курсу цэнтра на ліквідацыю травапольнай сістэмы земляробства, што вяло да разбурэння кармавой базы жывёлагадоўлі.

Менавіта дзякуючы падтрымцы Ф.А. Сурганава Горацкая сельскагаспадарчая акадэмія пераўтварылася ў буйны цэнтр падрыхтоўкі кадраў для сельскагаспадарчага сектара ў эканоміцы, стала моцным цэнтрам навукова-даследчай працы. Дзякуючы ініцыятыве Ф.А. Сурганава ў Мінску быў створаны Інстытут механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі і сельскагаспадарчы інстытут у Гродне.

Трагічна загінуў у аўтакатастрофе. 26.12.1976 г. Лужаснянскаму сельскагаспадарчаму тэхнікуму (цяпер аграрны каледж Віцебскай дзяржаўнай акадэміі ветэрынарнай медыцыны) было нададзена імя Ф.А. Сурганава. У музеі навучальнай установы зберагаецца бронзавы бюст выдатнага палітычнага дзеяча нашай краіны. Яго імем названа вуліца ў Мінску.

*Паводле Р.П. Платонава*

## ДАСЛЕДЧЫКІ ВІЦЕБСКАГА КРАЮ

Звесткі пра Віцебскі край можна адшукаць у старажытных летапісах, хроніках, інвентарных перапісах, мемуарах, нататках падарожнікаў, навуковых працах, якія выдаваліся ў розныя часы. Прыгадаем некаторых даследчыкаў, якія даследавалі наш край.

Без-Карніловіч Міхаіл Восіпавіч (1796–1862), гісторык, краязнаўца і этнограф, вайсковы тапограф, статыстык, генерал-маёр. Пад яго кіраўніцтвам у 1831–1847 гг. праводзілася тапаграфічнае і вайскова-статыстычнае вывучэнне



М.В. Без-Карніловіч

Мінскай, Наўгародскай, Віцебскай, Валынскай губерняў і Беластоцкай акругі. Напісаў ваенна-статыстычны агляд Віцебскай губерні, у якім даў ацэнку правіянтных і дарожна-транспартных магчымасцей краю. Пры вядзенні геадэзічных работ на Віцебшчыне зацікавіўся і збіраў інфармацыю пра аб'екты старажытнай гісторыі: курганы, гарадзішчы, замчышчы, земляныя валы, фартэцыі і іншыя помнікі даўніны. Збіраў таксама і этнаграфічныя матэрыялы. На падставе атрыманых звестак выдаў кнігу "Исторические сведения о примечательнейших местах в Белоруссии..." (СПб., 1855). У ёй асобны раздзел прысвечаны помнікам старажытнасці Віцебскага павета. Гэта асабліва каштоўныя звесткі, таму што некаторыя з помнікаў не дайшлі да нашага часу, аднак маюць важнае значэнне для археалагічнага даследавання краю.

## Брэжга (Breżgo) Баляслаў Рычардавіч



Б.Р. Брэжга

(31.03.(12.04.).1887, Рэжыцкі павет Віцебскай губ. – 30.09.1957, Рыга), гісторык, архівіст. Скончыў павятовае вучылішча, Віцебскую гімназію (экстэрнам у 1910 г.), Маскоўскі археалагічны інстытут (1916). Першая праца "Инициалы и орнамент в актовых книгах Витебского архива древних актов XVI–XVIII веков" была надрукавана ў "Віленскім весніку " ў 1915 годзе. На працягу трох гадоў прадставіў у МАІ да абароны 3 дысертацыі: у 1916 годзе спаборніцтва на атрыманне вучонага-археографа (архівіста) "Архивы полоцко-витебского края в прошлом и настоящем", ў 1917 годзе спаборніцтва на атрыманне звання вучонага-археолага – "Материалы для археологической карты Витебской губернии" і ў 1918 годзе спаборніцтва на атрыманне звання гісторыка мастацтваў – "Ян Матейко как

представитель польской исторической живописи”. Усе яны былі бліскуча абаронены і ўзнагароджаны залатымі медалямі. Вясной 1920 года Б. Брэжга быў прызначаны загадчыкам Віцебскага аддзялення Маскоўскага археалагічнага інстытута. Пасля яго закрыцця ў 1922 годзе перайшоў на працу ў Віцебскі дзяржаўны архіў і з’явіўся адным з арганізатараў архіўнай справы на Віцебшчыне ў гады Савецкай улады. У 1925 годзе вярнуўся ў Латвію, дзе працягваў займацца даследаваннямі гісторыі і культуры Віцебшчыны, на што ўказвае шэраг яго работ: “Архівы і архіўная спадчына ў Віцебшчыне” // Віцебшчына. Віцебск (Т. 1, 1925); “Ахова помнікаў старажытнасці на Віцебшчыне” // Беларуская школа ў Латвіі (Рыга, 1932), “Замкі Віцебшчыны” (Вільня, 1933).

Б. Брэжга – аўтар больш за 120 друкаваных прац, з якіх каля 30 прысвечаны гісторыі Віцебска і Віцебшчыны. Прыгадаем тыя, што звязаны з гісторыяй Прыдзвіння: “Мястэчка Глазамічы ці Янавічы”, “Рэпін на берагах Дзвіны”, “Лёс іезуіцкіх і гімназічных бібліятэк у Полацку і Віцебску”, “Аб паходзе палачан у 1106 годзе і аб Дзвінскіх камянях з надпісамі”.

Прычыніўся да вывучэння нашага краю і польскі гісторык італьянскага паходжання Аляксандр Гваньіні. У 1558–1583 гг. прымаў удзел у Лівонскай вайне. Быў камендантам горада Віцебска. Гваньіні – аўтар “Хронікі Еўрапейскай Сарматыі”, якая змяшчае цікавую інфармацыю пра паўночную Беларусь. Кніга багата ілюстравана. У ёй апісаны гарады і крэпасці ВКЛ, матэрыяльная і духоўная культура, звычаі і абрады насельніцтва Беларусі (галоўным чынам паўночна-ўсходняй часткі, а гэта значыць сучаснай тэрыторыі Віцебскага раёна). У раздзеле “Спосаб апрацоўкі глебы і сяўбы на Белай Русі” апісаў, як сяляне рыхтавалі глебу пад пашу: выцярэблівалі і выпальвалі ўчасткі лесу, рыхтавалі ляда, пасля ўзорвалі яго  і сеялі пшаніцу, жыта, авёс. Гваньіні паведамляе таксама, калі на Беларусі сеялі ў XVI ст. гарох, авёс і грэчку, дзе і як захоўвалі сабраны ўраджай, прадукты харчавання і іншыя звесткі.

Выдатны славяназнавец, пачынальнік беларускай, польскай, украінскай археалогіі, фалькларыстыкі, этнаграфіі і дыялекталогіі Зарыян  Якаўлевіч Даленга-Хадакоўскі (сапр. Чарноцкі Адам; 24.12.1784–1825) вывучаў у пачатку


З.Я.Даленга-Хадакоўскі

XIX ст. старажытнасці Прыдзвінскага краю. 14.12.1818 г. упершыню на Беларусі атрымаў ад Віленскага універсітэта адкрыты ліст (дазвол) на права раскопак. Даследаваў гарадзішчы ў Полацку, Віцебску, в. Старое Сяло Віцебскага раёна і іншых, рабіў запісы фальклору, абрадаў, мясцовых дыялектаў. Надаваў вялікае значэнне тапонімам тыпу Стайкі, Волакі. Так, ён звярнуў увагу на назву “Пераваласчна” ў вярхоўях Друці. Склаў карту гарадзішчаў на Беларусі. Напісаў чатырохтомны “Слоўнік назваў гарадзішчаў і ўрочышчаў” – першы вопыт такога роду ва ўсходнеславянскай археалогіі.

Гарбачэўскі Іван Данілавіч (1860–1914), беларускі настаўнік, краязнаўца, гісторык, этнограф, пісьменнік, фалькларыст. На працягу ўсяго жыцця вывучаў гісторыю, фальклор і побыт беларусаў. У гісторыка-этнаграфічных нарысах “Пра волакі Вялікага воднага шляху з варагаў у грэкі” (1894) даказваў існаванне на тэрыторыі старажытнай Беларусі апрача агульнавядомых, яшчэ і мноства карацейшых водных шляхоў зносін. Апісаў населеныя пункты па Заходняй Дзвіне (“Уніз па Дзвіне”, 1895).

Дабравольскі Валянцін Васільевіч (1892–?) краязнаўца. Падрыхтаваў да друку  матэрыялы для бібліяграфіі Віцебшчыны (дадатковыя да раней надрукаваных у 1-м томе “Віцебшчыны”). Удзельнічаў у працы біяграфічнай камісіі (камісія па складанні біяграфій некаторых дзеячаў Віцебшчыны).

Катлоўскі Пётр (кан. XVIII – пачатак XIX ст.), настаўнік Невельскага павятовага вучылішча, калежскі асэсар. Склаў апісанне Віцебскай губерні, якое было выяўлена ў аддзеле рукапісаў Расійскай дзяржаўнай бібліятэкі Апісанне датуецца 1808 годам. Арыгінал уяўляе сабой акуратна сброшураваны сшытак на 34 аркушах. Утрымлівае звесткі пра клімат, прыроду, жывёльны, раслінны свет, заняткі, норавы і звычаі насельніцтва Віцебскай губерні на мяжы XVIII – XIX стагоддзяў.

Лабунскі Юзеф (1852–1922), гісторык права, публіцыст. Аўтар нарысаў “Віцебск”, “Віцебскі павет”, “Віцебская губерня” ў “Слоўнік геаграфічны каралеўства Польскага…”. Дзяліў Віцебскую губерню ў гістарычным і этнаграфічным плане на Інфлянты і Беларусь. Да апошняй адносіў усходнюю Віцебшчыну. Артыкулы ўтрымліваюць цікавыя статыстычныя, этнаграфічныя і гістарычныя звесткі пра Віцебшчыну.

Лісоўская А.Ф. (другая пал. XIX ст.), карэспандэнт П.В. Шэйна. Запісвала легенды і паданні ў Віцебскім павеце. “Бог і святы Мікола”, “Чаму каня ціць просіць”, “Разумная праля”, “Бог і Яго ўгоднікі Пятніца і Субота”.

Лур’е Майсей Ізраілевіч (1890–?), краязнаўца, педагог. Вывучаў гандаль, дынаміку цэн, ёмістасць рынку, сельскагаспадарчы баланс Віцебскай акругі. Аўтар артыкулаў “Цэнзавая прамысловасць Віцебшчыны да вайны і ў часе рэвалюцыі” і “Кірмашы”, у якіх змешчана інфармацыя аналітычнага складу са спісам цэнзавых прадпрыемстваў на 1913 і на 1927 гг. з назвай прадпрыемства, месцазнаходжаннем, уласнікам, сілавымі ўстаноўкамі, колькасцю працоўных і лёсам за час вайны. Спіс утрымлівае 74 назвы. Падрыхтаваў даклад “Эканамічны стан Віцебшчыны ў 1919–1921 гг.”.

Выдатнай крыніцай для вывучэння гісторыі і культуры Віцебшчыны з’яўляюцца карты, створаныя інжынерам, мастаком, картографам Станіславам Пахалавіцкім (2-я палова XVI ст.). Ён выконваў абавязкі картографа пры каралі Рэчы Паспалітай Стафане Баторыі. Склаў “Вопіс Полацкага княства”, “Карту Полацкай зямлі” і “План аблогі Полацка войскамі Стафана Баторыя ў 1579 г.” Працаваў над выявамі крэпасцей на Полаччыне: Казьяны, Красная, Сітна, Сокал, Суша і Туроўля. Склаў планы Лукомлі, Астроўны, Сянна, Іказні, Пагоста, Лосвіды і інш. Малюнкі Пахалавіцкага – каштоўны матэрыял для рэканструкцыі фартыфікацыі і забудовы розных месцаў Віцебшчыны 2-й паловы XVI ст.

Поляк Іпаліт Паўлавіч (1891–1937), беларускі грамадскі дзеяч, педагог, краязнаўца. Пражываючы ў Віцебску, прымаў актыўны ўдзел у працы ВАКТ (эканамічная секцыя).

Распрацоўваў тэму “Сацыялістычнае будаўніцтва на Віцебшчыне”. Меў артыкулы “Калгасы Віцебшчыны к канцу першай пяцігодкі”, “Калгасы Віцебшчыны”, “Саўгас Доўжа (Віцебскі раён)”. Артыкулы змяшчаюць цікавейшую інфармацыю па тапаніміцы, статыстыцы, эканамічным развіцці паўночнай часткі Віцебскага раёна.

Раманаў Еўдакім Раманавіч (1855–1922), выдатны беларускі этнограф, фалькларыст, археолаг. Віцебшчыне прысвечаны шэраг грунтоўных даследаванняў. Сярод іншых вылучаецца праца “Материалы по исторической топографии Витебской губернии. Уезд Велижский” (Магілёў, 1898). Раманаў дае падрабязнае, дэталёвае апісанне водных аб’ектаў, урочышчаў, назваў населеных пунктаў, помнікаў археалогіі ў іх наваколлях. Аўтар прыводзіць не толькі назвы сучасных паселішчаў, але аналізуе іх па гістарычных крыніцах і параўноўвае з сучаснымі. Напрыклад, згадвае па працы М. Цызарава (1701 г.) в. Дрэтшчына, якая на момант напісання кнігі называлася Дыч’і Лукі (Дрычалукі ў пач. XXI ст). Такія параўнанні дазваляюць рабіць не толькі гістарычны, але і філолага-тапанімічны аналіз. Называе месцы знаходак старажытных рэчаў у блізкіх наваколлях Віцебска (Заронаўская, Храпавіцкая, Курынская воласці і інш.).


Е.Р. Раманаў

У брашуры “Опыт белорусского народного снотолкователя» (1889) змяшчае 540 тлумачэнняў сноў, сабраных у большасці на тэрыторыі Віцебшчыны (у тым ліку Аршанскім, Сенненскім, Гарадоцкім, Лепельскім, Віцебскім паветах).

Рысак (Бялыніцкая-Біруля), даследчыца музычнага фальклору Віцебшчыны. З мэтай вывучэння народных песень здзейсніла шэраг паездак па Віцебшчыне.

Селіванаў А.Ф. (канец XIX ст.), аўтар артыкулаў “Витебск”, “Витебская губерния”, “Витебский Марков монастырь”, “Городок”, “Дрисса”, “Лепель”, “Полоцк”,

“Сенно” ў энцыклапедычным слоўніку Бракгаўза і Ефрона (1892).

Семянтоўскі (Семянтоўскі-Курыла) Аляксандр Максімавіч (1821–1893), беларускі і рускі этнограф, археолаг, краязнаўца, фалькларыст. Паходзіў з Палтаўшчыны (Украіна). Скончыў ліцэй князя Безбародка. У 1863 г. накіраваны на Беларусь, тут хутка асіміляваўся і з вялікай энергіяй узяўся за даследаванне краю. Апісваў гісторыю Віцебскай губерні, старажытныя помнікі, археалагічныя знаходкі.


А.М. Семянтоўскі

У Віцебску працаваў сакратаром Губернскага статыстычнага камітэта і адначасова быў рэдактарам неафіцыйнай часткі газеты “Витебские губернские ведомости”, пазней – рэдактарам “Памятной книжки Витебской губернии”. Асабіста ім былі рэдагаваны кніжкі за 1863, 1864, 1865, 1866, 1869, 1878, 1881 гг. У кнігах апублікаваны 18 яго артыкулаў і вялікая колькасць статыстычных даных.

Прыводзіў звесткі пра помнікі старажытнасці ў Віцебскім павеце. Напрыклад, у Старасельскай воласці называе 3 курганы і 1 гарадзішча: “... 1 курган “Лавочник” (40 – номер на карте) находится на землях озеровского общества, помещицы Ярентовичевой, 2-й на земле помещика Любощинского, 3-й в имении г. Лабунскаго. Первое городище находится на крестьянской земле Летчанского общества при деревне возле озера Летцы, другой в имении помещика Добашинскаго у самой реки Двины...”

Сабраў звесткі пра 30 замкаў і замчышчаў на Віцебшчыне, больш як пра 1200 земляных насыпаў. Упершыню правёў класіфікацыю археалагічных аб’ектаў паводле іх прызначэння.

Стварыў карту археалагічных помнікаў (змешчана ў кнізе “Памятники старины Витебской губернии” (1867), утрымлівае 77 найменняў). Асноўнай этнаграфічнай працай А. Семянтоўскага пра побыт і культуру беларусаў з’яўляецца “Этнаграфічны агляд Віцебскай губерні” (1872).

Аўтар шэрага артыкулаў на розную тэматыку, якія з'яўляюцца каштоўнай крыніцай для вывучэння мінулага нашага раёна.

**Слупскі Фартунат Лявонцьевіч** (1836 – ?), краязнаўца. Аўтар артыкула "О волнении поме¬щичьих крестьян Витебской губернии в 1847 г.", змешчанага ў "Памятнай кніжцы Віцебскай губерні за 1866 г." Аўтар распавядае аб сялянскіх хваляваннях, выкліканых чуткамі пра тое, што прыгонныя могуць атрымаць волю, пры ўмовах таго, што адпрацуюць пэўны тэрмін на будаўніцтве Мікалаеўскай чыгункі. Даследаванне ўтрымлівае багаты факталагічны матэрыял, аналізуюцца прычыны цяжкага становішча сялян і захады мясцовай адміністрацыі па вырашэнні складанай сітуацыі.

**Спіцын Аляксандр Андрэевіч** (1858–1931), археолаг, педагог, гісторык, краязнаўца. Член-карэспандэнт АН СССР (1929).

Аўтар серыі "Обозрений губерний в археологическом отношении". У 1897 г. выйшаў том, прысвечаны Віцебскай губерні. Некалькі прац пазнейшага часу былі прысвечаны Віцебшчыне: пра падоўжаныя і доўгія курганы, якія ён лічыў старажытнымі пахаваннямі палачан.



Мацей Стрыйкоўскі

У другой пал. XVI ст. на Віцебшчыне жыў і працаваў польскі і беларускі гісторык, храніст **Мацей Стрыйкоўскі** (1547–1586). Самы значны і вядомы яго твор – "Хроніка польская, літоўская, жамойцкая і ўсяе Русі" (1582). Яна ўтрымлівае вельмі важныя звесткі пра гісторыю горада і наваколляў. Лічыцца, што яго твор прысвоіў (выкарыстаўшы службовае становішча) і выдаў пад сваім іменем А. Гваньіні.



У.К. Стукаліч

**Стукаліч Уладзімір Казімі–равіч** (1856–1918), літаратуразнавец, гісторык, краязнаўца. Аўтар артыкулаў, якія маюць пэўнае дачыненне да гісторыі і культуры Віцебшчыны: "Кароткая нататка аб беларускай гаворцы" (1895), "Да пытання пра арганізацыю універсітэта ў Віцебску" (1903), даследаванняў

“А.П. Сапуноў. Да 25-годдзя яго навуковай і літаратурнай дзейнасці” (1905), “М.Я. Нікіфароўскі. 1845–1910 гады” і іншыя (рэцэнзія на зборнік “Белоруссия и Литва”, выдадзены П. Бацюшкавым. Быў знаёмы з І.Я. Рэпіным, перапісваўся з Г.І. Успенскім, сустракаўся з ім у Віцебску ў 1890 г.

Супінскі Антон Казіміравіч (1896, Піншчына–?), гісторык, краязнаўца. Прымаў актыўны ўдзел у мясцовай краязнаўчай рабоце: раскопках курганоў каля в. Лятохі, вывучэнні падзямелляў былога Фарнага касцёла і інш. Аўтар нарыса “Прыгонная Віцебшчына”, змешчанага ў другім томе “Віцебшчыны”. Даюцца аналіз, статыстыка, і робіцца вывад, што з пераходам у склад Расійскай імперыі колькасць падаткаў на Беларусі павялічылася ў 12 разоў. Прыводзіцца спіс абшарнікаў-землеўласнікаў Віцебскага павета, колькасць вёсак і сялян па рэвізіях 1772–1787 гг.

Трусман Ю.Ю. (другая палова XIX ст.), аўтар выдання “Этимология местных названий Витебской губернии” (1897). Выданне – унікальная крыніца па тапаніміцы і гістарычнай геаграфіі Віцебшчыны. Аўтар прыводзіць тлумачэнні назваў з літоўскай, латвійскай, фіна-ўгорскіх і іншых моў.

Федаровіч Вацлаў Пятровіч (1848–1911), краязнаўца, калекцыянер, юрыст. Член-карэспандэнт Кракаўскай АН.

Дапамагаў у раскопках археолагам. Калекцыяніраваў зброю, археалагічныя, нумізматычныя, сфрагістычныя, этнаграфічныя матэрыялы. Калекцыя Федаровіча была адной з самых багатых археалагічных калекцый на тэрыторыі Беларусі ў канцы XIX ст. Па меркаванні У.Г. Краснянскага, “музей уяўляе сабой каштоўны збор музейных рэчаў і дастаткова поўна характарызуе гісторыю мясцовага краю”. Най-



В.П. Федаровіч

больш значнымі з'яўляліся калекцыі курыльных трубак, масонская калекцыя (адна з найбольш значных у тагачаснай Расіі).

У 1917 г. калекцыя В. Федаровіча была нацыяналізавана. У 1924 г. яна стала часткай Віцебскага абласнога краязнаўчага музея.

З'яўляўся ініцыятарам і складальнікам выдання літаратурна-краязнаўчага зборніка "З ваколіц Дзвіны" (Віцебск, 1912). Меў рукапісную "Энцыклапедыю Віцебшчыны", у якой змясціў прозвішчы і кароткія звесткі пра людзей, хаця б чымсьці звязаных з Віцебшчынай.

**Шлюбскі Аляксандр Ануфрыевіч** (1897–1941), беларускі этнограф, фалькларыст, архівіст. Займаўся арганізацыяй архіўнай справы на Віцебшчыне.



А.А. Шлюбскі

Краязнаўчая дзейнасць Шлюбскага пачалася 23.03.1913 г. у с. Бялынічы (10 вёрст ад Віцебска), дзе ён пачаў запісваць беларускія народныя песні. На працягу 10 год ім было сабрана ў Віцебскім, Веліжскім, Полацкім, Лепельскім, Сенненскім, Аршанскім паветах каля 3.000 адзінак этнаграфічнага матэрыялу (песні, казкі, загадкі, прыказкі) і вялікая колькасць іншага фальклорнага і бытавога матэрыялу. Па яго ініцыятыве выдаваўся часопіс "Беларускі этнограф".

Асноўнае месца А. Шлюбскага ў краязнаўчай дзейнасці Віцебшчыны займала галіна этнаграфіі і яе гісторыі. А.А. Шлюбскі склаў разгорнутую інструкцыю "Звесткі па зборы вуснай народнай творчасці ў Беларусі" (1919), сабраў і апублікаваў матэрыялы пра культурна-асветніцкае жыццё Віцебшчыны, Мінска, пра падзеі грамадзянскай вайны на Беларусі. Даследаваў старажытныя вераванні, матэрыяльную культуру беларусаў. Аўтар нарысаў-партрэтаў Е. Раманава, А. Сапунова, М. Нікіфароўскага, З. Бядулі, У. Дабравольскага.

Асноўныя працы А. Шлюбскага – поўны бібліяграфічны даведнік "Матэрыялы да беларускай бібліяграфіі" і "Матэрыялы да вывучэння фальклору і мовы Віцебшчыны".


П.В. Шэйн

**Шэйн Павел Васільевіч** (1826–1900), этнограф, фальклярыст, педагог. Працаваў настаўнікам у Віцебскай гімназіі. Займаўся зборам народнага фальклору. Напрыклад, ад сваёй служанкі Мар’і Васільеўны Кашкевіч ён запісаў каля 400 песень і абрадаў, з якіх больш за 300 увайшло ў яго першы зборнік “Беларускія песні” (1873).

Найбольш важная праца П. Шэйна “Беларускія песні” з’яўляецца самай буйной сярод аналагічных зборнікаў 60–70-х гг. XIX ст. У ёй сабрана больш за 1000 беларускіх народных песень, 10 казак, легенд, паданняў, некалькі запісаў прыкмет, замоў і забабонаў, сабраных у Віцебскай губерні, у тым ліку і Віцебскім павеце.

## ПАДАРОЖНІКІ, ШЛЯХ ЯКІХ ПРАЛЯГАЎ ПРАЗ НАШ КРАЙ



З Прыдзвіннем розным чынам былі звязаны лёсы асобных людзей, якія пабывалі ў нашым краі і пакінулі аб ім уласныя ўражанні. А былі тут розныя палітычныя дзеячы, дыпламаты, вайскоўцы, даследчыкі і навукоўцы, шэраг іншых знакамітых асоб. Апісваючы свае падарожжы, яны распавядалі пра горад Віцебск і яго наваколлі. Канешне, гэтыя звесткі носяць суб’ектыўны характар. Адным падарожнікам наваколлі спадабаліся, а іншым – не (напрыклад, па той прычыне, што тут загразла ягоная фурманка, на якой ён падарожнічаў, ці ў карчме

падалі нясмачную страву). У любым выпадку, апісанні падарожнікаў і іх успаміны з'яўляюцца важнай крыніцай для вывучэння нашага краю і вартыя асобнай увагі.

Дыпламат, падарожнік, пасол Свяшчэннай Рымскай імперыі ў Масковіі Сігізмунд Герберштэйн двойчы ў пачатку XVI ст. праязджаў у Маскву і Ноўгарад па тэрыторыі Беларусі, у тым ліку праз Віцебшчыну. У выніку падарожжаў была напісана кніга "Запіскі аб Маскавіцкіх справах". У ёй значнае месца адведзена апісанню старажытнай Віцебшчыны. Напрыклад, аўтар даў характарыстыку рэкам, азёрам, балотам, адзначаючы, што на поўначы Полаччыны ён сутыкнуўся з такой колькасцю рэк, што ні падлічыць, ні прывесці ўсе назвы не маглі нават мясцовыя жыхары. Апісаў жывёльны і раслінны свет паўночнай Беларусі. Апісаў заняткі, побыт насельніцтва, рэлігійныя вераванні, абрады, гандлёвыя сувязі, крэпасці і інш. На падставе кнігі С. Герберштэйна створаны шматлікія еўрапейскія карты ВКЛ і Расіі.

Па загадзе рускага цара Пятра I у 1701 г. рускі стольнік Максім Цызараў праплыў па рацэ Дзвіне і "зрабіў тайным звычаем ад Віцебска ўверх да самых вярхоўяў Дзвіны ракі чарцёж з сапраўднай мераю па маштабу". На сваю карту М. Цызараў нанёс усе аб'екты, якія маглі цікавіць рускіх, перш за ўсё абарончыя ўмацаванні. Тым самым аўтар пакінуў для гісторыі матэрыялы пра тагачасны стан помнікаў архітэктуры і археалогіі. Карта з'яўляецца каштоўнейшай крыніцай для вывучэння населеных пунктаў па беразе Дзвіны.

У другой палове XVIII ст. рускі падарожнік, натураліст, этнограф, акадэмік Расійскай АН І.І. Ляпёхін (1740–1802) даследаваў Беларусь і Прыбалтыку (экспедыцыя апісала прыроду, побыт народа, склала гербарый беларускай флоры). У яго навуковым паведамленні гаворыцца пра Дзвінскія (Барысавы) камяні з надпісамі.

У канцы XVIII ст., калі голад ахапіў Віцебшчыну, Павел I паслаў туды рускага паэта, дзяржаўнага дзеяча, сенатара Г.Р. Дзяржавіна (1743–1816) з мэтай высвятлення становішча сялян і нястачы хлеба ў Беларускім краі. За некалькі месяцаў (у 1794 і 1799 гг.) Дзяржавін дэталёва даследаваў становішча сялян, пабываў ў вёсках, мястэчках і гарадах

Віцебскай губерні. У сваіх запісках пакінуў апісанне жыцця і стану гаспадаркі сялян наваколляў Віцебска.



Г.Р. Дзяржавін

У пачатку XIX ст. рускі ваенны пісьменнік У.Б. Бранеўскі, удзельнік экспедыцыі ў Міжземнае мора пад камандаваннем адмірала Д. Сянявіна, праязджаў праз Віцебшчыну. У сваім дзённіку "Путешествие от Триеста до С.-Петербурга в 1810 году" апісаў (у форме прыватных лістоў) шлях следавання атрада ваенных маракоў. Пакінуў апісанні Віцебска, замалёўкі нораваў беларусаў, іх адзення і жылля.



В.М. Севяргін

У 1802 годзе вучылішчы Віцебскай губерні аглядаў акадэмік Пецярбургскай Акадэміі навук, рускі мінералог, хімік В.М. Севяргін (1765–1826). Пры гэтым ён вёў дзённік, дзе занатаваў свае ўражанні. Праз год у Пецярбургу выдаў кнігу "Записки путешествия по западным провинциям Российского государства", у якой ён змясціў звесткі пра беларускія гарады і пасёлкі, заняткі насельніцтва, стан эканомікі і асветы сучасных наваколляў Віцебска. Апісаў геалагічную будову Паўночнай Беларусі, яе карысныя выкапні. Пакінуў падрабязнае апісанне мінералаў, на якія багата Віцебшчына: "Крэмяні шэрыя і бурыя, агат стракаты і буры, ружовы кварц, граніт, яшма крывавага і іншых колераў, серпенцінны камень, светла-зялёны, з чырвонымі крапінамі, абломкі дахавага сланца, апсіднага і прабірнага каменяў, гаршковая, трубачная і цагляная гліна, таксама глiністыя вохры, у фарбу прыгодныя, і яшчэ шматлікія скамянеласці... усе вапнавыя; яны вымываюцца з берагоў Дзвіны. Тут жа знаходзяцца вапнавы камень і абломкі мармуру – чырвонага, бурага і шэрага...". Падрабязна апісваў раслінны і жывёльны свет Полаччыны і Віцебшчыны. У даследаванні прыводзяцца

цікавыя звесткі і пра рыб, якія жылі ў рэках Прыдзвіння. Паводле яго запісаў, напрыклад, зрэдку траплäліся мурэны вагай 12–20 фунтаў (5–8 кг) і ментузы вагай 3–4 фунты.

У 1815 годзе праз Віцебск падарожнічаў на сваім экіпажы батанік, натураліст А.К. Башняк (15.8.1786–1831). У кнізе "Дневные записки путешествия А. Бошняка в разные области Западной и Полуденной России в 1815 г." (1820–1821) ён пакінуў цікавыя звесткі пра краявіды, населеныя пункты Беларусі. Рабіў апісанне ландшафту, прычым, не толькі апісваў краявіды, але і імкнуўся вызначыць геалагічнае мінулае Беларусі, яе глебы, клімат, лясы, карысныя выкапні. Ёсць між іншым і апісанне наваколляў Віцебска: "Ад карчмы за Янавічамі ехаў я роўнымі, нізкімі і балоцістымі мясцінамі... Паступова рэльеф зноў рабіўся гарыстым, а глеба, раней ілістая, на ўзгорках была перамяшана з глінай". "Запіскі..." ўтрымліваюць цікавыя звесткі пра рысы сялянскага быту, археалагічныя і архітэктурныя помнікі паўночнай Беларусі. Апісваў сельскую гаспадарку Прыдзвіння, асушэнне балот. Лічыў, што заходнія паветы Смаленшчыны, дзе жылі беларусы, у этнічных і этнаграфічных адносінах не розніліся ад усходніх паветаў Віцебскай губерні.

Цікавыя звесткі пра Прыдзвінне пакінуў рускі падарожнік, мемуарыст М.П. Жданаў у сваёй кнізе "Путевые заметки по России в двадцати двух губерниях" (1843). Апісваючы Віцебск аўтар адзначаў, што "...архітэктура храмаў, большай часткай каталіцкіх, – зграбная і цудоўная. ... На вышыні берага Дзвіны зроблены бульвар, адкуль відаць увесь зарэчны горад, мост праз раку, баркі, плыты, каталіцкі касцёл, былы езуіцкі кляштар, губернатарскі дом (у якім жыў Напалеон), а далёка ўніз па Дзвіне – Маркаў манастыр, за горадам – роўнядзь зялёнага выпасу, а за ім – горы ў сіняве. Гэты ландшафт ёсць адзін з лепшых, якія я бачыў у час падарожжа". Улічваючы, што аўтар вандраваў па 22 губернях Расійскай імперыі, такая пахвала азначае шмат. У кнізе ўтрымліваюцца цікавыя звесткі пра развіццё сельскай гаспадаркі Віцебшчыны.

У сярэдзіне XIX ст. па Віцебшчыне падарожнічаў Б.А. Цалінскі (сяр. XIX ст.). У сваёй працы ён даў цікавую характарыстыку сельскай гаспадарцы на Віцебшчыне. Апісаў

спосабы пасадкі бульбы (у загоны, у рады, у баразну, “пад шнур”). Аналізаваў карысную практыку вырошчвання бульбы на Віцебшчыне: “...памешчык, палкоўнік Лянкевіч, меў у маёнтку Падбярэззе добрыя даходы з дрэннай падзолістай і пясчанай зямлі, бо садзіў бульбу, якая радзіла сам-дзесяць і ішла на вінакурэнне. Прыводзіць прыклады супраціўлення ўвядзенню пасадак бульбы. Апісвае гісторыю, якая здарылася ў 1817 г. у маёнтку Цялятнікі, калі гаспадар маёнтка, генерал Р. Гернгрос пачаў прымушаць сваіх сялян, каб яны садзілі на сваіх палях бульбу.

Апісаў гандаль і вялікую ролю Дзвіны ў гандлі з Заходняй Еўропай. Змясціў падрабязныя звесткі пра меры вагі, даўжыні, катэгорыі лодак, тавары, час, які займае вандроўка ў Рыгу і назад, цяжкасці, якія чакаюць гандляроў і бурлакоў на Дзвіне.

Апісаў некаторыя спосабы палявання на ваўкоў, адзначаючы, што паляваннем на Віцебшчыне захапляліся не дужа. Б. Цалінскага ўразіла, што “тутэйшыя паны не трымалі столькі псарняў і паляўнічых коней, як у іншых губернях”. Згадвае цікавы факт: здабытыя воўчыя шкуры фарбавалі і прадавалі пад выглядам “беларускіх янотаў”.

Сярод асоб, якія вывучалі наш край, былі і мастакі. Менавіта дзякуючы іх дзейнасці мы можам дакладна ведаць, якім быў знешні выгляд гарадоў, іх наваколляў, помнікаў архітэктуры. Неаднаразова і на працяглы час выязджаў на Віцебшчыну польскі мастак, прадстаўнік акадэмічнага класіцызму Юзаф Пешка, дзе працаваў у дамах багатых мецэнатаў. Каштоўную гістарычную крыніцу ўяўляюць сабой серыі пейзажаў Віцебска (12 работ) і яго наваколляў. На замалёўках, акварэлях, карцінах, эцюдах старанна прамаляваны архітэктурныя помнікі Віцебшчыны, скрупулёзна зафіксаваны дэталі будынкаў, мастоў, ручаін, дрэваў. За празмерную дакладнасць у перадачы дэталяў нават крытыкаваўся сучаснікамі, але для нас акварэлі Пешкі з’яўляюцца адной з галоўных крыніц, якія аднаўляюць выгляд Віцебска пачатку XIX стагоддзя. Большасць твораў зберагаецца ў музеях Польшчы, а таксама ў бібліятэцы АН Украіны ў Львове.

У 1864 годзе Рускім археалагічным таварыствам з мэтай выяўлення старажытнасцей Беларусі была праведзена экспедыцыя. На працягу экспедыцыі замалёўкі рабіў вядомы

мастак, археолаг Дз.М. Струкаў (1827?–1899). Да справаздачы Струкавым быў падрыхтаваны альбом на 200 лістах. У ім змяшчаліся замалёўкі населеных месцаў, цэркваў, касцёлаў, археалагічных помнікаў, помнікаў архітэктуры, твораў выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (крыжы, люстры, надмагільныя помнікі, іконы, святочныя рэлігійныя адзенні, узоры царкоўнага арнаменту і інш.). Віцебскай губерні прысвечана 83 малюнкі (42% ад агульнай колькасці). Сярод іншых малюнкаў было і “дагістарычнае гарадзішча авальнай формы і курганы, якія знаходзяцца ля яго падножжа” на Заходняй Дзвіне каля в. Старое Сяло.

Віцебску і наваколлям прысвечаны 27 малюнкаў. Увагу мастака прыцягнулі Троіцкая і Ільінская цэрквы, Маркаў, Тадулінскі манастыры, камень І. Кунцэвіча, што знаходзіўся ў 3-х вярстах ад горада.

Такім чынам, мемуары, дыярыушы, нататкі пра падзеі, апісанні падарожнікаў і іх успаміны з’яўляюцца важнай крыніцай для вывучэння нашага краю. Па гэтай прычыне варта весці дзённікі, у якіх адлюстроўваюцца падзеі, якія адбываюцца ў нашай мясцовасці. Хто ведае, можа быць і вашы нататкі праз якую сотню гадоў стануць важнай крыніцай па вывучэнні гісторыі нашага краю пачатку XXI стагоддзя?

# ДУХОЎНАЯ І МАТЭРЫЯЛЬНАЯ КУЛЬТУРА КРАЮ

ТЭМА 2

## ЛЕГЕНДЫ І ПАДАННІ ПРЫДЗВІННЯ

Легенды і паданні з'яўляюцца аднымі з найбольш важных элементаў гісторыка-культурнай спадчыны нашага народа. Яны адлюстроўваюць гістарычны лёс краіны, духоўныя каштоўнасці людзей Беларусі. Для жыхара кожнай мясцовасці яны з'яўляюцца пэўнымі звеннямі, якія злучаюць пакаленні нашага народа.
Выклікаюць цікавасць шматлікія паданні нашага краю. Вось некаторыя з іх.

● У в. Доўжа існуе некалькі паданняў, якія тлумачаць назву вёскі, возера Сосна. Існуе легенда і пра камень Кахання (вялізны валун, які знаходзіцца на беразе возера (між іншым, самы вялікі ў Віцебскім раёне).

***Пра паходжанне назвы вёскі.*** Шмат гадоў таму жыла тут панна. Была яна старой, не было ў яе ні дзяцей, ані ўнукаў, ані проста сваякоў. Быў у спадчыне толькі прыгожы замак. Але справы ішлі кепска і каб звесці канцы з канцамі, вымушана яна была браць шмат чаго ў доўг. Большасць пазык рабіла ў суседа. Калі ж памерла, то спадчына (замак і вёска) перайшла яму, але назва ў вёскі стала Доўжа, ад слова доўг, з прычыны пераходу ў маёмасць пана.

***Пра возера Сосна і камень закаханых.*** Даўным-даўно жыла ў вёсцы дзяўчына. Праездам у вёсцы быў пан. Ён пасватаўся да бацькоў дзяўчыны, і яны аддалі дачку за яго. Але дзяўчына закахалася ў мясцовага каваля па прозвішчы Сасноўскі і стала патаемна сустракацца з ім. Рабілі яны гэта каля вялізнага каменя, што ляжаў на беразе рэчкі Храпаўлянка, якая цякла з возера ў Дзвіну. Пра сустрэчы каля каменя стала вядома пану, і ён загадаў высачыць закаханых

і забіць іх. Служкі пана так і зрабілі. Целы забітых пан загадаў кінуць у возера і душы іх не мелі спакою да канца вякоў (калі нябожчыкі не пахаваны па хрысціянскім абрадзе, душы не змогуць трапіць ні ў рай, ні ў пекла, а вымушаны будуць цярпець і чакаць канца свету). Загадаў зрабіць ён так і таму, каб знішчыць усялякую памяць пра здраду і людзей, якія адважыліся на яе. Але людзі памяталі пра зладзейства і сталі называць возера па прозвішчы каваля – Сосна. Асабліва шкада было людзям дзіця, якім, як потым высветлілася, была цяжарная дзяўчына.

Пэўны сэнс у паданні ёсць. На Беларусі ніколі не было азёраў з назвамі Сосна – не ўласціва гэта нашаму краю. Тапанімічны слоўнік Беларусі кажа, што такія назвы маглі з'яўляцца толькі ў выніку перайменавання ў сувязі з якімі-небудзь надзвычайнымі падзеямі. Такой падзеяй мог быць рэальны выпадак з закаханымі. Назва каменя, яго месцазнаходжанне (на беразе ракі і возера), звесткі пра тое, што на ім былі забіты людзі, ускосна сведчаць пра тое, што ён мог выкарыстоўвацца ў якасці месца для ахвярапрынашэнняў і капішча.

● В. Бараўляны Мазалаўскага с/с Віцебскага раёна. За 1 км на поўнач ад вёскі, на беразе ракі Шэсценка ёсць месца, якое называюць ***"Чортаў мост"***. Цяпер, у выніку правядзення меліярацыі рака больш нагадвае ручаіну. На самым беразе знаходзяцца старажытныя курганы. Каля іх праходзіла старажытная дарога з Віцебска на Вялікія Лукі. Праз раку тут была зроблена грэбля, гаць, мост. Аднак амаль увесь час ён утрымліваўся ў нядбайным стане і выклікаў шмат нараканняў у праязджаючых купцоў. Іх фурманкі перакульваліся, застравалі ў гразі. За частыя паломкі і марнаванне часу гэта месца назвалі "чортавым". Пазней праз рэчку быў зроблены мост, які і цяпер называюць "Чортаў мост".

● У в. Букаціна Мазалаўскага с/с Віцебскага раёна існуе паданне пра балота, якое знаходзіцца на паўднёвай ускраіне вёскі. У мясцовых жыхароў існуе паданне, што раней тут было глыбокае возера, але пасля таго, як у ім утапілася дачка памешчыка, ён загадаў спусціць з возера ваду і тут утварылася балота.

● В. Сакольнікі Мазалаўскага с/с Віцебскага раёна.

***"Французскія могілкі"***. За 1 км на паўднёвы ўсход ад вёскі знаходзіцца ўрочышча Кахоўка. У ім знаходзіцца курганны могільнік, які складаецца з 57 насыпаў вышынёй

1–1,5, дыяметрам 5–7 м. У 1891 г. іх даследаваў Е. Раманаў. Мясцовыя жыхары называюць курганы “французскімі могілкамі”. Існуе паданне, што ў часы вайны 1812 года каля Сакольнікаў быў бой, у якім загінула шмат французаў, якія былі пахаваны ў курганах. Аднак сучасныя даследаванні (1972 г. – Г.В. Штыхаў, 1981 г. – Л.У. Калядзінскі) дазваляюць сцвярджаць, што ў могільніку пахаваны крывічы, якія жылі ў VIII–XII стст.

● У пасёлку Лужасна існуе некалькі паданняў.

***Паданне пра “Гроб-гару”.*** Так называецца вялізны холм у Цёплым лесе. Існуе паданне, што раней на гэтым месцы была вёска, якая пазней правалілася пад зямлю. Ёсць і такі варыянт легенды: тут была царква, якая правалілася пад зямлю. Калі-некалі чутны яе званы.

Існуе і менш распаўсюджаны варыянт легенды. Раней холм быў выспай, якую абкружала возера. На гэтую выспу ў 1812 годзе памешчыкі звязлі свае скарбы ад французскіх войскаў. Схавалі яны іх пад зямлёй, куды спусціцца можна было праз жалезныя дзверы. Прайшоў час, возера ператварылася ў балота. Невядома, што сталася з памешчыкамі, але скарбы і зараз знаходзяцца ў зямлі. Дастаць іх ніхто не мог, бо не мог падняць ці адчыніць жалезныя дзверы. Пазней яны схаваліся пад зямлёй і цяпер нябачныя. Падобная легенда згадваецца А. Семянтоўскім пра замчышча на возеры Езярышча (Памятники старины Витебской губернии. – СПб., 1867).

Падобнага роду паданні пра вёскі ці цэрквы, праваленыя пад зямлю, дастаткова пашыраны на Беларусі. Напрыклад, у в. Навасёлкі Лятчанскага с/с існуе легенда пра царкву і возера. Каля турбазы “Верасы” ёсць возера Чорнае. Існуе паданне, што раней на месцы возера была царква, але правалілася пад зямлю і на тым месцы ўтварылася возера. Звычайна тут знаходзяцца помнікі археалогіі – гарадзішчы, паселішчы, стаянкі і інш. Так ёсць і ў Лужасна. Тут знаходзіцца гарадзішча ранняга жалезнага веку (3-я чвэрць I тысячагоддзя н.э.), а блізка ад яго і селішча. Месца вядома навукоўцам з 1873 года. Раскопкі праводзіліся ў 1972 і 1974 гг. Г.В. Штыхавым.

Зараз холм, на якім знаходзілася гарадзішча, амаль з усіх бакоў абкружаны балотам. Хутчэй за ўсё, на яго месцы было мелкаводнае возера, якое паступова зарастала і ператваралася ў балота. Яно ўтварылася пасля пабудовы каля Лу-

жасна чыгункі, якая сваім насыпам перакрыла сцёк ручаіне, што адводзіла ваду да Дзвіны.

***Паданне пра царкву Узвіжання Крыжа.*** Царква Узвіжання Крыжа была пабудавана па зароку мясцовых памешчыкаў, якія абяцалі, што адбудуюць каменную царкву, калі Напалеон не парабуе іхныя маёнткі і маёмасць. Царква была пабудавана на месцы каплічкі.



Дуб, які зросся з ясенем у в. Лужасна

***Паданне пра дуб, які зросся з ясенем у п. Лужасна (“Браты”).*** Легенда з’явілася нядаўна і тлумачыць паходжанне помніка прыроды. Растуць у пасёлку Лужасна два дрэвы – дуб і ясень, быццам абняўшыся адзін з другім. Біёлагі сведчаць, што такая з’ява вельмі рэдкая ў прыродзе. Пакуль дрэвы былі малыя, месца хапала, а як павырасталі – дык стала бракаваць. Пачалі яны спрачацца, каб адзін аднаму саступіў. Ніхто не жадаў саступаць, бо коштам кожнаму жыццё было. Ад спрэчак перайшлі да свары, а ад яе і да бойкі. Біліся не дзень і не два, абхапіўшы адзін аднаго. Але праз колькі дзён стаміліся так, што знясілелі ў канец. І зразумелі абое, што калі яшчэ трошку так адзін аднаго памучаюць, то жывым ужо ніхто не застанецца, абое загінуць, а на пустым месцы не дрэвы – крапіва ды пустазелле расці будуць. Лепей у цеснаце ды ў міры жыць, чым памерці абедзвюм з-за гонару. Памірыліся яны, але сіл ужо столькі страчана было, што не хапала ім, каб паасобку стаяць. Так і засталіся яны стаяць абняўшыся, дапамагаючы як сябар сябру. І дапамагаюць яны адзін аднаму з таго часу дагэтуль. Так і растуць, абняўшыся, але не ў барацьбе, а ў падтрымцы. І людзі іх сталі называць “братамі”.

● У в. Цяцёркі Мазалаўскага с/с Віцебскага раёна існуе легенда ***пра азёркі, у якіх нельга прамерыць дно***, а калі людзі

паспрабавалі зрабіць гэта, то чорт не даў зрабіць тое.

У лесе каля вёскі знаходзяцца два азёркі. Яны невялікія, з усіх бакоў акружаны лесам. Берагі зыбкія і падысці да вады можна толькі па гацях ці зімой. Ніхто з мясцовых не ведаў, якая глыбіня ў азёркаў. Аднойчы сабраліся людзі і вырашылі вымерыць дно ў аднаго з азёркаў. Узялі лодку, пасярод возера прывязаўшы груз да вяроўкі, сталі яго апускаць. Аднак



Адлюстраванне хвояў у вадзе возера каля в. Цяцёркі

вымераць дно не змаглі – і першая вяроўка скончылася, і другая. Прывязаўшы трэцюю, сталі апускаць, але нехта з-пад вады моцна дзергануў яе так, што людзі яе выпусцілі з рук, а самі пападалі. З-пад вады толькі пачуўся голас:

– Не мерай вяроўкай, а памерай галоўкай.

Людзі зразумелі, што гэта быў чорт, які прапанаваў не мераць дно звычайным спосабам, а прынесці чалавечае жыццё. Людзі кінулі і больш дно ў Цяцёрках не мералі.

● ***Возера Валконка*** каля в. Сушчова Мазалаўскага с/с Віцебскага раёна. Людзі ў Сушчова вераць, што ў возеры Валконка ў 1812 годзе французскія жаўнеры схавалі нарабаваныя скарбы.

● У в. Мазалава добра ведаюць ***паданне пра Ігната Манькоўскага і маёнтак Мілае*** ў в. Мазалава. Малады небагаты дваранін Ігнат Манькоўскі закахаўся ў дачку важнага вяльможы. Каханне было ўзаемным. Але калі ён пасватаўся

да дзяўчыны, то бацька адмовіў яму па некалькіх прычынах: Манькоўскі быў небагаты і не меў маёнтка і сродкаў на ўтрыманне сям'і, не меў высокага звання. Бацька прапанаваў пасватацца яшчэ раз, калі жаніх будзе багатым і пры пасадзе. Манькоўскі разумеў, што вельможа не стане чакаць дзесяцігоддзі, калі ён зможа стаць такім, а выдасць дачку за іншага. І. Манькоўскі напісаў ліст імператару Паўлу І, у якім распавёў пра выпадак. І змог сустрэцца з ім. Павел І пашкадаваў закаханых і загадаў перадаць І. Манькоўскаму ў пажыццёвую ўласнасць фальварак (гаспадарку з некалькімі вёскамі) і надаць Манькоўскаму не наступны чын, а той, які ішоў праз адзін. Больш таго, ён згадзіўся быць сведкам з боку жаніха на вяселлі. Пасля такога бацька не мог адмовіць Манькоўскаму і маладыя пажаніліся. Потым Манькоўскі набыў в. Мазалава і пабудаваў маёнтак, які назваў “Мілае”. Ён захаваўся да нашых часоў. Частка падання прыведзена ў артыкуле К.А. Манькоўскага “Император Павел I и Игнатий Маньковский”, змешчанага ў № 8 часопіса “Русская старина” 1882 г.

***Пра памешчыка Тальке***. Аднойчы польскаму каралю, які наведваў Віцебск, была прадстаўлена мясцовая шляхта. Сярод запрошаных прадстаўнікоў адзін быў вельмі мажны і тоўсты. Звалі яго Тальке. Адрэкамендавалі толькі з найлепшага боку. За асобыя заслугі кароль вырашыў аддзячыць Тальке, аднак вырашыў і разыграць яго. Ён абвесціў, што надзеліць шляхціцу столькі зямлі, сколькі ён зможа абысці ад усходу да заходу сонца. Зразумела, што для тоўстага чалавека доўга хадзіць пешшу даволі складана, аднак ад хуткасці і вынослівасці залежыць будучае багацце.

З раніцы Тальке прыехаў у мясцовасць, дзе цяпер знаходзіцца в. Мазалава і да самага змяркання хадзіў самым хуткім ходам, як толькі мог. Згодна са сваім словам польскі кароль падарыў яму гэтую зямлю. Пазней частку гэтага надзела набыў І. Манькоўскі і пабудаваў на ім маёнтак “Мілае”.

● ***Возера Ліпкі, у якім водзіцца вадзяная пачвара***. За некалькі кіламетраў на ўсход ад в. Саўчонкі, каля ваеннага палігона “Лосвіда”, ёсць некалькі лясных азёркаў. Існуе легенда пра тое, што ў іх жыве вадзяная пачвара. Людзі ўпэўнены, што азёркі злучаюцца паміж сабой пад зямлёй воднымі каналамі, па якіх пачвара перабіраецца з аднаго возера ў другое.

● ***Легенда пра здарэнне на рэчцы Заронаўка.*** Летам дзеці пайшлі купацца на рэчку паблізу ад дома. Хутка трэба было ісці на абед, і яны спяшаліся, каб не спазніцца. Яшчэ стаяўшы на беразе, яны ўбачылі, што па рацэ плыве лодка, у якой стаіць жанчына ў белым. Жанчына запыталася ў іх пра штосьці, аднак ніхто потым не памятаў, пра што. Дзеці глядзелі на яе, пакуль яна не праплыла далей. Так, не купаўшыся, яны хутка пабеглі дадому на абед. Але аказалася, што яны спазніліся нават на вячэру. Ім падалося, што яны адсутнічалі колькі дзесяткаў хвілін, а на самай справе іх не было некалькі гадзін. Гэта адбылося напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны, і потым дзеці самі лічылі, што яны бачылі смерць.



Возера Лосвіда

● ***Легенда пра Напалеонаўскую дарогу праз возера Лосвіда.*** Возера Лосвіда вельмі глыбокае. У паўднёва-ўсходняй частцы ёсць месцы, дзе глыбыня больш за 20 метраў. У паўночнай частцы возера ўтварае луку, якая называецца Малое Лосвіда. Тут з аднаго на другі бок можна перайсці, як кажуць мясцовыя жанчыны, “не замачыўшы спадніцы”. Гэтае месца называюць Напалеонаўскай дарогай, ці Напалеонаўскай трапой.

Згодна з паданнем, у 1812 годзе ў гэтым месцы войска французаў з Напалеонам было абкружана рускай арміяй.

Уначы да Напалеона прыйшоў д’ябал і прапанаваў уратавацца ад немінучай гібелі ці палону. Калі імператар згадзіўся, нячысты загадаў жаўнерам шапкамі насіць зямлю ў возера. У выніку чараўніцтва, у гэтым месцы ўтварылася падводная “дарога”, па якой французы змаглі перайсці возера і выратавацца ад рускага войска.

Існуе яшчэ некалькі тлумачэнняў паходжання “пераходу”. На адным баку возера ёсць вёска Малое Лосвіда, на другім – Вялікае. У адной вёсцы ў пана жыла прыгожая дачка, у другой – у пана быў сын. Калі маладыя пакахалі адзін аднаго, бацькі загадалі насыпаць праз возера дарогу, каб іх дзецям можна было прасцей сустракацца, хадзіўшы з вёскі ў вёску напрамую, бо ў абход ісці некалькі кіламетраў.

Ёсць паданне пра тое, што дарогу загадаў насыпаць памешчык, каб жартаваць са сваімі гасцямі. Усадзіўшы ў карэту, ён вёз іх каля возера, а потым на поўнай хадзе ўязджаў у возера. Людзі страшэнна палохаліся, думаючы, што патонуць, аднак карэта працягвала ехаць па вадзе, як па сухому.

Навукоўцы мяркуюць, што гэтае месца магло ўтварыцца дзякуючы падводным цячэнням возера.

● ***У в. Скрабова Вымнянскага с/с расказваюць легенду пра ведзьмака.*** Жыў некалі ў гэтай вёсцы адзін мужык – Кузьма. Пагаворвалі, што ён займаецца нячыстымі справамі, бо д’яблу душу прадаў. А высветлілася гэта такім чынам. Аднойчы ў аднаго вяскоўца, Трахіма, перастала ў гаспадарцы весціся скаціна. Асабліва часта паміралі каровы. Вырашыў Трахім схадзіць да сваёй кумызнахаркі, якая людзям ніякай шкоды не рабіла, а наадварот, дапамагала высветліць падроб. Ну вось ён і прыйшоў да кумы. Пашаптала яна крыху, паглядзела на ваду і адкрыла Трахіму твар чарнакніжніка. Сказала зрабіць тое і тое, дала загаворанай вады, каб ён напаіў скаціну. Зрабіў ён усё як трэба, і ў гаспадарцы ўсё пайшло на лад. Неўзабаве да яго завітаў той вядзьмак з пляшкай гарэлкі. Вось селі яны за стол, выпілі, а гаспадар і гаворыць: “Кінь, Кузьма, чорную справу!”. Той кажа: “Добра, добра. Лепш яшчэ вып’ем!”. І толькі Трахім кульнуў чарку, як зваліўся на падлогу. Стала яму ліха і хутка ён памёр.

У той жа вёсцы ёсць паданне і ***пра добрую знахарку***. Каля возера стаяла адзінокая хаціна. Жыла там знахарка Марыля. Збірала яна зёлкі, варыла адвары і лячыла

ўсіх, хто да яе ні звяртаўся. Добрая была жанчына, чулая, ніколі нікому не адмаўляла. Але ўсім прыходзіць час паміраць. Занядужыла і Марыля. Прыйшлі да яе ўсе, каму яна адвары давала, каго лячыла і проста людзі з навакольных вёсак. Усе пытаюць: чым дапамагчы? А яна адказвае: “Пэўна, прыйшоў ужо мой час, толькі вы не плачце па мне, а пахавайце на краю могілак. Будуць на маёй магіле травы розныя расці, дык вы не бойцеся, збірайце іх, і яны вам абавязкова ўсім на карысць пойдуць”. Пахавалі Марылю як яна прасіла, і па сённяшні дзень прыходзяць людзі на магілу, збіраюць тыя травы і хваробу як рукой здымае.

● ***У в. Навасёлкі Лятчанскага с/с расказваюць паданне пра возера Бяздоннае***, што знаходзіцца непадалёк. Старыя людзі кажуць, што на беразе возера была драўляная царква і яна, як яны сцвярджаюць, у адну са службаў правалілася пад зямлю. Засталіся бачнымі толькі купалы, іх быццам можна было бачыць яшчэ пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. З цягам часу зніклі і яны. На месцы царквы ўтварылася возера. Берагі гэтага возера ўяўляюць сабой суцэльную дрыгву, па якой можна з цяжкасцю падысці да самай вады, але ўжо ў сантыметры ад берага вы не зможаце дастаць дна. Кажуць, што ў ціхае надворʼе можна пачуць званы. Пад зямлёй гэта возера злучаецца з Белым возерам, якое знаходзіцца недалёка ад турбазы “Верасы”. Узровень вады ў гэтых азёрах заўсёды аднолькавы. А яшчэ ў Бяздонным возеры немцы пры адступленні тапілі сваю тэхніку. Зараз да возера захавалася адзіная дарога, з іншых бакоў яно акружана векавымі елкамі і соснамі, схавана ад людскіх вачэй. Запісана са слоў Яўхіма Сцяпанавіча Селіванава, 1907 года нараджэння (вёска Навасёлкі).

● ***У в. Старое Сяло распавядаюць гісторыю (былічку) пра каменны крыж,*** які ззяў уначы. Апошнім гаспадаром старасельскага маёнтка быў славуты генерал рускай арміі Іван Аляксеевіч Андрыянаў. Ён удзельнічаў у шматлікіх войнах і меў вялікую колькасць узнагарод. Але самай дарагой узнагародай ён лічыў сімвалічны залаты ключ, які атрымаў ад жыхароў аднаго балгарскага горада. Гэты горад быў вызвалены ад туркаў кавалерыяй Андрыянава ў час руска-турэцкай вайны.

Пасля выхаду ў адстаўку генерал пастаянна жыў у сваім старасельскім маёнтку. У 1912 годзе І.А. Андрыянаў

памёр. Перад смерцю ён выказаў сваім родным пажаданне: пахаваць яго на старых могілках ля драўлянай царквы, дзе пахаваны былі яго жонка і сын. Яшчэ генерал пажадаў, каб яму ў труну паклалі сімвалічны залаты ключ. Жаданні генерала былі выкананы. Праз некаторы час на магіле памёршага генерала быў пастаўлены гранітны помнік, сярэдні фрагмент якога прадстаўляў пліту з выбітым на ёй ва ўсю метровую вышыню праваслаўным крыжам.

Прайшоў некаторы час, і царкоўны вартаўнік Фёдар Шылін пачаў заўважаць нейкае незвычайнае свячэнне ў глыбіні могілак. Будучы чалавекам забабонным і веруючым, ён спалохаўся  і адначасова здзівіўся гэтай незвычайнай з'яве. І ў адну з цёмных начэй, калі замільгацеў загадкавы агеньчык, цікаўнасць перамагла. Сцяўшы дыханне, вартаўнік рушыў у глыб могілак. Хутка ён зразумеў, што прыйшоў да магілы генерала Андрыянава і што свяціўся крыж на магільнай пліце. Вартаўнік прыклаў далонь да крыжа, ён быў цёплы, а далонь як бы прасвечвалася.

Пасля царкоўны вартаўнік неаднаразова наведваўся да незвычайнага крыжа. Ён ужо не баяўся гэтай з'явы, а лічыў яе боскай праявай. Колькі б доўжылася гэтая цудоўная з'ява – невядома. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. была разбурана старая царква, зніклі і могілкі пры ёй. Магільная пліта была закладзена ў падмурак нейкай будоўлі.

Старую гісторыю прыгадалі не так даўно, калі гранітная пліта з крыжам была выкапана ў падмурку старой школы. Яе апазналі па апісанні старых жыхароў і ўнучкі Андрыянава, якая наведалася ў Старое Сяло. Аднак болей пліта не свеціцца.

● ***У Суражы так тлумачаць паходжанне назвы горада***. Калісьці праз мястэчка, дзе зараз знаходзіцца Сураж, ехала расійская царыца Кацярына II. Так здарылася, што Кацярына са світай  засталася тут начаваць. А раніцай спытала ў мясцовых жыхароў, як называецца гэта мястэчка. Яны адказалі, што ніяк. І тады яна загадала суправаджаючым суражацца (гэта значыць збірацца ехаць далей) і дадала: “Няхай гэта месца будзе Суражам”.

Вядома, гэта не навуковае, а народнае тлумачэнне назвы, бо Сураж існаваў задоўга да з'яўлення Кацярыны II на свет, але і народнае тлумачэнне каштоўна як для навукоўцаў-філолагаў, так і простых людзей, бо з'яўляецца нашай духоўнай спадчынай.

## ПАДАННІ, ЗАПІСАНЫЯ ВЯДОМЫМІ ЭТНОГРАФАМІ І КРАЯЗНАЎЦАМІ

Матэрыялы з Віцебскага павета актыўна збіраліся навукоўцамі XIX ст., якія жылі на Віцебшчыне: Е. Раманавым, М. Нікіфароўскім, П. Шэйнам. Шмат з іх вельмі старажытныя і ўяўляюць цікавасць не толькі для жыхароў Прыдзвінскага краю, але і ўсходніх славян увогуле. Напрыклад, паданні "Аб стварэнні балот", "Аб паходжанні д'ябла і балатоў", "Адкуль мядзведзь", "Адкуль каза", "Аб паходжанні ваўка", "Пра паходжанне бусла", "Пчала, голуб" тлумачаць паходжанне рэчаў, жывых істот.

Легенды "Бог, баба і мужык", "Бог і святы Мікола", "Юры, Мікола і мужык", "Мікола і Касьян", "Разумная праля", "Бог і яго ўгоднікі Пятніца і Субота" распавядаюць пра паходжанне святаў.

Філасофскія пытанні пра ўзаемаадносіны дабра і зла, жыццё і смерць, каханне і здраду, долю і нядолю, веліч і маласць, паходжанне стасункаў паміж людзьмі тлумачылі нашы продкі ў паданнях: "Пра асілкаў", "Як упярод хавалі людзей", "Зачым людзі перасталі ведаць", "Зачым дзеці як родзяцца не ходзяць", "Аб царкве, што ўвалілася пад зямлю" і інш.

З гэтымі легендамі і паданнямі вы можаце пазнаёміцца на старонках кніг: Нікіфароўскі М.Я. "Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды и обычаи, легендарные сказания о лицах и местах" (1897), "Легенды і паданні", пад рэдакцыяй М.Я. Грынблата (1983, 2005) і некаторых іншых. Іх можна адшукаць у Віцебскай абласной бібліятэцы імя У.І. Леніна.

# АСЯРОДКІ ХРЫСЦІЯНСКАЙ ДУХОЎНАСЦІ

## Віцебскі Маркаў Свята-Троіцкі манастыр

Віцебскі Маркаў Свята-Троіцкі мужчынскі манастыр на працягу стагоддзяў адыгрываў ролю важнага цэнтра праваслаўя на Віцебшчыне. Знаходзіцца ён на правым беразе Дзвіны. Раней тэрыторыя манастыра месцілася прыкладна ў 4-х км ад гарадской рысы. Сёння гэта раён вуліцы М. Горкага, а сам манастыр з Свята-Пакроўскай (Казанскай) царквой XVIII ст. схаваны за вялізнымі будынкамі ААТ "Віцебскі камбінат шаўковых тканін". Згодна паданню, заснаваў манастыр чалавек па імені Марка, які на ўласным участку зямлі пабудаваў капліцу і пачаў весці богаўгодны лад жыцця. Весткі пра гэтага чалавека распаўсюдзіліся па наваколлі, многія людзі прыходзілі, каб памаліцца Богу разам з ім, а некаторыя заставаліся. Такім чынам узнікла манаскае пасяленне. Адбылося гэта недзе ў XIV ст. Менавіта Марка, згодна манастырскім запісам, лічыўся заснавальнікам манастыра. Праз пэўны час па невядомых прычынах манастыр прыпыніў сваё існаванне. Першае датаванае ўпамінанне ў дакументах (1576 г.) датычыцца не манастыра, а Маркаўскага прыходу, настаяцель якога Феафан (Рыпінскі) стаў Полацкім архіепіскапам.

У XVII ст. князь Леў Самуіл Агінскі, цівун аршанскі, і пан Севасцьян Мірскі, суддзя земскі браслаўскі, дамагліся ад караля Жыгімонта III прывілея на права аднаўлення манастыра. У 1633 г. гэтыя магнаты пабудавалі ў ім драўляную царкву і жылыя пабудовы, а ў 1638 г. надзялілі манастыр маёнткамі Маркава і Шыдлоўшчына, якія выкупілі ва ўладальнікаў. Сын Льва Самуіла, князь Сімяон Караль Агінскі перайшоў у каталіцтва. Але заставаўся чалавекам талерантным, паважаў веру продкаў. Спецыяльнай граматай 1687 г. ён пацвердзіў правы праваслаўнага манастыра на атрыманыя маёнткі. Прычым у адным з пунктаў дакумента гаварылася, што ў выпадку адыходу ад "релеи нашей старожитной греческой" (г.зн. праваслаўя) ва ўніяцтва ці каталіцтва, манастыр згубіць падтрымку фундатараў. У 1690 г., пасля таго як манастыр згарэў у час пажару, князь Сімяон пабудаваў драўляную царкву ў гонар Святой Троіцы (праіснавала да пачатку XX ст.) і манаскія келлі. Царква, узведзеная народнымі майстрамі пад кіраўніцтвам В. Харошкі, была вы-

разным узорам Віцебскай школы дойлідства, уяўляла сабой драўляны крыжова-цэнтрычны чатырохзрубны храм, кожны зруб якога быў накрыты асобным шатровым дахам.

Манастыр на працягу сваёй гісторыі прытрымліваўся праваслаўя. Знаходзіўся ён у веданні мітрапалітаў Кіеўскіх і Галіцкіх, а пэўны час у другой палове XVII ст. – маскоўскага патрыярха. У 1657 г. ігумен Маркава манастыра Каліст (Рытарайскі) быў пасвечаны патрыярхам Ніканам у сан Полацкага епіскапа. Патрыярх (па іншай версіі цар Аляксей Міхайлавіч) падараваў манастыру ікону Казанскай Божай маці, якая стала галоўнай манастырскай святыняй і лічылася цудатворнай. У хуткім часе пасля перанясення іконы з Масквы Маці Божая па малітвах людзей выратавала горад ад маравой язвы. Пасля да яе звярталіся з малітвамі аб выздараўленні і пазбаўленні напасцяў і духоўных скорбяў.

У XVIII ст. манастыр неаднаразова цярпеў ад наездаў і парубак, прыцясненняў манастырскіх падданых з боку мясцовых землеўласнікаў. Адзін з настаяцеляў, Серапіён (Пчолка) з трыма манахамі ў другой чвэрці XVIII ст. перайшоў ва уніяцкую веру. Але большасць насельнікаў манастыра засталася вернай праваслаўю.

Пасля ўваходжання беларускіх земляў у склад Расійскай імперыі статус манастыра ўзрос – з 1798 г. ён стаў архімандрыяй. Да яго быў прыпісаны Невельскі заштатны манастыр.

У час вайны 1812 г. Маркаў манастыр быў разрабаваны французамі. Цудатворную ікону Казанскай Божай маці выратавалі манахі, схаваўшы ў лесе. Пазней, пры дапамозе ахвяравальнікаў, манастыр быў адноўлены.

Манастыр меў значныя зямельныя ўладанні. Але да сярэдзіны XIX ст. яны, акрамя 150 дзесяцін, былі ўзяты ў казну. У 1842 г. Маркаў манастыр быў прылічаны да 1 класа, мог мець 20 манахаў, атрымліваў ад дзяржавы 3185 руб. серабром. Пры манастыры былі майстэрні, школа для слабадскіх дзяцей. На пачатку XX ст. манастырскі комплекс быў абнесены мураванай агароджай. Складаўся ён з 4-х цэркваў (Свята-Троіцкай, Свята-Пакроўскай, Свята-Мікалаеўскай, Свята-Параскеўскай), званіцы-брамы, дома ігумена, брацкага дома, шэрагу гаспадарчых пабудоў.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі, у 1918 г. манастыр быў закрыты. У яго будынках месціліся канцэнтрацыйны лагер, дзіцячы дом, аддзяленне міліцыі. У час Вялікай

Айчыннай вайны будынкі былі пашкоджаны. Пасля вайны ў ацалелых размяшчаўся абласны архіў. Пазней будынкі былі зруйнаваны, а на іх месцы пабудавалі карпусы шоўкаткацкай фабрыкі. Захавалася толькі Свята-Пакроўская царква. Менавіта ў гэтым храме, перайменаваным у гонар іконы Казанскай Божай маці, аднавіліся богаслужэнні ў час акупацыі. У пасляваенны час царква заставалася адзіным дзеючым храмам Віцебска.

Адраджэнне Маркава Свята-Троіцкага манастыра пачалося ў лістападзе 2000 г. На канец 2005 г. у ім налічвалася 16 манахаў ва ўзросце ад 28 да 80 гадоў на чале з ігуменам Савам. 8 паслушнікаў рыхтаваліся прыняць пострыг. Знаходзяць прытулак у манастыры бяздомныя, лік якіх у халады дасягае 40 чалавек. Гэтых людзей называюць "труднікамі" (ад руск. слова "трудиться"). Яны працуюць на карысць манастыра, рамантуюць будынкі, выконваюць сталярныя і шавецкія працы. Маецца невялічкі зямельны ўчастак, карова, козы. Істотную дапамогу манахам аказваюць фермеры.

## Тадулінскі Свята-Успенскі манастыр

Тадулінскі манастыр быў заснаваны каля 1743 г. трокскім ваяводаю князем Тадэвушам Агінскім і яго жонкай княгіняй Ізабэлай на беразе маляўнічага возера Вымна (сучасны Віцебскі раён). Спачатку манастыр быў уніяцкім і належаў Базыльянскаму ордэну. Яшчэ да стварэння манастыра на тым месцы існавала драўляная праваслаўная царква ў імя Успення Прасвятой Багамаці. На яе фундаменце на рубяжы 1760



Возера Вымна

– 1770-х гг. была пабудавана мураваная царква, асвечаная полацкім уніяцкім арцыбіскупам Фларыянам Грабніцкім. Па ліквідацыі ў 1799 г. Віцебскага Успенскага базыльянскага манастыра яго манахі былі пераведзены ў Тадулінскі манастыр.

Галоўнымі манастырскімі святынямі былі дзве іконы: Прасвятой Багамаці, падораная князямі Агінскімі, у гонар якой быў асвечаны манастыр і Свяціцеля Цудатворца Мікалая, перанесеная ў Тадуліна з Віцебскага Успенскага сабора. Манастыр меў багатыя бібліятэку і архіў. Тадулінскія манахі валодалі таксама значнымі зямельнымі ўгоддзямі, падараванымі Агінскімі і іншымі ахвяравальнікамі.

З 1842 г. манастыр стаў праваслаўным. На сярэдзіну 1860-х гг., калі яго наведаў вядомы віцебскі краязнаўца, сакратар Губернскага статыстычнага камітэта А.М. Семянтоўскі, манастыр знаходзіўся ў занядбаным стане. У ім жылі акрамя настаяцеля, архімандрыта Ануфрыя, два іераманаха, тры святара, адзін дыякан і трое паслушнікаў. “Вообще наружность монастыря весьма печальна, и следы разрушения виднеются на каждом шагу; разселины в стенах, опавшие карнизы, облезшая побелка, почерневшие кровли, повалившаяся ограда – все это крайне неприятно поражает взор православного путника; по всему видно, что обитель эта доживает свой век ...”, – пісаў А.М. Семянтоўскі.

У 1888 г. манастыр быў ператвораны ў жаночы. Манахі, людзі сталага веку, многія – сляпыя і паралізаваныя, былі пераведзены ў Віцебскі Маркаў і Полацкі Богаяўленскі манастыры. Пачалося адраджэнне Тадулінскага манастыра. Яно звязана з дзейнасцю першай ігуменні Арыстаклеі (мірскае імя – Любоў Пятроўна Раеўская). З яе адыходам ад свецкага жыцця звязана легенда. Быццам бы на бале дзяўчына даведалася аб здрадзе жаніха і адразу ж паехала ў манастыр. Калі праз некалькі дзён яе адшукалі родныя і жаніх, весткі пра шлюб якога аказаліся выдумкай, ніякія ўгаворы не змаглі прымусіць Любоў Пятроўну вярнуцца. Яна правяла шмат гадоў свайго жыцця ў Полацкім Спаса-Еўфрасінеўскім, а потым у Тадулінскім манастырах.

Ігумення Арыстаклея давяла да ладу манастырскую гаспадарку. На пачатку XX ст. у манастыры знаходзілася звыш 50 манахінь. Яны, разам з нанятымі вяскоўцамі, працавалі па абслугоўванні, утрыманні манастыра, яго хра-

маў, збудаванняў, займаліся паляводствам, агародніцтвам, садаводствам на манастырскіх землях. Праца давала плён і прыбытак. Манастыр быў здольны выдаткоўваць значныя ахвяраванні на справу адукацыі. Так, жаночае духоўнае вучылішча ў Віцебску атрымлівала ад яго 2 тыс. залатых рублёў штогод і часткова забяспечвалася прадуктамі харчавання.

Па ініцыятыве ігуменні Арыстаклеі пры самім манастыры было адкрыта двухкласнае жаночае вучылішча і ўзорная школа пры ім. Навучэнкі вучылішча маглі экстэрнам здаваць экзамены на атрыманне пасведчанняў настаўніц вясковых школ. Такім чынам, з 1891 г., калі ў вучылішчы быў першы выпуск, да 1920-х гг. Віцебшчына атрымала дзесяткі настаўніц. Вучылішча і школа, аб'яднаныя ў 1920-я гг., працавалі як пачатковыя агульнаадукацыйныя да 1941 г.



Рэшткі пабудоў манастыра (сучасны выгляд)

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі з мэтай захавання ранейшага ладу жыцця манахіні вымушаны былі арганізаваць калгас. Але Суражскі райвыканком прапанаваў Манашкам ісці да сваякоў або ў адзін з навакольных калгасаў. Памяшканні і маёмасць манастыра адышлі калгасу, арганізаванаму ў в. Слабада. Частка земляў была перададзена калгасам іншых вёсак. Значная колькасць элементаў унутранага ўбрання, абразоў, асабліва з пакрыццём каштоўнымі металамі, была вывезена ўладамі.

У гады Вялікай Айчыннай вайны манастыр быў зруйнаваны. Па сённяшні дзень ён не адноўлены.

Такім чынам, Маркаў Свята-Троіцкі і Тадулінскі Свята-Успенскі манастыры з'яўляліся важнымі цэнтрамі духоўнага, культурнага, гаспадарчага жыцця ў Віцебскім рэгіёне. З'яўленне абодвух звязана з фундатарскай дзейнасцю прадстаўнікоў рода князёў Агінскіх. Іх гісторыя – неад'емная частка гісторыі Бацькаўшчыны і народа. Нават у самыя цяжкія часы манастыры давалі людзям прытулак і духоўнае суцяшэнне, неслі ў грамадства асвету, займаліся выхаваннем высокіх маральных ідэалаў.

# УСТАНОВЫ АДУКАЦЫІ І МУЗЕІ

## ЛУЖАСНЯНСКІ АГРАРНЫ КАЛЕДЖ

15 лістапада 1909 года было адчынена Лужаснянскае ніжэйшае сельскагаспадарчае вучылішча другой ступені (з'явілася першая сельскагаспадарчая ўстанова ў Віцебскай губерні). Аднак гэтая падзея магла адбыцца яшчэ 25 гадоў раней.

У 1876 г. у Віцебску было створана Віцебскае таварыства сельскіх гаспадароў. Дзейнасць таварыства аказала вельмі важны ўплыў на развіццё культуры земляробства ў Прыдзвінні. Яно з'яўлялася "спадкаемцай" Беларускага вольнага эканамічнага таварыства ў Віцебску, якое існавала з 1826 па 1841 г. Мэтамі таварыства былі: павышэнне прадукцыйнасці сваіх гаспадарак, садзеянне развіццю земляробства, паляпшэнне збыту прадукцыі, найму працоўнай сілы, абмен інфармацыяй аб арэндзе маёнткаў, новых машынах, сельскагаспадарчых



Будынак земляробчай школы

прыладах працы, поспехах у селекцыі раслін і жывёл, азнаямленне з навінкамі сельскагаспадарчай літаратуры.

У 1881 г. віцебскі губернатар Растоўцаў перадаў сабраныя сялянамі на святкаванне 25-годдзя праўлення цара Аляксандра II грошы (а іх было некалькі дзесяткаў тысяч) на заснаванне сельскагаспадарчай школы і ўзорнай фермы. Таварыства ўзаемнага крэдыту землеўладальнікаў Віцебскай губерні таксама пералічвала 5% ад чыстага прыбытку на ствараемую школу.

Пасля Растоўцава на пасаду Віцебскага губернатара быў прызначаны генерал фон Валь, які таксама спрыяў дзейнасці таварыства. На частку грошай, якія знаходзіліся на дэпазіце губернскага ўпраўлення па сялянскіх справах, таварыства ў 1891 годзе ў памешчыцы Е. Краснадземскай выкупіла маёнтак Лужасна з 101 дзесяцінай зямлі і гаспадарчымі пабудовамі. Тут і меркавалася распачаць будаўніцтва сельскагаспадарчай школы. Нават пачаліся пэўныя работы. А.П. Сапуноў яшчэ ў канцы XIX ст. у адной са сваіх кніг піша пра “прыгожы недабудаваны будынак у былым маёнтку Лужасна”.

Аднак, на жаль, з прыходам новага губернатара князя В.М. Далгарукага грошы (па пастанове губернскага ўпраўлення па сялянскіх справах) былі перададзены на будаўніцтва ў Гарадку царкоўна-прыходскай школы. Дзякуючы намаганням віцэ-старшыні Віцебскага таварыства сельскіх гаспадароў была распачата судовая справа супраць губернскага ўпраўлення праваслаўнай кансісторыі. Дзякуючы пецярбургскаму адвакату Альшамоўскаму працэс быў выйграны і грошы перададзены сельскагаспадарчаму таварыству, аднак адбылося гэта толькі ў 1906 г.

Праз некалькі гадоў школа была пабудавана. Урачыстае адкрыццё адбылося 15 лістапада 1909 г. Такім чынам, школа замест 1884 г. стала працаваць толькі праз 25 гадоў. Пры школе была створана сельскагаспадарчая ферма, даследчае поле, сад, садовы пітомнік, сталярная майстэрня, кузня. Школа добра адпавядала мэтам стварэння і стала сапраўдным цэнтрам сельскагаспадарчай культуры для сялянскіх гаспадарак Віцебскага павета.

Тут пачаў дзейнічаць земляробчы гурток, кіраўніком якога з’яўляўся вядомы краязнаўца, сапраўдны стацкі саветнік В.К. Златкоўскі, віцэ-старшынёй – Г.Ф. Самовіч, сакратаром-казначэем – Я.К. Стукаліч. Для гаспадароў праводзіліся курсы па садаводстве і агародніцтве, ладзіліся

сельскагаспадарчыя выставы. Такім чынам адкрыццё вучылішча (так стала называцца школа) спрыяла павышэнню ўзроўню культуры ў Віцебскім павеце.

Пасля рэвалюцыі 1917 года земляробчае вучылішча працягвала працу. У 1929 г. яно было пераўтворана ў Лужаснянскі дзяржаўны ільнопяньковы тэхнікум Наркамата земляробства БССР. Змена ў профілі тлумачылася тым, што ў адпаведнасці з праграмай індустрыялізацыі СССР у Беларусі планавалася развіваць лёгкую прамысловасць. Гэта прадугледжвала развіццё фабрык і заводаў па вытворчасці тканін, прадуктаў харчавання, будаўнічых матэрыялаў. Для большага атрымання сыравіны трэба было павышаць яе вытворчасць, а гэта, адпаведна, акрамя іншых чыннікаў патрабавала павялічыць колькасць спецыялістаў. Вядома, што на Віцебшчыне, дзякуючы асаблівасцям клімату і геаграфічнага становішча, добра расце лён. Гэта і абумовіла развіццё ільнаводства і лёгкай прамысловасці. У сувязі з чым прынялі рашэнне аб перапрафіліраванні тэхнікума на падрыхтоўку кадраў для развіцця ільнаводства. Да вайны было падрыхтавана 1150 спецыялістаў.

У час вайны тэхнікум вельмі пацярпеў. У яго памяшканнях размяшчаўся фашысцкі гарнізон. Там, дзе цяпер знаходзіцца дэндрапарк, быў нямецкі аэрадром. У будынках сельскагаспадарчага двара быў арганізаваны лагер для палонных чырвонаармейцаў, куды змяшчалі і мясцовых жыхароў, западозраных у сувязях з партызанамі. За перыяд акупацыі была знішчана бібліятэка, лабараторнае абсталяванне, зруйнавана вучэбна-вопытная гаспадарка.

Адразу пасля вызвалення, у 1944 г., тэхнікум аднавіў сваю дзейнасць. Аднак спецыялізацыя змянілася. Беларусь станавілася “адкормачным цэхам СССР” і развівала мяса-малочную жывёлагадоўлю. У тэхнікуме з’явіліся спецыяльнасці агранома і птушкавода. У 1970 г. адбылося аб’яднанне Лужаснянскага і Бігосаўскага зааветэрынарнага тэхнікумаў. Быў пабудаваны новы вучэбны корпус і студэнцкі гарадок.



Клінічны (ветэрынарны) корпус Лужаснянскага каледжа

За пасляваенны час у тэхнікуме было падрыхтавана

больш за 10 000 спецыялістаў: ветэрынараў, заатэхнікаў, аграномаў, птушкаводаў (птушкаводчаскае аддзяленне існавала да 1988 г.). У тэхнікуме ўвесь час працуюць курсы павышэння кваліфікацыі брыгадзіраў і іншых спецыялістаў сярэдняга звяна. На кафедрах выкладаюць больш за 100 настаўнікаў і майстроў вытворчага навучання. Навучанне праводзіцца ў трох карпусах, у тым ліку лабараторна-практычным на 900 месцаў. Студэнцкі гарадок уключае 4 інтэрнаты. Працуе сталовая на 300 месцаў. Пры тэхнікуме ў 1974 годзе быў створаны дэндралагічны парк, які ў 1994 г. быў абвешчаны помнікам прыроды мясцовага значэння. Тэхнікум мае стадыён з гумова-бітумным пакрыццём і трыбунамі на 1200 месцаў. За добраўпарадкаванне тэрыторыі ў савецкія часы тэхнікум быў узнагароджаны дыпломам II ступені ВДНГ СССР. Лепшыя традыцыі выкладчыкі і студэнты працягваюць у цяперашні час.

Асаблівы гонар каледжа – будынак былой земляробчай школы. У ім размясцілася кафедра механізацыі сельскай гаспадаркі. Будынак з'яўляецца помнікам гісторыі і культуры і ахоўваецца як культурная каштоўнасць нашай краіны. Будынак двухпавярховы, у перспектыве мае форму літары Г. Выступы ўтвараюць невялікі ўнутраны дворык. У аб'ёмна-прасторавай кампазіцыі вылучаецца высокі стрэльчаты купал у форме шатра, які надае сілуэту будынка асаблівую выразнасць. Каляровая гама таксама вырашана досыць арыгінальна – фасады афарбаваны ў жоўтае і чырвонае. Будынак – яскравы прыклад архітэктуры стылю "мадэрн".

## ЛУЖАСНЯНСКАЯ ШКОЛА-ІНТЭРНАТ-ГІМНАЗІЯ ДЛЯ ЗДОЛЬНЫХ І ТАЛЕНАВІТЫХ ДЗЯЦЕЙ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ


Лужаснянская школа-інтэрнат-гімназія

Лужаснянская школа-інтэрнат для здольных і таленавітых дзяцей Віцебскай вобласці была адкрыта ў ліпені 1994 года рашэннем Віцебскага аблвыканкома, у 1997 годзе атрымала статус гімназіі. Яна дае магчымасць найбольш здольным вучням з малазабяспечаных сямей з сельскай

мясцовасці Віцебскай вобласці, а таксама дзецям-сіротам і дзецям, якія засталіся без апекі бацькоў, атрымаць сярэднюю адукацыю з улікам іх жаданняў і запатрабаванняў.

З’яўляючыся сельскай навучальна-выхаваўчай установай, школа-інтэрнат-гімназія закладвае фундамент фарміравання будучай эліты для беларускай вёскі, што з’яўляецца асабліва неабходным у сучасных умовах.

## МУЗЕІ ВІЦЕБСКАГА РАЁНА

### Дзяржаўныя музеі

**Віцебскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей**

Пачаў працу ў сакавіку 2004 г. Знаходзіцца ў в. Акцябрская. Першы раздзел прысвечаны гісторыі і культуры краю ад старажытнасці да нашых дзён. У экспазіцыі прадстаўлены матэрыялы раскопак гарадзішча і селішча Лужасна, пячаткі віцебскіх князёў, гербы гг. Віцебска, Суража, м. Янавічы, матэрыялы, якія адносяцца да жыцця і дзейнасці славутых землякоў: А.І. Абрамовіча, М. Лынькова, М.Я. Нікіфароўскага, Ф.А. Сурганава і інш. Значнае месца ў экспазіцыі адведзена тэме Вялікай Айчыннай вайны ў гісторыі нашага краю. На вітрынах змешчаны баявыя ўзнагароды, дакументы, фотаматэрыялы, прысвечаныя партызанскай барацьбе, падполлю, баям за вызваленне Віцебска, асабліва сцям правядзення аперацыі “Баграціён” у наваколлях Віцебска.



Частка экспазіцыі Віцебскага раённага краязнаўчага музею

Шырока прадстаўлены дакументы і матэрыялы савецкага перыяду ў гісторыі раёна: узнагароды, нагрудныя значкі, граматы, фотаздымкі. Цікавасць выклікаюць касцюмы народнага ансамбля танца “Колас”, які доўгі час з’яўлялася “культурнай візіткай” нашага раёна.

У асобным зале прадстаўлены матэрыялы, прысвечаныя Вялікай Айчыннай вайне і сучаснаму жыццю раёна. Зал прыстасаваны для чытання лекцый, правядзення культурна-масавых мерапрыемстваў. Некалькі разоў на год у музеі праводзяцца часовыя выставы.

## Ведамственныя

**Музей гісторыі Лужаснянскага сельскагаспадарчага тэхнікума.**

Адкрыты у 1970 г. У трох залах размешчаны стэнды, экспанаты і прадметы аб гісторыі тэхнікума ад адкрыцця ў 1909 г да нашых дзён.

**Анатамічны музей Лужаснянскага сельскагаспадарчага тэхнікума (аграрнага каледжа).**

Адкрыты ў 1970 г. з мэтай лепшай падрыхтоўкі ветэрынарных фельдшараў на ветэрынарным аддзяленні тэхнікума. Для гэтага была праведзена значная праца па стварэнню наглядных дапаможнікаў і анатамічных прэпаратаў. Узначаліла гэту працу выкладчык анатоміі М.К. Панцюхова. Большасць макрапрэпаратаў і дапаможнікаў былі створаны студэнтамі і практыкантамі на анатамічным гуртку.

За час існавання музея было створана больш за 1000 вільгастных, сухіх, эластычных прэпаратаў па ўсіх раздзела прадмета “Анатомія і фізіялогія хатніх жывёл”. Сярод складаных для выраблення і рэдкіх прэпаратаў можна адзначыць шкілет каня лева- і правастаронняга распілу, у якім усе раздзелы падпісаны па латыні і вызначаны рознымі колерамі для лепшага запамінання; шкілеты каровы, авечкі, казы, свінні, сабакі, кошкі, труса з мэтай вывучэння параўнальнай анатоміі; сухія і вільгастныя матэрыялы па вывучэнню мышц. Прадстаўляе цікавасць экспазіцыя, прысвечаная фаўне Беларусі, у якую ўваходзяць чучалы жывёл, птушак, рыб, земнаводных Віцебскага раёна і вобласці.

**Музей баявой і працоўнай славы у в. Шапурова.**

Адкрыты ў 1969 г. у адміністрацыйным будынку эксперыментальнай базы імя Шмырова. Экспанаты музея прысвечаны гісторыі гаспадаркі баявой дзейнасці первай Беларускай партызанскай брыгады. У музеі захоўваюцца ўласныя рэчы камандзіра брыгады П.М. Шмырова, партызан, падарункі наведвальнікаў музея, узнагароды, фотаздымкі, альбомы, граматы.

## Школьныя музеі

**Музей баявой і працоўнай славы Акцябрскай СШ.**

Адкрыты ў 1984 г. Мае два раздзела: працоўнай славы і баявой славы.

У першым раздзеле прадстаўлены матэрыялы, прысвечаныя ўзнікненню першых камун у вёсках Васюты і Шульцава і ўтварэнню на іх базе першага калгаса; узнікненню ў 1959 г. на аснове калгаса “Віцебскі” саўгаса “Сялюты”; лепшым людзям гаспадаркі. Другі раздзел прысвечаны ўдзельнікам грамадзянскай вайны – ураджэнцам Акцябрскага сельскага Савета; нашым землякам – удзельнікам баёў за Маскву і Сталінград; вызваленню Беларусі, аперацыі “Баграціён”, Дню Перамогі.

**Краязнаўчы музей Бабініцкай СШ.**

Заснаваны ў 1964 годзе, займае асобны будынак. Мае наступныя раздзелы: “Жыццё і быт беларускай вёскі”,; “Вызваленне нашага краю ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў”; “Партызанскі рух у нашым краі”; “Гісторыя школы і вучэбнай гаспадаркі “Падбярэззе”. У музеі захоўваюцца летапіс школы, падарункі гасцей музея.

Арганізатарам музея быў дырэктар школы Ул.Д. Крукоўскі, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, заслужаны настаўнік БССР.

Музей у свой час вёў вялікую перапіску са сваякамі загінуўшых, з архівамі Міністэрства абароны СССР, з генерал-палкоўнікам І. І. Людніквым, генералам арміі А. П. Белабародавым, генерал-лейтэнантам І. С. Бязуглым.

**Народны музей воінскай славы Варонаўскай СШ.**

Працуе з 24 верасня 1967 года, займае асобны будынак плошчай каля 80 кв.м., у яго фондах больш за 3000 экспанатаў. Экспазіцыя складаецца з пяці раздзелаў: “Пачатак Вялікай Айчыннай вайны”; “Партызанская вайна на Віцебшчыне”; “Подзвіг воінаў на Безыменнай вышыні”; “Подзвіг воінаў на вышыні 222,9”; “Воіны-землякі”.

У музеі прадстаўлены ўспаміны ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, фотаздымкі, дакументы аб злачынствах нямецка-фашысцкіх захопнікаў на акупіраванай тэрыторыі, асабістыя рэчы ўдзельнікаў вайны, лісты ветэранаў, замалёўкі франтавога мастака В. С. Рогаля.

У музеі экспануюцца макет Безыменнай вышыні і макет-дыяграма вышыні 222,9, сабраны матэрыялы аб 39-й арміі, якая вызваляла вёску Вароны, Віцебск і Віцебскую вобласць.

Музей двойчы быў удзельнікам Усесаюзнай выстаўкі дасягненняў народнай гаспадаркі (ВДНГ), узнагароджаны граматамі савета ветэранаў 17-й гвардзейскай і 158-й стралковай дывізій, дыпломам Міністэрства асветы БССР.

У 1980 годзе музею прысвоена ганаровае званне “народны”.

**Краязнаўчы музей Даўжанскай СШ.**

Створаны ў 1989 годзе. У ім прадстаўлены матэрыялы і экспанаты па наступных тэмах: “Жыццё і быт вёскі”; “Рэспублікі былога Савецкага Саюза”; “Воіны-землякі ў баях за Радзіму”; “Удзельнікі грамадзянскай вайны”; “1-я Віцебская партызанская брыгада”; “Воіны-вызваліцелі раёна”; “39-я армія ў Віцебска-Аршанскай наступальнай аперацыі”; “Гісторыя Даўжанскай школы, Віцебскай біяфабрыкі і саўгаса “Лосвіда”.

Стэнды адлюстроўваюць гісторыю краю ад старажытных часоў да нашых дзён. У музеі захоўваюцца прадметы ваеннай амуніцыі і ўзбраення, старажытныя прылады працы.

**Музей баявой славы Замастоцкай СШ імя Героя Савецкага Саюза В. А. Канаваленкі.**

Адкрыты ў 1987 годзе. Матэрыялы, стэнды, дакументы музея расказваюць аб Герою Савецкага Саюза У. А. Канаваленку, які вучыўся ў гэтай школе, аб Героях Савецкага Саюза М. І. Дружыніне і П. А. Крываносе, лётчыку падпалкоўніку І. А. Самахвалаве, камандзіру батальёна 19-й гвардзейскай стралковай дывізіі І. Ф. Ступачэнку, якія вызначыліся пры вызваленні мясцовасці ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

У музеі шмат матэрыялаў аб баявым шляху 19-й гвардзейскай стралковай дывізіі, аб партызанах і падпольшчыках, актыўных удзельніках вайны – земляках, аб загінуўшых у гады вайны жыхарах, аб савецкіх воінах, загінуўшых пры вызваленні вёскі Замасточча.

**Музей народнай славы Заронаўскай базавай школы.** Адкрыты ў 1986 годзе, размешчаны ў асобным будынку. Краязнаўцамі школы сабраны багаты матэрыял аб гісторыі краю, аб баявых дзеяннях на тэрыторыі Заронаўскага сельсавета,

цікавыя матэрыялы аб Заронаўскім падполлі, па гісторыі саўгаса і школы.

У музеі захоўваецца перапіска са сваякамі загінуўшых воінаў, з ветэранамі вайны, удзельнікамі вызвалення, ксеракопіі гістарычных дакументаў, прадметы быту сельскіх жыхароў, ваеннай амуніцыі, узбраення.

У 1996 годзе музею прысвоена ганаровае званне "Народны".



На двары музея народнай славы Заронаўскай БШ

**Музей баявой славы Камароўскай сярэдняй школы-сада.** Музей адкрыты ў 1988 годзе. Мае некалькі стэндаў: "Мой родны край"; "Яны вучыліся ў нашай школе"; "Вызвалялі родную Беларусь"; "Слава народу-пераможцу"; "Гісторыя школы"; "Нішто не забыта, ніхто не забыты". Тут захоўваюцца матэрыялы аб воінах-вызваліцелях, працаўніках саўгаса "Рудакова", прадметы ваеннай амуніцыі і ўзбраення, хатняга ўжытку, пісьмы ўдзельнікаў вайны.

**Музей баявой славы Курынскай сярэдняй школы-сада.** Музей створаны ў 1970 годзе як музей М. Ф. Сільніцкага. Зараз ператвораны ў музей баявой славы і мае 4 раздзелы: "Гады прадваенныя"; "Вялікая Айчынная вайна 1941 – 1945 гг."; "Партызанскі рух на тэрыторыі Курынскага сельсавета"; "Расказы былых вязняў канцлагераў"; "Подзвігі бацькоў – сынам у спадчыну" (матэрыялы па ўшанаванні памяці герояў вайны).

У музеі сабраны матэрыялы аб Героях Савецкага Саюза М. Ф. Сільніцкім і А. С. Гайко, воінскіх часцях, якія вызвалялі Курына, аб мясцовых жыхарах, загінуўшых у баях, перапіска з воінамі-вызваліцелямі, сваякамі загінуўшых на курынская зямлі, зброя, асабістыя рэчы партызан.

**Музей баявой і працоўнай славы Мазалаўскай СШ.**

Музей створаны у 1979 г. Мае 4 раздзелы: "Узышла над Дзвіной зорка Кастрычніка" ; "Вялікая Айчынная вайна";

“Наш край у пасляваенны час” ; “Гісторыя школы”.

У першым раздзеле прадстаўлены цікавыя экспанаты: прылады працы і хатняга ўжытку сялян, адзенне і абутак, фотаздымкі першых калгаснікаў. У другім раздзеле сабраны прадметы амуніцыі, зброя, лісты з фронту, узнагароды, расказы аб ветэранах вайны, успаміны ўдзельнікаў вайны, спіс настаўнікаў і навучэнцаў школы, баявы шлях 145 стралковай дывізіі. Трэці раздзел – аб базавых прадпрыемствах: калгасе “Прызыў”, Віцебскай птушкафабрыцы і ПМК № 29. Чацвёрты прысвечаны гісторыі школы. У ім сабраны дакументы і фотаздымкі аб дзейнасці школы з 1918 г. да нашых дзён. У музеі ёсць сапраўдныя гістарычныя дакументы.

**Гісторыка-краязнаўчы музей Старасельскай СШ.** Адкрыты ў 1982 г. Мае наступныя раздзелы: “Гісторыя ўзнікнення Старога Сяла і бліжэйшых населеных пунктаў, этнаграфія, дарэвалюцыйны перыяд”; “Гісторыя даваеннага перыяду (1918–1941 г), першыя камуны, лесазавод “Пралетарый”, іпадром, калгасы. Рэпрэсіі 1935–1937 г.”; “Вялікая Айчынная вайна на тэрыторыі роднага краю” ; “Гісторыя Старасельскай школы, бальніцы, аптэкі, пошты, чыгункі на старасельскім адрэзку, саўгаса імя У.П. Краева, школы рукадзелля”.

Музей мае каля 1500 экспанатаў асноўнага фонду і каля 3000 дапаможнага. Фонды музея пастаянна папаўняюцца новымі дакументамі, прадметамі, экспанатамі.

Найбольш каштоўныя з экспанатаў: рэшткі керамікі, знойдзеныя ў раёне гарадзішча і селішча днепра-дзвінскай культуры, прадметы хатняга ўжытку, кавалак ядра і крэмневая стрэльба перыяду вайны 1812 г. Уяўляюць цікавасць даваенныя фотаздымкі царквы, сялянскіх хат, будынка дома генерала ад кавалерыі І.А. Андрыянава, уладальніка мясцовага маёнтка.



У гісторыка-краязнаўчым музеі Старасельскай СШ

У музеі знаходзяцца матэрыялы аб веліканe Фёдару Махнове, копіі дакументаў НКВД на рэпрэсіраваных жыхароў.

Многа тут матэрыялаў аб Вялікай Айчыннай вайне. Сярод іх сапраўдныя дакументы пра Герояў Савецкага Саюза У.П. Краева, Ф.П. Ерзікава,

М.А. Ніканава, Дз.М. Пятрова – вызваліцеляў краю. У музеі захоўваюцца асабістыя рэчы воінаў, лісты П.А. Белабарадова і І.В.Кулікова, галерэя малюнкаў франтавога мастака В.І. Зотава, баявыя ўзнагароды. Музей мае шмат матэрыялаў аб установах, якія знаходзіліся на тэрыторыі сельскага савета.

У 1994 г. музею прысвоена ганаровае званне “Народны”.

**Музей баявой славы Суражскай СШ.**

Адкрыты ў 1982 г. Мае багатую экспазіцыю, у якой прадстаўлены наступныя раздзелы: “Зверствы фашыстаў на суражскай зямлі”, “Дзейнасць першай Беларускай партызанскай брыгады”, “Падпольныя партыйныя і камсамольскія арганізацыі”, “Воіны – удзельнікі баёў за Сураж”, “Суражане – удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны”: “Настаўнікі і навучэнцы школы – удзельнікі вайны”.

Музей мае многа матэрыялаў пра арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху і патрыятычнага падполля М.П. Шмырова, П.М. Голубева, Р.У. Шкрэду, Д.Ф. Райцава, М.Ф. Біруліна, А.А.Баскакава, А.Е. Сакалова і іншых. Два раздзелы прысвечаны воінскім часцям і злучэнням, якія прымалі ўдзел у вызваленні Суражскага раёна – 358 стралковай дывізіі, 39 асобай курсанцкай брыгадзе, 51 стралковай брыгадзе. Тут захоўваюцца дакументы з асабістага архіва камісара першай Беларускай партызанскай брыгады Р.У.Шкрэды.

**Музей народнай славы “Спадчына” Янавіцкай СШ.** Адкрыты ў 1972 г. Мае 14 раздзелаў: “Вытокі” (прадметы этнаграфіі): “Гісторыя ўзнікнення і развіцця Янавічаў”, “Устанаўленне савецкай улады”, “Развіццё культуры ў Янавічах”, “М.М.Барадзін – вядомы рэвалюцыянер і палітычны дзеяч”, “Беларусь сінявокая”, “Дзеля жыцця на зямлі”, “Баявыя сяброўкі”, “Арляняты Вялікай Айчыннай вайны”, “Партызанскі край”, “Мір зямлі Віцебскай”, “Памяць пра тых, хто легендай авеяны”. Сярод экспанатаў музея – прылады працы селяніна і ўзоры сельскагаспадарчай прадукцыі, якія апавядаюць аб гісторыі пасёлка і яго жыхарах, аб знакамітых земляках. Вялікае месца займаюць звесткі аб баявым мінулым: фотаздымкі, матэрыялы аб воінах, загінуўшых у баях за вызваленне Янавічаў, спісы мірных жыхароў, растраляных фашыстамі.

У музеі ёсць матэрыялы аб 145 і 332 стралковых дывізіях, якія вызвалялі Янавічы, аб Герою Савецкага Саюза Г.С. Гарфункіне – ураджэнцу Янавічаў.

раздзел III

ТЭМА 4

# ТУРЫСЦКА-КРАЯЗНАЎЧЫЯ РЭСУРСЫ НАШАГА КРАЮ

У кожным кутку нашага старадаўняга краю захаваліся цікавыя мясціны – курганы, гарадзішчы, помнікі прыроды, гісторыі, культуры, проста прыгожыя месцы.



Былы адміністрацыйны будынак Лужаснянскай землябробчай школы

На тэрыторыі раёна знаходзіцца пад аховай дзяржавы 54 помнікі гісторыі і культуры. З іх асаблівую цікавасць уяўляюць музей-сядзіба мастака І.Я. Рэпіна “Здраўнёва” каля в. Койтава, паштовая станцыя (1843) у в. Бараўляны, Пакроўская царква (псеўдарускі стыль, 1908) і будынак Землябробскай школы (стыль мадэрн, 1909) у в. Лужасна, 24 помнікі археалогіі (гарадзішчы, селішчы, курганныя могільнікі, замчышча), 28 ваенных могілак і брацкіх пахаванняў савецкіх салдат, партызан і мірных жыхароў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Ёсць на нашай зямлі і помнікі, якія патрабуюць неадкладнай аховы. Сярод іх сядзібны дом маёнтка “Мілае” ў в. Мазалава, які належаў вядомаму асветніку XIX ст. І. Манькоўскаму, будынак царквы Узвіжання Крыжа і адміністрацыйны будынак былой Землябробскай школы ў в. Лужасна, сядзібны дом у в. Лукі, рэшткі вадзянога



Рэшткі вадзянога млына каля былой в. Шкялі

млына каля былой в. Шкялі (Мазалаўскі с/с), “Камень кахання” каля в. Доўжа, месца былой в. Пуцявішча (як месца дзеяння паэмы “Тарас на Парнасе”), в. Касцюкі (радзіма Ф. Махнова – самага высокага чалавека на свеце), БМД-2 каля палігона Лосвіда (як помнік афганцам), каменныя крыжы каля вв. Каралёва, Лужасна, Суднікі, Сушчова і іншыя.

Прыгадаем найбольш цікавыя на нашу думку месцы, якія варта ўбачыць.

## Воз. Лосвіда.

Амаль кожны жыхар Віцебска ведае пра возера Лосвіда (фрагмент карты Полацкага і часткі Віцебскага ваяводства 1579 г. з выявай возера і вёскі Лосвіда гл. на малюнку справа).




Возера Лосвіда

Гэта адно з самых прыгожых, маляўнічых месцаў не толькі ў наваколлях горада, але і ў нашай краіне. Шмат хто прыязджае адпачыць на турбазу “Лосвіда”, на прыгожыя пляжы, пахадзіць па прыбярэжных лясах, пашукаць грыбоў, ягад. Возера асабліва папулярна сярод рыбакоў: па-першае, да яго проста і танна дабірацца (на прыгарадным цягніку); па-другое, возера глыбокае (глыбіня больш за 20 метраў), а гэта значыць, што і рыбы тут шмат і яна вялікая. Традыцыйна на возеры праводзяць водна-спартыўныя святы.

Дзіўная флора возера і яго прыбярэжных лясоў: тут багата лекавых, рэдкіх і незвычайных раслін (напрыклад, шмат цыкуты ядавітай – самай атрутнай расліны ў Еўропе, якой, дарэчы, пазбавілі жыцця выдатнага грэчаскага філосафа Сакрата). Ёсць тут і расліны, занесеныя ў Чырво-




Возера Лосвіда на карце М. Пахалавіцкага (1579 г.)

ную кнігу Беларусі (гідрыла мутоўчатая, частуха Валенберга, палушнік азёрны і іншыя). Яшчэ ў савецкі час на берагах возера планавалася стварэнне батанічнага заказніка.

Вакол возера растуць хвойныя, яловыя і бярозавыя лясы. Летам і ўвосень тут шмат людзей, якія наведваюць іх у пошуках грыбоў і ягад.



БМД-1 – помнік дэсантнікам 103 паветрана-дэсантнай дывізіі

Непадалёк ад возера знаходзіцца палігон мабільных войскаў (былой славутай 103-й гвардзейскай паветрана-дэсантнай дывізіі, якая першай была ўведзена ў Афганістан). Каля ўваходу на КПП стаіць сапраўдны помнік дэсантнікам – БМД-1 (баявая машына дэсанта).

У наваколлях возера людзі сяліліся здаўна, таму тут захаваліся да нашых часоў помнікі археалогіі – курганы, гарадзішчы, паселішчы, а ў часы сярэднявечча нават быў замак.

У час Другой сусветнай вайны на берагах возера ў баях загінулі дзесяткі тысяч салдат. У адно толькі няўдалае наступленне, якое адбылася 31 снежня 1943 года, загінула 5000 чалавек савецкіх салдат. Як напамін пра мінулае, стаяць зараз каля Лосвіда помнікі воінам, якія аддалі ўласнае жыццё за свабоду нашай Радзімы.

**Месцы жорсткіх баёў на тэрыторыі раёна.** На працягу амаль года ў 1943–1944 гг. на тэрыторыі раёна ішлі баі. І савецкія, і нямецкія войскі надавалі вельмі важнае значэнне Віцебску, імкнуліся захапіць і ўтрымаць яго ў сваіх руках. Немцы называлі горад “ключом да Прыбалтыкі”. Імкнучыся захапіць горад, савецкае камандаванне не лічылася са стратамі. Ваенныя могілкі, на якіх пахаваны тысячы салдат і афіцэраў, што загінулі пры вызваленні раёна, знаходзяцца



Помнік савецкім воінам на брацкіх могілках у в. Заронава

ў вв. Альгова, Арлова, Асінаўка, Вароны, Войтава, Вымна, Гараднянскі Мох, Герасімава, Задзвінне (Пялёнкі), Заронава, Копці, Котава, Макарава, Ноўка, Старое Сяло, Сушчова, Шаркі. Лічбы страт савецкіх войскаў вельмі разняцца. Па спісам ваенкамата на тэрыторыі раёна пахавана 42 тыс. савецкіх воінаў і партызан. Члены рэспубліканскай асацыяцыі “Пошук” сцвярджаюць, што яны заніжаны ў 3 разы.

**г.п. Руба.** Вельмі цікавае месца нашага краю. Тут знаходзяцца адны з самых вялікіх парогаў на Дзвіне, якія заўсёды былі небяспечнымі для плытоў і суднаў. Буруны ад камянёў бачны ў самую вялікую ваду. Уздоўж ракі і па яе рэчышчы выходзяць на паверхню старажытныя (дэвонскія) пласты даламітаў. Тут знаходзіцца буйнейшае ў Еўропе радовішча высокаякасных вапнякоў. Распрацоўка радовішча вялася здаўна, а ў 1931 г. быў адкрыты вапнавы завод і пачалася прамысловая здабыча. У 1968 г. ён стаў Віцебскім камбінатам вапнавых матэрыялаў, а з 1978 г. Віцебскім вытворчым аб’яднаннем “Даламіт”. Для вывазу гатовай прадукцыі з Рубы была нават праведзена чыгуначная ветка.

Здабываемая ў кар’еры “Гралёва” парода – даламіт – з’яўляецца горнай пародай, якая больш як на 90% складаецца з мінерала даламіт (належыць да класа карбанатаў). На Беларусі вядома 10 радовішч даламіту. Усе яны адносяцца да верхнедэвонскіх, г.зн. што яны ўтварыліся 405 10 млн. гадоў таму назад. Доўжыўся дэвонскі перыяд 60 млн. гадоў. За гэты час на зямлі з’явіліся земнаводныя, на сушы гаспадарылі папаратнікі. Прыгадаем, што дыназаўры жылі 120–60 млн. гадоў таму назад. Менавіта з рэштак ў істот, якія асядалі на дно мора і ўтварыўся шматметровы слой даламіту, які цяпер і распрацоўваецца. І цяпер можна адшукаць цікавыя адбіткі былых жывых арганізмаў у кавалках пароды. Яны могуць стаць сувенірам на памяць аб экскурсіі на дно былога дэвонскага мора.

Даламіт выкарыстоўваецца ў будаўнічай, металургічнай, хімічнай, шкляной і іншых галінах прамысловасці як будаўнічы матэрыял, флюс, на вытворчасць шчэбеню, як цеплаізалюючы і вогнеўпорны матэрыял. Даламітавая мука выкарыстоўваецца для вапнавання кіслых глебаў.

**Вярхоўскі парог на Дзвіне.** Самы небяспечны парог на ўсёй рацэ. Пра яго чытайце ў раздзеле, які прысвечаны прыродзе краю, раздзеле “Наша Дзвіна”.

**Дом-сядзіба І.Я. Рэпіна "Здраўнёва".** Непадалёк ад Віцебска знаходзіцца вельмі цікавае месца, дзякуючы якому наш край стаў вядомым далёка за межамі Беларусі. З 1892 па 1900 г. ва ўласным маёнтку "Здраўнёва" жыў і працаваў вядомы рускі мастак І.Я. Рэпін. У 1892 г. ён набыў лецішча (дачу) каля Віцебска. Мастак змог зрабіць такі дарагі набытак дзякуючы таму, што імператару Аляксандру III вельмі спадабалася карціна "Запарожскія казакі пішуць ліст турэцкаму султану". Імператар набыў яе за 32 тысячы рублёў (гіганцкая на тыя часы сума). За гэтыя грошы мастак змог разлічыцца з даўгамі і набыць дачу для адпачынку і творчай дзейнасці. З некалькіх варыянтаў ён спыніўся на прапанове Сафіі Яскевіч і набыў маёнтак Сафіеўка са 120 дзесяцінамі зямлі з лесам, садам, паркам і штучным ставом. У маёнтку былі адзін сядзібны і 2 жылыя дамы, флігель, гаспадарчыя будынкі.

Як творчая асоба, І. Рэпін вырашыў перабудаваць дом, што і было зроблена па асабістых эскізах мастака. Змяніў ён і назву сядзібы. Паблізу ад яе знаходзілася вёска Драўнёва. І. Рэпін жа назваў новы маёнтак Здраўнёвам, каб падкрэсліць прыгажосць і чысціню гэтага месца. Сам мастак пісаў сваім сябрам: "Не в моем характере поддаваться среде и киснуть. Нет, я из скучного, неустроенного прозаичного дома затеял устроить удобное жилье, простое, но симпатичное, приспособленное к обстоятельствам и местности". На працягу першых гадоў жыцця тут І. Рэпіным быў прыведзены ў парадак лес, сад, умацаваны бераг Дзвіны, пабудаваны дом з вежай з назіральнай пляцоўкай.

Сам мастак жыў у Здраўнёва з сям'ёй з вясны да восені 1892–1900 гг. На зіму вяртаўся ў Санкт-Пецярбург, дзе выкладаў у акадэміі мастацтваў. Заставаўся тут бацька мастака – Яфім Васільевіч, з прычыны вельмі сталага ўзросту. Летам 1894 г. ён памёр на 91-м годзе жыцця. Пахаваны на царкоўных могілках у вёсцы Слабада (цяпер гэта пасёлак Вярхоўе). Рэпін напісаў для слабадской царквы два абразы: "Хрыстос" і "Маці Божая", якія цяпер зберагаюцца ў Віцебскім абласным краязнаўчым музеі.

Выдатнаму мастаку вельмі падабалася навакольная прырода. Спалучэнне зелені палёў, лясоў, блакіту нябёсаў, які адбіваўся ў вадзе хуткай Дзвіны, прыводзілі яго ў захапленне. Ён пісаў вядомаму крытыку Стасаву: "У нас тут груши в цвету и яблони развертываются. Погода прелестная, тепло и даже дождик, столь желательный, прошел третьего дня. Лес напротив за рекой, зелень, как на лубочных картинках.



Дом-сядзіба І.Я. Рэпіна "Здраўнёва"

Кругом озими начинают принимать серебристый оттенок. В лесу соловьи заливаются, им вторят прочие птицы. А какие здесь луга! Какая трава, какие цветы! И столько земляники! Такой сладкой и крупной".

За перыяд 1892–1900 гг. у Здраўнёве мастаком было створана больш за 40 карцін і малюнкаў: "Беларус", "Асенні букет", "Паляўнічы са стрэльбай", "На Заходняй Дзвіне. Усход сонца" (эцюд; усе ў 1892 г.), "Святочнае гулянне ў Здраўнёве" (1893), "Касец-ліцвін" (1893), "Дуэль", "Месячная ноч. Здраўнёва", "Партрэт сына Юрыя на тэрасе здраўнёўскага дома" (усе ў 1896 г.), "Паненкі на прагулцы сярод статка кароў" (1896). Цікавыя іншыя карціны і малюнкі, створаныя Рэпіным пад Віцебскам: "Вёска Цякава", "У полі" (1893), "У хаце" (1895), "Пастух" (1892), "Карова" і "Лодкі" (абедзве ў 1892 г.).

У Здраўнёва І. Рэпін зацікавіўся Віцебскім паўстаннем гараджан 1623 г. супраць уніі і забойствам віцяблянамі архіепіскапа Іасафата Кунцэвіча. Мастак нават зрабіў эскіз карціны, аднак саму карціну не напісаў.

У Здраўнёве І. Рэпіна часта наведвалі вядомыя людзі Віцебска і наваколля: гісторык А.П. Сапуноў, краязнавец і грамадскі дзеяч В.К. Стукаліч, фатограф С.А. Юркоўскі, ваенны юрыст пісьменнік А. Жыркевіч, вучні мастака М. Барысаў, К. Вяшчылаў, І. Трапічнікаў, сваякі Рэпіных. Рэпіны сябравалі з сям'ёй свяшчэнніка Дзяканава з в. Слабада.

З мясцовым насельніцтвам у Рэпіна былі добрыя адносіны. Мастаку падабаліся простыя і гаспадарлівыя сяляне. Часта яны прыходзілі да І. Рэпіна пагаварыць аб сваім жыцці-быцці. А калі ў в. Каралёва здарыўся пажар, І. Рэпін сам паехаў туды і дапамог пагарэльцам грашыма і адзеннем. Правобразам беларуса са знакамітай карціны з'яўляецца малады селянін з в. Сахарава Сідар Шаўроў.

З 1900 г. І.Я. Рэпін рэдка бываў у Здраўнёве. Ён набыў сабе другую сядзібу, у Карэліі, непадалёк ад Пецярбурга, якую назваў "Пенаты". У Здраўнёве засталася жыць малодшая дачка мастака – Таццяна Ільінічна Рэпіна-Язева. Пасля 1917 г. сядзібу хацелі нацыяналізаваць, аднак за сваякоў І. Рэпіна заступіліся мясцовыя жыхары, якія любілі і паважалі блізкіх вялікага мастака. Дачка І. Рэпіна арганізавала ў доме школу, дзе працавала настаўніцай разам з мужам сваёй дачкі І.Дз. Дзяканавым. У Здраўнёве нарадзіліся праўнукі Рэпіна – Валянцін, Кірыл, Даніла, Раман. У 1930 г. яны выехалі з СССР. Нягледзячы на намаганні І.Я. Рэпіна прыцягнуць увагу віцебскіх губернскіх улад да аховы сядзібы, пасля ад'езду яе ўладальнікаў за мяжу дом і іншыя пабудовы былі прададзены на дровы.

У 1970 г. было прынята рашэнне аб стварэнні музея-сядзібы, а ў 1989 г. – завершаны асноўныя работы. Сядзіба была адноўлена так, як яе праектаваў Рэпін, праведзены археалагічныя раскопкі і цяпер тут знаходзіцца музей. Арыгіналаў карцін выдатнага мастака няма, аднак ёсць некаторыя акварэлі, малюнкі, рэчы побыту былой сядзібы, абразы канца XIX ст., лісты, фотаздымкі, успаміны.



Возера Сосна

**Доўжа, возера Сосна і Камень кахання.** Самы вялікі камень у нашым раёне – "Камень кахання", ці "Камень закаханых", знаходзіцца каля в. Доўжа. Пра яго чытайце ў раздзеле ***"Аб'екты, якія могуць быць зарэгістраваны як***

***помнікі прыроды”.***

Яшчэ адно незвычайнае і прыгожае месца наваколляў – возера Сосна, на беразе якога і знаходзіцца в. Доўжа. Возеру, напрыклад, прысвяціў свой верш “Даўжанскае возера” вядомы польскі паэт-рамантык Тадэвуш Лада-Заблоцкі (1811–1847), які жыў і вучыўся ў Віцебску ў першай палове XIX стагоддзя. Возера Сосна не адзінае, яшчэ ёсць Малое, Сярэдняе, Канавалаўскае і Цыганскае. Іх злучае невялічкая рэчка, на беразе якой знайшоў сабе прытулак самы вялікі камень Віцебскага раёна – “Камень кахання”.

Сама в. Доўжа ўзнікла даўно. У межавым запісе Віцебскага ваяводства 12.01. 1623 года згадваецца, што пры маёнтку Доўжа, каля вёсак Ясені і Дуб, ёсць гарадзішча. На гарадзішчы расце “Галяшова хвоя”. Сучасная Доўжа – дастаткова вялікая вёска, тут пражывае больш за 600 чалавек. Зараз яна славіцца на ўсю Беларусь біяфабрыкай імя Я.Р. Каваленкі – месцам, дзе вырабляюць патрэбныя для айчыннай сельскай гаспадаркі вакцыны.

На тэрыторыі раёна маюцца магутныя дрэвы хвоі звычайнай, якія, верагодна, з’яўляюцца самымі вялікімі ў нашай краіне. Чытайце пра іх у раздзеле ***“Аб’екты, якія могуць быць зарэгістраваныя як помнікі прыроды”.***

Былая в. Пуцявішча – месца дзеяння першай паэмы на беларускай мове “Тарас на Парнасе”.

Сатырычна-гумарыстычны твор, помнік беларускай літаратуры. Напісана, найбольш верагодна, у 1850-х гадах. Доўга распаўсюджвалася ў рукапісах, упершыню апублікавана ў газеце “Мінскі лісток” (1889). Сярод найбольш верагодных аўтараў паэмы – Канстанцін Вераніцын (1834–1904). Нарадзіўся ён у в. Астраўляны (цяперашні Гарадоцкі раён) у сялянскай сям’і. Сваімі здольнасцямі звярнуў увагу пана, які выправіў вучыцца сялянскага хлопца ў Віцебскую гімназію. Потым ён працягваў навучанне ў Пецярбургскай медыка-




Памятны знак у гонар паэмы “Тарас на Парнасе” (г. Гарадок)

хірургічнай акадэміі і Горы-Горацкім інстытуце. Верагодна, у час навучання ў апошнім і была напісана паэма, дзеянні якой адбываюцца на Віцебшчыне і менавіта на тэрыторыі нашага раёна. Пра гэта сведчыць шэраг фактаў. Па-першае, відавочна геаграфічная прывязка. З самага пачатку згадваецца населены пункт, дзе жыве галоўны герой паэмы:

Ці знаў хто, братцы, з вас Тараса.
У палясоўшчыках што быў?
На Пуцявішчы, ля Панаса,
Ён там ля лазні блізка жыў.

Населены пункт з назвай Пуцявішча на Беларусі быў толькі ў Віцебскім павеце, што пераканаўча даказаў славуты віцебскі краязнаўца М.Х. Плавінскі. Цяпер гэтай вёскі няма, яна знаходзілася непадалёк ад Пестуніцы Заронаўскага с/с. Звалася так і гара, на якой знаходзілася вёска, дасюль сярод мясцовых жыхароў ва ўжытку выразы з прыназоўнікам "на": "жылі на Пуцявішчы", "хадзілі на Пуцявішча", "на Пуцявішчы радня" (у адрозненне ад сучаснай формы "у"). Вёска існавала да 1939 г.

Па-другое, мова паэмы. Гэта жывая віцебская гаворка, якая захавалася сярод асобных яе носьбітаў і па сённяшні дзень, асабліва ў старэйшым пакаленні вяскоўцаў. Падобнае моцнае адгалінаванне беларускай гаворкі ўпэўнена гаспадарыла не толькі ў вёсках і дробных мястэчках, але пачувалася гаспадыняй і ў даваенным Віцебску, у розных яго грамадскіх месцах (на рынках, крамах і сходах), у сем'ях карэнных віцяблян. Гэтае слова вольна гучала не толькі з вуснаў беларусаў, ім ахвотна карысталіся рускія, яўрэі, цыганы і іншыя пры кантактаванні паміж сабой.

У аснове сюжэта твора – прыгоды палясоўшчыка (лесніка) Тараса. Палясоўшчык, аднак, дадаткова мусіў ведаць, дзе якая дзічына водзіцца, каб быць карысным на паляванні. Тарас, выправіўшыся ў пушчу, сустрэў мядзведзя і, спужаўшыся, зачапіўся за карэнні, паляцеў у яр і страціў прытомнасць. Апрытомнеўшы, ён пайшоў дадому, але трапіў на Парнас – месца, дзе жылі багі і паэты. Падобныя сюжэты, звязаныя з блуканнем у часе ці прасторы, існуюць у кожнага народа. Варта прыгадаць амерыканскага Рып ван Вінклі, які, стаміўшыся, лёг адпачнуць і праспаў 80 гадоў. Між іншым, людзі гавораць, што такія мясціны ёсць і ў нашым раёне, толькі "губляюцца" там людзі не на дзесяткі гадоў, а толькі на некалькі дзён. Можа быць, людзі "губляюцца" з-за зло-

ўжывання алкагольнымі напоямі, аднак расказваюць такое і пра людзей непітушчых. Адно з такіх месцаў, адпаведна з паданнямі, знаходзіцца ў межах поймы р. Шэвінка.

Дзеянні паэмы адбываюцца ў двух вымярэннях – каля в. Пуцявішча, дзе жыве Тарас, і другім вымярэнні – каля гары Парнас, якая лічылася месцам жыхарства старажытнагрэчаскіх багоў.

Паэма адыграла вялікую ролю ў станаўленні беларускай літаратурнай мовы і ўмацаванні ў ёй дэмакратычна-рэалістычнага кірунку. Некаторымі вонкавымі адзнакамі твор прымыкае да травесційных (парадыйных) паэм, і мае ідэйную пераемнасць з паэмай – папярэдніцай "Энеідай навыварат". У паэме даецца яскравая, напоўненая шэрагам рэалій карціна побыту беларускіх сялян XIX ст.

Вельмі старанна створаны вобраз Тараса – адзін з першых рэалістычных вобразаў чалавека з народа ў беларускай літаратуры. Партрэт яго спісаны з нашага з вамі земляка з в. Пуцявішча. Такім чынам, ураджэнец Віцебшчыны, рэальны палясоўшчык Тарас стаў прататыпам літаратурнага персанажа, якога можна лічыць сімвалам беларуса XIX стагоддзя. Жыхары нашай мясцовасці могуць ганарыцца тым, што з'яўляюцца нашчадкамі такіх слаўных продкаў.

**в. Вароны.** У вёсцы знаходзіцца некалькі помнікаў. У 1912 г. тут быў узведзены помнік на месцы бою ў кастрычніку 1812 г., дзе рускі атрад уланаў падпалкоўніка Сталыпіна разбіў французскі ар'ергард і ўзяў у палон 400 салдат і генерала Пушэ.

У вёсцы і каля яе знаходзіцца некалькі помнікаў Вялікай Айчыннай вайны. На ваенных магілках пахаваны каля 4000 савецкіх салдат, у асноўным воінаў 39-й Арміі. Тут жа ўсталяваны помнік "віцебскім панфілаўцам" – 27 салдатам 875-га палка 158-й стралковай дывізіі. Раніцай 25 снежня 1943 г. група пад камандаваннем ст. лейтэнанта І. Бясхлебнага захапіла вышыню каля в. Друкава, якая займала важнае стратэгічнае



Крыж каля в. Вароны, узведзены ў памяць ахвяраў сталінскіх рэпрэсій

становішча, і на працягу дня ўтрымлівала яе. Выконваючы свой воінскі абавязак амаль усе салдаты загінулі, але не пакінулі вышыню. За праяўленую мужнасць яны былі ўзнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені.

Непадалёк ад вёскі ўсталяваны помнік лётчыкам 953-га штурмавога авіяпалка, які вызначыўся ў баях пры вызваленні Віцебска і атрымаў ганаровае найменне “Віцебскі”. Больш падрабязна пра дзеянні славутага воінскага злучэння можна даведацца ў музеі ПТВ № 96.

Каля воз. Палонскага, непадалёк ад дарогі, знаходзіцца месца, дзе ў 1933–1937 гг. супрацоўнікамі НКУС праводзіліся расстрэлы “ворагаў народа”. У асноўным гэта былі жыхары Віцебска і наваколляў. У 1960–1990-я гады ахвяры сталінскіх рэпрэсій былі рэабілітаваны. Цяпер на гэтым месцы ўстаноўлены мемарыяльны крыж. На ім вянок з калючага дроту і шыльда “Ахвярам сталінскіх рэпрэсій”.


Верталёт на аэрадроме Пяшчанка

в. Суднікі. Вартай увагі з’яўляецца в. Суднікі Мазалаўскага с/с. Непадалёк ад яе, на х. Сурганы, нарадзіўся Ф.А. Сурганаў – выдатны дзяржаўны і палітычны дзеяч БССР, які займаў самыя высокія пасады ў БССР і СССР.

На могілках, што знаходзяцца паблізу ад вёскі, ёсць каменныя крыжы, якія маюць гісторыка-культурную каштоўнасць.

У лесе непадалёк ад вёскі цячэ святая крыніца. У двух кіламетрах ад Суднікаў працуе асфальтавы завод, на які цікава зрабіць экскурсію, каб пазнаёміцца з працэсам вытворчасці асфальту.

п. Лужасна цікавы шэрагам славутасцей і асаблівых месц.

Тут, у “Цёплым лесе” знаходзяцца два помнікі археалогіі – гарадзішча і паселішча старажытнага чалавека (перыяд ранняга жалезнага веку – ранняга сярэднявечча). У самім пасёлку ёсць некалькі гісторыка-культурных помнікаў: будынак земляробчай школы і адміністрацыйны будынак, які цяпер выкарыстоўваецца пад аддзяленне сувязі (стыль мадэрн,



Пакроўская царква ў в. Лужасна

1909), Пакроўская царква і былая царква Узвіжання Крыжа Гасподня (класіцызм, 1815). На могілках у вусці Лужаснянкі і Дзвіны знаходзяцца каменныя крыжы з петрогліфамі. Ёсць некалькі помнікаў, памятных знакаў і мемарыяльных дошак: памятны знак на месцы знішчэння ваеннапалонных, партызан і мірных жыхароў у 1941–1944 гг., мемарыяльная стэла М. Сільніцкаму – першаму камсамольцу Беларусі, які быў удастоены звання Героя Савецкага Саюза, мемарыяльная шыльда ў гонар бою 1.02.1942 г. воінаў 4-й Ударнай Арміі і партызан атрада М.Ф. Біруліна з нямецкімі захопнікамі; помнік У.І. Леніну і Ф.А. Сурганаву (зберагаецца ў музеі аграрнага каледжа).

У Лужасна знаходзіцца помнік прыроды "Лужаснянскі дэндрапарк" і некалькі незвычайных прыродных аб'ектаў: рэшткі панскага парку; дуб і ясень, якія растуць з аднаго кораня ("Браты"), гіганцкі вяз; вялікія валуны, крыніцы.

У пасёлку размяшчаюцца вядомыя сваімі дасягненнямі навучальныя ўстановы: аграрны каледж Віцебскай дзяржаўнай акадэміі ветэрынарнай медыцыны (былы сельскагаспадарчы тэхнікум) і гімназія для здольных і таленавітых дзяцей Віцебскай вобласці. У каледжы дзейнічаюць 2 музеі: гісторыі Лужаснянскага сельскагаспадарчага тэхнікума і анатамічны. У пасёлку знаходзіцца стадыён з гумова-бітумным пакрыццём і трыбунамі на 1200 месцаў, на якім праводзіліся гульні



Батанічны заказнік “Чортава барада”

рэспубліканскага чэмпіянату па футболе.

Незвычайнае Лужасна і тым, што ў ім (на чыгуначнай станцыі “Лужасна”) у 1940 годзе быў зарэгістраваны мінімум тэмператур па Беларусі – 44°С.

Асобнай увагі турыстаў заслугоўваюць заказнікі (“Дымаўшчына”, “Чортава барада”, “Прыдзвінне”) і Лужаснянскі дэндрапарк. Больш падрабязна чытайце ў тэме ***“Ахоўваемыя прыродныя тэрыторыі і аб’екты”***.

Святыя крыніцы. Крыніцы нашы продкі шанавалі спрадвеку. Ім прыносілі ахвяраванні, у асноўным у выглядзе пладоў зямлі, тканіны, упрыгожванняў і інш. Адгалоскі тых ушанаванняў дайшлі і да сённяшняга часу ў выглядзе забабонаў аб тым, што ў фантан ці вадаём трэба абавязкова кінуць манетку, каб вярнуцца да яго яшчэ раз.

Пасля прыняцця хрысціянства нашы продкі захавалі павагу да крыніц, якія лічыліся святымі. Святая Параскева, імя якой у перакладзе азначае пятніца, была для ўсходніх славян ахоўніцай святых крыніц. Яна з’яўлялася адной з найбольш шанаваных на беларускіх землях, а таму наш народ пабудаваў над крыніцамі тысячы капліц, прысвечаных Параскеве-Пятніцы.

Падобныя гаючыя крыніцы існуюць і на тэрыторыі Віцебшчыны. Адна са святых крыніц знаходзіцца непадалёк ад



Святая крыніца каля в. Суднікі

в. Суднікі ў лесе. Яна ўяўляе сабою 2 "акна" няправільнай формы памерам прыблізна 3 на 4 метры. Краі "вокнаў" аплецены каранямі дрэў. У асноўным гэта яліны. Глеба чорнага колеру, мяккая. Вада чыстая, без паху. "Вокны" знаходзяцца адно ад другога прыкладна метрах у дваццаці. У адным пастаўлена металічнае кальцо дыяметрам метр. Каля і ў саміх "вокнах" ляжаць бярвенні для таго, каб з іх лягчэй было набіраць ваду. Вада цячэ спорна і ўтварае добрую ручаіну. Яна бяжыць у бок Дзвіны.

Па сведчаннях мясцовых жыхароў, да рэвалюцыі каля крыніцы стаяў вялікі крыж, свяцілі ваду. Расказваюць, што яшчэ нават пасля вайны тут стаяла каплічка і крыжы. Зламалі яе і вывернулі крыжы мясцовыя маладыя людзі: ці то па прычыне антырэлігійнай барацьбы, ці з-за нізкай культуры. Цяпер месца патрабуе ўпарадкавання. Вада не стала горшай і браць яе прыязджаюць з гарадоў і вёсак ажно з бідонамі на машынах.

Святая крыніца знаходзіцца каля в. Курына, вышэй па Дзвіне за метраў 500 ад мясцовых могілак. Яны ж адпаведна ад Курына прыкладна за 1,5–2 кіламетры. Раней над крыніцай стаяла скульптурная выява Багародзіцы ці нейкага святога. У савецкі час яе зруйнавалі. А гаючая вада і сёння людзей ды жывёл поіць.



Крыніца ў в. Мазалава

Непадалёк ад в. Ужляціна ёсць Сцепанкаў роў, у якім раней была крыніца, якую лічылі святой. Пасля правядзення меліярацыі ўзровень грунтовых вод панізіўся і вада з крынічкі сышла. Цяпер на былым месцы захаваліся толькі камяні ад падмурку капліцы.

Нажаль, да гэтага часу ў Віцебскім раёне не ўсе святыя

крыніцы выяўлены. Школьныя краязнаўчыя гурткі могуць дапамагчы навукоўцам у пошуках гэтых унікальных экалагічных і гісторыка-культурных аб'ектаў. Можна і добраўпарадкаваць тэрыторыю каля крыніцы, устанавіць шыльду, наглядаць, каб каля гаючай вады не выкарыстоўваліся мінеральныя і арганічныя ўгнаенні, не скідваліся бытавыя і прамысловыя адходы, якія могуць выклікаць забруджванне, засмечванне, спусташэнне крыніцы, прывесці да змены хімічнага складу вады.

## БЫЛЫЯ МАЁНТКІ НАШАГА КРАЮ

Памешчыцкія маёнткі з'яўляліся асяродкамі культуры ў наваколлі. Дваране былі адукаванымі людзьмі. Шмат хто з іх меў грошы і жаданне весці гаспадарку па-новаму, з ужываннем новых, сучасных спосабаў апрацоўкі зямлі і гаспадарання. Пры сядзібах, як правіла, былі бібліятэкі, калекцыі, зборы. Найбольш заможныя гаспадары мелі навуковыя кабінеты. Маёнткі з'яўляліся архітэктурнымі комплексамі. Пры іх разбіваліся паркі, сады, утвараліся пруды, у якіх заводзілася рыба. Для палявання рабіліся невялікія пітомнікі, дзе гадаваліся звяры для палявання (казулі, фазаны).

Аднак пасля 1917 г. практычна ўсе маёнткі былі разрабаваны, шэраг з іх спалены і разабраны на будаўнічыя матэрыялы. Пра маёнткі, іх гаспадароў і ролю, якую яны адыгрывалі ў айчыннай гісторыі і культуры, захавалася вельмі мала інфармацыі. Пры тым, што на нашай зямлі іх існавала больш за 150. Сярод іх былі вельмі буйныя, якія належалі славутым людзям: роду Агінскіх, У. Адамаву, А.С. Бялыніцкаму-Бірулю, А. Вярыгу-Дарэўскаму, К. Гібенталю, С. Косаву, Краснадземскім, В. Лужынскаму, І. Манькоўскаму, Г. Марцінкевічу, Сапегам, А.П. Сапунову і іншым.

Цяпер вельмі складана адшукаць звесткі пра тыя маёнткі. Нават пры жаданні гэта можна зрабіць толькі пра некаторыя з іх. Напрыклад, у дзяржаўным архіве Віцебскай вобласці захоўваюцца анкеты, якія рабіла губернская камісія па ахове помнікаў даўніны на маёнткі Адаменкі, Андронавічы, Гасмера, Дзягілева, Екацярынгоф, Завольша, Лескавічы, Обаль, Тулава, Чарніца. Анкеты ўтрымліваюць звесткі пра стан сядзібы, наяўнасць архіва, час забудовы, апошняга гаспадара, наяўнасць калекцый і іншыя звесткі.

Спынімся на былым маёнтку "Мілае" ў в. Мазалава Віцебскага павета, які належаў І. Манькоўскаму. Пра І. Мань-

коўскага можна прачытаць у раздзеле пра славутых землякоў. Звернем увагу на апісанне самога маёнтку і яго роль у гісторыі і культуры нашага краю. Ягоны лёс і прыклад шмат у чым тыповы.

Нагадаем, што па імператарскім загадзе ад 11 сакавіка 1797 года Ігнату Манькоўскаму надаваўся чын надворнага саветніка Беларускай губерні. У яго пажыццёвае валоданне перадаваўся казённы маёнтак Буева з вёскамі Плятнішчы, Выгары, Хмары, Сакольнікі, Малахава. Аднак пажыццёвае валоданне азначала, што ягоныя дзеці страцяць казённы маёнтак і ён зноў адыдзе казне. Таму пазней на свае грошы Манькоўскі набыў в. Мазалава ўжо ў прыватную ўласнасць.



Сучасны выгляд сядзібнага дома ў маёнтку "Мілае" у пач. XIX ст.

Тут ён пачаў будаўніцтва дома і гаспадарчых пабудоў. Сядзіба з'явілася ў 1801 г., а будаўніцтва памяшканняў працягвалася да 1806 г. Будынак двухпавярховы, мае прамавугольную форму і сіметрычную кампазіцыю з ярка вызначанай цэнтральнай часткай – франтонам трохкутнага тыпу. Фасад быў упрыгожаны кованымі балконамі, а франтон – люстрам, які, верагодна, мог выкарыстоўвацца для ўтрымання гадзінніка ці як ляток для галубятні. Захаваўся бакавы ўваход, які быў упрыгожаны кованым навесам.

Дом пабудаваны ў класічным стылі. Архітэктура будынка простая, з адсутнасцю якіх-небудзь яркіх упрыгожванняў. Па вертыкалі будынак разбіты трыма гарызантальнымі паясамі. Верхняя частка аздоблена аркатурай. Вокны цэнтральнай часткі будынка ўпрыгожаны фігурнымі паясамі. На астатніх упрыгожванні адсутнічаюць. Дах быў ці чатырохскатны высокі, ці чатырохскатны ламаны. Цяпер ён зменены. Зараз будынак не выкарыстоўваецца.

На р. Лужаснянка быў пабудаваны двухпавярховы млын, які з'яўляўся самым вялікім у Віцебскім павеце. У 1864 годзе, напрыклад, ён меў 10 ставоў і намолваў 36 000 пудоў мукі (амаль 580 тон). Другі па велічыні знаходзіўся ў маёнтку Лужасна, меў 8 ставоў і намолваў 27 000 пудоў мукі (больш за 430 тон).

У маёнтку меліся свіран вышынёй у некалькі паверхаў,

хлявы з высокімі падмуркамі і светлымі вокнамі, ляднік. Існаваў водаправод. Насупраць дома быў фантан. Каля маёнтку, які апісваў у сваёй працы А. Рыпінскі, быў парк з мноствам дэкаратыўных дрэваў.

Гаспадарамі маёнтку была сабрана багатая бібліятэка і вялікая калекцыя карцін, мастацкіх вырабаў са шкла, металу, фарфору, мармуру, дрэва, керамікі. Гаспадар займаўся вопытамі з электрычнасцю. У 1830 г. Вольным эканамічным таварыствам у Пецярбургу І. Манькоўскі быў узнагароджаны залатым медалём за пісьмовую работу па паляпшэнні сялянскай гаспадаркі на Беларусі.

На левым беразе р. Лужаснянкі насупраць млыну (100 метраў уверх па цячэнні ад рэшткаў мастка праз рэчку) былі фамільныя могілкі. Тут і быў пахаваны заснавальнік маёнтка. На помніку была выбіта эпітафія:

Летами старец удрученный
Среди любымих им холмов
Жил долго здесь уедененный
И лег между родных гробов.

Пасля рэвалюцыі маёнтак напаткаў лепшы лёс, чым іншыя панскія сядзібы. Яго не спалілі і не разабралі на гаспадарчыя патрэбы. Аднак разграблення ён не пазбегнуў. У пратаколе пасяджэння Віцебскай губернскай камісіі па ахове помнікаў даўніны і прадметаў мастацтва ад 10 лютага 1920 г. адзначаецца, што “з маёнтка “Мазалава” адбываецца вываз прадметаў даўніны”. Пазней будынак выкарыстоўваўся пад школу.

На сённяшні час ад усяго маёнтка захаваўся толькі сядзібны дом. Ён знаходзіцца ў цэнтры вёскі, каля будынка ПМК № 29. Зараз не выкарыстоўваецца. Нажаль, могілкі былі знішчаны ў 1980-я гады – яны пайшлі на падсыпку дарогі, а вадзяны млын разабраны.

Да гэтага часу дайшлі толькі некалькі сядзібных дамоў з былых маёнткаў нашага краю. Сярод іх “Мілае”, сядзіба У.У. Адамава ў в. Вялікія Лётцы, сядзіба ў в. Лукі. Нажаль, яны знаходзяцца ў кепскім стане і патрабуюць неадкладнай рэстаўрацыі для таго, каб захаваць для нашчадкаў не толькі ўзоры архітэктуры XIX стагоддзя, але і прыклады таго, як дбалі нашы продкі пра развіццё гаспадаркі, культуры ў нашым краі.

Спіс маёнткаў, якія існавалі ў Віцебскім павеце на пачатак XX стагоддзя глядзіце ў дадатку: “Населеныя пункты Віцебскага павета”.

## НАШ РАЁН СЁННЯ

На сённяшні дзень Віцебскі раён мае плошчу 2,8 тыс. кмІ. У раёне 369 населеных пунктаў, у якіх пражывае 42 тыс. чалавек. Раён у адміністрацыйным плане падзяляецца на 13 сельскіх і 2 пасялковых савета. Працаздольнага насельніцтва – 23 тысячы чалавек. У народнай гаспадарцы занята 14 307 чалавек.

### Віцебскі раённы выканаўчы камітэт.

Быў арганізаваны і пачаў сваю работу 20 жніўня 1924 года. Было сфарміравана 12 вясковых Саветаў.
У пасляваенны час загадчыкамі райвыканкома былі:
Бірулін Міхаіл Фёдаравіч;
Шырокіх Фёдар Цімафеевіч;
Дземенцей Мікалай Іванавіч, пазней – сакратар ЦК КП Беларусі;
Мяцеліца Васіль Іванавіч;
да 1966 г. – Дуброўскі Альгерд Антонавіч;
1971-1978 – Кейзераў Том Рыгоравіч;
1978-1991 – Сакалоў Міхаіл Матвеевіч;
1991 г. – март 1999 г. – Байкоў Васіль Міхайлавіч;
з 1999 г. – Вазміцель Іван Канстанцінавіч.

Прамысловасць. На тэрыторыі раёна размешчана 6 прамысловых прадпрыемстваў. Галоўнымі з іх з'яўляюцца: "Суражскі лясгас", "Віцебскі лясгас", "Віцебская біяфабрыка", "Віцебскі плодаагароднінны камбінат", Янавіцкі філіял ААТ "Малако", ААТ "Віцебская бройлерная птушкафабрыка".

Віцебскі лясгас быў арганізаваны ў 1936 годзе. Размешчаны на тэрыторыі Віцебскага, Ліозненскага, Сененскага, Гарадоцкага і Бешанковіцкага адміністратыўных раёнаў. Агульная плошча лясоў Віцебскага лясгаса па дадзеным Дзяржаўнага ўліку лясоў складае 75353 га. Лясы размешчаны вакол важнага прамысловага горада і абласнога цэнтра – г.Віцебска. Лясныя масівы параўнальна раўнамерна раскіданы на тэрыторыі раёна. На найбольш бедных глебах асноўнай пародай з'яўляецца сасна. Акрамя таго глебава-кліматычныя ўмовы раёна найбольш спрыяльныя для росту асіны, бярозы, альхі чорнай. Віцебскі лясгас налічвае 10 лясніцтваў, 22 майстарскіх участка, 2 дрэваапрацоўчых цэха.

Сярэднеспісачная колькасць працуючых у лясгасе складае 320 чалавек.

“Віцебская біяфабрыка” – адзінае ў краіне прадпрыемства па вытворчасці ветпрэпаратаў. На біяфабрыцы выробляюцца вакцыны, лекавыя сывараткі, дыягностыкумы, растворы і іншыя прэпараты. Спецыялістамі прадпрыемства была асвоена вытворчасць ветпрэпаратаў 20 найменняў. Біяфабрыка падтрымлівае сувязі больш чым з 17 прадпрыемствамі з Расіі, Прыбалтыкі, Украіны, Малдовы і Казахстана.

ААТ “Віцебская бройлерная птушкафабрыка з’яўляецца найбольш буйным прадпрыемствам, на якім працуюць 1 289 чалавек. Тут адчыніўся унікальны ў Беларусі цэх забою птушкі і перапрацоўкі мяса. Ён створаны па нямецкім праекце і забяспечаны галандскім абсталяваннем, што дазволіць фабрыцы выпускаць да 24 тысяч тон мяса ў год, пры былым аб’ёме – 16 тысяч у год, больш за 150 найменняў мясной прадукцыі.

Суражскі лясгас знаходзіцца на тэрыторыі двух адміністрацыйных раёнаў: Віцебскага і Гарадоцкага. У склад лясгаса ўваходзіць 9 лясніцтваў. Агульная плошча Суражскага лясгаса складае 58760 га. Асноўныя лясы – хваёвыя, бярозавыя, асінавыя, яловыя, чорна-альховыя. Лясгас вырабляе ў сучасны час піламатэрыялы, паддоны, зрубы дамоў, шчыты заборныя, сок бярозавы і іншае. Лясгас – комплексная гаспадарка, якая вырашае кола пытанняў, пачынаючы ад рубак галоўнага карыстання да аднаўлення лясоў, аховы леса, перапрацоўкі драўніны цэхам дрэваапрацоўкі.

Янавіцкі філіял ААТ “Малако” пачаў сваю дзейнасць у 1953 годзе. Зараз у філіяле працуюць 79 чалавек. Асноўныя віды прадукцыі ААТ “Малако” – сыры тлустыя і нятлустыя, парашок сухі сырны, тварог, масла. Прадпрыемства пастаўляе сваю прадукцыю ў 60 магазінаў г.Віцебска, мае свой фірменны магазін “Надзея” у г.п.Янавічы. На працягу ўсёй дзейнасці філіял неаднаразова выходзіў пераможцам сярод прадпрыемстваў харчовай прамысловасці.

**Сельская гаспадарка.** Землі сельскагаспадарчага прызначэння займаюць 81 463 га, пашы – 45 290 га. Усяго – 113 677 га. Пераважаюць сугліністыя – 77,2 %; супясчаныя – 15,6 %, тарфяныя – 4,3 %.

У сельскай гаспадарцы занята 5 510 чалавек. У раёне дзейнічаюць 24 сельскагаспадарчых прадпрыемствы рознай



Шыльда Віцебскай абласной сельскагаспадарчай доследнай станцыі НАН Беларусі ў в. Тулава

формы ўласнасці і падпарадкавання, 47 фермерскіх гаспадарак. Маецца ў раёне цяплічны камбінат ААТ “Рудакова”, комплекс па вытворчасці ялавічыны ЗАТ “Ліпаўцы” і свініны “Лучоса”. На 2005 г. пагалоўе буйной рагатай жывёлы складала 34 662 галоў, у тым ліку кароў – 14 622. Сярэдні надой малака з каровы складае 3 482 кг.

У адпаведнасці з Дзяржаўнай праграмай адраджэння і развіцця сяла за 2005–2010 гг. на тэрыторыі раёна запланавана стварэнне 17 аграгарадкоў.

**Адукацыя.** У раёне дзейнічаюць 15 сярэдніх школ, 5 сярэдніх школ-садоў, 4 базавыя школы, 1 базавая школа-сад, 2 пачатковыя школы, 1 пачатковая школа-сад, 18 дашкольных устаноў, дзіцяча-юнацкая спартыўная школа, цэнтр дзіцячай творчасці. У школах раёна навучаецца 4 307 дзяцей, дашкольныя ўстановы наведваюць 902 дзіця. У сістэме адукацыі працуе 1 677 чалавек, з іх педработнікаў – 973.

На тэрыторыі раёна знаходзяцца Вялікалятчанскі дзіцячы дом, 2 дзіцячых дома сямейнага тыпу, 1 дзяржаўны дзіцячы сацыяльны прыют, дзяржаўны агульнаадукацыйны ліцэй № 1 Віцебскага раёна, Лужаснянская школа-інтэрнат-гімназія для здольных і таленавітых дзяцей Віцебскай вобласці, прафесійна-тэхнічнае вучылішча № 13 дрэваапрацоўкі (у выпраўленчай калоніі № 3). Сярэднія спецыяльныя вучэбныя ўстановы прадстаўлены Віцебскім дзяржаўным прафесійным ліцэем

№ 3 сельскагаспадарчай вытворчасці і аграрным каледжам Віцебскай дзяржаўнай акадэміі ветэрынарнай медыцыны.

У 12 школах дзейнічаюць музеі, 3 з якіх маюць званне “народнага”.

**Медыцына.** У раёне знаходзіцца 5 бальніц (на 240 коек), 1 здраўпункт, 8 амбулаторый, 26 фельчарска-акушэрскіх пунктаў. Забеспячэнне медыкаментамі насельніцтва раёна здзяйсняецца праз раённую аптэку № 161 праз 6 аптэк. У раёне працуе 66 дактароў і 202 работніка сярэдняга медперсанала.




Карта Віцебскага раёна

Сувязь. У раёне 50 аддзяленняў сувязі. У іх працуюць 201 чалавек, з якіх 147 – паштальёны. Тэлефонную сувязь забяспечваюць 48 аўтаматычных тэлефонных станцый (АТС), якія абслугоўваюць 14 807 тэлефонных кропак. Мабільную сувязь забяспечваюць кампаніі "МТС", "Вэлком" і "Бэст". У раёне дзейнічаюць 11 радыявузлоў, якія абслугоўваюць 16 980 радыёкропак.

Бытавое абслугоўванне ў раёне забяспечваюць 2 Домы быту, 3 гарадскіх і 17 сельскіх комплексна-прыёмных пунктаў.

Гандаль на тэрыторыі раёна ажыццяўляюць 104 дзяржаўныя прадпрыемствы, з якіх 19 прадуктовых, 6 прамысловых, 70 тавараў паўсядзённага запыту, 9 аўталавак. Гандаль ажыццяўляюць і 750 індывідуальных прадпрымальнікаў.

Тавараварот за 2005 год склаў 68,9 млрд. руб. (31 318 181$).

Фінансы. Бюджэт раёна за 2005 год складаў 25 млрд. 857 млн. 370 тыс. руб., што адпавядае 11, 7 млн. $. План бюджэта на 2006 год – 23 млрд. 227 млн. 623 тыс. рублёў (10 550 810 $).

Сярэднямесячны заробак у снежні 2005 г. складаў 427,1 тыс. руб. (194 $).

Спорт. Для заняткаў фізкультурай і спортам у раёне створана добрая база: стадыён у в. Лужасна, закрыты плавальны басейн і крыты спартыўны манеж у в. Ноўка, 28 спартыўных залаў, 36 комплексных спартыўных пляцовак, 10 хакейных пляцовак, 7 стралковых ціраў, два міні-басейны.

Раён ганарыцца сваімі лепшымі спартсменамі, чэмпіёнамі, пераможцамі буйных спаборніцтваў – майстрамі спорту А. Грунтавым, Т. Кохінай, Р. Шнэпсам, К. Зайцавым, М. Садоўнічым, В. Станкевічам, П. Ланочыкам, В. Шчасным і інш. Майстар спорту міжнароднага класа Уладзімір Котаў на XX Алімпійскіх гульнях у Маскве заняў чацвёртае месца ў спаборніцтвах па лёгкай атлетыцы.

Культура. У раёне дзейнічае сетка ўстаноў культуры, якая складаецца з устаноў клубнага тыпу, бібліятэк і школ мастацтваў. У нашым краі знаходзіцца 33 установы клуб-

нага тыпу: Раённы дом культуры, 2 гарпасялковыя Дамы культуры (у г.п. Янавічы і г.п. Сураж), 20 сельскіх Дамоў культуры, 9 сельскіх клубаў, 1 сельскі клуб-бібліятэка). Мы маем 1 раённую, 47 сельскіх бібліятэк і 6 школаў мастацтва. У сістэме аддзела культуры працуе 325 чалавек.

У раёне 186 клубных фарміраванняў, 100 з якіх дзіцячыя. Да лепшых калектываў мастацкай самадзейнасці можна аднесці наступныя.

Хор Вымнянскага сельскага Дома культуры. Створаны ў 1963 г. У 1975 г. прысвоена званне народнага. Удзельнік І Усесаюзнага фестывалю народнай творчасці (1977), лаўрэат Рэспубліканскага агляду-конкурсу мастацкай самадзейнасці (1978), лаўрэат І Рэспубліканскага фестывалю "Беларусь – мая песня" (1998). Першы кіраўнік хору М.С. Крашчонкін. Цяпер – Ф.В. Сяржанаў. У рэпертуары беларускія, рускія, украінскія народныя песні, песні беларускіх аўтараў.

Хор Тулаўскага сельскага Дома культуры. Створаны ў 1966 г. У 1983 г. прысвоена званне народнага. Пераможца абласнога конкурсу харавых калектываў (1990). У рэпертуары хору беларускія, рускія народныя песні, песні беларускіх аўтараў.

Ансамбль танца "Колас" Віцебскага раённага Дома культуры. Створаны ў 1950 г. У 1962 г. прысвоена званне народнага. Кіраўнікі ансамбля ў розныя гады: А.Х Партной, В.В. Дзірнеў, Е.М. Станкевіч, Ю.В. Бязлюдава, Л.В. Лаберка, І.П. Гарбуноў. За сваю творчую дзейнасць ансамбль стварыў і выканаў больш за 300 танцавальных твораў. Калектыў выступаў у Маскве, Ленінградзе, Кіеве, у Прыбалтыцы, удзельнічаў у І Усесаюзным фестывалі ансамбляў народнага танца ў г. Кішынёве, неаднаразовы лаўрэат усесаюзных і рэспубліканскіх конкурсаў і фестываляў, удзельнік усіх дэкад самадзейнага мастацтва БССР, выязджаў на гастролі ў Польшчу.

Ансамбль узнагароджаны Граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, бронзавымі медалямі ВДНГ СССР, шматлікімі граматамі.

Драматычны калектыў група "Тэатр". Створаны ў 1991 г. на базе Віцебскага РДК. У 1994 г. прысвоена званне народнага. Лаўрэат першага Рэспубліканскага фестывалю

“Беларусь – мая песня” (1998 г). Удзельнік абласнога конкурсу народных тэатраў і драматычных калектываў “Талачын-92”, Міжнароднага фестывалю мастацтваў “Славянскі базар у Віцебску”. Кіраўнік групы А.І. Нісневіч.

Эстрадны калектыў група “Альянс”. Створаны ў 1991 г. На базе Віцебскага раённага навукова-метадычнага цэнтра. З сакавіка 1996 г. працуе пры Віцебскім РДК. У лістападзе 1995 г. прысвоена званне народнага. Калектыў удзельнічае ва ўсіх раённых, гарадскіх мерапрыемствах, аглядах-конкурсах, фестывалях, адборачным туры тэлевізійнага фестывалю “Зорная ростань”, прымаў удзел у Міжнародным фестывалі мастацтваў “Славянскі базар у Віцебску”. Кіраўнік групы А.А. Аляксееў (са жніўня 1997 г.). У рэпертуары каля 30 твораў беларускіх і сучасных аўтараў іншых краін.

Эстрадны калектыў “Мара”. Створаны ў 1988 г. на базе Ноўкінскага сельскага палаца культуры. У 1996 годзе прысвоена званне народнага. Калектыў з’яўляецца пастаянным удзельнікам многіх канцэртаў, фестываляў, якія праводзяцца ў вобласці, раёне, Ноўкінскім Палацы культуры. Кіраўнік калектыву С.Н. Буры. У рэпертуары песні сучасных выканаўцаў, народныя песні, танцы, песні ўдзельнікаў калектыву.

Ансамбль народнай песні “Весялуха”. Створаны ў 1990 г. на базе Бабініцкага сельскага Дома культуры. У 1996 г. прысвоена званне народнага. Удзельнік абласнога тэлевізійнага фестывалю “Беларусь – мая песня”, свята, прысвечанага Дням славянскай пісьменнасці і культуры “Усе мы браты, славяне” ў г. Веліж, прызёр абласнога фестывалю фальклору, прысвечанага 150-годдзю М.Я. Нікіфароўскага. У рэпертуары беларускія народныя песні, а таксама мясцовыя фальклорныя напевы, абрады і звычаі.

Ансамбль народнай песні “Раніца”. Створаны ў 1993 г. на базе Віцебскага раённага Дома культуры. У 1988 г. прысвоена званне народнага. Лаўрэат першага рэспубліканскага фестывалю “Беларусь – мая песня”(1998 г.), удзельнік Міжнароднага фестывалю мастацтваў “Славянскі базар у Віцебску”, свята “Грай, гармонік”, прызёр абласнога фестывалю фальклору, прысвечанага 150-годдзю М.Я. Нікіфароўскага. Кіраўнік ансамбля Т.В. Бадзеева. У рэпертуары калектыву беларускія і рускія народныя песні.

## Дадатак 1

# Виды высших сосудистых растений флоры Витебского района, занесенные в Красную книгу Республики Беларусь (3-е изд., 2005)

| № п/п | Название | Место распространения растений |
|---|---|---|
| 1. | Ликоподиелла заливаемая – Lycopodiella inundata (L.) Holub | Левая сторона шоссе Витебск– Орша, недалеко от поворота на г. Богушевск |
| 2. | Баранец обыкновенный – Huperzia selago (L.) Bernh. ex Schrank et C. Mart | Летчанский с/с Ботанический заказник “Придвинье” |
| 3. | Борец шерстистоустый – Aconitum lasiostomum Rei-chenb | Летчанский с/с Ботанический заказник “Придвинье” |
| 4. | Ветреница лесная – Anemone sylvestris L. | Октябрьский с/с |
| 5. | Живокость высокая – Delphinium elatum L. | Окрестности г. Витебска |
| 6. | Купальница европейская – Trollius europaeus L. | Октябрьский, Вороновский, Летчанский, Мазоловский с/с |
| 7. | Хохлатка промежуточная – Corydalis intermedia (L.) Merat | Летчанский с/с |
| 8. | Береза карликовая – Betula nana L. | Заказник-клюковник “Чистик” |
| 9. | Волдырник ягодный – Cucubalus baccifer L. | Летчанский с/с Ботанический заказник “Чертова борода” |
| 10. | Фиалка горная (Фиалка высокая) – Viola montana L. (=V. elatior Fries) | Летчанский с/с Ботанический заказник “Придвинье” |
| 11. | Зубянка клубненосная – Dentaria bulbifera L. | Куринский с/с |
| 12. | Первоцвет высокий – Primula elatior (L.) Hill | Летчанский, Мазоловский с/с Ботанический заказник “Придвинье” |
| 13. | Морошка приземистая – Rubus chamaemorus L. | Заказник-клюковник “Чистик” |
| 14. | Линнея северная – Linaea borealis L. | Летчанский с/с Заказник-клюковник “Запольский” Ботанический заказник “Придвинье” |
| 15. | Горечавка крестообразная – Gentiana cruciata L. | Окрестности д. Тулово |
| 16. | Шалфей луговой – Salvia pratensis L. | Летчанский с/с |
| 17. | Колокольчик широколистный – Campanula latifolia L. | Октябрьский, Бабиничский, Вороновский, Летчанский с/с Ботанический заказник “Придвинье” |

| | | |
|---|---|---|
| | | Ботанический заказник “Витебский” Ботанический заказник “Чертова борода” |
| 18. | Гидрилла мутовчатая – Hydrilla verticillata (L.fll.) Royle | оз. Кривое, Коренево, Лосвидо, Сосна |
| 19. | Каулиния малая – Caulima minor (All.) Coss. et Germ | оз. Лосвидо |
| 20. | Наяда морская – Najas marina L. | оз. Лосвидо |
| 21. | Лук скорода, или резанец – Allium schoenoprasum L. | Окрестности г.п. Руба |
| 22. | Тофильдия чашечковая – Tofieldia calyculata (L.) Wahlenb | Окрестности г. Витебска |
| 23. | Шпажник черепитчатый – Gladiolus imbricatus L. | Октябрьский, Бабиничский, Вороновский, Летчанский с/с Ботанический заказник “Придвинье” Ботанический заказник “Витебский” Ботанический заказник “Чертова борода” |
| 24. | Касатик сибирский – Iris sibirica L. | Летчанский с/с |
| 25. | Пололепестник зеленый – Coeloglossum viride (L.) C. Hartm | Летчанский с/с |
| 26. | Венерин башмачок настоящий – Cypripedium calceolus L. | Летчанский с/с Ботанический заказник “Придвинье” |
| 27. | Пальчатокоренник майский – Dactylorhiza majalis (Reichenb.) P.F. Hunt et Summerhayes | Окрестности г. Витебска Ботанический заказник “Чертова борода” Орнитологический заказник “Дымовщина” |
| 28. | Дремлик темно-красный – Epipactis atrorubens (Hoffm. ex Bernh.) Bess | Летчанский с/с Ботанический заказник “Придвинье” |
| 29. | Кокушник длиннорогий – Gymnadenia conopsea (L.) R.Br. | Летчанский с/с |
| 30. | Тайник яйцевидный – Listera ovata (L.) R.Br. | Летчанский с/с |
| 31. | Мякотница однолистная – Malaxis monophyllos (L.) Sw. | Окрестности г. Витебска |
| 32. | Ятрышник мужской – Orchis mascula (L.) L. | Летчанский с/с |
| 33. | Ятрышник шлемоносный – Orchis militaris L. | Летчанский с/с |
| 34. | Осока Буксбаума – Carex buxbaumii Wahlenb | Летчанский с/с |
| 35. | Осока Дэвелла – Carex davalliana Smith | Летчанский с/с |
| 36. | Осока малоцветковая – Carex pauciflora Light | Летчанский с/с Окрестности г. Витебска |
| 37. | Осока корневищная – Carex rhizina Blytt ex Lindbl | Окрестности г. Витебска |
| 38. | Сеслерия голубая – Sesleria caerulea (L.) Ard. | Летчанский с/с Окрестности г. Витебска |

## Дадатак 2

# Спіс жывёл, занесеных у Чырвоную кнігу Беларусі, якія сустракаюцца ў Віцебскім раёне (адпаведна з Чырвонай кнігай (2004)

| № п/п | Назва | Па-лацінску | Па-руску | Месца распаўсюджання |
|---|---|---|---|---|
| | | **Жывёлы** | | |
| 1. | Сажалкавая начніца | Myotis dasycheme | Прудовая ночница | Сустракалася да 1970 г. |
| 2. | Арэшнікавая соня | Muscardinus avellanaruis | Мушловка, или Орешниковая соня | – |
| 3. | Звычайная палятуха | Pteromys volans | Обыкновенная летяга | – |
| 4. | Буры мядзведзь | Ursus arctos | Бурый медведь | Распаўсюджаны ў паўночнай і паўночна-ўсходняй частцы |
| 5. | Барсук | Meles meles | Барсук | – |
| | | **Птушкі** | | |
| 6. | Вялікі бугай, чапля-бугай | Botaurus stellaris | Большая выпь | – |
| 7. | Чорны бусел | Ciconia nigra | Черный аист | Распаўсюджаны па ўсім раёне |
| 8. | Вялікі савук, вялікі крохаль | Mergus merganser | Большой крохаль | – |
| 9. | Чорны каршун | Mirvus migrans | Черный коршун | – |
| 10. | Змеяд, арол-вужаед | Circaetus gallicus | Змееяд | – |
| 11. | Малы арлец, малы прадворлік | Aquila pomarina | Малый подорлик | Сустракаецца па ўсім раёне |
| 12. | Арол-маркут, беркут | Aquila chrisaetos | Беркут | – |
| 13. | Скапа | Pandion haliaetus | Скопа | Сустракаецца па ўсім раёне |
| 14. | Пустальга | Falco tinnunculus | Пустельга | Сустракаецца па ўсім раёне |
| 15. | Сокал-дрымлюк, дзербнік | Falco columbarius | Дербник | Сустракаецца па ўсім раёне |
| 16. | Сокал-кабец, каршачок | Falco subbuteo | Чеглок | – |
| 17. | Сокал-падарожнік, сапсан | Falco peregrinus | Сапсан | Патрабуецца пацвярджэнне |
| 18. | Пардва, белая курапатка | Lagopus lagopus | Белая куропатка | – |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 19. | Малы пагоніч | Porzana parva | Малый погоныш | Сустракаецца па ўсім раёне |
| 20. | Драч, дзяркач | Crex crex | Коростель | Сустракаецца па ўсім раёне |
| 21. | Шэры журавель | Grus grus | Серый журавль | Сустракаецца па ўсім раёне |
| 22. | Залацісты сявец, залацістая сеўка | Pluvialis apricaria | Золотистая ржанка | Сустракаецца па ўсім раёне |
| 23. | Баталён, турухтан | Philomachus pugnax | Турухтан | Сустракаецца ў пойме Дзвіны |
| 24. | Вялікі грыцук, вялікі верацей-нік | Limosa limosa | Большой веретейник | Сустракаецца па ўсім раёне |
| 25. | Сярэдні кулён, сярэдні кулон | Numenius phaeopus | Средний кроншнеп | Сустракаецца па ўсім раёне |
| 26. | Кулік-селянец, вялікі уліт | Tringa nebularia | Большой улит | Сустракаецца па ўсім раёне |
| 27. | Малая чайка | Larus minutus | Малая чайка | Сустракаецца па ўсім раёне |
| 28. | Шызая чайка | Larus canus | Сизая чайка | Сустракаецца па ўсім раёне |
| 29. | Пугач | Bubo bubo | Филин | – |
| 30. | Даўгахвостая кугакаўка | Strix uralensis | Длиннохвостая неясыть | Сустракаецца па ўсім раёне |
| 31. | Балотная сава | Asio flammeus | Болотная сова | – |
| 32. | Зімародак звычайны | Alcedo attis | Обыкновенный зимородок | Сустракаецца па ўсім раёне |
| 33. | Сіваграк, сіваваронка | Coracias garrulus | Сизоворонка | – |
| 34. | Беласпінны дзяцел | Dendrocopos leucotos | Белоспинный дятел | Сустракаецца па ўсім раёне |
| 35. | Жаўрук-смяцюха, чубаты жаваранак | Galerida cristata | Хохлатый жаворонок | – |
| | | **Рэптылііі** | | |
| 36. | Мядзянка | Coronella austriaca | Медянка | Не пазначаны |
| | | **Рыбы** | | |
| 37. | Сялява | Coregonus albula | Европейская ряпушка | Сустракаецца па ўсім раёне |
| 38. | Рыбец | Vimba vimba | Обыкновенный рыбец | Не пазначаны |
| | | **Насякомыя** | | |
| 39. | Шчытападобны аўсянік | Prosopistoma foleacium | Щитоподобная поденка | Сустракаецца па ўсім раёне |
| 40. | Пахучы красацел | Calosoma sycophanta | Пахучий – красотел | – |
| 41. | Рашэцісты жужаль | Carabus cancellatus | Решетчатая жужелица | – |
| 42. | Жужаль менетрые | Carabus menetriesi | Жужелица менетрие | – |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 43. | Залацістаямчаты жужаль | Carabus clathratus | Золотистоямчатая жужелица | – |
| 44. | Фіялетавы жужаль | Carabus violaceus | Фиолетовая жужелица | – |
| 45. | Шчыгрынавы жужаль | Carabus coriaceus | Шагреневая жужелица | – |
| 46. | Жук-алень | Lucanus cervus | Жук-олень | Не пазначаны |
| 47. | Малое начное паўлінавае вока | Eudia pavonia | Малый ночной павлиний глаз | Сустракаецца па ўсім раёне |
| 48. | Малінавая ордэнская стужка, або пурпурная стужачніца | Catocala sponsa | Малиновая орденская лента, или пурпурная ленточница | – |
| 49. | Малая дубовая ордэнская стужка, або малая дубовая стужачніца | Catocala promissa | Малая дубовая орденская лента, или дубовая ленточница | – |
| 50. | Мядзведзіца-гаспадыня, або вялікая мядзведзіца | Pericallia matronula | Медведица-хозяйка, или большая медведица | – |
| 51. | Стрэлкавы пядзенік | Gagitodes satittata | Стрельчатая пяденица | – |
| 52. | Прыгожы пядзенік | Chariaspilates formosaria | Красивая пяденица | – |
| 53. | Краявочка прыдарожная, або буйнавочка | Lopinga achine | Краеглазка придорожная, или крупноглазка | – |
| 54. | Ранняя шашачніца, або вялікая шашачніца | Euphydryas maturna | Ранняя шашечница, или большая шашечница | – |
| 55. | Тарфяннікавая жаўтушка | Colias palaeno | Торфяниковая желтушка | – |
| 56. | Аксамітніца юта | Oeneis jutta | Сатир ютта | – |
| 57. | Шашачніца Брытамара | Melitaea britomartis | Шашечница Бритомара | – |
| 58. | Мохавы чмель | Bombus muscorum | Моховой шмель | – |
| 59. | Чмель Шрэнка | Bombus schrenckii | Шмель Шренка | – |
| | **Віды, уключаныя ў Чырвоны спіс Міжнародным саюзам аховы прыроды, якія сустракаюцца на тэрыторыі раёна** | | | |
| 60. | Гогаль звычайны | Bucephala clangula | Гоголь | – |
| 61. | Вавёрка звычайная | Sciurus vulgaris | Белка обыкновенная | – |
| 62. | Бабёр рачны | Castor fiber | Бобр речной – | |
| 63. | Мыш-малютка | Micromus minutus | Мышь-малютка | – |
| 64. | Гарнастай | Mustela erminea | Горностай | – |
| 65. | Лясны тхор | Mustela putoris | Лесной хорь | – |
| 66. | Выдра | Lutra lutra | Выдра | – |

## Дадатак 3

## Спіс населеных пунктаў Віцебскага павета (па кнізе “Список населенных мест Витебской губернии” (1906)

### ВОЛАСЦІ ВІЦЕБСКАГА ПАВЕТА

Бабиничская, с. Бабиничи, сельские общества: Авдеевичское, Андроновичское, Бабиничское, Косовское, Туловское; п/о Кордон, церкви в Бабиничах и Скуловичах; школы: училище м. н. пр., церковный приход в Бабиничах, водяные мельницы в им. Косово и д. Малиновка, 9 школ грамоты.

Верховская, с. Слобода, сельские общества: Буевское, Котовское, Мазоловское, Путиловское, Шалыгинское, п/о Витебск, церковь в с. Слобода, часовня в им. Виниполь, училище м. н. пр. в Слободе, 6 школ грамоты, мельницы водяные в им. Мазолово и в с. Шкели.

Вымнянская, с. Котово, сельские общества: Вымнянское, Гончаровское, Мишутянское, Тадулинское, п/о Яновичи, церкви в с. Котово и Вымно, женский монастырь в с. Тадулино и часовня в им. Тадулино, костел в с. Станьки, училище м. н. пр. в Котово, церковный приход в с. Вымно, 6 школ грамоты, мельницы: паровая в им. Вымно, ветряная в д. Кожемякино.

Жеребычская, с. Слобода – Жеребычи, сельские общества: Гришановское, Зароновское, Зачернянское, Каравашнское, Язвинское, п/о Шумилино, церкви: в с. Зароново, в д. Слобода-Жеребычи и Козаногово, часовни в Завязье и Козаногово, училище м. н. пр. в с. Зароново, церковные приходы в с. Зароново, Жеребычи, ветряная мельница в им. Зароново, 11 школ грамоты.

Королевская, с. Королево, сельские общества: Велидичское, Друковское, Королев¬ское, Лужинское, Манулковское, Поддубьевское, Стасевское, Хотемлянское, Шульцевское, п/о Витебск, церкви в с. Королево, в погостах Поддубье, Стасево, Фальковичи, римско-католическая каплица в им. Хотемля,

училище м. н. пр. в с. Королево-2, церковные приходы в погостах Поддубье, Стасево, Фальковичи, в им. Манулки, 11 школ грамоты, лечебное учреждение в с. Королево, мельницы: паровая – в фол. Осиповка, ветряные – в имениях Старое Королево и Обухово, кирпичные заводы в им. Новое Королево и Семченки.

Куринская, с. Курино, сельские общества: Ботыничское, Козловичское, Куринское, Латыговское, Островское, Пышниковское, Хомяковское, Хотольское, п/о Кордон, церкви в с. Курино, погостах Островские и Пышняки, в им. Козловичи, часовни в д. Дражно и в им. Старинки, двухклассное училище м. н. пр. в с. Курино, церковные приходы в с. Курино и в погостах Островские и Пышняки, лечебное учреждение в с. Курино, водяные мельницы в с. Курино, в имениях Лопатки и Хомяково, в д. Рудня, стеклозавод в п. Новка, 11 школ грамоты.

Мишковская, с. Мишково, сельские общества: Княжицкое, Лужеснянское, Марков¬ское, Пестуницкое, Подберезское, Тереспольское, Шалыгинское, церкви в фол. Шидловщина, в пог. Лужесно, в им. Шалыги, кроме того Марков Свято-Троицкий монастырь, училища м. н. пр. в пог. Лужесно-2 и д. Ольгово, церковные приходы в пог. Лужесно и в д. Маркова Слобода, 17 школ грамоты, водяная мельница в им. Лужесно, льнопрядильная фабрика близ Маркова монастыря, винокурный завод в им. Тересполь.

Селютская, им. Селюты, сельские общества: Билевское, Лососинское, Любашковское, Селютское, Тиховское, церкви в с. Кобыльники, Любашково, Селюты, в им. Лососино, часовня в пог. Поповка, училище м. н. пр. при волостном правлении в д. Гайдуки, церковные приходы в с. Кобыльники и Любашково, в пог. Поповка, водяные мельницы в имениях Лососино и Селюты, в с. Любашково и д. Слободка, 13 школ грамоты.

Старосельская, с. Старое Село, сельские общества: Летчанское, Мядилинское, Патконское, Уволокское, Ужлятинское, п/о Старое Село, церкви в с. Мядилино, Старое Село, Ужлятино, римско-католические каплицы близ с. Ужлятино и близ д. Просмыщино, училище м. н. пр. в с. Старое Село, церковные приходы в с. Старое Село, Ужлятино и Мядилино, 10 школ гра-

моты, мельницы: водяные – в фольварках Овсяники и Цыганы, в им. Старое Осло, ветряная – в д. Малое Чирино.

Храповичская, при им. Мартинково, сельские общества: Должанское, Мартинковское, Пепряжское, Путиловское, п/о Боровляны, церкви в с. Кабище и Храповичи, часовня в с. Кабище, училище м. н. пр. в с. Кабище, церковный приход в с. Храповичи, 9 школ грамоты, водяные мельницы в д. Трашково, кирпичный завод в им. Боровляны.

Щербинская, с. Телятники, сельские общества: Аниськовское, Бороникское, Городнянское, Комлевское, Куковячинское, Телятниковское, церкви в с. Телятники, в сел. Стахорщина, в им. Залучесье, часовня в с. Телятники, училище м. н. пр. народное в с. Телятники, 11 школ грамоты, водяная мельница в им. Добрейка, кирпичный завод в д. Городно.

Яновичская, при д. Глазомичи, близ м. Яновичи, сельские общества: Ботаничское, Глазомичское, Горолевское, Казимировское, Лемницкое, Неворожское, п/о Яновичи, церкви в м. Яновичи, в с. Глазомичи, в д. Иваньково и Село, часовня в д. Пивовары, училище м. н. пр. при волостном правлении, церковные приходы в м. Яновичи-2 и в с. Лемница, 12 школ грамоты, лечебное учреждение, паровые мельницы в м. Яновичи и в им. Шкляни, водяные мельницы в м. Яновичи, в д. Симаны и в ф. Домословие, заводы кирпичные в имениях Яновичи и Задубровье, в д. Малые Орешенки и Ширяки.

